МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«БАРАНАВІЦКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ»

# ПРАКТЫКУМ ПА АРФАГРАФІІ І ПУНКТУАЦЫІ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

## Вучэбна-метадычны комплекс для студэнтаў педагагічных спецыяльнасцей

**Рэкамендавана да друку рэдакцыйна-выдавецкім саветам**

Репозиторий БарГУ

Баранавічы
РВА БарДУ
2011

УДК 811.161.3(078)
ББК 81-8(4Бел)я73
П69

А ў т а р ы - с к л а д а л ь н і к і:

*В. М. Шавель, М. В. Швед*

Р э ц э н з е н т ы:

*Г. М. Канцавая*, кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры рускай і беларускай моў з методыкай выкладання ўстановы адукацыі «Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна»;
*І. А. Голуб,* выкладчык кафедры філалогіі ўстановы адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт»;
*Л. І. Станіслаўчык,* магістр педагагічных навук, загадчык кафедры псіхалогіі ўстановы адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт»

**П69** **Практыкум па арфаграфіі і пунктуацыі беларускай мовы** [Тэкст] : вучэбна-метадычны комплекс для студэнтаў пед. спецыяльнасцей / аўт.-склад.: В. М. Шавель, М. В. Швед. — Баранавічы : БарДУ, 2011. — 194, [2] с. — 90 экз. — ISBN 978-985-498-439-1.

Вучэбна-метадычны комплекс змяшчае асноўныя тэарэтычныя звесткі, практычныя, тэставыя заданні па асноўных тэмах курса «Практыкум па арфаграфіі і пунктуацыі беларускай мовы». Практычныя заданні комплекса накіраваны на засваенне і ўдасканаленне арфаграфічных і пунктуацыйных навыкаў у адпаведнасці з Правіламі беларускай арфаграфіі і пунктуацыі, зацверджанымі Законам Рэспублікі Беларусь ад 23 ліпеня 2008 года.

Прызначаецца для студэнтаў ВНУ Рэспублікі Беларусь педагагічных спецыяльнасцей, будзе карысны школьнікам, абітурыентам, настаўнікам.

**УДК 811.161.3(078)**
**ББК 81-8(4Бел)я73**

**ISBN 978-985-498-439-1**
**© БарДУ, 2011**

Репозиторий БарГУ

## СПІС СКАРАЧЭННЯЎ І АБРЭВІЯТУР

| | | |
|---|---|---|
| АС | — | арфаграфічны слоўнік |
| г. д. | — | гэтак далей |
| г. зн. | — | гэта значыць |
| грэч. | — | грэчаскі |
| знач. | — | значэнне |
| інш. | — | іншы |
| лац. | — | лацінскі |
| НРБ і БРС | — | новы руска-беларускі і беларуска-рускі слоўнік |
| пад. | — | падобны |
| параўн. | — | параўнайце |
| РБС | — | руска-беларускі слоўнік |
| сін. | — | сінонім |
| СНСБМ | — | слоўнік новых слоў беларускай мовы |
| ТСБМ | — | Тлумачальны слоўнік беларускай мовы |

Репозиторий БарГУ

# УВОДЗІНЫ

Беларуская мова як дзяржаўная мова ў Рэспубліцы Беларусь адыгрывае важную ролю ў жыцці беларускага грамадства. Таму ўнармаванасць дзяржаўнай мовы, захаванне адзінства арфаграфічных і пунктуацыйных нормаў пісьмовай мовы ў значнай ступені забяспечваюць стабільнасць у сферы моўнай камунікацыі і маюць важнае дзяржаўнае і палітычнае значэнне.

Асноўная мэта факультатыўнага курса «Практыкум па арфаграфіі і пунктуацыі беларускай мовы» — развіццё і ўдасканаленне філалагічнага мыслення студэнтаў; павышэнне пісьменнасці студэнтаў, культуры іх мовы; засваенне і фарміраванне арфаграфічных і пунктуацыйных уменняў і навыкаў у адпаведнасці з Правіламі беларускай арфаграфіі і пунктуацыі, зацверджанымі Законам Рэспублікі Беларусь ад 23 ліпеня 2008 года; фарміраванне ўстаноўкі на практычнае выкарыстанне атрыманых студэнтамі ведаў у іх будучай прафесійнай дзейнасці і іншых сферах сацыяльнай актыўнасці.

Вучэбна-метадычны комплекс адпавядае патрабаванням вучэбнай праграмы для спецыяльнасцей 1-01 02 02-04 Пачатковая адукацыя. Беларуская мова і літаратура; 1-01 02 02-06 Пачатковая адукацыя. Фізічная культура; 1-01 02 02-09 Пачатковая адукацыя. Сацыяльная педагогіка.

Вучэбна-метадычны комплекс змяшчае асноўныя тэарэтычныя звесткі, практычныя, тэставыя заданні па асноўных тэмах курса «Практыкум па арфаграфіі і пунктуацыі беларускай мовы». Значная ўвага ў змесце вучэбна-метадычнага комплекса надаецца тым зменам, якія адбыліся ў беларускім правапісе. Зместавае напаўненне тэставых заданняў, прапанаваных пасля кожнага модуля, ахоплівае пераважную большасць тэарэтычных пытанняў, якія замацоўваюцца праз выкананне практычных заданняў.

Факультатыўны курс «Практыкум па арфаграфіі і пунктуацыі беларускай мовы» разлічаны на 34 гадзіны для груп спецыяльнасцей 1-01 02 02-06 Пачатковая адукацыя. Фізічная культура; 1-01 02 02-04 Пачатковая адукацыя. Беларуская мова і літаратура; 1-01 02 02-09 Пачатковая адукацыя. Сацыяльная педагогіка.

Рэпазіторый БарДУ

# *ПРАГРАМНА-ІНФАРМАЦЫЙНЫ БЛОК*

## ВЫПІСКА З ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ

Вучэбная праграма складзена на аснове базавай праграмы для вышэйшых навучальных устаноў «Практыкум па арфаграфіі і пунктуацыі беларускай мовы», зацверджанай Навукова-метадычным саветам БарДУ ад 26 мая 2010 года (пратакол № 9) УД–97/10/баз.

## ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН ДЫСЦЫПЛІНЫ

| № п/п | Назва радзела, тэмы | Колькасць гадзін | |
|---|---|---|---|
| | | Усяго | Практычныя заняткі |
| 1 | Раздзел I **Арфаграфія** | 16 | |
| 1.1 | *Тэма 1* Прынцыпы беларускай арфаграфіі | 2 | 2 |
| 1.2 | *Тэма 2* Правапіс галосных | 2 | 2 |
| 1.3 | *Тэма 3* Правапіс зычных | 2 | 2 |
| 1.4 | *Тэма 4* Правапіс мяккага знака і апострафа | 2 | 2 |
| 1.5 | *Тэма 5* Правапіс вялікай і малой літар | 2 | 2 |
| 1.6 | *Тэма 6* Правапіс складаных слоў | 2 | 2 |
| 1.7 | *Тэма 7* Правапіс суфіксаў у беларускай мове | 2 | 2 |
| 1.8 | *Тэма 8* Правапіс не (ня) з рознымі часцінамі мовы | 2 | 2 |
| 2 | Раздзел II **Пунктуацыя** | 18 | |
| 2.1 | *Тэма 9* Пунктуацыя як сістэма пастаноўкі знакаў прыпынку. Знакі прыпынку паміж дзейнікам і выказнікам | 2 | 2 |
| 2.2 | *Тэма 10* Пунктуацыя пры аднародных членах сказа | 2 | 2 |
| 2.3 | *Тэма 11* Пунктуацыя пры адасобленых членах сказа | 2 | 2 |
| 2.4 | *Тэма 12* Пунктуацыя пры параўнальных зваротках і зваротках | 2 | 2 |
| 2.5 | *Тэма 13* Пунктуацыя пры пабочных і ўстаўных словах, словазлучэннях і сказах | 2 | 2 |
| 2.6 | *Тэма 14* Пунктуацыя ў складаназлучаных сказах | 2 | 2 |
| 2.7 | *Тэма 15* Пунктуацыя ў складаназалежных сказах | 2 | 2 |
| 2.8 | *Тэма 16* Пунктуацыя ў бяззлучнікавых складаных сказах | 2 | 2 |
| 2.9 | *Тэма 17* Пунктуацыя ў складаных сказах з рознымі відамі сувязі. Пунктуацыя ў сказах з простай мовай | 2 | 2 |
| | У С Я Г О | 34 | 34 |

Рэпазіторый БарДУ

## ЗМЕСТ ДЫСЦЫПЛІНЫ

### Раздзел I
### Арфаграфія

Тэма 1 **Прынцыпы беларускай арфаграфіі**

Арфаграфія як раздзел мовазнаўства. Змест і задачы арфаграфіі, яе сувязь з фанетыкай і графікай.

Паняцце арфаграмы, арфаграфічнага правіла. Асноўныя прынцыпы беларускай арфаграфіі (фанетычны і марфалагічны). Абмежаванасць дыферэнцыйных і традыцыйных напісанняў у беларускай мове.

Тэма 2 **Правапіс галосных**

Правапіс *о, э — а*. Правапіс літар *е, ё, я.* Правапіс спалучэнняў галосных у іншамоўных словах.

Правапіс прыстаўных галосных *і, а*. Правапіс літар *і, ы, й* пасля прыставак.

Правапіс літары *у — ў*. Правапіс галосных пасля няпарных цвёрдых зычных.

Тэма 3 **Правапіс зычных**

Правапіс звонкіх і глухіх, свісцячых і шыпячых.

Зычныя *д — дз*, *т — ц* і іх правапіс. Правапіс падоўжаных зычных. Правапіс некаторых спалучэнняў зычных.

Правапіс прыстаўной і ўстаўной літары *в*.

Тэма 4 **Правапіс мяккага знака і апострафа**

Правапіс змякчальнага і раздзяляльнага мяккага знака.

Правапіс апострафа.

Репозиторий БарГУ

Тэма 5 **Правапіс вялікай і малой літар**

Агульныя правілы правапісу вялікай і малой літар.

Вялікая і малая літары ў асабовых назвах; у найменнях асоб, звязаных з рэлігіямі, назвах міфалагічных і казачных герояў; у геаграфічных і астранамічных назвах; у назвах дзяржаўных органаў і іншых арганізацый; у найменнях пасад і званняў, ветлівых зваротах і спецыяльных абазначэннях; у назвах дзяржаўных і нацыянальных сімвалаў, узнагарод, прэмій і г. д.; у назвах знамянальных падзей і дат, перыядаў і эпох.

Тэма 6 **Правапіс складаных слоў**

Правапіс злучальных галосных у складаных словах. Правапіс складаных назоўнікаў і прыметнікаў.

Тэма 7 **Правапіс суфіксаў у беларускай мове**

Правапіс суфіксаў у беларускай мове. Правапіс галосных у некаторых суфіксах назоўнікаў (суфіксы *-ак-* і *-ік- (-ык-)*; *-ічк- (-ычк-)* і *-ечк- (-ачк-))*, прыметнікаў (суфіксы *-енн-; -еў-, -аў-, -оў-, -ёў-; -еньк- (-аньк-, -эньк*-)), дзеясловаў (суфіксы *-ава- (-ява-); -ва-; -іва- (-ыва-))*.

Тэма 8 **Правапіс не (ня) з рознымі часцінамі мовы**

Асобнае і злітнае напісанне часціц *не (ня)* з назоўнікамі, прыметнікамі, займеннікамі, прыслоўямі і іншымі часцінамі мовы.

## Раздзел II
## **Пунктуацыя**

Тэма 1 **Пунктуацыя як сістэма пастаноўкі знакаў прыпынку. Знакі прыпынку паміж дзейнікам і выказнікам**

Пунктуацыя як сістэма пастаноўкі знакаў прыпынку. Роля пунктуацыі ў афармленні пісьмовай мовы.



Рэпазіторый БарДУ

Знакі прыпынку ў канцы сказа: кропка, пытальнік, клічнік, шматкроп'е. Знакі прыпынку паміж дзейнікам і выказнікам.

### Тэма 2 **Пунктуацыя пры аднародных членах сказа**

Знакі прыпынку пры аднародных членах сказа са спалучальнымі, з супастаўляльнымі, размеркавальнымі, уступальнымі, умоўнымі, уступальна-супрацiўнымі, з параўнальна-супастаўляльнымі злучнікамі. Знакі прыпынку пры аднародных членах сказа з далучальнымі злучнікамі. Знакі прыпынку пры аднародных членах сказа з бяззлучнікавай сувяззю. Знакі прыпынку пры аднародных членах сказа з абагульняльнымі словамі.

### Тэма 3 **Пунктуацыя пры адасобленых членах сказа**

Знакі прыпынку пры адасобленых дапасаваных і недапасаваных азначэннях. Знакі прыпынку пры адасобленых прыдатках.

Знакі прыпынку пры адасобленых акалічнасцях, выражаных адзіночнымі дзеепрыслоўямі і дзеепрыслоўнымі словазлучэннямі, прыслоўямі.

Знакі прыпынку пры акалічнасцях, выражаных назоўнікамі.

Знакі прыпынку пры адасобленых дапаўненнях і ўдакладняючых членах сказа.

Знакі прыпынку пры адасобленых паясняючых і далучальных членах сказа.

### Тэма 4 **Пунктуацыя пры параўнальных зваротах і зваротках**

Звароты, якія адносяцца да ўказальных слоў. Параўнальныя звароты, якія ўводзяцца пры дапамозе спалучэнняў (больш як (не больш як), больш чым (не больш чым), менш як (не менш як), менш чым (не менш чым), не бліжэй як і г. д. Знакі прыпынку пры параўнальных зваротах, якія маюць заключальнае або паясняльнае значэнне.

Репозиторий БарГУ

Знакі прыпынку пры зваротках, якія стаяць у пачатку, сярэдзіне і ў канцы сказа. Знакі прыпынку пры зваротках, якія ўжываюцца з часціцамі і асабовымі займеннікамі.

### Тэма 5 **Пунктуацыя пры пабочных і ўстаўных словах, словазлучэннях і сказах**

Коска пры пабочных сінтаксічных канструкцыях. Працяжнік, коска і працяжнік пры пабочных словах, словазлучэннях і сказах.

Знакі прыпынку пры ўстаўных канструкцыях з аслабленай сувяззю. Знакі прыпынку пры ўстаўных словах, словазлучэннях і сказах, якія маюць цесную сувязь. Коска і працяжнік пры ўстаўных канструкцыях.

### Тэма 6 **Пунктуацыя ў складаназлучаных сказах**

Знакі прыпынку ў складаназлучаных сказах са спалучальнымі, супастаўляльнымі, размеркавальнымі, далучальнымі часткамі.

### Тэма 7 **Пунктуацыя ў складаназалежных сказах**

Знакі прыпынку ў складаназалежных сказах з даданымі азначальнымі, дапаўняльнымі, дзейнікавымі і выказнікавымі часткамі.

Знакі прыпынку ў складаназалежных сказах з акалічнаснымі часткамі (даданымі часу, месца, прычыны, мэты, умовы, выніку, меры і ступені, спосабу дзеяння).

Знакі прыпынку ў складаназалежных сказах з даданымі параўнальнымі і супастаўляльнымі часткамі, з даданымі далучальнымі часткамі.

Знакі прыпынку ў складаназалежных сказах з некалькімі галоўнымі і даданымі часткамі.

### Тэма 8. **Пунктуацыя ў бяззлучнікавых складаных сказах**

Знакі прыпынку ў бяззлучнікавых складаных сказах са спалучальнымі і супастаўляльнымі часткамі. Бяззлучнікавыя сказы з азначальнымі і дапаўняльнымі часткамі, знакі прыпынку ў іх.

Репозиторий БарГУ

Знакі прыпынку ў бяззлучнікавых сказах з акалічнаснымі і далучальнымі часткамі.

Тэма 9 **Пунктуацыя ў складаных сказах з living рознымі відамі сувязі. Пунктуацыя ў сказах з простай мовай**

Коска, кропка з коскай, двукроп'е, коска з працяжнікам, працяжнік у сказах з рознымі відамі сувязі (камбінаванай будовы).

Двукоссе пры простай мове. Працяжнік у сказах з простай мовай.

Знакі прыпынку пры цытатах і спасылках.

Перыяд. Яго афармленне на пісьме.

Репозиторий БарГУ

# *НАВУЧАЛЬНА-МЕТАДЫЧНЫ БЛОК*

## МОДУЛЬ 1
## АРФАГРАФІЯ

***Мэта*** — падрыхтаваць студэнтаў да ўсведамлення месца беларускай мовы ў развіцці культуры і духоўным адраджэнні нацыі, засваення асаблівасцей арфаграфічнай сістэмы беларускай мовы.

***Задачы:***

фарміраваць навыкі распазнавання ў тэкстах арфаграм, абгрунтавання правільнасці напісання ў адпаведнасці з пэўным правілам;

пазнаёміць студэнтаў з тымі зменамі, якія адбыліся ў беларускай арфаграфіі ў адпаведнасці з Законам, прынятым 23 ліпеня 2008 года.

фарміраваць навыкі правядзення арфаграфічнага аналізу прапанаванага лінгвістычнага матэрыялу.

## Т Э М А 1
## ПРЫНЦЫПЫ БЕЛАРУСКАЙ АРФАГРАФІІ

### 1.1 Арфаграфія як раздзел мовазнаўства

Тэрмін *арфаграфія* (ад грэч. *orthographia: orthos* = правільны, прамы + *graphō* = пішу) літаральна суадносіцца з тэрмінам *правапіс.* Але значэнні гэтых слоў *(арфаграфія* і *правапіс)* не супадаюць.

У сучаснай моўнай практыцы тэрмін а р ф а г р а ф і я мае чатыры значэнні:

1. Раздзел мовазнаўства, у якім вывучаюцца і распрацоўваюцца правілы аднастайнай перадачы вуснай мовы на пісьме (а іншы раз і афіцыйна даецца дазвол на варыянтнасць).

2. Сістэма агульнапрынятых напісанняў, якая склалася гістарычна і якой карыстаецца грамадства.

3. Правілы, якія патрабуюць аднастайнага абавязковага для ўсіх носьбітаў мовы напісання слоў і іх значымых частак (марфем) у тых выпадках, дзе магчымыя розныя напісанні.

Репозиторий БарГУ

4. Выкананне прынятых правілаў (ці практычнае выкарыстанне правілаў у пісьмовых тэкстах розных стыляў).

*Асноўная задача арфаграфіі* — выпрацаваць такія правілы напісання слоў і марфем, якія адначасова:

– былі б простымі ў выкарыстанні;

– адлюстроўвалі гукавы склад вуснай мовы;

– захоўвалі нязменнасць некаторых марфем слова і выразнасць яго граматычных форм, напрыклад, *пясчаны, дарожка, падказаць,* а не *«пяшчаны, дарошка, патказаць».*

Тэрмін *правапіс* з'яўляецца калькай грэчаскага слова. У адрозненне ад тэрміна *арфаграфія* ён мае больш шырокае значэнне: гэта не толькі сістэма агульнапрынятых правілаў, але і сістэма правілаў ужывання знакаў прыпынку (пунктуацыя) [6, с. 10-11].

## 1.2 Паняцце арфаграмы, арфаграфічнага правіла

А р ф а г р а м а (ад грэч. *orthos* = правільны, прамы + *gramma* = запіс, літара) — гэта такое напісанне слова, якое выбіраецца з рада магчымых пры адным і тым жа вымаўленні і адпавядае існуючаму правілу ці традыцыі.

Напрыклад, напісанні *расчоска, рашчозка, разчозка, ражчоска* будуць вымаўляцца заўсёды аднолькава — [рашчоска], але з пункту погляду арфаграфіі нарматыўным будзе лічыцца толькі першае слова *расчоска,* паколькі менавіта ў ім рэалізаваны наступныя правілы: 1) аканне (не пад націскам у беларускай мове пішацца літара *а*); 2) правапіс прыставак на *з- (с-)*; 3) напісанне зычных у слабай пазіцыі, якое правяраецца моцнай іх пазіцыяй *(расчасаць).*

Усе арфаграмы беларускай мовы можна падзяліць на два тыпы: арфаграмы, звязаныя з абазначэннем фанемнага саставу слова, і арфаграмы, не звязаныя з абазначэннем фанем.

Да арфаграм, звязаных з абазначэннем фанемнага саставу слова, адносяцца:

1) літары ў слове ў адпаведнасці з фанемамі ў моцнай пазіцыі (моцная пазіцыя для галосных — націскное становішча): *бэлька, маянэз, бэжавы — белы, сетка — сэрвіс, спартсмен — бармэн.* Напісанне літар у падобных словах неабходна запамінаць і

Рэпазіторый БарДУ

правяраць толькі па слоўніку: *шынель, панэль, сэт, турнэпс, баранеса* і інш.;

2) літары ў слове ў адпаведнасці з фанемай у слабай пазіцыі, якую можна паставіць у моцную пазіцыю (для звонкіх гукаў слабая пазіцыя — гэта пазіцыя на канцы слова, перад глухім зычным): *пірог — мох — мог, загадка, падказка (пірага, моху, магу, загадаць, падказаць)*. Каб праверыць арфаграму слабай пазіцыі, неабходна вызначыць, у якую марфему ўваходзіць фанема, якая абазначаецца арфаграмай, а затым знайсці моцную пазіцыю для гэтай фанемы ў той жа марфеме;

3) літары ў слове ў адпаведнасці з фанемай у слабай пазіцыі, якія нельга паставіць у моцную пазіцыю. Да такіх арфаграм адносяцца, напрыклад, літары *з, с* у прыстаўках: *узмор'е, раскапаць, спыніць, збегчы.* Фанема <з> у прыстаўках указаных слоў абазначаецца па тым гуку, якім яна прадстаўлена ў слове. Перад літарамі, якія абазначаюць глухія гукі, пішацца літара *с*, перад звонкімі — літара *з.* А фанемы <б>, <д> у адпаведных прыстаўках заўсёды прадстаўлены літарамі *б, д* незалежна ад наступных гукаў: *аб'ехаць, адказаць, адрэзаць, падцянуцца*;

4) наяўнасць або адсутнасць літары: *каменьчык — вагончык, кантраст — кантрасны, праезд — праязны, ралля — беларускі, ножычак — ножычка*.

Да арфаграм, не звязаных з абазначэннем фанем, адносяцца:

1) напісанне слова разам, асобна, праз злучок: *Давыд-Гарадок — давыд-гарадоцкі, па-першае — па першаму* (слову), *наверх — на верх* (дома);

2) напісанне слова з вялікай ці малой літары: *бацькаўшчына — Бацькаўшчына, танк — Танк* (псеўданім), *шарык — Шарык* (мянушка сабакі);

3) напісанне слоў-абрэвіятур вялікімі ці малымі літарамі: *БДУ, БТ, ЛіМ, МАЗ, БелТА, СНД, ДАБМ* («Дыялекталагічны атлас беларускай мовы»); *нэп, вну, загс*;

4) перанос часткі слова з аднаго радка на другі: *вя-сна і вяс-на, па-дышоў, пад-казаў*; **нельга:** *вясн-а, п-адышоў;*

5) графічныя скарачэнні: *мн. л. — множны лік* (**нельга:** мно. лі.); *кг — кілаграм* (**нельга:** кіл.); *с.-г. — сельскагаспадарчы* (**нельга:** сель.-гаспа.); *в/ч — вайсковая часць* (**нельга:** во/ча).

Репозиторий БарГУ

А р ф а г р а ф і ч н а я  п а м ы л к а — гэта замена арфаграмы іншым знакам пры захаванні аднолькавага вымаўлення слова. Так, калі студэнт у слове *дзядзька* замест *дз* напіша *ц («дзяцька»)* — гэта значыць, ён не ведае правіла перадачы на пісьме звонкіх гукаў перад глухімі. Гэта арфаграфічная памылка, бо вымаўленне слова не змяняецца. Калі ж студэнт напіша *«дзідзька»,* то ў гэтым выпадку ён дапусціць не арфаграфічную, а маўленчую памылку, паколькі такое напісанне не будзе адпавядаць нарматыўнаму вымаўленню. Такім чынам, арфаграфічныя памылкі ўзнікаюць пры замене арфаграмы забароненым правіламі арфаграфіі спосабам перадачы таго ж вымаўлення.

Каб пазбегнуць арфаграфічных памылак, неабходна ведаць тыпы і віды арфаграм і тое, як праверыць арфаграму.

А р ф а г р а ф і ч н а е  п р а в і л а — гэта палажэнне, якое прапануе нарматыўнае напісанне слова ў адпаведнасці з канкрэтным арфаграфічным прынцыпам. Адхіленне ад прынцыпу лічыцца выключэннем з правіла. Напрыклад, напісанне літар *е, я* ў словах *вясна, зямля, сям'я, веснавы, земляны, сем'янін* адпавядае арфаграфічнаму правілу перадачы на пісьме «якання» (у першым складзе перад націскам пішам *-я,* ва ўсіх астатніх складах адносна націску — літару *е*). Напісанне гэтых жа літар у словах *легенда, перон, завязь, роўнядзь, цягавіты* — выключэнні з правіла.

Арфаграфічнае правіла грунтуецца на пэўных прынцыпах беларускай арфаграфіі [6, с. 12—14].

## 1.3 Асноўныя прынцыпы беларускай арфаграфіі

А р ф а г р а ф і ч н ы  п р ы н ц ы п (ад лац. *principum* — аснова, пачатак) — пэўная заканамернасць, звязаная з нацыянальнай спецыфікай мовы, на аснове якой грунтуюцца і аб'ядноўваюцца ў групы канкрэтныя правілы напісання. Іншымі словамі — гэта кіруючая ідэя ў выбары літар там, дзе гук можа быць абазначаны варыятыўна. У сучаснай беларускай арфаграфіі пераважная большасць усіх правілаў аб'ядноўваюцца ў групы на аснове *фанетычнага, марфалагічнага (фанематычнага), традыцыйнага, дыферэнцыйнага* прынцыпаў. Два з іх (фанетычны і фанематычны) з'яўляюцца



Рэпазіторый БарДУ

вядучымі. Гэта значыць, што большасць беларускіх правілаў заснаваныя менавіта на гэтых прынцыпах.

Ф а н е т ы ч н ы м   п р ы н ц ы п а м прынята называць такі прынцып напісання слоў, паводле якога гукі перадаюцца на пісьме адпаведна літаратурнаму вымаўленню (вымаўляем *[дэзынф'экцыйа], [фарватар], [баранав'іцк'і]*, пішам *дэзынфекцыя, фарватар, баранавіцкі).* Пры дапамозе гэтага прынцыпу адлюстроўваюцца пазіцыйныя чаргаванні гукаў, г. зн. гукі слабых пазіцый абазначаюцца літарамі на аснове прамой адпаведнасці: *гук → адпаведная яму літара.* Па гэтай прычыне фанетычныя напісанні падобныя ў некаторай ступені на транскрыпцыю, толькі яны менш дакладныя. Графічнае адзінства марфемы пры гэтым захоўваецца не заўсёды. Параўнайце: *зямля — земляны, клён — кляновік* [6, с. 18].

На фанетычным прынцыпе грунтуюцца наступныя правілы:

1. Аканне. Правапіс на месцы гукаў [о], [э] пасля цвёрдых і зацвярдзелых зычных ва ўсіх ненаціскных складах літары *а: мова — маўленне, бор — бары, сэрца — сардэчны.*

2. Яканне. Правапіс *я* на месцы *е, ё* ў першым складзе перад націскам: *весела — вясёлы, вяселле, зелень — зялёны, снег — сняжок.*

3. Правапіс *ы, і, й* пасля прыставак (*разыграць, зайсці, дэзынфармацыя, субынспектар, заінтрыгаваць*).

4. Правапіс спалучэнняў галосных у запазычаных словах (*археалагічны, маянэз, геніяльны, акіян, Нью-Ёрк*).

5. Правапіс галосных у складаных словах (*мнагазначны, чорнавалосы, вогнетрывалы, кінапанарама, паліклініка, полісемія, паўмесяца, поўдзень, шасцігодка*).

6. Правапіс прыстаўных галосных і зычных (*імгла, заржаць, гэтулькі, восень*).

7. Правапіс ў (у нескладовага): *паўза, клоўн.*

8. Правапіс прыставак *з-, без-(бяз-), раз-(роз-), уз-, цераз-* (перад глухімі зычнымі пішацца *с): бясспрэчны, бязмежны, звесці, ссыпаць, расказаць.* Прыстаўка *з-* перадаецца літарай *с* перад галоснымі [а], [у], [ы]: *сагітаваць, сурочыць, сыграць, сыскаць;* **але**: *зыначыць.*

9. Абазначэнне на пісьме цвёрдых зычных [д], [т] літарамі *дз, ц* перад *е, ё, і, ю, я* і мяккімі [в'], [м'] у корані слова: *людзі, дзеці, дзверы, цвёрды, Дзмітравіч, Дзяніс, Дзвіна, Ціхан, Цюмень, Мацвей, Мацвеенка.*

10. Правапіс падоўжаных зычных: падоўжанае вымаўленне зычных [дз'], [з'], [л'], [н'], [ц'], [с'], [ж], [ч], [ш] паміж галоснымі



Репозиторий БарГУ

на пісьме перадаецца падваеннем адпаведных літар (падоўжанае вымаўленне [дз’] абазначаецца на пісьме спалучэннем *ддз)*: *разводдзе, суддзя, збожжа, вяселле, карэнне, калоссе, жыццё, заціішша, сучча, палоззе*.

11. Правапіс спалучэнняў *зн, нц, рц, рн, сн, сл* на месцы этымалагічных [здн], [лнц], [рдц], [рдн ], [стн], [стл]: *прыязны, сонца, сэрца, міласэрны, абласны, радасны, шчаслівы*.

12. Напісанне літары *т* на месцы спалучэння [дт] на канцы іншамоўных слоў: *Шміт, Кранштат, Гумбальт*.

13. Напісанне падвойнага *ч* на месцы суфіксальнага [цк] перад *-ін- і (-ын-)* у геаграфічных назвах: *Полаччына* (параўн.: *Полацк, полацкі), Случчына (Слуцк, слуцкі), Беласточчына, Турэччына, Нямеччына*; **але:** *Брэстчына, Навагрудчына*.

14. Напісанне адной літары *с* і *з* у словах *расада, расаднік, расол, расольнік, ростань, разява, разявіць*.

15. Перадача на пісьме асіміляцыі свісцячых да шыпячых у словах *пяшчота, рошчына, шчасце, ушчуваць, нішчымны, нішчымніца* і вытворных ад іх.

16. Напісанні літары *с* на месцы гістарычных спалучэнняў [жс], [шс], [хс], [гс] у некаторых словах *таварыскі, адэскі, прыгоства, купецкі, мастацкі* і інш. [12, с. 157—163].

М а р ф а л а г і ч н ы ( ф а н е м а т ы ч н ы ) п р ы н ц ы п заключаецца ў тым, што знакамі алфавіта абазначаюцца фанемы, якія складаюць дадзеную марфему, незалежна ад таго, у якіх гуках выражаюцца гэтыя фанемы, г. зн. кожная фанема ў любой пазіцыі адлюстроўваецца на пісьме адным і тым жа знакам, які адпавядае фанеме ў моцнай пазіцыі [6, с. 18].

На марфалагічным прынцыпе грунтуюцца наступныя правілы:

1. Правапіс звонкіх і глухіх зычных: *снег, след, год, казка, барацьба, малацьбіт, просьба*.

2. Правапіс цвёрдых і мяккіх зычных: *збор, мосцік, снег*.

3. Правапіс свісцячых і шыпячых зычных: *зжаць, расчасаць, счарсцвець*.

4. Правапіс выбухных *д, т* у спалучэнні з афрыкатамі *ч, ц*: *лётчык, пераплётчык, у лодцы, у вопратцы*.

5. Правапіс *ж, з, с* перад суфіксам *-чык-* у назоўніках, якія абазначаюць назву асобы па роду дзейнасці, прафесіі і пад.: *грузчык, даносчык, берабежчык*.



Репозиторий БарГУ

6. Правапіс зычных на стыку марфем: у геаграфічных назвах (і вытворных ад іх словах) на канцы зычныя асновы *з, ж, ш, г, х* і каранёвага *д* перад суфіксальным [с] захоўваюцца ў прыметніках: *каўказскі, волжскі, нясвіжскі, латышскі, выбаргскі, казахскі, заводскі, параходства*.

7. Напісанне *е* ў прыназоўніку *без* і часціцы *не: без клопату, без радасці, не быў, не бачыў*.

8. Напісанне суфіксаў *-язь, -ядзь: дробязь, боязь, роўнядзь* [12, с. 163—166].

9. Напісанне спалучэнняў *сч, шч* вымаўляюцца адпаведна як [шч]: *расчуліць, расшчодрыцца, расчапіць (кручкі), расшчапіць (палена)*.

10. Нязменны правапіс *б, д* на канцы прыставак і прыназоўнікаў *аб, ад, над, пад*: *абсмяяць, адкупіцца, надпіс, падсохнуць, аб песні, над школай, пад сонцам*.

Т р а д ы ц ы й н а е н а п і с а н н е — гэта такое напісанне, пры якім выбар літары для абазначэння фанемы ажыццяўляецца не на аснове праверкі моцнай пазіцыяй, а на аснове этымалогіі і традыцыі [6, с. 18-19].

Да традыцыйнага напісання ў сучаснай беларускай мове належаць выключэнні з асноўных правілаў. Напрыклад, паводле існуючай традыцыі, у пачатку ўласных назваў заўсёды пішацца літара *у (складовае): да Урала, ва Уруччы, на Украіне, да Уладзіміра*.

Па традыцыі пішуцца:

1. Словы *заяц, пояс, памяць, тысяча, месяц*.

2. З вялікай літары новы вершаваны радок.

3. З вялікай літары назвы міжнародных арганізацый: *Сусветны Савет Міру, Генеральная Асамблея Арганізацыі Аб'яднаных Нацый*.

Д ы ф е р э н ц ы й н ы п р ы н ц ы п служыць для адрознення аднолькавых паводле гучання слоў або іх форм, г. зн. арфаграфічна адрозніваць тое, што не адрозніваецца фанематычна. Літары пры гэтым асацыіруюцца не з гукамі, а непасрэдна з сэнсам (параўнайце: *стол — столь, кон — конь*); ужыванне вялікіх літар у імёнах (параўнайце: *Колас — колас)*; ужыванне галосных у канчатках назоўнікаў творнага склону ў аманімічных прозвішчах і геаграфічных назвах (параўнайце: *Пушкіным — Пушкінам, Барысавам — Барысавым*); ужыванне канчаткаў прыметнікаў вінавальнага і роднага склону (параўнайце: *чорнага хлопца — чорны стол*) [6, с. 19].

Такім чынам, правілы перадачы гукаў (фанем) літарамі ў складзе слоў і марфем у сучаснай беларускай арфаграфіі пабудаваны ў асноўным на фанетычным і марфалагічным прынцыпах.



Репозиторий БарГУ

Р а з д з е л   а р ф а г р а ф і і — гэта сукупнасць правілаў, заснаваных на пэўных прынцыпах.

У беларускай арфаграфіі вылучаюцца пяць адносна самастойных раздзелаў. Гэтыя раздзелы і іх асноўныя прынцыпы змешчаны ў наступнай табліцы:

| Раздзел арфаграфіі | Асноўныя прынцыпы |
|---|---|
| 1. Сукупнасць правілаў перадачы на пісьме галосных, зычных гукаў, мяккага знака і апострафа ў саставе слова і асобных марфем | *Фанетычны* (адзін з вядучых пры перадачы на пісьме галосных гукаў), *марфалагічны* (вядучы пры перадачы на пісьме зычных гукаў), *традыцыйны* (пры напісанні слоў неславянскага паходжання) |
| 2. Сукупнасць правілаў злітнага, паўзлітнага (праз дэфіс, або злучок) і раздзельнага напісання слоў і іх частак | *Лексіка-марфалагічны.* Сутнасць яго ў тым, што словы пішуцца асобна, часткі слоў — разам |
| 3. Сукупнасць правілаў ужывання вялікай літары | Дзейнічаюць *лексічны і сінтаксічны прынцыпы:* вылучаюцца прапіснымі літарамі ўласныя імёны і некаторыя іншыя тыпы слоў, а таксама пачатковыя словы самастойных сказаў |
| 4. Сукупнасць правілаў пераносу частак слоў з аднаго радка на другі | *Складова-марфемны:* часткова ўлічваецца складовая структура |
| 5. Правілы графічнага скарачэння слоў | *Літарна-гукавы:* апора на большую інфарматыўнасць зычных гукаў |

Цэнтральным раздзелам беларускай арфаграфіі з'яўляецца першы раздзел, які ўключае правілы перадачы на пісьме галосных, зычных гукаў, мяккага знака і апострафа ў саставе слова і асобных марфем.

Асобны раздзел беларускай арфаграфіі складае перадача на пісьме неславянскіх імёнаў і прозвішчаў, а таксама геаграфічных назваў. Выдзяленне такога раздзела абумоўлена тым, што ў запазычаных словах могуць вымаўляцца такія гукі, якіх няма ў беларускай мове, напрыклад, білабіяльны гук [w], што ёсць у англійскай, французскай, іспанскай і іншых мовах. У беларускай мове ён можа перадавацца рознымі спосабамі: літарай *у* (складовае) — *уайт, уік-энд,* літарай *в* — *ват, трамвай, Аёва, Ашава* [6, с. 20-21].

**Парадак арфаграфічнага разбору**

1. Адзначыць арфаграмы.
2. Вызначыць сутнасць напісання.
3. Назваць правіла, на якім грунтуецца напісанне.

Репозиторий БарГУ

У з о р: ***Лёгкія** крокі на **вузкай** сцяжынцы* (Я. Брыль).

*Лё**гк**ія, ву**зк**ай* — правапіс звонкіх зычных перад глухімі ў сярэдзіне слова. Правіла: звонкія зычныя ў сярэдзіне слова перад глухімі на пісьме захоўваюцца незалежна ад вымаўлення. Правяраем: *лёгенькі, вузенькі*. ***В**узкай* — правапіс прыстаўных зычных. Правіла: прыстаўны зычны *в* пішацца перад каранёвым *у*. *Сц**я**жынцы* — правапіс галосных *е, я*. Правіла: у першым складзе перад націскам замест *е* пішацца *я* (сцежка). ***Сц**яжынцы* — правапіс мяккага знака. Правіла: мяккі знак не пішацца пасля мяккіх зычных *дз, з, с, ц* перад мяккімі, калі пры змяненні слова абодва зычныя застаюцца мяккімі або становяцца цвёрдымі (*сцяжынцы — сцежка, сцежачка*) [2, с. 86].

## Гласарый

**Арфаграма** — гэта такое напісанне слова, якое выбіраецца з рада магчымых пры адным і тым жа вымаўленні і адпавядае існуючаму правілу ці традыцыі.

**Арфаграфічнае правіла** — гэта палажэнне, якое прапануе нарматыўнае напісанне слова ў адпаведнасці з канкрэтным арфаграфічным прынцыпам.

**Арфаграфічная памылка** — гэта замена арфаграмы іншым знакам пры захаванні аднолькавага вымаўлення слова.

**Арфаграфічны прынцып** — пэўная заканамернасць, звязаная з нацыянальнай спецыфікай мовы, на аснове якой грунтуюцца і аб'ядноўваюцца ў групы канкрэтныя правілы напісання.

**Арфаграфія** — раздзел мовазнаўства, у якім вывучаюцца і распрацоўваюцца правілы аднастайнай перадачы вуснай мовы на пісьме (а іншы раз і афіцыйна даецца дазвол на варыянтнасць).

**Дыферэнцыйны прынцып** — прынцып, які служыць для адрознення аднолькавых паводле гучання слоў або іх форм.

**Марфалагічны (фанематычны) прынцып** — прынцып, сутнасць якога заключаецца ў тым, што знакамі алфавіта абазначаюцца фанемы, якія складаюць дадзеную марфему, незалежна ад таго, у якіх гуках выражаюцца гэтыя фанемы.

**Раздзел арфаграфіі** — гэта сукупнасць правілаў, заснаваных на пэўных прынцыпах.

**Традыцыйнае напісанне** — гэта такое напісанне, пры якім выбар літары для абазначэння фанемы ажыццяўляецца не на аснове праверкі моцнай пазіцыяй, а на аснове этымалогіі і традыцыі.

**Фанетычны прынцып** — такі прынцып напісання слоў, паводле якога гукі перадаюцца на пісьме адпаведна літаратурнаму вымаўленню.

## Пытанні для самападрыхтоўкі

1. Што такое арфаграфія?
2. Што такое арфаграма?
3. Што такое арфаграфічнае правіла?

Рэпазіторый БарДУ

4. Якія прынцыпы правапісу з'яўляюцца асноўнымі ў сучаснай беларускай арфаграфіі?
5. У чым заключаецца сутнасць фанетычнага прынцыпу правапісу?
6. Назавіце напісанні, што грунтуюцца на фанетычным прынцыпе.
7. У чым заключаецца сутнасць марфалагічнага прынцыпу правапісу?
8. Якія правілы заснаваны на марфалагічным прынцыпе?
9. У чым заключаецца сутнасць традыцыйнага прынцыпу напісання?
10. У чым заключаецца сутнасць дыферэнцыйнага прынцыпу правапісу?

## Трэнінг уменняў

**Заданне 1.** Выпішыце з тэксту словы, напісанне якіх не супадае з вымаўленнем. Запішыце гэтыя словы ў транскрыпцыі.

**Гомель.** Шмат таямнічага ўтойваецца і ў назвах некаторых нашых абласных цэнтраў. Паводле шчаслівага збегу акалічнасцей так сталася, што ўсе яны маюць даволі багатае гістарычнае мінулае, а гэта дае падставы для ўзнікнення розных легендаў аб паходжанні іх назваў. Прычым дапытлівы чалавечы розум па некаторых з іх яшчэ і па сённяшні дзень не дакапаўся да ісціны, працягваючы задавальняць сваю зацікаўленасць усяго толькі здагадкамі, гіпотэзамі. Узяць, напрыклад, Гомель. Хаця многія вучоныя ледзь не катэгарычна выводзяць яго са старажытнага тэрміна «гаміла» (гамола) — магіла, узгорак, сёй-той на ўзроўні спрошчанага падыходу да разгадкі схільны тлумачыць этымалогію тапоніма тым, што паблізу горада, размешчанага на рацэ Сож, было мелка, і людзі, каб папярэдзіць адзін аднаго ў час руху па вадзе, выкрыквалі: «Го-го-го! Мель!» Не навукова, але досыць займальна! (Л. Лыч)

**Заданне 2.** Выпішыце словы, у якіх напісанне выдзеленых галосных заснавана: 1) на фанетычным прынцыпе правапісу; 2) на марфалагічным прынцыпе правапісу.

С**а**рдэчны, роўн**я**дзь, ар**ы**шт, б**е**з догляду, ц**я**жкавата, в**я**сёлы, леб**я**дзіны, пед**і**нстытут, дэз**ы**нфекцыя, Бакачы**а**, ч**о**рнавалосы, аўды**я**льбом, н**е** прыйдзе.

Репозиторий БарГУ

**Заданне 3.** Выпішыце словы, у якіх напісанне выдзеленых зычных заснавана: 1) на фанетычным прынцыпе правапісу; 2) на марфалагічным прынцыпе правапісу.

**С**пяваць, маніфе**сн**ы, бя**с**концы, цзінь-чуа**нс**кі, фу**т**баліст, кло**ў**н, перабе**ж**чык, хара**с**тво, Шмі**т**, ра**с**чоска, со**нц**а, смалявi**цк**і, галу**б**ка, чань-чу**нс**кі, на лава**чц**ы, аванпо**сн**ы, белару**ск**і.

**Заданне 4.** Знайдзіце адну пунктуацыйную і пяць арфаграфічных памылак.

Вялікакняжацкая канцылярыя ў часы Гусоўскага была высокаю ўстановай. Тут ствараліся праэкты дзяржаўных дакументаў, рэдагаваліся тэксты законаў і зацверджаліся прывілеі. Канцылярыя патпарадкоўвалася канцлеру, які ў сучасным разуменні быў міністрам замежных спраў і юстыцыі, а ў нейкай меры нават і ўнутраных спраў у адной асобе, паколькі стаяў на варце законнасці, сімвалам якой была вялікая каралеўская (княжацкая) пячатка. Канцлер насіў яе пры сябе і абавязаны быў публічна знішчыць на пахаванні караля (У. Калеснік).

**Заданне 5.** Прачытайце тэкст. Знайдзіце ў тэксце ўсе месцы, дзе магчымы арфаграфічныя памылкі. Растлумачце, чым у кожным выпадку яны могуць быць абумоўлены. Якому прынцыпу падпарадкоўваецца напісанне вылучаных вамі арфаграм?

**Разьбярства.** На тэрыторыі Беларусі пашыраны разьба па дрэве і разьба па косці, апошняя з якіх вядома з часоў позняга палеаліту. Інтэр’еры культавых будынкаў, палацаў, сядзіб, мэблю аздаблялі разьбой па дрэве. Разьбой упрыгожвалі іканастасы, алтары, амбоны, арганы, ліштвы, карнізы, ганкі, а таксама мэблю. Асаблівую папулярнасць набыла драўляная скульптура.

Адметнай рысай народнага дойлідства, напрыклад, Пасожжа з’яўляецца росквіт разьбярства. Хаты ўпрыгожваюць разныя ліштвы. У іх можна бачыць і старажытныя сімвалы-знакі ўрадлівасці, жыцця, сямейнага дабрабыту, цікавыя кампазіцыі розных зместаў (Паводле Я. Сахута).

Репозиторий БарГУ

## Прамежкавы тэставы кантроль

*Адзначце правільныя варыянты адказаў.*

1. *Арфаграфіяй называюць:*
   а) умоўны від пісьма, які выкарыстоўваецца для найбольш дакладнай перадачы вымаўлення;
   б) унармаванае напісанне, выбранае з некалькіх магчымых, якое адпавядае пэўнаму правілу;
   в) раздзел мовазнаўства, які распрацоўвае пытанні тэорыі і практыкі складання слоўнікаў;
   г) раздзел мовазнаўства, які вывучае суадносіны паміж літарамі і гукамі ў фанаграфічным пісьме;
   д) раздзел мовазнаўства, які вывучае сістэму правіл, што забяспечвае аднастайнасць перадачы маўлення на пісьме.

2. *Асноўнымі прынцыпамі беларускай арфаграфіі з'яўляюцца:*
   а) граматычны;
   б) акцэнталагічны;
   в) дэрывацыйны;
   г) марфалагічны;
   *д)* фанетычны.

3. *На фанетычным прынцыпе заснаваны наступныя правілы беларускай арфаграфіі:*
   а) правапіс звонкіх і глухіх зычных;
   б) літара *я* на месцы *е, ё* пасля мяккіх зычных у першым складзе перад націскам;
   в) правапіс свісцячых і шыпячых зычных;
   г) напісанне літары *т* на месцы спалучэння [дт] на канцы іншамоўных слоў;
   д) правапіс выбухных *д, т* у спалучэнні з афрыкатамі *ч, ц*.

4. *На марфалагічным прынцыпе заснаваны наступныя правілы беларускай арфаграфіі:*
   а) правапіс на месцы гукаў [о], [э] пасля цвёрдых і зацвярдзелых зычных ва ўсіх ненаціскных складах літары *а*;
   б) правапіс *ў* (у нескладовага);
   в) правапіс *б, д* на канцы прыставак і прыназоўнікаў *аб, ад, над, пад*;



Репозиторий БарГУ

г) правапіс галосных у складаных словах;
д) напісанне *е* ў прыназоўніку *без* і часціцы *не*.

5. *Напісанне выдзеленых арфаграм заснавана на фанетычным прынцыпе ў наступных словах:*
а) па**д**скочыць;
б) не парэ**жс**я;
в) бязліта**сн**ы;
г) н**е** твой;
д) бала**сн**ы;
е) дыз**ы**нфармацыя;
ж) выл**е**піць;
і) па-сусе**дс**ку;
к) **в**опытны;
л) журналіс**ц**кі;
м) сала**ў**і;
н) бяспамя**цц**е;
п) а**б**секчы;
р) зако**нн**ы;
с) кантэк**сн**ы;
т) разво**ддз**е;
у) прыб**я**рэжны;
ф) развед**ч**ык;
х) га**ль**штук;
ц) **с**ветлы.

6. *Напісанне выдзеленых арфаграм заснавана на марфалагічным прынцыпе ў наступных словах:*
а) перабе**жч**ык;
б) прачне**шс**я;
в) бру**сч**атка;
г) зацв**я**рдзелы;
д) Г**іё**м;
е) ра**ў**нд;
ж) вые**зд**;
і) **в**уліца;
к) **з**борнік;
л) даве**д**ка;
м) францу**зс**кі;



Репозиторий БарГУ

н) секво**я**;
п) кам**ень**чык;
р) герца**г**;
с) (у) ха**т**цы;
т) а**д**працаваць;
у) п**ія**р;
ф) ла**ў**ка;
х) н**е** можа;
ц) **дз**янёк.

ТЭМА 2
## ПРАВАПІС ГАЛОСНЫХ

## 2.1 Правапіс о, э — а

1. У беларускіх словах літары *о, э* пішуцца толькі пад націскам. Не пад націскам яны змяняюцца на *а.* Гэта з'ява называецца *а к а н н е м* : *бо́р — б**а**рав**ы́**, сэ́рца — с**а**рдэ́чны, крэ́мль — кр**а**млёўскі.*

2. Ненаціскное *э* захоўваецца ў іншамоўных словах і першай частцы складаных слоў: *рэцэ́пт, тэарэты́чны, экску́рсія, шэравокі, рэдказубы*.

3. Ненаціскное непачатковае *э* падпарадкавалася аканню ў даўно запазычаных словах: *а́др**а**с, р**а**ды́ска, бухга́лт**а**р, ма́йст**а**р, р**а**мо́нт, с**а**крэ́т, с**а**кр**а**та́р, хара́кт**а**р, літ**а**ра, літ**а**ратура, галант**а**рэ́я, ш**а**рэ́нга, д**а**ліка́тны, д**а**лікатэ́с, Ш**а**ўчэ́нка, Га́ш**а**к, лат**а**рэ́я, дыспе́тч**а**р, эш**а**ло́н, фе́льч**а**р, аранж**а**рэ́я, ж**а**мчу́жына, кват**а**ра́нт, ара́нж**а**вы.*

4. У некаторых беларускіх словах назіраецца чаргаванне галосных у складах: *ро // ры, ло // лы* (*о́* — пад націскам, *ы* — не пад націскам): *др**о́**вы // др**ы**во́тня, др**ы**васе́к; кр**о́**шка // кр**ы**шы́ць; др**о́**гнуць // др**ы**жа́ць; гр**о́**м // гр**ы**ме́ць, гр**ы**мо́ты; бр**о́**д // бр**ы**сці́; кр**о́**ў // кр**ы**ва́вы* і *кр**о̀**ватачы́ць // кр**ы**вацёк; бр**о́**вы // бр**ы**во́; гл**о́**тка // гл**ы**та́ць; бл**о́**хі // бл**ы**ха́.*

5. У наступных іншамоўных і славянскіх словах у адпаведнасці з беларускім літаратурным вымаўленнем пішацца *ы* на месцы ненаціскных *э* ці *а*: *бр**ы**зент, р**ы**сора, др**ы**зіна, р**ы**зіна, інж**ы**нер, канц**ы**лярыя, поч**ы**рк, ар**ы**шт, ц**ы**р**ы**монія, зар**ы**ва, мар**ы**ва, гор**ы**ч,*



Рэпазіторый БарГУ

*трывога*, *чырвоны, чырвонец*, *хрыбет*, *хрысціца*, *трыснёг (трысцё)* і ў вытворных ад іх, а таксама ў словах *яблык*, *яблыня*, *яблычны* [7, с. 24-25].

## **Новае ў правапісе** [8, с. 8]

| Правілы 1959 года | Правілы 2008 года |
|---|---|
| **§ 23**<br>У канцавым адкрытым складзе злучэнні *іо, йо* абазначаюцца літарамі *іо (ыю): адажыю, імпрэсарыю, какао, радэо; Антоніо, Токіо, Бакачыю, Ватэрлоо, Мінданао, Рыю-Негра* | **§ 4**<br><...><br>**2.** Незалежна ад паходжання слова гук [о] у ненаціскных складах вымаўляецца як [а], што перадаецца на пісьме: *адажыа, імпрэсарыа, какава, радэа; Антоніа, Бакачыа, Ватэрлоа, Мінданаа, Токіа, Рыа-Негра* |
| Асобнага правіла адносна напісання фіналяў *-эль, -эр* не было.<br><br>**§ 5, 11**<br>Адзначалася толькі, што пасля шыпячых, *р, ц* (не з *т* мяккага) і *д, т* галосныя *е, э* абазначаюцца на пісьме літарай *э: жэтон, рэформа, карцэр, гардэроб, грэйдэр, лідэр, ордэн, тэлефон, катэт, катэр* | **§ 4**<br><...><br>**6.** Ненаціскныя фіналі *-эль, -эр* у запазычаных словах перадаюцца як *-аль, -ар: грэйдар, камп'ютар, лідар, пэйджар, фарватар, фламастар, шніцаль.*<br>Ненаціскныя фіналі *-эль, -эр* ва ўласных імёнах іншамоўнага паходжання перадаюцца нязменна: *Гендэль, Гюнтэр, Ландэр, Одэр, Манчэстэр, Пітэр, Шапенгаўэр, Юпітэр* |

## **Параўнай і запомні новыя напісанні слоў!** [6, с. 30—33]

| Напісанні паводле правіл 1959 года | Напісанні паводле правіл 2008 года | Напісанні ў рускай мове |
|---|---|---|
| адажыю | адажыа | адажио |
| Антарыю | Антарыа | Антарио |
| Антоніо | Антоніа | Антонио |
| аўдыё- | аўдыя- | аудио- |
| аўдыёальбом | аўдыяальбом | аудиоальбом |
| аўдыёзапіс | аўдыязапіс | аудиозапись |
| аўдыётэкст | аўдыятэкст | аудиотекст |
| Бакачыю | Бакачыа | Бакачио |
| Ватэрлоо | Ватэрлоа | Ватерлоо |
| відэо- | відэа- | видео- |
| відэадыск | відэадыск | видеодиск |
| відэазапіс | відэазапіс | видеозапись |
| відэачат | відэачат | видеочат |
| Галілео | Галілеа | Галилео |
| Гарацыю | Гарацыа | Горацио |
| Жаліо-Кюры | Жаліа-Кюры | Жалио-Кюри |
| імпрэсарыю | імпрэсарыа | импресарио |
| мас-медыя і масмедыя | мас-медыя (масмедыйны) | мас-медиа и масмедиа |

Рэпазіторый БарДУ

*Продолжение табл.*

| Напісанні паводле правіл 1959 года | Напісанні паводле правіл 2008 года | Напісанні ў рускай мове |
|---|---|---|
| Мао | Маа | Мао |
| мультымедыя і мультымедыа | мультымедыя | мультимедиа |
| партфоліо і партфоліа | партфоліа | партфолио |
| парэо | парэа | пароо |
| Пінокіо | Пінокіа | Пинокио |
| радэо | радэа | радео |
| сальфеджыо | сальфеджыа | сальфеджио |
| Сан-Антоніо | Сан-Антоніа | Сан-Антонио |
| Токіо | Токіа | Токио |
| трыо | трыа | трио |
| альма-матэр | альма-матар | альма-матер |
| аўтсайдэр | аўтсайдар | аутсайдер |
| бартэр | бартар | бартер |
| барэль | бараль | барель |
| блокбастэр і блокбастар | блокбастар | блокбастер |
| вальтэр | вальтар | вальтер |
| Вальтэр | Вальтэр | Вольтер |
| Вестмінстэр | Вестмінстэр | Вестминстер |
| вінчэстэр і вінчэстар | вінчэстар | винчестер |
| Вінчэстэр | Вінчэстэр | Винчестер |
| гендэр і гендар | гендар | гендер |
| гендэрнасць і гендарнасць | гендарнасць | гендерность |
| дыстрыб'ютэр і дыстрыб'ютар | дыстрыб'ютар | дистрибъютер |
| камп'ютэр | камп'ютар | компьютер |
| камп'ібтэрны | камп'ютарны | компьютерный |
| камп'ютэршчык | камп'ютаршчык | компьютерщик |
| карцэр | карцар | карцер |
| катэр | катар | катер |
| кластэр | кластар | кластер |
| кратэр | кратар | кратер |
| лідэр | лідар | лидер |
| лідэрства | лідарства | лидерство |
| магістэр | магістар | магистер |
| магістэрскі | магістарскі | магистерский |
| менеджэр, менэджэр, менеджар і менэджар (СНСБМ) | менеджар | менеджер |
| містэр | містар | мистер |
| ордэр | ордар | ордер |
| Пітэр | Пітэр | Питер |
| постар і постэр | постар | постер |
| прынтэр | прынтар | принтер |
| рэйнджэр | рэйнджар | рейнджер |
| світэр | світар | свитер |
| сканер | сканер | сканер |
| скутэр | скутар | скутер |
| трансмітэр | трансмітар | трансмитер |
| трэйдэр | трэйдар | трэйдер |
| тынэйджар, тынэйджэр, тынейджэр і цінейджэр | тынейджар | тинейджер |

Репозиторий БарГУ

*Окончание табл.*

| Напісанні паводле правіл 1959 года | Напісанні паводле правіл 2008 года | Напісанні ў рускай мове |
|---|---|---|
| (СНСБМ) | | |
| фламастэр | фламастар | фломастер |
| Чартэр | чартар | чартер |
| чэстэр (сыр) | чэстар | честер |
| Шапенгаўэр | Шапенгаўэр | Шопенгауэр |
| юпітэр | юпітар | юпитер |
| Юпітэр | Юпітэр | Юпитер |

## 2.2 Правапіс літар е, ё, я

1. У беларускай мове літара *ё* пішацца толькі пад націскам. У першым складзе перад націскам *е, ё* змяняюцца на *я* ў славянскіх словах. Гэта з’ява называецца я к а н н е м : *мёд* — *мядо́к*, *лес*— *лясо́к*, *бе́лы горад* — *Бялгра́д*.

2. Ва ўсіх іншых пераднаціскных і паслянаціскных складах асновы пішацца *е: леснічо́ўка*, *зеленава́ты*, *велікава́ты*, *вестуны́*; *во́сень*, *вясёленькі*, *за́едзь*, *за́сень*.

3. У першым складзе перад націскам *е* не змяняецца на *я* ў многіх словах іншамоўнага паходжання і пасля *г, к, х*, у тым ліку і ва ўласных назвах пасля *г, к, х*: *леге́нда*, *калекты́ў*, *семе́стр*, *секу́нда*, *метро́вы*, *Еўро́па*, *гекта́р*, *Аргенціна*, *кефір*, *Туркеста́н*, *Херсо́н*, *Гена́дзь*, *Гера́сім*, *Гера́кл*.

4. Даўно запазычаныя словы падпарадкаваліся яканню: *дзяжу́рны*, *каляндáр*, *яфрэ́йтар*, *сяржа́нт*, *мянту́з*, *яно́т*, *я́ўрэй*, *яхідна*.

5. Спрадвечнае (этымалагічнае) *я* пішацца незалежна ад месца націску (доказ спрадвечнасці — праверка націскам або перакладам на рускую мову): *мяккава́ты* (доказ: *мя́ккі*, рус. *мя́гонький*), *су́вязь* (доказ: *звя́зваць*, рус. *связь*), гэтаксама: *дзе́вяць*, *дзе́сяць*, *цягаві́ты*, *вы́цягнуць*, *цягнікі*, *цяжкава́ты*, *вы́цяжка*, *святкава́нне*, *пяцярня́*, *упяцяры́х*, *Пры́пяць*, *Свіцязь*, *дро́бязь*, *ро́ўнядзь*, *бо́язь*, *віцязь*, *за́вязь*, *по́гляд*, *ме́сяц*, *по́яс*, *за́яц*, *ядавіты*, *ярына́*, *яравы́*, *яскра́вы*, *ячме́нь*, *па́мяць*, *ты́сяча*, *лямантава́ць*, *се́яць*, *ве́яць*, *вы́кіпяціць*, *вы́явіць*, *ма́ятнік*, *мяцяжы́*, *вы́меняць*, *зязюляня́*, *дзятляня́*, *ка́яцца*, *калядава́ць*, *Ярасла́ў*, *Якімо́віч*, *Якубо́ўскі*, *Ярашэ́віч* і некаторыя іншыя, а таксама вытворныя ад іх.

Репозиторий БарГУ

6. У беларускіх словах *бл**е́**ск (бл**я́**ск) // бл**і**шча́ць*, *бл**і**скаві́ца* назіраецца чаргаванне галосных у складах: *ле // лі* (*е́* — пад націскам, *і* — не пад націскам).

Аналагічнае гістарычнае чаргаванне галосных *е* // *і* назіраецца і ў прыкладах: *цв**е́**т* // *цв**і**сці*, *цв**і**це́нне*, *зацв**і**та́ць(-нне)*; *кв**е́**тка* // *кв**і**тне́ць*; *см**е́**х* // *усм**і**ха́цца*; *здз**е́**рці* // *здз**і**ра́ць*; *сц**е́**рці* // *сц**і**ра́ць*; *св**е́**тлы* // *св**і**та́ць*, *св**і**та́нак(-нне)*; *в**е́**тлівы* // *в**і**та́цца*; *пам**е́**рці* // *пам**і**ра́ць*; *сц**е́**ле* // *рассц**і**ла́е*; **але:** *сл**е́**пнуць (асл**я**піць)* // *сл**і**пу́чы* і // *сл**я**пу́чы* (дапускаюцца варыянты). *Адл**е́**гчы* // *адл**і**га* (абодва галосныя націскныя).

Гістарычнае чаргаванне галосных *о* // *і* (*о́* — пад націскам, *і* — не пад націскам): *зб**о́**р* // *зб**і**ра́ць, зв**о́**н* // *зв**і**не́ць* [7, с. 25-26].

## **Новае ў правапісе** [8, с. 17]

| Правілы 1959 года | Правілы 2008 года |
|---|---|
| **§ 6**<br>Галосныя *е, ё* ў першым складзе перад націскам абазначаюцца на пісьме літарай *я*, напрыклад: *землі — зямля, сем'і — сям'я, лес — лясы, сцены — сцяна.* Але ў словах *дзевяць — дзевяты, дзесяць — дзесяты, семнаццаць — семнаццаты, васемнаццаць — васемнаццаты* і вытворных ад іх пішацца *е* | **§ 6**<br>**1.** Галосныя *е, ё* ў першым складзе перад націскам абазначаюцца на пісьме літарай *я: дзевяць — дзявяты, дзесяць — дзясяты, сем — сямнаццаць, восем — васямнаццаць, пяцьдзясят, цецерукоў — цецярук, перанесці — перанясу, сёстры — сястра, вёслы — вясло, ёмкі — ямчэй, ёрш — ярша* |

## **Параўнай і запомні новыя напісанні слоў!** [6, с. 44]

| Напісанні паводле правіл 1959 года | Напісанні паводле правіл 2008 года | Напісанні ў рускай мове |
|---|---|---|
| дзевяты | дзявяты | девятый |
| дзевятка | дзявятка | девятка |
| дзесятка | дзясятка | десятка |
| дзесяты | дзясяты | десятый |
| семнаццаць | сямнаццаць | семнадцать |
| семнаццаты | сямнаццаты | семнадцатый |
| васемнаццаць | васямнаццаць | восемнадцать |
| васемнаццаты | васямнаццаты | восемнадцатый |
| паўдзесятка | паўдзясятка | полдесятка |
| пяцідзесяты | пяцідзясяты | пятидесятый |
| пяцьдзесят | пяцьдзясят (але пяццюдзесяццю) | пятьдесят |
| шасцідзесяты | шасцідзясяты (але шасцідзесяці) | шестидесятый |
| сямідзесяты | сямідзясяты (але семдзесят, сямідзесяці) | семидесятый |
| васьмідзесяты | васьмідзясяты (але восемдзесят, васьмідзесяці) | восьмидесятый |

Репозиторий БарГУ

## **Новае ў правапісе** [8, с. 5]

| Правілы 1959 года | Правілы 2008 года |
|---|---|
| Правіла напісання літар *э, е* на канцы іншамоўных слоў не было сфармулявана.<br><br>**§ 5, 11**<br>Адзначалася, што пасля шыпячых, *р, ц* (не з *т* мяккага) і *д, т* галосныя *э, е* перадаюцца праз *э,* напрыклад: *Сарэнта, канцэрт, Улан-Удэ, тэхніка.*<br>Пасля астатніх зычных звычайна пішацца *е.* Літара *э* ўжываецца ў невялікай групе слоў, пераважна пасля губных зычных і *з, н, с,* напрыклад: *бэлька, бэз, сурвэтка, галіфэ, кафэ, маянэз, турнэпс, пенснэ, турнэ, асэсар* і інш. | **§ 3**<br>**<…>**<br>**2.** На канцы запазычаных нязменных слоў, а таксама ўласных імён і геаграфічных назваў пасля зычных, акрамя *л, к,* пішацца *э: купэ, рэзюмэ, рэнамэ, кафэ, галіфэ, кашнэ, кабернэ, фрыкасэ, плісэ, каратэ, дэкальтэ; Струвэ, Мерымэ, Эйвэ, Хасэ, Морзэ, Табідзэ, Брыгвадзэ, Каба-Вердэ, Душанбэ, Сан-Тамэ;* **але**: *сальта-мартале, філе, камюніке, піке.*<br>**3.** Літара *э* ў запазычаных словах пасля губных зычных, а таксама пасля *з, с, н* пішацца згодна з літаратурным вымаўленнем. Так, словы *капэла, сурвэтка, экзэмпляр, маянэз, тунэль, сэрвіс, інтэрнэт* пішуцца з *э,* а словы *медаль, менеджмент, нервы, парламент, перспектыва, газета, сервіз* — з літарай *е* |
| **§ 18**<br>***Заўвага 2.*** Слова *радыё,* стаўшы першай часткай складаных слоў, не мяняе свайго напісання, напрыклад: *радыёхваля, радыёпрыёмнік, радыёкропка, радыёантэна, радыёперадача, радыёграма, радыёзонд, радыёкамітэт* | **§ 2**<br>**3.** Літара **ё** пішацца ў складаных словах з першай часткай *радыё: радыёстанцыя, радыёграма, радыёантэна.*<br>Калі першая частка складанага слова ўтворана з назвы хімічнага элемента *радый,* то пішацца літара ***е,*** якая з'яўляецца злучальнай галоснай: *радыеактыўнасць, радыеметрычны, радыеізатоп* і інш. У першым складзе перад націскам у гэтым выпадку пішацца *я: радыяметрыя, радыяхімія, радыялогія, радыяграфія* |

## **2.2 Правапіс спалучэнняў галосных у іншамоўных словах**

1. Калі спалучэнні *іо, йо* вымаўляюцца як два склады, тады яны на пісьме абазначаюцца:

а) паміж зычнымі — літарамі *іё* (*ыё*) пад націскам і *ія* (*ыя*) не пад націскам: *біёлаг, біёграф, дамініён, Ліён, аксіёма, бібліёграф, Галакціён, Гесіёд, патрыёт, рацыён, радыёла, стадыён, бастыён; біялогія, бібліятэка, геліятроп, піянер, ажыятаж, перыядычны, патрыятызм, акцыянерны, нацыянальны, рацыяналізатар*;



Рэпазіторый БарДУ

б) у пачатку слова — літарамі *іо* пад націскам і *іа* не пад націскам: *іон, іонны, Іосіф; Іанічнае мора, іанійцы, іанізацыя, Іакагама, Іаркшыр, Іашкар-Ала, Іаан*.

2. Калі спалучэнні *іо, йо* вымаўляюцца як адзін склад, тады на пісьме яны перадаюцца:

а) пасля галосных — праз *ё* пад націскам і *я* не пад націскам: *раён, раённы, маёр, Маёраў, Лаёла; маянэз, маяран, маярат, раяніраванне*;

б) у пачатку слова — праз *ё*: *ёг, ёгурт, ёд, ёдзісты, ёт (гук), ёта (літара), ётацыя, ёдаформ, ёднаваты, ётаваны*.

3. Спалучэнне *іе* абазначаецца на пісьме літарамі *іе* (*ые*): *гігіена, кліент, аўдыенцыя, арыентацыя, абітурыент, кліентура, іерархія, іена, іерогліф, Іерусалім, іерыхонскі*.

4. Спалучэнне *йе* заўсёды вымаўляецца як адзін склад і на пісьме ў пачатку слова і пасля галосных перадаецца праз *е*: *езуіт, праект, канвеер, траекторыя, Феербах, фае*.

5. Спалучэнне *іа* абазначаецца на пісьме літарамі *ія* (*ыя*) незалежна ад месца націску: *авіяцыя, ліяна, геніяльны, Іліяда, энтузіязм, фартэпіяна, піяніст, сацыялізм, сацыяльны, варыянт, матэрыял, матэрыялізм, дыяметр, дыяпазон, дыяфрагма*.

6. Спалучэнне *йа* на пісьме перадаецца пасля зычных *л, с, ц* (мяккага), *дз* і непрыставачных *н* і *з* — праз *ья*, пасля астатніх зычных — праз *'я*: *мільярд, мільярдны, кальян, мадзьяр, альянс, мільярдэр, саф'ян* [9, с. 14-15].

**Новае ў правапісе** [8, с. 19].

| Правілы 1959 года | Правілы 2008 года |
|---|---|
| **§ 24**<br>Калі злучэнні *іо, йо* вымаўляюцца (у беларускай мове) як адзін склад, тады на пісьме яны перадаюцца:<br>1. Пасля галосных, як правіла, праз *ё* пад націскам і праз *я* не пад націскам: *раён, маёр, Маёраў, Лаёла, маянэз, маяран, маярат.*<br>Аднак у невялікай групе слоў, напісанне якіх вызначаецца ў слоўнікавым парадку, злучэнне *йо* захоўваецца, напрыклад: *Агайо, Гюйо, Нью-Йорк* і інш. | **§ 9**<br>**6.** Спалучэнне *йа* на пісьме перадаецца:<br>пасля галосных і ў пачатку слова — праз *я: раяль, пляяда, саквояж, лаяльны, Савоя, Малая, Мая, ярус, яхта, ярд, яхант, ятаган.*<br><br>**§ 16**<br>**3.** У сярэдзіне запазычаных слоў, у тым ліку ва ўласных назвах, літара *й* пішацца толькі перад зычнымі: *дызайн, Драйзер, Айні, лайнер, камбайн.* |

Рэпазіторый БарДУ

*Окончание табл.*

| Правілы 1959 года | Правілы 2008 года |
|---|---|
| | Гукавое спалучэнне зычнага гука [й] з галоснымі ў словах іншамоўнага паходжання перадаецца ётаванымі галоснымі, як і ў словах уласнабеларускіх:<br>1) на пачатку слова: *Ёфе, Нью-Ёрк;*<br>2) пасля галоснага ў сярэдзіне слова: *маёр, маярат, маянэз, раён, Аюнскі;*<br>3) пасля галоснага на канцы слова: *фае, секвоя, Мая, папая* |

## **Параўнай і запомні новыя напісанні слоў!** [6, с. 47—51]

| Напісанні паводле правіл 1959 года | Напісанні паводле правіл 2008 года | Напісанні ў рускай мове |
|---|---|---|
| Агайо | Агаё | Агайо |
| Іаганесбург (РБС) і Йаханесбург (АС) | Іаганесбург | Иоганнесбург |
| іанасфера | іанасфера | ионосфера |
| Іанічныя астравы | Іанічныя астравы | Ионические острова |
| Іардан | Іардан | Иордан |
| іарданец | іарданец | иорданец |
| Іарданія | Іарданія | Иордания |
| іезуіт і езуіт | езуіт | иезуит |
| іерогліф | іерогліф | иероглиф |
| Іерусалім | Іерусалім | Иерусалим |
| іога і ёга (НРБіБРС) | ёга | йога |
| іон | іон | ион |
| Йельскі універсітэт | Іельскі ўніверсітэт | Йельский университет |
| медыязорка | медыязорка | медиозвезда |
| Нью-Йорк | Нью-Ёрк | Нью-Йорк |
| Эфіопія | Эфіопія | Эфиопия |

## 2.3 Правапіс прыстаўных галосных *і, а*

1. Прыстаўныя галосныя *а, і* пішуцца перад збегам зычных, першы з якіх *р, л, м*, прычым, перад *м* — заўсёды, а перад *р, л* — калі папярэдняе слова заканчваецца на зычны ці калі слова з такімі спалучэннямі зычных пачынае новы сказ або стаіць пасля знака прыпынку: ***з ар****жаным хлебам*; *н**а р**жаны хлеб*; *ду**б іль**сніцца*; *бяроз**а ль**сніцца*; *н**а ам**шэлы тын*; *па**д ім**глой; Іржуць коні, калёсы скрыпяць ад Дона да Буга* (Я. Купала). *Часамі на цэлыя кіламетры*



Репозиторий БарГУ

*рассцілалася дарога роўным, нібы выбеленым на сонцы, ільняным палатном* (Я. Колас).

2. Пасля прыставак і першай часткі складанага слова, якія заканчваюцца на галосную, прыстаўныя літары *і* і *а* перад *р, л, м* не пішуцца: *заржавець, заржаць, прымчацца, вокамгненна* [9, с. 13-14].

## 2.4 Правапіс літар *і, ы, й* пасля прыставак

1. Гук [і] пасля прыставак, якія заканчваюцца на галосны, чаргуецца з [й] і перадаецца на пісьме літарай *й*:

– у словах з коранем *іс*-ці, *ігр*-аць, *ім*-я, *інач*-ай на месцы ненаціскнога пачатковага каранёвага [і]: *зайсці, прыйшоў, выйду, увайсці, выйграць, зайграць, выйгрыш, перайменаваць, найменне, займеннік, перайначыць, перайначванне*;

– у словах *займаць, наймаць, пераймаць, перайманне, праймаць*.

У астатніх выпадках пачатковы каранёвы гук [і] захоўваецца пасля прыставак на галосны: *заіскрыцца, заікацца, заінець, праіснаваць, заінтрыгаваць, праілюстраваць, праінфармаваць, неістотны, Прыіртышша, Заішым’е, Заілійскі, праіранскі* [9, с. 21].

### **Новае ў правапісе** [8, с. 43]

| Правілы 1959 года | Правілы 2008 года |
|---|---|
| Пры спалучэнні прыстаўкі, якая канчаецца на зычную, з коранем або другой прыстаўкай, якія пачынаюцца з ненаціскнога *і,* замест *і* пішацца *ы,* напрыклад: *сыграць, сыскаць, абымшэлы, зымшыць, абыржавець, абыржавелы,* а таксама пад націскам у словах *сыспаду, спадыспаду.*<br>Аднак галосная *і* захоўваецца:<br>1. У словах з прыстаўкамі *між-* і *звыш-,* напрыклад: *міжірыгацыйны, звышіндустрыяльны, звышімклівы.*<br>2. У словах з іншамоўнымі прыстаўкамі і часцінкамі *пан-, суб-, транс-, контр-,* напрыклад: *панісламізм, субінспектар* | Пры спалучэнні прыставак *(аб-, ад-, над-, пад-, раз-, з-* (с-), *уз-, спад-, перад-, дэз-, суб-)* са словамі, што пачынаюцца з *і,* у адпаведнасці з вымаўленнем замест *і* пішацца *ы: абыграць, абынтэлігенцыцца, зымправізаваць, зыначаны, зысці, сысці, адыграць, адыменны, адыходзіць, сыграцца, сычычык, узыход, спадылба, спадыспаду, перадынфарктны, падынтэграваць, разысціся, перадымперскі, перадыспытны, субынспектар, дэзынфіцыраваць, дэзынфармацыя.*<br>Пасля прэфіксоідаў *(звыш-, між-, пан-, супер-, транс-, контр-)* і захоўваецца: *звышінфляцыя, звышіндустрыяльны, звышімклівы, міжінстытуцкі, міжірыгацыйны, панісламізм, контрідэя, контрігра, суперінтэлект, трансіндыйскі* |

Репозиторий БарГУ

## 2.5 Правапіс літары *у—ў*

1. Літара ў (у нескладовае) пішацца згодна з беларускім літаратурным вымаўленнем пасля галосных:

– пры чаргаванні [л] з [ў]: *даў, мыў, казаў, змоўклі, воўк, шоўк, шчоўк, поўны, коўзкі, моўчкі, паўметра, боўтаць*; **але:** *палка, памылка, сеялка, Алдан, Алжыр, Албанія, Волга, Валдай, Балгарыя*;

– пры чаргаванні [в] з [ў]: *лаўка (лава), крыўда (крывы), зноўку (новы), аўса (авёс), бацькаў (бацькавы), кроў (крыві), любоў (любові), кароў (карова), гатоў (гатовы), аўчына, аўторак, каўбой, аўгур, Аўстрыя, Аўдоцця, Аўрора, Каўказ, Боўш, Роўда, аўгіевы стайні*; **але:** *краіна В'етнам, рака Влтава, армія В'етконга*.

2. Гук [у] на пачатку ўласных імён і назваў заўсёды перадаецца вялікай літарай *у* складовае без надрадковага значка: *ва Узбекістан (для ўзбекаў), на Уральскіх гарах (на ўральскіх дарогах), на Украіне (за ўкраінцаў), за Уладзіміра, каля Уладзіслава, да Усяслава* [9, с. 20-21].

3. Нязменным засталося напісанне ***у*** на пачатку ўласных назваў, якое заўсёды перадаецца вялікай літарай ***У*** складовае без надрадковага значка. Гэтая норма распаўсюджваецца на напісанне асабовых імёнаў, імёнаў па бацьку і прозвішчаў і ў тых выпадках, калі ўвесь тэкст напісаны вялікімі літарамі. Напрыклад: ВІНШУЕМ З ДНЁМ НАРАДЖЭННЯ ШАНОЎНАГА УЛАДЗІМІРА УЛАДЗІСЛАВАВІЧА УРБАНОВІЧА. Ва ўсіх астатніх выпадкаў у тэкстах, напісаных вялікімі літарамі, дзейнічаюць агульныя правілы правапісу ***у*** складовага і ***ў*** нескладовага: ВІНШУЕМ УДЗЕЛЬНІКАЎ МІЖНАРОДНЫХ СПАБОРНІЦТВАЎ; ЗАПРАШАЕМ НА ЎРАЧЫСТЫ СХОД, ПРЫСВЕЧАНЫ ДНЮ ПЕРАМОГІ; ВІТАЕМ УДЗЕЛЬНІКАЎ ПЕРШАГА ЎСЕБЕЛАРУСКАГА З'ЕЗДА НАСТАЎНІКАЎ.

### **Новае ў правапісе** [8, с. 26]

| Правілы 1959 года | Правілы 2008 года |
|---|---|
| **§ 82**<br>*У* не скарачаецца:<br>**3.** У пачатку слоў іншамоўнага паходжання, а таксама ў сярэдзіне іх пасля галосных перад | **§ 15**<br>**1.** Нескладовае *ў* пішацца згодна з беларускім літаратурным вымаўленнем пасля галосных:<br>– пры чаргаванні [у] з [ў]: |

Рэпазіторый БарДУ

*Окончание табл.*

| Правілы 1959 года | Правілы 2008 года |
|---|---|
| зычнымі, калі *у* ўтварае самастойны склад: *праменні ультра-фіялетавыя, соус, кансіліум, дзяржаўны універсітэт, раунд, клоун, прэзідыум* і інш. Калі ж *у* ў сярэдзіне слова самастойнага складу не ўтварае, тады яно скарачаецца: *аўдыторыя, браўнінг, маўзер, аўдыенцыя* | – у пачатку слова (калі гэта слова не пачынае сказ і перад ім няма знакаў прыпынку): *на ўвесь дзень (ад усіх), моцны ўдар (ад удару), хацелася ўзяць (хацеў узяць), сонца ўзімку (месяц узімку), крыкі «ўра» (крык «ура»), для ўніята (з уніятам), ва ўніверсітэце (перад універсітэтам), на ўзвей-вецер (сцяг узвіўся), ледзьве ўчуў (раптам учуў);* <br> – у сярэдзіне слова пасля галосных перад зычнымі: *аўдыенцыя, аўдыякасета, аўра, даўн, джоўль, саўна, фаўна, каўчук, маўзер, маўр, паўза, раўнд;* **але:** *траур* |
| Правіла-выключэнне адносна напісання на канцы ў запазычаных нязменных словах літар *у* ці *ў* не было сфармулявана | **§ 15** <br> **<...>** <br> **1.** На канцы запазычаных слоў ненаціскное *у* не скарачаецца: *фрау, Шоу, Ландау, Каратау, Дахау, Цеміртау, ток-шоу, ноу-хау* |
| Правіла адносна фіналяў *-ум, -ус* у запазычаных словах не было сфармулявана | **§ 15** <br> **3.** Гук [у] не чаргуецца з [ў] пад націскам і ў запазычаных словах, якія заканчваюцца на *-ум, -ус: да урны, групоўка ультра, ух ты!, прэзідыум, кансіліум, радыус, страус, соус* і вытворных ад іх |

## Пытанні для самападрыхтоўкі

1. Назавіце, у якіх выпадках у беларускай мове пішуцца галосныя *о, э, а*.
2. Калі ў беларускай мове замест літары *о* пішацца не пад націскам *ы*?
3. У якіх выпадках пішацца галосны *е* не пад націскам?
4. Ахарактарызуйце асаблівасці правапісу спалучэнняў галосных у запазычаных словах.
5. Калі ў беларускай мове каранёвае *і* пераходзіць у *ы*?
6. У якіх выпадках у беларускай мове пераход каранёвага *і* ў *ы* не адбываецца?
7. Размяжуйце, у якіх іншамоўных словах пішацца *у* (у складовае), а ў якіх *ў* (у нескладовае).

# Трэнінг уменняў

**Заданне 1.** Падбярыце аднакаранёвыя словы так, каб літары *о, э* сталі не пад націскам. Растлумачце напісанне гэтых слоў.

Шэпт, рэмень, крэсліць, прэсны, трэск, цэгла, шэсць, прэс, сэрца, крошка, пошта, дрот, шчодры, пост, рэўнасць, бровы, жоўты, шэры, шэрсць, спрэчка, запрэгчы, шчэбет, жэрдка, стрэльба, дровы.

Репозиторий БарГУ

**Заданне 2.** Выберыце правільны варыянт напісання выдзеленых слоў і патлумачце яго.

1. Жыхар горада Брэста — *брэстаўчанін* ці *брастаўчанін*?

2. Нарэзанае дробнымі кавалачкамі смажанае або варанае мяса з якой-небудзь прыправай — *фрыкасэ* ці *фрыкасе*?

3. Абагульненне звестак, здабытых у працэсе аналізу даследаваных з'яў, у адзінае цэлае — *сінтаз* ці *сінтэз*?

4. Чалавек з вузкім мяшчанскім кругаглядам і ханжаскімі паводзінамі, абывацель — *філістар* ці *філістэр*?

5. Прамы абмен таварамі або паслугамі паміж прадпрыемствамі, краінамі; тавары, рэчы, атрыманыя такім шляхам, — *бартар* ці *бартэр*?

6. Маленькі бутэрброд на драўлянай ці пластмасавай палачцы — *канапэ* ці *канапе*?

7. Прычапная або самаходная землярыйная машына з адвалам для выраўноўвання палатна грунтавой дарогі, планіроўкі адхонаў, пракладкі канаў — *грэйдар* ці *грэйдэр*?

8. Падробнік крэдытных картак, які выкарыстоўвае іх для набыцця пакупак у інтэрнэт-магазінах, — *кардар* ці *кардэр*?

9. Двухбаковы інфармацыйны стэнд з падсветкай — *лайт-постар* ці *лайт-постэр*?

10. Пляжная хустка, якая павязваецца на талію, — *парэо* ці *парэа*?

11. Парода невялікіх сабак з кароткай шэрсцю і доўгімі вушамі — *пінчар* ці *пінчэр*?

**Задание 3.** Запішыце словы правільна. Патлумачце правапіс галосных.

1. Б...раг — б...рагавы, прыб...р...жны, наб...р...жная.
2. П...сня — п...сн...р, п...сн...ры, п...с...ннік.
3. В...траны — в...ц...р, в...трыска, в...тракі.
4. Дз...д — прадз...д, дз...дул...вы.
5. Вы...зд — вы...зджаць, вы...зджаны, б...звы...зны.
6. Цв...рды — цв...рдз...ць, зацв...рдз...ваць, зацв...рдз...нне.
7. Дз...с...ць — дз...с...ты, дз...с...цера, дз...с...тка, дз...с...тнік.
8. Дз...вяць — дз...вяты, дз...в...цера, дз...в...тка.

Репозиторий БарГУ

**Заданне 4.** Выберыце правільны варыянт напісання выдзеленых слоў і патлумачце яго.

1. Штаны, якія аблягаюць калені і расшыраюцца ўгары, — *галіфэ* ці *галіфе*?

2. Шырокі пругкі пояс для сцягвання таліі — *гарсет* ці *гарсэт*?

3. У інфарматыцы: праграма, якая кіруе работай перыферыйнага абсталявання (прынтара, сканера), — *драйвер* ці *драйвэр*?

4. Акуляры без дужак, якія трымаюцца на пераноссі пры дапамозе спружыны, — *пенснэ* ці *пенсне*?

5. Амаль вертыкальнае зніжэнне самалёта на вялікай хуткасці, пікіраванне — *пікэ* ці *піке*?

6. Асобны прадмет з рада аднародных прадметаў, асобная адзінка чаго-небудзь — *экземпляр* ці *экзэмпляр*?

7. Цялеснае пакаранне — *экзекуцыя* ці *экзэкуцыя*?

8. Верш на зададзеныя рыфмы — *бурымэ* ці *бурыме*?

9. Дзялок, прадпрымальнік — *бізнесмен* ці *бізнэсмэн*?

10. Электрычнае ўстройства для аптычнага ўводу інфармацыі ў памяць камп'ютара — *сканер, сканэр* ці *сканар*?

**Заданне 5.** Перакладзіце на беларускую мову.

Новеллы Мериме, служба сервиса, цинковое клише, красивая панель, вкусное фрикасе, вязаное кашне.

**Заданне 6.** Запішыце словы па-беларуску, растлумачце правапіс *о, э, а, е, ё, я.*

I. Тематика, Кремль, температура, аттестат, прогрессивный, демонстрация, телевизор, корреспондент, десант, редактор, референдум, секретарь, адрес, орден, рессора, рекорд, цензура, театр, обелиск, Берлин, Некрасов, балерина, метро, телеграф, метафора, методика, нелёгкий, операция, Евангелие, кибернетика, лекционный, персона, терем, секрет, Сенегал, Тернополь, горечь.

II. Молоко, дорога, чернеть, барокко, сопрано, адажио, шестёрка, деревянный, жемчужный, черёмуха, мастер, лотерея, инженер, канцелярия, осмыслить, десант, Европа, жетон, шедевр, аллегория, племена, освещение, безоблачный, кленовый, Белград, дежурный,

Репозиторий БарГУ

ефрейтор, земледелец, веранда, сенсация, кедровник, вековой, выделить, зелень, турне, Семипалатинск.

**Заданне 7.** Калі замест пропуску неабходна ўставіць літару *у (у складовае),* пастаўце лічбу 1, калі *ў (у нескладовае)* — лічбу 2:

| | |
|---|---|
| Юбілейная ...ніверсіяда | |
| Дзяржаўная ...нія | |
| Поўная ...рна | |
| Прыгожыя ...ланы | |
| Пабывалі ў Гвінеі-Біса... | |
| Шчанюкі рызеншна...цара | |
| Адсвяткавалі меды...м | |
| Арфаграфічная ...ніфікацыя | |
| Сімфанічная ...верцюра | |
| Правялі калёкві...м | |
| Утульная са...на | |
| Лячэнне ...льтрагукавое | |

**Заданне 8.** Перакладзіце на беларускую мову, растлумачце правапіс спалучэнняў галосных.

Мемориал, стереотип, аудиозапись, хореография, шампиньон, йодистый, виолончель, абитуриент, фейерверк, ажиотаж, ион, майор, фойе, конвейер, бастион, ориентация, аксиома, миллион, профессионал, импресарио, марионетка, педиатр, авиатор, миллиард, видеосистема, океан, масмедиа (мас-медиа), чемпион, чемпионат, капричио, приоритет, реабилитация.

**Заданне 9.** Запішыце словы, раскрываючы дужкі і ўстаўляючы патрэбную літару.

Не(й, і)дэнтычны, за(й, і)кацца, спад(і, ы)лба, без(і, ы)дэйны, супер(ы, і)нтэнсіўны, звыш(ы, і)дэйны, пера(і, й)граць, аб(і, ы)мшэлы, дэз(ы, і)нфармацыя, аб(і, ы)лгаць, раз(і, ы, й)грацца, дэз(ы, і)нтэгратар, пост(і, ы)нфарктны, на(й, і)грываць, пад(ы, й)сці, звыш(ы, і)мклівы, с(і, ы)граць, спад(і, ы́)спаду, за(й, і)нтрыгаваць, пера(й, і)грываць, контр(ы, і)гра, між(ы, і)нстытуцкі, пед(ы, і)нстытут, ня(і, й)начай, пад(ы, й)дзеш, пры(й?)дзе.



Репозиторий БарГУ

**Заданне 10.** Спішыце словы, падкрэсліце прыстаўныя галосныя. Растлумачце іх наяўнасць ці адсутнасць.

Пад ...льдом, з ...ржышча, ён ...лгаў, ...мгненна, за...рдзецца, па ...ржэўніку, пакрылася ...ржой, у ...ржышчы, над ...лбом, да ведаў ...мкнуцца, права на ...льготны праезд, пад ...льноцерабілку, такі ...лгун, серп ...ржавы, ...мгла, на ...льнозаводзе, пад ...льдзінай, за...ржавець, па...мчацца, на веласіпедзе ...мчыць, вол ...рвануўся.

## Тлумачальны дыктант

Любоў да (Р, р)адзімы мае п...радумовай веданне мінулага свайго народа яго п...рамог і паражэнняў здабыткаў і страт яго г...рояў мысліцеляў в...лікіх майстроў помнікаў духоўнай і матэрыяльнай культуры.

Любоў да (Р, р)адзімы не з'яўляецца аднак вынікам атрымання ведаў хутчэй імкненне да ведаў ёсць вынік любові да (Р, р)адзімы. М...навіта любоўю да (Р, р)адзімы дыктуецца жаданне разгадаць загадкі даўніны даведвацца пра тое што было але чаго ўжо н...ма ці што засталося малапрыкметнымі сл...дамі ў скупых словах л...тапісаў і н...шматлікіх дакументах што зацерлася гужам стагоддзяў зац...гнулася глухімі туманамі мінулых эпох.

Цікавасць да даўніны мае духоўны характар яна караніцца ў сутнасці чалавека жыццё якога вельмі кароткае, але чый розум жадае агарнуць н...ахопны час зазірае ў будучыню і пранікае ў мінулае. (112 слоў)

## Прамежкавы тэставы кантроль

*Адзначце правільныя варыянты адказаў.*

1. *Словы, у якіх на месцы пропуску пішацца літара* ***я****:*
   а) ал...няня;
   б) к...раміка;
   в) с...мнаццаць;
   г) за...ц;
   д) ...куб.

Рэпазіторый БарГУ

2. *Словы, у якіх на месцы пропуску пішацца літара* ***ы*****:**
   а) бр…зент;
   б) нагр…ваць;
   в) аранж…рэя;
   г) ц…р…монія;
   д) др…вотня.

3. *У беларускай мове літара* ***у*** *(у складовае) пішацца ў наступных выпадках:*
   а) пасля злучка, калі папярэдняе слова заканчваецца на галосную;
   б) у пачатку ўласных назваў;
   в) у пачатку сказа;
   г) пасля галосных у сярэдзіне слова;
   д) у пачатку слова, калі яно стаіць пасля знака прыпынку.

4. *Словы, у якіх на месцы пропуску пішацца літара* ***ў*** *(у нескладовае):*
   а) аквары…м;
   б) ла…рэат;
   в) «Вясёлка» …знагародзіла;
   г) тры…мф;
   **д)** выпукла-…вагнуты.

5. *Словы, у якіх на месцы пропуску пішацца* ***у*** *(у складовае):*
   а) да...жыня;
   б) астрана...т;
   в) ваку...м;
   г) майстры-...мельцы;
   д) каля ...ладзікаўказа.

6. *Запазычаныя словы, у якіх спалучэнне галосных перадаецца на пісьме як* ***іё (ыё)****:*
   а) скал…з;
   б) патр…т;
   в) акс…ма;
   г) ар…нцір;
   *д)* баст…н.

Репозиторий БарГУ

7. *Запазычаныя словы, у якіх спалучэнне галосных перадаецца на пісьме як* ***ыя****:*
   а) д...мент;
   б) стац…нар;
   в) пенс…нер;
   г) афіц…нт;
   д) д…фільм.

8. *Словы, у якіх галосная* ***а*** *— прыстаўная:*
   а) абрус;
   б) амшара;
   в) аржаны;
   г) алмаз;
   д) аўторак.

9. *Словы, у якіх трэба дапісаць літару* ***і****:*
   а) Восеньская …мгла пачынала пераходзіць у дробны дождж;
   б) Вечарам пры…мчаўся аднекуль кур'ер;
   в) За лесам гучна …ржала жарабя;
   г) …льсніцца сліпучы белы снег;
   д) Рэкі заснулі пад …льдом.

10. *Словы, у якіх пасля прыстаўкі пішацца* ***і****:*
   а) уз...ходзіць;
   б) пра...грываць;
   в) за...мацца;
   г) аб...ржавець;
   д) не…стотны.

# Т Э М А 3
# ПРАВАПІС ЗЫЧНЫХ

## 3.1 Правапіс звонкіх і глухіх, свісцячых і шыпячых

1. Чаргаванне звонкіх і глухіх зычных (акрамя прыставачнага *з*), шыпячых і свісцячых на пісьме не адлюстроўваецца: *рыбка, дарожка, вучышся, сшытак*. Для праверкі правільнасці напісання

Рэпазіторый БарГУ

звонкіх і глухіх зычных трэба змяніць слова ці падабраць іншае аднакаранёвае слова, каб пасля зычнага, які патрабуе праверкі, быў галосны або зычныя *р, л, м, н, в*: *рыбка — рыба, магчы — магу, кладка — кладак, даведка — даведацца, дзядзька — дзядзечка, хадзьба — хадзіць, казка — казаць*.

Словы *лязг, лязгаць* маюць варыянты *ляск, ляскаць*.

2. Правапіс уласнабеларускіх і запазычаных слоў, у якіх напісанне звонкіх і глухіх зычных нельга праверыць, вызначаецца па слоўніку: *футбол, баскетбол, вакзал, айсберг, экзамен, Афганістан* [9, с. 15-16].

## 3.2 Зычныя *д – дз*, *т – ц* і іх правапіс

1. Чаргаванне цвёрдых зычных гукаў [д], [т] з мяккімі [дз’], [ц’] (дзеканне і цеканне) адлюстроўваецца на пісьме: замест *д, т* перад *е, ё, і, ю, я* пішуцца адпаведна *дз, ц*: *гарады — у горадзе, народы — у народзе, хата — у хаце, чысты — чысцюткі, латынь — лацінка*.

2. Чаргаванне [д], [т] з [дз’], [ц’] адбываецца перад мяккім [в’]: *два — дзве, дзвесце, чатыры — чацвёрты, чэрствы — счарсцвелы*.

Літара *ц* і афрыката *дз* перад мяккім [в’] пішуцца згодна з вымаўленнем у словах: *дзверы, мядзведзь, бацвінне, цвёрды, цвярозы, цвік, цвілы, цвісці, ліцвін, ліцвінка, яцвяг, Мацвей, Мацвеенка, Бацвіннік*; **але:** *твіст*.

3. Гукі [д] у канцы прыстаўкі і [т] у складзе суфікса перад мяккім [в’] захоўваюцца нязменна і на пісьме перадаюцца адпаведна літарамі *д* і *т*: *адвезці, у таварыстве, у агенцтве, у выдавецтве, аб прыродазнаўстве, у грамадстве, у братэрстве*.

Гук [т] вымаўляецца нязменна і на пісьме перадаецца літарай *т* перад мяккім [в’] у аддзеяслоўных назоўніках і ў словах, вытворных ад іх: *бітва — у бітве, брытва — брытве, брытвенны, клятва — клятве, клятвенны, пітво — у пітве, паства — у пастве*. Літары *д* і *т* пішуцца таксама ў некаторых іншых словах: *мардва — мардве, мардвін, Мардвінаў, Літва — у Літве*.

4. У запазычаных словах (а таксама ў вытворных ад іх) цвёрдыя *д*, *т*, як правіла, пішуцца нязменна: *дэлегат, дэманстрацыя, медыцына, апладысменты, індык, тыраж, скептык, ерэтык, пластык, тэарэтык, авантура, дыктатура*.



Репозиторий БарГУ

5. Перад суфіксамі і спалучэннямі суфіксальнага паходжання -*ін*-, -*ір*-, -*ік*-, -*ёр*-, -*еец*-, -*ейск*- у словах іншамоўнага паходжання, а таксама ў словах, вытворных ад іх, [д] і [т] чаргуюцца з [дз’], [ц’], што і адлюстроўваецца на пісьме: *сульфіды — сульфідзін, каманда — камандзір, індзеец, індзейскі* (але: *Індыя — індыец, індыйскі, індыйцы*), *мантаж — манцёр, манціроўка, манціровачны, білет — білецік*.

6. Зычныя *дз*, *ц* пішуцца ў некаторых словах, правапіс якіх вызначаецца па слоўніку: *мундзір, дзюна, дзюшэс, бардзюр, арцель, арцішок, цір, цітр, эцюд, цюль, нацюрморт, уверцюра, накцюрн, цюркскі, цюльпан, каранцін*.

7. Зычныя *д*, *т* або *дз*, *ц* пішуцца ў адпаведнасці з беларускім літаратурным вымаўленнем ва ўласных імёнах і назвах: *Дадэ, Дэфо, Тэлаві, Атэла, Тэкля, Тэкерэй, Тэрэза, Шаптыцкі, «Юманітэ», Дзяніс, Гарыбальдзі, Дзвіна, Дзясна, Барадзіно, Цютчаў, Целяханы, Цімкавічы, Таіці* і інш. Правапіс такіх слоў вызначаецца па слоўніку [9, с. 16-17].

## **3.3 Правапіс падоўжаных зычных** [4, с. 204]

| Правіла | Прыклад |
|---|---|
| Зычныя [з'], [с'], [л'], [н'], [дз'], [ц'], [ж], [ш], [ч] паміж галоснымі вымаўляюцца падоўжана і на пісьме абазначаюцца дзвюма літарамі, а [дз’] — трыма *(ддз)* | *Палоззе, колоссе, зелле, насенне, стагоддзе, пяццю, збожжа, узвышша, ноччу* |
| **Запомні** іншамоўныя словы | *Ванна, манна, бонна, панна, Мекка, мецца, дурра, донна, Жанна, Сюзанна, саванна, мадонна, Ганна* |
| Зычныя [с], [л] не абазначаюцца падвоенымі літарамі ў словах | *Ілья, лью, Ульяна, Касьян, Емяльян, Юльян, Традзьякоўскі* і вытворных ад іх *льецца, Касьянаўна* і інш. |
| Няма ўмоў для ўзнікнення падоўжаных зычных і адпаведна іх абазначэння дзвюма літарамі ў словах іншамоўнага паходжання | *Ала, Генадзь, Інэса, праграма, група, дыфузія, каса* |
| Не трэба блытаць з падоўжанымі гукамі спалучэнне зычных на стыку марфем, абазначаных дзвюма аднолькавымі літарамі | *Абяззброіць, бяссуфіксны, насценны, каменны* |

Репозиторий БарГУ

## 3.4 Правапіс некаторых спалучэнняў зычных

1. Спалучэнні зычных *ск*, *ст*, *сц* [с'ц'] на канцы кораня слова могуць чаргавацца з *шч*, што і перадаецца на пісьме: *воск — вашчыць, густы — гушчар, хрысціць — хрышчоны*. Калі каранёвае *с* стаіць побач з суфіксальным *к*, якое можа чаргавацца з *ч*, то спалучэнне гукаў [с] і [ч] (у вымаўленні — [шч]) перадаецца як *сч*. Напісанне *сч* захоўваецца і ва ўсіх вытворных словах: *пясчынка, пясчанік, супясчаны, супясчанік, брусчатка*.

2. Спалучэнне зычных *дт* на канцы слоў іншамоўнага паходжання перадаецца праз *т*: *Гумбальт, Кранштат, Брант, Рэмбрант, Шміт, Клот* [9, с. 17-18].

### **Новае ў правапісе** [8, с. 25]

| Правілы 1959 года | Правілы 2008 года |
|---|---|
| **§ 63**<br>У злучэннях *зд, ст* зычныя *д, т* перад наступнымі *н* і *л* не вымаўляюцца і на пісьме не перадаюцца: *позна, праязны, выязны, бязлітасны, пачэсны, шаснаццаць, ненавісны, існаваць, скарасны, колькасны, абласны, радасны, вусны, капусны, жаласлівы, паслаць, шчаслівы, карыслівы, помслівы.*<br>***Заўвага.*** Злучэнне *стн* у прыметніках, утвораных пры дапамозе суфікса *-н-* ад назоўнікаў іншамоўнага паходжання з канцавым *ст,* захоўваецца без змен: *баластны, фарпостны, аванпостны, кампостны, кантрастны* | **§ 13**<br>**1.** У асобных словах адбылося спрашчэнне груп зычных: гістарычныя спалучэнні *здн, згн, стн, скн, стл, рдн* вымаўляюцца як *зн, сн, сл, рн,* што і адлюстроўваецца на пісьме:<br>***здн-зн:*** *праязны, выязны* (параўн.: *прыезд, выезд), позна, спазніцца, Пазнышаў;*<br>***згн-зн:*** *бразнуць* (параўн.: *бразгаць);*<br>***стн-сн:*** *бязлітасны* (параўн.: *літасць), месны* (параўн.: *змястоўны, месца);*<br>тое ж у запазычаннях: *кантрасны* (параўн.: *кантраст), кампосны* (параўн.: *кампост), фарпосны* (параўн.: *фарпост);*<br>***скн-сн:*** *бліснуць* (параўн.: *бліскаць, бліскавіца, бляск*), *пырснуць* (параўн.: *пырскаць*), *пляснуць* (параўн.: *пляскаць*), *ляснуць* (параўн.: *ляскаць*), *трэснуць* (параўн.: *трэскаць*); **але:** *віскнуць*, *націскны*;<br>***стл-сл:*** *жаласлівы* (параўн.: *жаласць*), *шчаслівы* (параўн.: *шчасце*), *карыслівы* (параўн.: *карысць*), *няўрымслівы* (параўн.: *урымсціцца*), *помслівы* (параўн.: *помста*), *паслаць* (параўн.: *пасцялю*, *пасцель*);<br>***рдн-рн:*** *міласэрны*, *міласэрнасць* (параўн.: *сардэчны*) |

Репозиторий БарГУ

## 3.5 Правапіс прыстаўной і ўстаўной літары *в*

1. Прыстаўная літара *в* **пішацца** перад націскным *о*:
   – у пачатку слоў: *возера, вольха, восень, воспа, Вогненная Зямля, Вольга* і інш., у вытворных ад іх словах пасля прыставак: *абвостраны, адворваць, павойкаць, увосень*; **але:** *окаць* (і вытворныя ад яго), *одум*. Пры змене месца націску *о* пераходзіць у *а* і прыстаўная *в* у гэтых словах не пішацца: *абады, азёрны, асенні*;
   – перад прыстаўкамі *о*-, *об*-, *од*- (*от*-): *вокіс, вокісел, вокрык, вопыт, вопіс, вобземлю, вобмацкам, вобыск, водгалас, водгук, воддаль, водзыў, водпаведзь, водпуск, водсвет, водступ, вотруб'е* і інш., а таксама *навобмацак, наводдалек, паводле, наводшыбе* і інш.;
   – у запазычаных словах: *вохра, воцат* і вытворных ад іх: *вохрыць, павохрыць, воцатнакіслы* і інш.

2. У словах *вока, вострьі, восем, вакол* і вытворных ад іх прыстаўная *в* захоўваецца незалежна ад месца націску: *вачэй, завочны, увачавідкі, уваччу; вастрыць, вастрыня, завастрэнне; васьмёра; ваколіца, наваколле, ваколічны.*

3. Перад націскным *о* у сярэдзіне некаторых слоў пішацца ўстаўная літара *в*: *ніводзін, Лявон, Лявончанка, Радзівонаў* і інш.

4. Прыстаўная літара *в* не пішацца ў запазычаных словах і некаторых уласных імёнах і назвах перад пачатковым націскным [о]: *опера, ода, ордэн, офіс, Оксфард, Ом, Омск, Орша* і інш.

5. Прыстаўная літара *в* **пішацца**:
   – перад каранёвым *у* ў пачатку слоў: *вугал, вуда, вугаль, вуж, вузел, вузы, вуліца, вунь, вус, вусны, вуха, вучань*, а таксама ў вытворных ад іх словах незалежна ад месца націску: *абвуглены, чатырохвугольнік, завулак, навудзіць, вузлы, вузлаваты, вусаты, вусач, вучыцца, навука, навучальны, вушэй, завушніцы, лапавухі, залатавуст* і інш.;
   – перад націскнымі прыстаўкамі *у*-, *уз*- (*ус*-): *вупраж, вузгалаўе, вусцілка, вусцішна.*

6. Устаўная літара *в* **пішацца** ў сярэдзіне слоў:
   – перад націскным *у*: *павук, цівун, каравул, есавул*, а таксама ў вытворных ад іх словах незалежна ад месца націску: *павуцінне, павучок; цівуном; каравульны; есавульскі;*



Репозиторий БарГУ

– перад *у* ва ўласных імёнах і геаграфічных назвах: *Матэвуш, Навум, Навумаўка, Тадэвуш.*

7. Прыстаўная літара *в* **не пішацца** перад націскным пачатковым *у*:

– у запазычаных словах: *ультра, ультрафіялетавы, унтэр, унікум, унія, урна*; **але:** *вустрыца*;

– ва ўласных імёнах і назвах: *Ульяна, Ула, Умань, Уздзенскі раён, Узда, Урал, Узбекістан, Украіна, Ушачы, Уэльс* і інш. [9, с. 18—20].

### Пытанні для самападрыхтоўкі

1. Прааналізуйце правапіс звонкіх і глухіх, свісцячых і шыпячых зычных і зрабіце вывад, на якім прыцыпе заснавана іх напісанне.
2. Калі ў беларускай мове трэба пісаць у словах літары *дз*, *ц*, а калі — *д*, *т*?
3. У якіх выпадках не адбываецца падаўжэнне зычных?
4. Ахарактарызуйце асаблівасці напісання прыстаўных зычных у беларускай мове.

## Трэнінг уменняў

**Заданне 1.** Запішыце словы ў слупок, падкрэсліце месца арфаграмы і пасля кожнага слова коратка растлумачце правапіс звонкага ці глухога, свісцячага ці шыпячага зычнага, як паказана ва ўзоры.

У з о р: *на пе**ч**цы* — праверачныя словы: *на пе**ч**ы, пе**ч**ачка*. (Шыпячы [ч] перад свісцячым [***ц***] вымаўляецца як [***ц***]).

*Бара**ць**ба* — праверачнае: *бар**ц**ы*. **(**Глухі [***ц'***] перад звонкім [***б***] прыпадабняецца да звонкага, вымаўляецца як [***дз '***] **)**.

*У**ш**чуваць* — выключэнне (**-ш-** у корані). Запомніць: пішацца ў адпаведнасці з вымаўленнем.

Ма(т, ч)чына, пя(с, ш)чота, пя(с, ш)чынка, лёгенька ў(с, ш)чыкнуць, зага(ч, т, д)чык, салда(т, ч)чына, Брэ(ст, ш)чына, разно(ш, с)чык, с(ь?)ні(сь, ш)ся, латы(шс, с)кі, бя(ш, с)шумна, маркоці(сь, ш)ся, (с, ш)чэпкі ляцяць, разбіць ворага ў(с, ш)чэнт, голі(сь, ш)ся, каўка(з, с)кі, гарадо(кс, ц)кі, грама(дз, дс, ц)кі, дасле(ч, д)чык, хлебная ро(с, ш)чына, жані(дзь, ць)ба, ні(ш, с)чымны колас, на рэ(ц, ч)цы, н...дас(ь?)ве(ч, д)чанас(ь?)ць, до(ш, ж)(ч, дж), ра(ш, с)чыніць акно, гру(ш, з)чык, студэн(тс, ц)кі білет, адвака(тс, ц)кая практыка, фу(д, т)бол.

Репозиторий БарГУ

**Заданне 2.** Перакладзіце словы на беларускую мову. Вусна растлумачце наяўнасць або адсутнасць дзекання, цекання.

| 1 варыянт | | 2 варыянт | |
|---|---|---|---|
| 1) фонетика;<br>2) этюдник;<br>3) студент;<br>4) на старте;<br>5) индеец;<br>6) тираж;<br>7) диктор;<br>8) антенна;<br>9) командировка;<br>10) телеграмма | 11) грамматика;<br>12) в ракете;<br>13) динамо;<br>14) увертюра;<br>15) на заборе;<br>16) аттестат;<br>17) динамит;<br>18) латинский;<br>19) возбудить;<br>20) термометр | 1) на флоте;<br>2) десант;<br>3) в порту;<br>4) гвардейский;<br>5) мундир;<br>6) телескоп;<br>7) термос;<br>8) деталь;<br>9) Матвей;<br>10) дискотека | 11) цветение;<br>12) дизель;<br>13) в винограде;<br>14) кратер;<br>15) в огороде;<br>16) фантастика;<br>17) билетёр;<br>18) в посуде;<br>19) литвинка;<br>20) в компоте |

**Заданне 3.** Выпішыце са сказаў словы з фанетычным падаўжэннем зычных, а потым — з марфалагічным падваеннем. Растлумачце, як узнікла фанетычнае падаўжэнне і марфалагічнае падваенне.

1. Над палосамі свежай раллі, над жытняй рунню і травой цэлы дзень не змаўкаюць цудоўныя песні-званочкі жаўранкаў і грукатанне трактара. 2. Жыццё я не зблытаю з сонечным ззяннем, бо гэтулькі колераў мае яно! 3. Шматлікіх рэчак буйнае разводдзе па ўсёй краіне радасна гудзе. 4. Каласы схіляе долу збожжа. 5. Бачу родныя ўзвышшы стройных волатаў-лясоў. 6. Жыццё — найадказнейшы экзамен, яго ніяк не абмінеш. 7. Восенню, калі прыйшла пара ўборкі ўраджаю, юннаты з гордасцю падводзілі вынікі. 8. На панэлях кладуць узоры муляры, — рыхтуйце, людзі, наваселле. 9. Журыўся на Палессі жуbecause. 10. Па ўзбярэжжы пад соснамі стаялі палаткі, а найчасцей проста «Масквічы» і «Волгі», у якіх спалі ноччу іх уладальнікі. 11. Дождж вясенні несціхана лье, кроплямі на шкле аконным скача. 12. Усміхнулася сонца, дыхнула цяплом, міла, гожа праменне рассеяла.

**Заданне 4.** Запішыце правільна словы, раскрыўшы дужкі.

Кампос(т?)ны, ад(д)зячыць, на(д, т)хненне, Слу(т, ч)чына, ма(с?)штаб, рас(с?)ол, лан(д?)шафт, ас(в, ф)альт, салда(тс, ц)кі, гара(дс, ц)кі, сусе(дс, ц)кі, заво(дс, ц)кі, вільнюс(с?)кі, лі(дс, ц)кі,



Репозиторий БарГУ

латы(ш?)скі, паляшу(кс, ц)кі, лю(дс, ц)кі, ры(ж?)скі, уша(чс, ц)кі, бешанкові(чс, ц)кі, белаве(ш, ж)скі, поз(д?)ні, помс(т?)лівы, svіс(т?)нуць, Шмі(д?)т, бязлітас(т?)на.

**Заданне 5.** Перакладзіце словы на беларускую мову, растлумачце напісанне спалучэнняў зычных.

Устный, проездной, скоростной, бессмертный, поздно, безвыездной, капустный, Кронштадт, аванпостный, шестнадцатый, счастливый, форштадт, отдалённый, Рембрандт, свистнуть, областной.

**Заданне 6.** Запішыце словы, раскрываючы дужкі і ўстаўляючы, дзе трэба, прыстаўныя літары.

На…укападобны, …одбліск, Ля…он, …указ, …опіс, …успамін, …одгулле, …оспа, …оперны, горад …Осла, …обер-афіцэр, …ускапаны, Лары…он, Мікалай Мікалаевіч …Озераў, …ачаняты, …осемдзесят, …універсам, …успышка, …одгалас, …астрэйшы, …Обаль, …мшэлы, …этак, …орыва, на…астрыць, …ужовы, …обад, …удзільна, …альховы, …аколіца, на…окал, …унты, …успомніць, …Ожагаў, г. …Ушачы, г. …Урэчча, …Уолт …Уітмен, …обыск, …універсітэт, …унія.

## Прамежкавы тэставы кантроль

*Адзначце правільныя варыянты адказаў.*

1. *Правільна напісаныя словы:*
   а) пяшчаны;
   б) аб’ездчык;
   в) узмешкі;
   г) дзядзька;
   д) прыкаска.

2. *Словы, у якіх пішацца **дз**:*
   а) ін(дэ, дзе)кс;



Репозиторий БарГУ

б) брыга(ды, дзі)р;
*в)* каман(ды, дзі)роўка;
г) мело(ды, дзі)я;
*д)* гвар(дэ, дзе)ец.

3. *Пры ўтварэнні пэўных граматычных форм у наступных назоўніках адбываецца цеканне:*
а) агароджа з (дрот);
б) распаўсюджаны ў (свет);
в) памылка ў (тэкст);
г) знаходзіцца ў (росквіт);
д) дасягнуць (мэта).

4. *Словы з падоўжанымі зычнымі літарамі:*
а) мас…аж;
б) разво…дзе;
в) ас…істэнт;
г) саван…а;
д) бя…снежны.

5. *Словы з падваеннем зычных, якое ўзнікла на стыку марфем:*
а) песенны;
б) кіпенне;
в) аддалены;
г) падарожжа;
д) рассейваць.

6. *Правільна напісаныя словы:*
а) растацца;
б) валлё;
в) ванна;
г) разяўлены;
д) шассі.

7. *Правільна напісаныя словы:*
а) свістнуць;
б) капусны;
в) выяздны;



Репозиторий БарГУ

г) зайздросны;
д) ушчуванне.

8. *Словы, у якіх на месцы пропуску пішацца літара **в**:*
а) …обыск;
б) …унія;
в) …угаль;
г) …опера;
д) …облака.

9. *Словы з прыстаўнымі (устаўнымі) зычнымі:*
а) ...одгалас;
б) Тадэ...уш;
в) на...огул;
г) ...унук;
д) ...устрыца.

10. *Словы, у якіх дапушчана памылка:*
а) множства;
б) бязлітасны;
в) прапагандыскі;
г) дойліцкі;
д) ашчаслівіць.

## Т Э М А 4
## ПРАВАПІС МЯККАГА ЗНАКА І АПОСТРАФА

### 4.1 Правапіс змякчальнага мяккага знака

1. Мяккі знак **пішацца** пасля зычных *з, л, н, с, ц* (з мяккага *т*), *дз* (з мяккага *д*):

– для абазначэння на пісьме мяккасці зычнага на канцы слова: *мядзведзь, дзень, соль, вось, чытаць, стань, дзесь, кудысь, вішань, кухань, песень*;
– для абазначэння на пісьме мяккасці зычнага перад цвёрдым зычным: *дзядзька, бацька, касьба, барацьба, пісьмо, Вязьма, Кузьма, восьмы, процьма, дзьмухавец*;



Репозиторий БарГУ

– для абазначэння на пісьме мяккасці зычнага перад наступным мяккім зычным тады, калі пры змене формы таго ж слова (або пры замене яго другім словам таго ж кораня) гэты мяккі зычны становіцца цвёрдым, а папярэдні зычны захоўвае сваю мяккасць: *барацьбе, барацьбіт (барацьба), пісьменнік (пісьмо), васьмі, васьмю (восьмы), цьмяны (цьма)*. Калі пры змене формы таго ж слова (або пры замене яго другім словам таго ж кораня) мяккасць зычных не захоўваецца, то мяккасць зычнага перад наступным мяккім зычным на пісьме мяккім знакам не абазначаецца: *дзве — два, шэсць — шосты, звінець — звон*.

2. Мяккі знак пішацца для абазначэння мяккасці зычных у дзеясловах загаднага ладу:

– перад канчаткам першай асобы множнага ліку -*ма*: *кіньма, сядзьма*;
– перад постфіксам у другой асобе множнага ліку -*це*: *будзьце, кіньце, сядзьце, станьце, намыльце*;
– перад постфіксам -*ся*: *кінься, звесься*.

3. Мяккі знак пішацца для абазначэння мяккасці зычных у назоўніках перад канчаткам творнага склону множнага ліку -*мі*: *коньмі, людзьмі, грудзьмі, дзецьмі*.

4. Мяккі знак пішацца:

– у складаных лічэбніках: *пяцьдзясят, шэсцьдзясят, пяцьсот, шэсцьсот, дзевяцьсот*;
– у постфіксе -*сьці*, які ўваходзіць у склад слова: *штосьці, чагосьці, кудысьці, дзесьці, чамусьці, якісьці*;
– у слове *ледзьве*.

5. Мяккі знак пішацца для абазначэння на пісьме мяккасці [л] перад зычнымі: *пальцы, кольцы, відэльцы, сальца, вальцы, колькі, толькі, гульні, вельмі, Альф'еры, бразільскі (Бразілія), венесуэльскі (Венесуэла), уральскі (Урал), лепельскі (Лепель), лільскі (Ліль), Мангальф'е*.

6. Мяккі знак пішацца для абазначэння на пісьме мяккасці [н]:

– перад суфіксам -*к*-, а таксама перад суфіксам -*чык*- (калі слова без суфікса -*чык*- заканчваецца мяккім знакам): *песенька, вішанька, нянька (і няньчыць); карэньчык (корань), агеньчык (агонь)*;
– перад суфіксам -*ск*- у прыметніках, утвораных ад назваў месяцаў, якія заканчваюцца мяккім [н'], і ад назоўніка

*восень*: *студзеньскі, чэрвеньскі, ліпеньскі, снежаньскі, восеньскі*, а таксама ў суадносных уласных назвах: *Чэрвеньскі раён, Ліпеньская школа*;

– у суфіксе -*еньк*- (-*эньк*-, -*аньк*-): *маленькі, даражэнькі, прыгожанькі*.

7. Мяккі знак **не пішацца:**

– пасля шыпячых *ж, дж, ч, ш, р, ц* (не з *т* мяккага) і *д, т*, а таксама пасля губных *б, в, м, п, ф*: *дождж, ноч, мыш, цар, купец, голуб, п'едэстал, сям'я, В'етнам, верф*;

– пасля *з, с, ц, дз* перад мяккімі зычнымі, калі пры змене формы таго ж слова (або пры замене яго другім словам таго ж кораня) нельга паставіць гэтыя *з, с, ц, дз* перад цвёрдым зычным: *песня — песні — песнямі, звер — зверам — звяроў, свет — свяціць — асвятленне*, *чацвёрты — чацвярціна — чацверыком, чацвер — чацвяргом, дзверы — дзвярэй, цвёрды — сцвярджаць; схіліцца, скінуць, ёсць, Дзвіна, Дзмітрый*;

– пры падаўжэнні зычных: *насенне, ралля, галлё, калоссе*, а таксама падваенні: *ззяць* [9, с. 22—24].

### **Новае ў правапісе** [8, с. 31]

| Правіла | Прыклад |
|---|---|
| **§ 88**<br>Мяккі знак не пішацца:<br>4. У прыметніках з суфіксам *-ск-*, утвораных ад назоўнікаў на *-нь: конскі* (конь), *астраханскі* (Астрахань), *любанскі* (Любань).<br>***Заўвага.*** У прыметніках, утвораных ад кітайскіх назваў на -нь, мяккі знак захоўваецца: *чань-чуньскі, уханьскі, цянь-шаньскі*; **але:** Сямёнаў-Цян-Шанскі і інш. | **§ 18**<br>**<...>**<br>7. Мяккі знак не пішацца: у прыметніках з суфіксам *-ск-*, утвораных ад назоўнікаў на *-нь-: конскі* (конь), *астраханскі* (Астрахань), *любанскі* (Любань), *чань-чунскі* (Чань-Чунь), *цянь-шанскі* (Цянь-Шань). |

## 4.2 Правапіс раздзяляльнага мяккага знака

1. Раздзяляльны мяккі знак пішацца пасля зычных *л, с, ц* (з мяккага *т*), *дз* і непрыставачных *н* і *з* перад *е, ё, і, ю, я* ў словах іншамоўнага паходжання: *рэльеф, калье, павільён, дасье, канферансье, пасьянс, парцье, ранцье, Дзьюі, кастаньеты, каньён, Нью-Ёрк, каньяк, Лавуазье*.



Репозиторий БарГУ

2. Ва ўласных імёнах і назвах, утвораных ад імён на *-ій* (*-ый*), пасля зычных *л, с, ц, дз, н, з* перад суфіксальным *-еў-* (*-ев-*) пішацца мяккі знак: *Васільеў, Васільевіч, Васільеўка, Васільеўскі востраў, Арсеньеў, Арсеньевіч, Афанасьевіч, Кандрацьеў, Кандрацьевіч, Аркадзьеў, Аркадзьевіч*.

3. Пасля *г, к, х* і збегу зычных, акрамя *нц*, перад суфіксальным *-еў-* (*ев-*) пішацца *і* (*ы*): *Георгіеў, Георгіевіч, Яўціхіеў, Яўціхіевіч, Іракліевіч, Яўлампіевіч, Ануфрыеў, Ануфрыевіч, Ануфрыеўка, Дзмітрыеў, Дзмітрыевіч*; **але:** *Вікенцьеў, Вікенцьевіч, Лаўрэнцьеў, Лаўрэнцьевіч, Кліменцьевіч* і інш. [9, с. 24-25].

## 4.3 Правапіс апострафа

### **Новае ў правапісе** [8, с. 31]

| Правіла | Прыклад |
|---|---|
| **§ 89**<br>Апостраф пішацца пры раздзельным вымаўленні зычных з наступным галосным:<br>2. У сярэдзіне слова пасля губных *б, в, м, п, ф,* заднеязычных *г, к, х*, шыпячых *ж, дж, ч, ш,* зубных *д, т і р* перад літарамі *е, ё, ю, я, і: Аляб'еў, Барб'е, В'етнам, інтэрв'ю, сям'я, куп'ё, п'яўка, саф'ян, д'ябал, Пракоф'еў, Пракоф'евіч, Мантэг'ю, Лук'янаў, Х'юлет, бар'ер, надвор'е, Мар'іна Горка, Грыгор'еў, Юр'еў, Аж'е, Буш'е, Д'еп, Камп'ен.*<br><br>**§ 136**<br>На мяжы састаўных частак раздзяляльныя апостраф і мяккі знак не пішуцца, напрыклад: *цэхячэйка;* **але** *ь* як знак мяккасці ў такіх выпадках пішацца, напрыклад: *косць, утыль* | **§ 19**<br>4. Апостраф пішацца пры асобным вымаўленні зычных з наступным галосным:<br>– пасля прыставак, якія заканчваюцца на зычную, перад *е, ё, ю, я* і націскным *і*: *ад'езд, аб'ём, аб'ява, аб'ядндаца, пад'ёмны, раз'юшыцца, між'ярусны, аб'інець, уз'яднанне, ад'ютант, ін'екцыя, кан'юнктура*;<br>– у сярэдзіне слова пасля губных *б, в, м, п, ф,* заднеязычных *г, к, х*, шыпячых *ж, дж, ч, ш*, зубных *д, т* і дрыжачага *р* перад літарамі *е, ё, і, ю, я: б'еца, вераб'і, В'етнам, інтэрв'ю, сям'я, Дзям'ян, Камп'ен, куп'ё, п'юць, саф'ян, Пракоф'еў, Пракоф'евіч, Мантэг'ю, Лук'янаў, Аж'е, Буш'е, Д'еп, бар'ер, надвор'е, Грыгор'еў, Юр'еў, Мар'іна Горка;*<br>– у складаных словах з першай часткай *двух-, трох-, чатырох-, шмат-* перад літарамі *е, ё, ю, я*: *двух'ярусны, трох'ярусны, шмат'ядзерны, шмат'ёмісты.*<br><br>**§ 15**<br>**<...>**<br>5. Апостраф не пішацца у складаных і складанаскарочаных словах на мяжы састаўных частак, у тым ліку калі іх часткі пішуцца праз злучок: *цэхячэйка, дзяржюрвыдавецтва, трэдюніёны* |



Репозиторий БарГУ

**Выключэнне:** прыставачны [з] становіцца мяккім пад уплывам суседняга мяккага [j]: *раз'яднацца* — *ра[з'jа]днацца*, аналагічна *раз'ехацца, раз'юшаны* і пад.

Пасля **ў** апостраф не пішацца: *здароўе.*

### Пытанні для самападрыхтоўкі

1. Пералічыце правілы напісання змякчальнага мяккага знака.
2. Пералічыце правілы напісання раздзяляльнага мяккага знака.
3. Пералічыце правілы напісання апострафа.

## Трэнінг уменняў

**Заданне 1.** Калі замест пропуску трэба напісаць мяккі знак, пастаўце лічбу 1, калі апостраф — лічбу 2, калі апостраф і мяккі знак не пішуцца — лічбу 3.

| | |
|---|---|
| Цікавая сен...ёра | |
| Двух...ярусны ложак | |
| Раз...юшаны сабака | |
| Вядомая куцюр...е | |
| Наведалі дзет...яслі | |
| Супер...якасць | |
| Трэд...-юніён | |
| Аб...ём памяці камп...ютара | |
| Новая дзярж...юркалегія | |
| Віцэ-прэм...ер урада Рэспублікі Беларусь | |
| Галоўны н…юсмейкер | |
| Вясёлы канферанс…е | |
| Шмат...ядзерны | |
| Лепел...скі | |

**Заданне 2.** Запішыце прапанаваныя словы па-беларуску.

Суперинфляция, Софья, семьсот, Алябьев, третьекурсник, четырехъярусный, Касьян, степь, консьерж, серьёзный.

Репозиторий БарГУ

**Заданне 3.** Запішыце словы, згрупаваўшы іх паводле пунктаў правіла «Правапіс мяккага знака і апострафа».

Штос...ці, ледз..., двух...ярусны, аб...інець, л...е, п...яўка, ц...мяны, ц...ма, дз…ме, дз...муць, кон...мі, раз...бяр, раз...ба, дзес...ці, пяц...дзесят, шэсц...сот, людз...мі, ліпен...скі, восен...скі, струмен...чык, парц...е, ал...янс, аб...ём, раз...езд, б...юць, кап...ё, сен...ёр, верф...ю, лез...це, соцен...ка, вас...мёрка, звес...ся, грудз...мі, пас...янс, саф...ян, кал...е, медал...ён, сядз...це.

**Заданне 4.** Запішыце словы, устаўляючы, дзе трэба, літары і знакі.

Восем...дзесят, студзен…скі, вас...мёрка, сустрэн...ся, парц...еры, аб...яднанне, вераб...іны, самадзяржаў...е, дз...веры, жнівен...скі, стан...це, ц...вілы, барац...біт, сур...ёзны, бул...ён, аб...ява, цюмен...скі, піс...меннасць, мен...ш, ін...шы, шэсц...сот, едз...це, Н...ю-Ёрк, п...еса, аген…чык, у радас...ці, саф…ян, кампан...ён, ваз...мі, пяц...дзесят, міл...ярд.

**Заданне 5.** Выпішыце па парадку нумары слоў, у якіх на месцы кропак трэба пісаць мяккі знак.

1) кан…як; 2) чань-чун…скі; 3) шмат…ядзерны; 4) карэн…чык; 5) кін...шчык (разм.); 6) дз...мухавец; 7) шчас...лівы; 8) Об...ю; 9) В...етнам; 10) увас...мярых; 11) кап...ё; 12) зац...менне; 13) з...мен...шыць; 14) кагос...ці; 15) свежас...ці; 16) любан...скі; 17) п...яўка; 18) астрахан...скі; 19) насып...це; 20) Сібір...ю; 21) звес...ся; 22) збуц...велы; 23) ц...віль; 24) ц...віцен...не; 25) сляз…мі; 26) соцен...ка; 27) пагалоў...е; 28) ц...мяны; 29) ледз...ве; 30) раз...юшаны.

## Кантрольны дыктант

### Беларус і яго характар

Тыповага беларуса я досыць лёгка адрозню сярод іншых.

Паўночны беларус ростам пераважна высокі. На поўдні часцей трапляюцца людзі сярэдняга росту, больш прыземістыя, затое

Репозиторий БарГУ

больш каржакаватыя. У апошні час назіраецца тэндэнцыя да павышэння сярэдняга росту, як і паўсюль.

Чарнявых сярод беларусаў няшмат. Пераважаюць на Беларусі валасы светла-русыя ці нават бялявыя. Адпаведна і колер вачэй часцей за ўсё блакітны, шэры ці сіні.

Рысы аблічча мяккія, склад здаецца, на першы погляд, крыху далікатным, але гэтая далікатнасць падманвае. Праявы знешняй сілы, якая ўразіць на хвіліну дый звяне, замяняе тут вынослівасць, жылаватасць, цягавітасць.

Беларус якраз адрозніваецца шчодрасцю, заўсёднай гатоўнасцю прыйсці на дапамогу ў бядзе. Калі раней у каго на вёсцы здараўся пажар — вёска талакою за пару дзён ставіла пагарэльцу новую хату, дзялілася з ім жытам: кожны адсыпаў са сваіх засекаў колькі мог, каб чалавек дажыў да вясны і абсеяўся. Потым з кожнай хаты неслі рэчы: хто посцілку, хто падушку, хто палатно, хто гаршкі.

Раней у час голаду іншым разам людзі з больш багатых мясцін прыходзілі на Беларусь па дапамогу. У нас вымачыць дажджом жыта — уродзіцца бульба на пяску і авёс, не будзе бульбы — будуць грыбы, рыба, не будзе й таго — паляванне выручыць. І ніколі не чулі, каб галадаючага адпусцілі з хаты з пустымі рукамі. І гэта не толькі ў час бяды, але і ў звычайныя добрыя часы ўсе, хто прыязджае да нас адзначаюць як адну з галоўных рыс — гасціннасць. (Паводле У. Караткевіча). (216 слоў).

## Т Э М А 5
## ПРАВАПІС ВЯЛІКАЙ І МАЛОЙ ЛІТАР

### 5.1 Вялікая і малая літары ў асабовых назвах

1. З **вялікай літары** пішуцца:
   – імёны, імёны па бацьку, прозвішчы, псеўданімы, мянушкі, а таксама дадатковыя азначэнні пры гэтых назвах: *Міхал Казімір Радзівіл Рыбанька, Казімір Чацвёрты Ягелончык, Іаан Багаслоў, Кірыла Тураўскі, Сімяон Полацкі; Віктор Гюго, Джэк Лондан, Вольфганг Амадэй Моцарт; Дон Кіхот, Дон Жуан, Нестар Летапісец*;

Рэпазіторый БарДУ

– кожнае імя ў састаўных імёнах і прозвішчах, калі яны пішуцца асобна або праз злучок: *Эрых Марыя Рэмарк, Іаган Себасцьян Бах, Ханс Крысціян Андэрсен, Жак Іў Кусто, Марыя-Луіза-Жазэфіна; Вікенцій Дунін-Марцінкевіч*;
– прозвішчы, а таксама імёны ў множным ліку, калі яны выступаюць як назва роду, групы асоб ці ўжываюцца ў значэнні агульнай назвы: *Міцкевічы, браты Гарэцкія, маёнтак Тышкевічаў, род Радзівілаў; Гагарыны, Заслонавы*;
– часткі састаўных асабовых імёнаў кітайцаў, карэйцаў, в'етнамцаў, бірманцаў, інданезійцаў, тайландцаў, цэйлонцаў, японцаў: *Ань Лушань, Ван Янмінь(Кітай); Ан Чхан Хо, Пак Ін Но (Карэя); Нгуен Фук Ань, Нгуен Чай (В'етнам); Пі Маў Нін, Такін Кода Хмайн (Бірма)*;
– пачатковыя часткі *Ібн, Бен, Шах-, Мак-, Сан-, Сант-, Сен-, Сент-, Тэр-* у іншамоўных асабовых імёнах, якія пішуцца асобна, разам або далучаюцца да іх праз злучок, а таксама пачатковыя *О', Д'*, якія пішуцца праз апостраф: *Ібн Сіна, Шах-Джахак, Мак-Доўэл, Сан-Мартын, Сант-Эліё, Сен-Жуст, Сент-Эцьен, Тэр-Петрасян, О'Генры, Д'Артаньян*;
– клічкі жывёл, птушак і іншых істот: *конь Варанок, карова Красуля*;
– прыналежныя прыметнікі, утвораныя ад асабовых імён і клічак жывёл, мянушак пры дапамозе суфіксаў *-ов-, -оў (-ав-, -аў), -ёв-, -ёў (-ев-, -еў), -ын-, -ін-*: *Кузьмоў сусед, Скарынавы выданні, Багдановічаў верш*;
– адносныя прыметнікі, утвораныя ад імён і прозвішчаў, псеўданімаў, калі такія прыметнікі ўваходзяць у склад састаўных уласных назваў: *Купалаўская прэмія* (прэмія імя Янкі Купалы), *Коласаўская стыпендыя* (стыпендыя імя Якуба Коласа), *Гарэцкія чытанні* (чытанні, прысвечаныя Максіму Гарэцкаму), *Варфаламееўская ноч* (гістарычная падзея ў Парыжы ў ноч святога Варфаламея), *Маркаўскія рады* (тэрміналагічная назва ў матэматыцы).

2. З **малой літары** пішуцца:
– агульныя назвы людзей, прадметаў, рэчываў і хімічных элементаў, адзінак вымярэння, якія ўтварыліся на аснове асабовых і геаграфічных назваў: *донжуан (быў донжуанам), донкіхот (такі донкіхот); джоўль, ом*;

Рэпазіторый БарДУ

– асабовыя назвы (прозвішчы, імёны і інш.) у форме множнага ліку, калі іх ужыванне выяўляе пагардлівыя, зневажальныя адносіны: *гарлахвацкія, заблоцкія, кручковы, пісулькіны, тулягі*;
– назвы чалавека, утвораныя ад асабовых імёнаў, якія ўказваюць на яго прыналежнасць або прыхільнасць да *каго-, чаго-небудзь*: *гегельянец, купалавец, магаметанін, махновец, талстовец*;
– прыметнікі, утвораныя ад асабовых назваў, якія ўжываюцца ў складзе ўстойлівых спалучэнняў з назоўнікамі (фразеалагізмаў) або ў складзе састаўных агульных назваў са значэннем адпаведнай адноснай прыкметы: *эзопаўская (эзопава) мова, ахілесава пята, гегелеўская дыялектыка, купалаўскі верш, напалеонаўскія планы, рэнтгенаўскі здымак, сідарава каза*;
– часткі *ван, да, дзі, дзю, дон (донна), дэ, дэр, ла, ле, фон, эль* і некаторыя іншыя ў іншамоўных асабовых назвах: *Людвіг ван Бетховен, Леанарда да Вінчы*; але ў асабовых назвах літаратурных герояў (*Дон Кіхот, Дон Хуан*), а таксама ў некаторых выпадках у прозвішчах і імёнах пішуцца з вялікай літары: *Ван Гог, Эль Грэка*;
– часткі *ага, ад, ал, ас, ар, аш, бей, бек, задэ, аглы, уль, зуль, кызы, аль, паша, хан, шах, эд, эль* і некаторыя іншыя ў іншамоўных асабовых назвах, якія падаюцца звычайна пасля назвы або перад ёй і пішуцца праз злучок: *Ібрагім-ага, Амар аш-Шарыф, Ібрагім-бей, Амад-задэ, Турсун-задэ, Кёр-аглы, Мамед-аглы, Сейф уль-Іслам, Зульфія-кызы, Амад эд-Дзін, Седах зуль-Факар, Сулейман-паша, Махамед эль-Куні* і інш. [9, с. 42—44].

## 5.2 Вялікая і малая літары ў найменнях асоб, звязаных з рэлігіямі, назвах міфалагічных і казачных герояў

1. З **вялікай літары** пішуцца:
– найменні найвышэйшых божастваў (боствеаў) у рэлігійных культах, а таксама ўсе словы ў спалучэннях, якія змяшчаюць гэтыя назвы: *Бог, Алах, Яхве, Шыва, Вішну; Госпад (Гасподзь),*



Репозиторий БарГУ

*Усявышні, Бог Сын, Божы (Боскі) Сын, Бог Дух Святы, Святы Дух, Прасвятая Тройца, Божая (Боская) Маці*;
– прыметнікі, утвораныя ад слова Бог: *Божы (Боскі) суд, Божы (Боскі) храм, Божая (Боская) міласць*;
– асабовыя імёны (і ўсе словы ў састаўных асабовых назвах, акрамя агульных назваў) заснавальнікаў рэлігійных вучэнняў, а таксама біблейскіх асоб (апосталаў, прарокаў, святых і інш.): *Ісус Хрыстос, Буда; Іаан Хрысціцель*;
– імёны легендарных і міфічных асоб, язычніцкіх багоў: *Антэй, Зеўс, Тытан, Венера, Фурыя, Дажбог, Пярун, Цмок*; **але як агульныя назвы**: *пярун* — удар грому, *іуда* (*юда*) — здраднік, *цмок* — змей, *фурыя* — злосная істота;
– уласныя назвы ўяўных і казачных істот, герояў літаратурных твораў: *Папялушка, Чырвоная Шапачка, Калабок, Дзед Мароз, Баба Яга, Пегас, Буцэфал*; **але як агульныя назвы:** *дзед-мароз* — ёлачнае ўпрыгожанне, *баба-яга* — агідная старая, *буцэфал* — стары конь;
– агульныя назвы істот, а таксама з'яў і прадметаў, калі яны персаніфікуюцца, выступаюць у ролі імёнаў герояў літаратурных твораў (у казках, байках і інш.): *Мядзведзь, Воўк, Ліса (Ліска), Заяц (Зайка), Асёл, Каза-дзераза, Коцік-варкоцік, Сарока-белабока, Бусел-клекатун, Карась-лежабок, Сонца, Праўда, Крыўда* і інш.

2. З **малой літары** пішуцца:
– слова *бог (гасподзь)* ва ўстойлівых выразах, звязаных з выказваннем розных пачуццяў у прастамоўі, а не са зваротам да Бога паводле рэлігійнай абраднасці і ўяўленняў: *бог яго ведае, божа (божачка) ты мой, божа збаў*;
– слова *бог* з агульным значэннем боства ў спалучэнні з асабовай назвай або з назоўнікам з агульным значэннем у родным склоне: *старажытны славянскі бог Пярун, бог сонца Дажбог, Сварог — бог неба*;
– агульныя назвы ўяўных істот: *архангел, анёл, херувім, фея, муза, дамавік, лясун, русалка, гном, троль, здань, хохлік* і інш. [9, с. 44-45].

Рэпазіторый БарДУ

## 5.3 Вялікая і малая літары ў геаграфічных і астранамічных назвах

1. З **вялікай літары** пішуцца:
   - уласныя назвы прыродных геаграфічных аб'ектаў: кантынентаў, гор, рэк, азёраў, лясоў, балот і інш.: *Еўразія, Фудзіяма, Акіянія, Адрыятыка, Задняпроўе*;
   - уласныя назвы краін, іх аб'яднанняў і частак, паселішчаў і іх частак, урочышчаў: *Беларусь, Кітай; Бенілюкс, Антанта; Запарожжа, Сібір; Міншчына, Лепельшчына, Случчына, Навагрудчына; Цэнтр; Усход, Вяснянка, Зялёны Луг*;
   - уласныя назвы астранамічных аб'ектаў: *Андрамеда; Стажары, Валапас; Сонца, Вега; Зямля, Юпітэр; Месяц, Фобас*;
   - назвы напрамкаў свету ў пераносным значэнні назваў адпаведнай групы краін або тэрыторыі: *Захад* (краіны заходняй часткі Еўропы разам з ЗША), *Усход* (азіяцкія краіны), *народы Поўначы*;
   - пачатковая службовая частка ў іншамоўных уласных геаграфічных назвах, якая пішацца з імі праз злучок: *Дан-Лэры* (горад), *Дэ-Кастры* (горад), *Ла-Пампа* (правінцыя), *Ла-Манш* (праліў), *Лос-Анджэлес* (горад);
   - іншамоўныя родавыя агульныя назвы ў складаных уласных геаграфічных назвах: *Рыа-Грандэ* (рыа — рака), *Лоб-Нор* (нор — возера), *Ісык-Куль* (куль — возера), *Пуэрта-Рыка* (пуэрта — порт);
   - часткі складаных уласных геаграфічных назваў, што пішуцца праз злучок (назоўнікі, прыметнікі): *Аўстра-Венгрыя, Эльзас-Латарынгія, Мінск-Мазавецкі*;
   - першае слова ў састаўных уласных геаграфічных і астранамічных назвах: *Ціхі акіян, Паўночны полюс, Белае возера, Асіповіцкае вадасховішча*;
   - усе часткі складанага прыметніка ў састаўных уласных назвах, калі такія часткі пішуцца праз злучок: *Азіяцка-Ціхаакіянскі рэгіён, Мінска-Маладзечанскае ўзвышша, Дняпроўска-Бугскі канал, Паўночна-Заходні край*;
   - усе знамянальныя словы ў афіцыйных уласных назвах дзяржаў і іх аб'яднанняў: *Садружнасць Незалежных Дзяржаў, Вялікае Княства Літоўскае, Рускае і Жамойцкае*;

Репозиторий БарГУ

– усе знамянальныя словы ў вобразных састаўных уласных геаграфічных і астранамічных назвах, калі гэтыя ўласныя назвы ўжываюцца без агульнай родавай назвы: *Стары Свет* (краіны Еўропы і Азіі), *Блізкі Усход, Чорная Афрыка, Крайняя Поўнач, Зямля Каралевы Мод, Дзікі Захад* (у ЗША); у назоўным і родным склонах у спалучэнні з агульнай родавай назвай: *туманнасць Конская Галава, бухта Залаты Рог, астравы Паўночная Зямля*.

2. З **малой літары** пішуцца:
– агульныя родавыя назвы геаграфічных, астранамічных і іншых падобных аб'ектаў у складзе ўласных назваў: *Афрыканскі кантынент, Атлантычны акіян, Уральскія горы, гара Казбек, рака Вілія, Князь-возера, Сапун-гара*;
– службовыя часткі ў складзе састаўных уласных геаграфічных найменняў: *Франкфурт-на-Майне, Рыа-дэ-Жанэйра, Па-дэ-Кале, Булонь-сэр-Мэр, Сьера-дэ-лас-Мінас, Дар-эс-Салам, Салам-і-Гомес* [9, с. 45—47].

## 5.4 Вялікая і малая літары ў назвах дзяржаўных органаў і іншых арганізацый

1. З **вялікай літары** пішуцца:
– усе словы ў найменнях вышэйшых органаў заканадаўчай, выканаўчай і судовай улады Рэспублікі Беларусь і іншых краін: *Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь, Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь, Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь;* **але:** *Нацыянальны сход Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь*;
– першае слова ў найменнях рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання і іншых арганізацый: *Міністэрства эканомікі Рэспублікі Беларусь (Мінэканомікі), Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы, Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны* і інш.;
– простыя і састаўныя ўласныя назвы ў складзе ўласных найменняў дзяржаўных органаў і іншых арганізацый:



Рэпазіторый БарДУ

*Адміністрацыя Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр балета Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўны літаратурны мемарыяльны музей Якуба Коласа, Таварыства Чырвонага Крыжа, Савет Бяспекі Арганізацыі Аб'яднаных Нацый (ААН)*;
- слова *Савет* у значэнні органа ўлады: *Мінскі абласны Савет дэпутатаў, сельскі Савет дэпутатаў*; **але:** *сельсавет*;
- словы *Дом, Палац,* якія пачынаюць найменне ўстановы: *Дом культуры, Дом народнай творчасці, Палац спорту, Палац мастацтваў*; **але:** *Зімовы палац, дом адпачынку*.

2. З **малой літары** пішуцца найменні аддзелаў і іншых падраздзяленняў навуковых і адукацыйных устаноў, іх органаў кіравання, а таксама словы тыпу *калегія, вучоны савет, навукова-метадычны савет, савет па абароне дысертацый, факультэт, аддзяленне, сектар, група: вучоны савет факультэта журналістыкі*; **але:** *Агульны сход Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Аддзяленне аграрных навук Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі* [9, с. 47-48].

## 5.5 Вялікая і малая літары ў найменнях пасад і званняў, ветлівых зваротах і спецыяльных абазначэннях

1. З **вялікай літары** пішуцца:
- словы або спалучэнні слоў, якія з'яўляюцца афіцыйнымі назвамі асобы па вышэйшых дзяржаўных і рэлігійных пасадах: *Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь, Прэм'ер-міністр Рэспублікі Беларусь, Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Старшыня Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь, Галоўнакамандуючы Узброенымі Сіламі Рэспублікі Беларусь, Генеральны пракурор Рэспублікі Беларусь, Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі, Каралева Аб'яднанага Каралеўства Вялікабрытаніі і Паўночнай*

Рэпазіторый БарДУ

*Ірландыі, Імператар Японіі, Папа Рымскі, Патрыярх Маскоўскі і ўсяе Русі, Далай-Лама.* У неафіцыйным ужыванні словы *прэзідэнт, старшыня, кароль, імператар* пішуцца з малой літары: *візіт прэзідэнта, выступленне старшыні, прыём у караля, загад імператара;* **але:** *выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь*;

– словы або спалучэнні слоў, якія з'яўляюцца назвамі асобы па вышэйшых дзяржаўных узнагародах Рэспублікі Беларусь і іншых краін (акрамя слова *кавалер*): *Герой Беларусі, Герой Савецкага Саюза, Герой Сацыялістычнай Працы, кавалер ордэна Ганаровага Легіёна*;
– у розных афіцыйных пасланнях, лістах займеннік *Вы* як форма ветлівага звароту да адной асобы;
– у высокім стылістычным ужыванні такія агульныя назвы, як *Радзіма*, *Айчына*, *Бацькаўшчына, Чалавек, Маці, Настаўнік, Майстар*;
– словы ў назвах бакоў у пагадненнях, кантрактах і іншых дагаворах: *Высокія Дагаворныя Бакі, Аўтар і Выдавецтва, Заказчык і Выканаўца* [9, с. 49].

## 5.6 Вялікая літара ў назвах дзяржаўных і нацыянальных сімвалаў, рэліквій, дзяржаўных узнагарод, прэмій, грамат, прызоў

1. З **вялікай літары** пішуцца:
– усе словы ў назвах дзяржаўных і нацыянальных, ваенных і культурных рэліквій: *Сцяг Перамогі, Крыж Ефрасінні Полацкай, Курган Славы, Курган Бессмяротнасці, Востраў Слёз, Помнік Перамогі*;
– усе словы ў поўных назвах ордэнаў і медалёў (акрамя слоў *медаль, ордэн і ступень*): *медаль «Залатая Зорка» Героя Савецкага Саюза, медаль «Залатая Зорка» Героя Сацыялістычнай Працы, ордэн Айчыны І (ІІ, ІІІ) ступені, ордэн Маці, ордэн Пашаны, ордэн Францыска Скарыны, ордэн Ганаровага Легіёна (Францыя), Георгіеўскі Крыж*; **але:** *ордэн Дружбы народаў*;



Рэпазіторый БарДУ

– першае слова ў назвах дзяржаўных сімвалаў, дзяржаўных і міжнародных прэмій, грамат, прызоў і інш.: *Дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўны герб Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўная прэмія Рэспублікі Беларусь, Ганаровая грамата Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровая грамата Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, Міжнародная прэмія Міру, Нобелеўская прэмія, Кубак свету, Кубак федэрацыі, Каралеўскі кубак* [9, с. 49-50].

## 5.7 Вялікая і малая літары ў назвах дакументаў, іх зводаў, унікальных прадметаў, твораў

1. З **вялікай літары** пішуцца:

– аднаслоўныя ўласныя назвы і першае слова ў састаўных назвах важнейшых дзяржаўных і міжнародных дакументаў, пагадненняў, актаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, іх зводаў: *Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь, Закон Рэспублікі Беларусь «Аб адукацыі», Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Аб узнагароджанні мнагадзетных маці ордэнам Маці», Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб судаўладкаванні і статусе суддзяў, Статут Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, Статут Вялікага Княства Літоўскага, Усеагульная дэкларацыя правоў чалавека, Літоўская метрыка;* **але:** *распараджэнне (пратакол даручэнняў) Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь*;

– аднаслоўныя ўласныя назвы і першае слова ў састаўных назвах прадметаў мастацтва і іншых адзінкавых і ўнікальных прадметаў, твораў, іх зводаў: *Дзявятая сімфонія Бетховена, Венера Мілоская, Янтарны пакой, Алмазны фонд, Біблія, Стары Запавет, Каран, Талмуд*.

2. З **малой літары** пішуцца агульныя назвы стыляў у мастацтве і архітэктуры: *барока, ракако, готыка, ампір, мадэрн* [9, с. 50-51].

Рэпазіторый БарДУ

## 5.8 Вялікая і малая літары ў назвах знамянальных падзей і дат, перыядаў і эпох, святаў

1. З **вялікай літары** пішуцца:
- аднаслоўныя ўласныя назвы і першае слова ў састаўных назвах знамянальных падзей і дат, перыядаў і эпох: *Варфаламееўская ноч, Адраджэнне, Рэфармацыя, Крыжовыя паходы, Лядовае пабоішча, Крычаўскае паўстанне, Супраціўленне, Першая сусветная вайна, Другая сусветная вайна*;
- аднаслоўныя ўласныя назвы і першае слова ў састаўных назвах дзяржаўных, традыцыйных і рэлігійных святаў: *Дзень Канстытуцыі, Дзень Перамогі, Дзень Незалежнасці Рэспублікі Беларусь (Дзень Рэспублікі), Новы год, Дзень жанчын, Свята працы, Дзень Кастрычніцкай рэвалюцыі, Нараджэнне Хрыстова, Дзень памяці, Дзень беларускай навукі, Дзень ведаў, Ушэсце Гасподняе, Уваскрэсенне Хрыстова, Вялікая субота, Таццянін дзень, Радаўніца, Вялікдзень, Каляды, Купалле, Дабравешчанне, Рамадан*; **але:** *8 Сакавіка, 9 Мая.*

2. З **малой літары** пішуцца назвы родаў і відаў знамянальных падзей і дат, перыядаў і эпох, асобных гадоў, дзён і інш.: *імперыялістычная вайна, лютаўская рэвалюцыя, паўстанне Тадэвуша Касцюшкі, кайназойская эра, неаліт, эпоха феадалізму, капіталістычная фармацыя, перыяд аднаўлення, залаты век, высакосны год, дзень адчыненых дзвярэй, санітарны дзень, месячнік дарожнай бяспекі* [9, с. 51].

**Параўнай і запомні новыя напісанні!** [6, с. 95—97]

| Напісанні паводле правіл 1959 года | Напісанні паводле правіл 2008 года |
|---|---|
| алах | Алах |
| багародзіца | Багародзіца, Матка Боская |
| благавешчанне | Дабравесце, Звеставанне, Благавешчанне |
| бог | Бог |
| богачалавек | Богачалавек |
| бог дух святы | Бог Дух Святы |
| божы дар [талент] | Божы дар [талент] |

Репозиторий БарГУ

*Окончание табл.*

| Напісанні паводле правіл 1959 года | Напісанні паводле правіл 2008 года |
|---|---|
| Брахма | Брахма |
| вадохрышча | Вадохрышча |
| вербная нядзёля | Вербная нядзеля |
| вербная субота | Вербная субота |
| вёрбніца | Вербніца |
| Вялікдзень | Вялікдзень |
| вялікі пост | Вялікі пост |
| вялікая субота | Вялікая субота |
| гроб гасподні | Гроб Гасподні |
| дабравешчанне | Дабравешчанне |
| дзяды | Дзяды |
| каляды | Каляды |
| каран | Каран |
| крыж гасподні | Крыж Гасподні |
| купалле | Купалле |
| курбан-байрам | Курбан-Байрам |
| масленіца | Масленіца |
| пакровы | Пакровы |
| папа рымскі | Папа Рымскі |
| пасха | Пасха |
| прасвятая троіца | Прасвятая Троіца |
| прачыстая ўладычыца | Прачыстая Уладычыца |
| нябесная царыца | Нябесная Царыца |
| псалтыр | Псалтыр |
| радаўніца | Радаўніца |
| рамадан | Рамадан |
| рамазан | Рамазан |
| руская праваслаўная царква | Руская Праваслаўная Царква |
| святы дух | Святы Дух |
| сёмуха | Сёмуха |
| талмуд | Талмуд |
| троіца | Троіца |
| чысты чацвер | Чысты чацвер |
| уваскрэсенне | Уваскрэсенне |
| уладыка нябесны | Уладыка Нябесны |
| ушэсце гасподняе | Ушэсце Гасподняе |
| успенне панны Марыі (зельная) | Успенне Панны Марыі (Зельная) — дзень, у які касцёл асвячае зёлкі |
| царыца нябесная | Царыца Нябесная |

Репозиторий БарГУ

## **Параўнай і запомні новыя напісанні!** [6, с. 97]

| Напісанні паводле правіл 1959 года | Напісанні паводле правіл 2008 года |
|---|---|
| першая сусветная вайна | Першая сусветная вайна |
| другая сусветная вайна | Другая сусветная вайна |

### Пытанні для самападрыхтоўкі

1. Назавіце асаблівасці напісання вялікай і малой літары ў асабовых назвах.
2. Пералічыце выпадкі напісання вялікай літары ў найменнях асоб, звязаных з рэлігіямі, назвах міфалагічных і казачных герояў.
3. Пералічыце выпадкі напісання малой літары ў геаграфічных і астранамічных назвах.
4. Акрэсліце асаблівасці напісання вялікай і малой літары ў назвах дзяржаўных органаў і іншых арганізацый.
5. Адзначце выпадкі напісання вялікай і малой літары ў найменнях пасад і званняў, ветлівых зваротах і спецыяльных абазначэннях.

## Трэнінг уменняў

**Заданне 1.** Растлумачце напісанне вялікай і малой літары ў словах.

Пётр Першы, Рычард Ільвінае Сэрца, Бонч-Бруевіч, Жан-Жак Русо, Барклай дэ Толі, форд, маўзер, дамавік, Баба Яга, Міхасёў сшытак, пракрустава ложа, Берынгаў праліў, купалаўскія традыцыі, Гібралтар, Заходняя Еўропа, Маскоўская шаша, аповесць «Жураўліны крык», востраў Зямля Прынца Карла, Заходне-Сібірская нізіна, Лас-Вегас, Мацей Бурачок, Мурчыны кацяняты, Чэшская Рэспубліка, Люксембург, Паўночная Італія, Каралева Англіі, Кіеўскі бульвар, сузор'е Вялікага Пса, русалка, Скандынаўе, баба-яга, фотаздымкі Месяца, 9 Мая, медаль «За адвагу», Другая сусветная вайна, Забайкалле, Арабская Рэспубліка Егіпет, Полацкая Сафія, Дзяржава Кувейт.

**Заданне 2.** Спішыце сказы, устаўце прапушчаныя літары, раскрыйце дужкі. Запішыце лічбы словамі.

1. 5 лістапада 1512 года ў ц...ркве (С, с) вятога Урбана сабралася кал...гія найслаўнейшых (Д, д) актароў (М, м) астацтваў і (М, м) едыцыны (П, п) адуанскага (У, у) ніверсітэта, каб вырашыць пытанне аб допуску да экзам...наў на ступень (Д, д) октара (М, м) едыцыны Францыска Скарыны. 2. Трохі ...боку стаяў стары кароцен...кі «(М, м) асквіч». 3. У хату (Л, л) есавік прынёс калыску цікавых казак поўную і сноў. Пра (Ч, ч) арадзея, (Р, р) ымшаву papліску, пра бацьк (ін, аў) дар і пра яго сыноў. 4. У мяк...ай цішы кол...раў

Рэпазіторый БарДУ

ласкавых успыхваюць аген...чыкамі травы, дзе (Ф, ф) ея мне пакінула сл...ды. 5. Святліцца (М, м) лечны (Ш, ш) лях — планетны мост. Ён (Р, р) озуму (В, в) ышэйшага тварэнне! 6. Мурашка ў гэтым свеце неабдымным, малю я (Б, б) ога: «Дай яшчэ адну пагодную, клапотную в...сну!» 7. На (К, к) упалле там птушка садзіцца, пяе, у (П, п) іліпаўку воўк нема вые. 8. Праз а...чыненае акно заляцела ў мой пакой (Б, б) ожая (К, к)ароўка і прысела на прынт...р. 9. На сустрэчу да студэнтаў (Б, б) еларускага (Дз, дз) яржаўнага (Т, т) эхналагічнага (У, у) ніверсітэта завіталі (М, м) іністр (А, а) дукацыі (Р, р) эспублікі (Б, б) еларусь, (С, с) таршыня (С, с) авета (Р, р) эспублікі (Н, н) ацыянальнага (С, с) ходу (Р, р) эспублікі (Б, б) еларусь, а таксама (М, м) ітрапаліт (М, м) інскі і (С, с) луцкі, (П, п) атрыяршы (Э, э) кзарх (У, у) сяе (Б, б) еларусі.10. Ефрасіння (П, п) олацкая ў немаладым ужо ўзросце накіравалася да (Г, г) роба (Г, г) асподняга.

**Заданне 3.** Калі неабходна выбраць вялікую літару, пастаўце лічбу 1, калі малую — лічбу 2.

| | |
|---|---|
| Сябар (С, с) карыназнавец | |
| (Б, б) урыданаў асёл | |
| (А, а) лесеў бацька | |
| Не давядзі (Б, б) ожа | |
| (С, с) карынаўскія першадрукі | |
| (В, в) ялікі пост | |
| (П, п) апа (Р, р) ымскі | |
| (К, к) рыжовыя паходы | |
| (Ж, ж) дановіцкая гародніна | |
| (У, у) зброеныя (С, с) ілы Рэспублікі Беларусь | |
| (Ж, ж) ыцень | |
| Генеральны (П, п) ракурор Рэспублікі Беларусь | |
| (Дз, дз) яржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь | |
| (С, с) аюз пісьменнікаў | |
| (С, с) карынаўская стыпендыя | |
| (Б, б) ожы дзьмухавец | |
| Храм (Б, б) ожы | |
| (Дз, дз) ева Марыя | |
| (С, с) тары Запавет | |
| (У, у) васкрэсенне Хрыстова | |

Репозиторий БарГУ

**Заданне 4.** Размяркуйце прапанаваныя словы ў адпаведныя пустыя клеткі табліцы згодна з новымі арфаграфічнымі правіламі і запішыце іх правільна.

Буда, вялікдзень, ісус хрыстос, крыж гасподні, біблія, іегова, дабравешчанне, евангелле, новы запавет, гроб гасподні, алах, мухамед, святы дух, каляды, каран, стары запавет, пасха хрыстова, шыва, псалтыр, руская праваслаўная царква, рамазан, брахма, талмуд, веды, курбан-байрам, дзева марыя, вялікі пост, заратустра.

| | |
|---|---|
| Імёны багоў у розных рэлігіях | |
| Словы, якія традыцыйна абазначаюць найважнейшыя рэлігійныя паняцці | |
| Імёны заснавальнікаў рэлігій | |
| Назвы культавых кніг | |
| Назвы рэлігійных святаў, пастоў | |

## Тлумачальны дыктант

### Васіль Уладзіміравіч Быкаў

Васіль Уладзіміравіч Быкаў нарадзіўся 19 чэрвеня 1924 года ў вёсцы (Б, б)ычкі (У, у)шацкага (Р, р)аёна (В, в)іцебскай (В, в)бласці. Бацька яго ўдзельнічаў у (П, п)ершай (С, с)усветнай вайне, а затым у (Г, г)рамадзянскай. Васіль Быкаў, скончыўшы ў 1939 годзе восем класаў (К, к)убліцкай (С, с)ярэдняй (Ш, ш)колы, паступіў на (С, с)кульптурнае аддзяленне (В, в)іцебскага (М, м)астацкага (В, в)учылішча. Аднак восенню 1940 года ў сувязі з пагаршэннем матэрыяльнага становішча сям'і і адменай (Д, д)зяржаўных (С, с)тыпендый вымушаны быў пакінуць вучобу ў вучылішчы. Паступіў у (В, в)іцебскую школу ФЗН, дзе вучыўся да (М, м)ая 1941 года. У чэрвені экстэрнам здаў экзамены за дзесяты клас (К, к)убліцкай (Ш, ш)колы.

У самым пачатку (В, в)ялікай (А, а)йчыннай (В, в)айны быў мабілізаваны на абарончыя работы. У зіму 1941—1942 гадоў жыў на (С, с)танцыі (С, с)алтыкова ў (А, а)ткарску (С, с)аратаўскай (В, в)бласці, дзе вучыўся ў (Ч, ч)ыгуначнай (Ш, ш)коле. Улетку 1942 года быў прызваны ў (Ч, ч)ырвоную (А, а)рмію, скончыў (С, с)аратаўскае (П, п)яхотнае (В, в)учылішча і з 1943 года ваяваў на (Д, д)ругім і (Т, т)рэцім (У, у)краінскіх (Ф, ф)рантах.



Репозиторий БарГУ

Пасля дэмабілізацыі жыў у (Г, г)родне, працаваў мастаком у (Г,г)родненскіх (М,м)айстэрнях, у рэдакцыіадах зноў служыў у (С, с)авецкай (А, а)рміі. Быў абраны (С, с)акратаром (Г, г)родзенскага (А, а)ддзялення (С, с)аюза (П, п)ісьменнікаў БССР (1972—1978).

З’яўляецца (Л, л)аўрэатам (Л, л)ітаратурнай (П, п)рэміі (І, і)мя Я. Коласа, (Дз, дз)яржаўнай (П, п)рэміі СССР, (Л, л)енінскай прэміі. З 1980 года — (Н, н)ародны (П, п)ісьменнік БССР. (Л. Савік).

## ТЭМА 6
## ПРАВАПІС СКЛАДАНЫХ СЛОЎ

### 6.1 Правапіс галосных у складаных словах

Правапіс галосных *о, э, а.*

1. У складаных словах можа быць адзін асноўны і адзін або некалькі пабочных націскаў. Калі ў другой частцы складанага слова націск на першым складзе, то ў першай частцы замест *о* пішацца *а*: *дабрадзей, скараход, салявар, бамбасховішча* [9, с. 9-10].

**Новае ў правапісе** [8, с. 15]

| Правілы 1959 года | Правілы 2008 года |
|---|---|
| **§ 18**<br>Захоўваюць у першай частцы *о* таксама словы на: *фота- (фотакартка, фотакопія, фотаздымакі* г. д., але: *фатаграфія* і вытворныя ад яго); *мота-(мотапоезд, моталодка, мотаспорт, мотагонкі* і г. д.; **але:** *матавоз, матацыкл* і вытворныя ад іх); *што- (штодзённа, штотыднёва, штомесяц).*<br><br>**§ 20**<br>***Заўвага 1.*** Лічэбнікі *сто* і *дзевяноста* ў якасці першай часткі складаных слоў захоўваюць сваё напісанне, напрыклад: *стодзённы, стотысячны, дзевяностатысячны, дзевяноста-гадовы;* але: *стагоддзе* | **§ 5**<br><...><br>**1.** Літара *о* захоўваецца ў складаных словах, першай часткай якіх з'яўляюцца *слова-, што-, фота-, мота-: словоформа, споватворчасць; штодзённы, штомесяц, штогод; фотаздымак, фотакопія, фотаплёнка, фотакамера, фотавыстаўка*; **але:** *фатаграфія* і вытворныя ад яго: *мотагонкі, мотакрос, мотаспорт*; **але:** *матавоз, матацыкл* і вытворныя ад іх.<br>Згодна з новымі правіламі, у складаных словах лічэбнік *сто* заўсёды мае форму *ста: станожка, стаметроўка, стагалосы* |

Рэпазіторый БарГУ

2. Калі ў другой частцы складанага слова націск не на першым складзе, то ў першай частцы захоўваецца *о*: *аснòвапалажэнне, бавòўнапрадзільны, вòдаразмеркавальнік, вòстракамбінацыйны, вòгнетрывалы, вагòнарамонтны, высòкаідэйны*.

У першай частцы некаторых складаных слоў, асабліва навуковых тэрмінаў, можа выразна праяўляцца пабочны націск і тады, калі асноўны націск падае на першы склад другой часткі. У такім выпадку пад пабочным націскам у першай частцы захоўваецца напісанне *о*: *аздòнастойкі, аздòтнакіслы, збòжжасховішча, мангòлазнаўства, мòвазнаўства, мòвазнаўчы, матòразборка, слòватворчасць* і інш.

Ва ўсіх іншых выпадках напісанне падобных слоў вызначаецца па слоўніку.

3. Літара *о* пішацца ў першай частцы складаных слоў, калі другая частка пачынаецца з *ў* (у нескладовага): *марозаўстойлівы, торфаўборачны*.

4. Лічэбнікі ад 600 да 800 утвараюць асобны тып складаных слоў, у якіх першая частка скланяецца і пішацца як самастойнае слова.

Напрыклад: *шэсцьсот, семсот, восемсот; шасцісот, сямісот, васьмісот; шасцістам, сямістам, васьмістам; шэсцьсот, семсот, восемсот; шасцюстамі, сямюстамі, васьмюстамі*; (аб) *шасцістах, сямістах, васьмістах*.

5. Гук [э] ў першай частцы складаных слоў захоўваецца і абазначаецца літарай *э*: *мэтанакіраваны, рэдказубы, арэхападобны, крэдытаздольнасць, тэлебачанне*.

6. У складаных словах, утвораных ад лічэбніка ў форме роднага склону і іншага слова, першая частка пішацца так, як яна пішацца ў родным склоне лічэбніка: *трохдзённы, чатырохпавярховы, шасцісоты, пяцідзёнка, сямікласнік, васьмігадовы, дзевяціградусны, саракагоддзе, двухсотметровы*.

7. Калі складаныя словы маюць у сваім складзе больш за дзве часткі, то кожная з іх пішацца як асобна ўзятае слова: *аўтатрактарабудаванне, аэрафотапрыбор* [9, с. 10-11].

Правапіс *е, ё, я* ў складаных словах.

1. У першай частцы складанага слова літара *е* захоўваецца незалежна ад таго, на якім складзе націск у другой частцы: *сенакасілка, серпадзюб, землетрасенне, светапогляд, свежавымыты, свежамарожаны* [9, с. 12].

Репозиторий БарГУ

### **Новае ў правапісе** [8, с. 17]

| Правілы 1959 года | Правілы 2008 года |
|---|---|
| **§ 16**<br>Складаныя словы з націскам на першым складзе другой часткі пішуцца як простыя, напрыклад: *агняцвет, вадаспад, ледарэз, санцапёк, краязнаўчы, жыццярадасны, агнястрэльны, вярблюдаводства, землеробства, зернясховішча, палітэхнікум, паліклініка, кантрамарка* | **§ 7**<br>**1.** У першай частцы складанага слова літара *е* захоўваецца незалежна ад таго, на якім складзе націск у другой частцы: *сенакос, сенакасілка, сенажаць, серпадзюб, верхнеазёрскі, свежамарожаны.*<br>Калі першай часткай складаных слоў з'яўляецца аснова *велік- / вялік-,* напісанне літар *е* або *я* залежыць ад таго, які склад у другой частцы націскны: калі першы — пішацца *е,* калі другі — пішацца *я: велікадушны, велікарускі, велікамучанік, велікасвецкі; Вялікабрытанія, вялікадзяржаўны, вялікагаловы* |

2. У першай частцы складанага слова літара *ё* захоўваецца пры націску не на першым складзе другой часткі і замяняецца на *е*, калі націск на першым складзе другой часткі: *лёгкаатлетычны, лёдадрабілка, мёдаварэнне; ледарэз, легкадумна*.

3. У складаных словах злучальныя галосныя *о, ё* пішуцца толькі пад націскам, галосная *а* — у любым ненаціскным складзе: *Вадохрышча, куродым, часопіс, геліёграф, марозаўстойлівы, прыборабудаўнічы*.

4. Злучальная галосная *е* ў складаных словах пераходзіць у *я*, калі націск на першым складзе ў другой частцы складанага слова: *баяздольны, зернясховішча, земляроб, жыццярадасны, крывятворны*; але: *боепрыпасы, жыццеапісанне, землекарыстанне, зернебабовы*.

Злучальная галосная *е* ў складаных словах захоўваецца, калі другая частка пачынаецца з *ў* (у нескладовага): *зернеўборачны, вогнеўстойлівы*.

Складанаскарочаныя словы пры напісанні звычайна разглядаюцца як простыя словы з адным націскам: *зямфонд, лясгас* [9, с. 13].

## 6.2 Правапіс складаных назоўнікаў і прыметнікаў

### Складаныя назоўнікі

1. Пішуцца **разам:**
- складаныя назоўнікі з дзвюх і больш асноў, якія спалучаюцца пры дапамозе злучальных галосных *о (а), е (я)*:

Рэпазіторый БарДУ

*конезавод, льнозавод, далягляд, землетрасенне, птушкагадоўля, чалавекалюбства, бульбакапалка, медыкапсіхолаг*;

– складаныя назоўнікі, у якіх першай часткай з'яўляецца дзеяслоўная форма загаднага ладу на *-і (-ы)*: *вярцішыйка, сарвігалава, вярнідуб, прайдзісвет, пакацігарошак*; **але:** *перакаці-поле, вей-вецер*;

– складаныя назоўнікі ад'ектыўнага тыпу скланення, калі яны з'яўляюцца навуковымі тэрмінамі: *галаваногія, бруханогія*;

– складаныя назоўнікі з першымі іншамоўнымі часткамі *авія-, агра-, аўта-, аэра-, бія-, вела-, гідра-, заа-, кіна-, макра-, метэа-, мікра-, неа-, стэрэа-, фота-*: *авіяздымак, агракомплекс, аўтапоезд, аэрафлот, біястымулятар, веласпорт, гідраслужба, заагігіена*;

– складаныя ўласныя назвы паселішчаў з пачатковай часткай *нова- (нава-), стара-, верхне- (верхня-), ніжне- (ніжня-), сярэдне- (сярэдня-)* і інш.: *Новалукомль, Навапалацк, Навасады, Навагрудак, Старакожаўка, Верхнядзвінск, Ніжнявартаўск, Сярэдняборск, Краснаполле, Крутагор'е, Светлагорск*;

– геаграфічныя назвы з другой часткай *-горад(-град), -горск*: *Кітайгорад, Слаўгарад, Валгаград, Салігорск, Светлагорск*.

2. Пішуцца **праз злучок** складаныя назоўнікі:

– у якіх скланяюцца ўсе словы: *папараць-кветка, вагон-рэстаран, лётчык-касманаўт, член-карэспандэнт*;

– у якіх скланяецца толькі апошняе слова: *жар-птушка, сон-трава, стоп-сігнал, вакуум-насос, дызель-матор, генерал-маёр, прэм'ер-міністр, норд-ост*;

– з аднаслоўным прыдаткам: *лён-даўгунец, заяц-русак, нявеста-красуня, дзед-мароз, горад-герой*. Пры адваротным парадку назоўніка і аднаслоўнага прыдатка злучок не пішацца: *красуня дзяўчына*;

– са значэннем цэласнай адзінкі вымярэння: *кілават-гадзіна, тона-кіламетр-гадзіна, самалёта-вылет, чалавека-дзень*; **але:** *працадзень*;

– якія называюць прадстаўнікоў палітычных і іншых грамадскіх рухаў: *ліберал-дэмакрат, нацыянал-патрыёт, сацыял-дэмакрат*;

– назоўнікі з першай часткай паў- (палавіна) і другой — уласным імем: *паў-Беларусі, паў-Расіі, паў-Мінска*.



Репозиторий БарГУ

– з пачатковымі часткамі *арт-, віцэ-, вэб-, контр-, лейб-, максі-, міні-, обер-, унтэр-, штаб- (штабс-), экс-, прэс-, блок-*: *арт-галерэя, віцэ-прэм'ер, вэб-старонка, лейб-гвардыя, контр-адмірал*; **але:** *контрігра, контратака* (*контр-* у значэнні «супраць»); *максі-прэс, міні-матч, обер-майстар, унтэр-афіцэр, штаб-ротмістр, штабс-капітан, экс-чэмпіён, экс-прэм'ер, прэс-сакратар, блок-сігнал*; **але:** *блокпост*.

3. Пішуцца **праз злучок:**
   – субстантываваныя спалучэнні слоў, якія з'яўляюцца назвамі раслін: *брат-і-сястра*;
   – састаўныя прозвішчы, імёны і назвы геаграфічных аб'ектаў: *Бялыніцкі-Біруля, Жан-Жак Русо, Бурат-Манголія, Эльзас-Латарынгія, Аўстра-Венгрыя*;
   – уласныя геаграфічныя назвы, якія з'яўляюцца спалучэннем назоўніка з назоўнікам у месным склоне і прыназоўнікам *на*, а таксама падобнымі іншамоўнымі спалучэннямі слоў з *дэ, сюр*: *Растоў-на-Доне, Франкфурт-на-Майне, Па-дэ-Кале*;
   – іншамоўныя ўласныя імёны з канцавымі часткамі *-хан, -шах, -паша, -бей, -бай, -задэ, -аглы, -кызы, -бек* і інш.: *Ахмат-шах, Асман-паша, Ізмаіл-бей, Курман-бай, Турсун-задэ, Кёр-аглы, Зейнал-кызы, Асман-бек*;
   – іншамоўныя ўласныя назвы асоб і геаграфічных аб'ектаў з пачатковымі часткамі *Ван-, Мак-, Нью-, Сан-, Санкт-, Сен-, Сент-*: *Ван-Дэйк, Мак-Магон, Мак-Кінлі, Нью-Кастл, Сан-Себасцьян, Сан-Марына, Санкт-Пецярбург, Сен-Санс, Сент-Экзюпеpы*;
   – уласныя назвы паселішчаў з пачатковай часткай *Усць-, Верх-, Соль-*: *Усць-Каменагорск, Верх-Ірмень, Соль-Ілецк.*

4. Пішуцца **асобна:**
   – калі ў назве, якая складаецца з двух і больш назоўнікаў, першы абазначае родавае паняцце, а другі з'яўляецца ўласным імем: *рака Днепр, горад Мінск, вулкан Везувій, маёр Кравец, дзед Янка*;
   – артыклі і часціцы (*да, дэ, ла, ле, ля* і інш.), а таксама *словы дэр, дон, фон, ван* у іншамоўных уласных назвах: *Леанарда да Вінчы, Шарль дэ Кастэр, Анарэ дэ Бальзак, ла Валета,*



Рэпазіторый БарДУ

*ла Мот, ле Шапелье, ля Крэзо, Ван дэр Мейлен, фон дэр Гольц, дон Хуан, Людвіг ван Бетховен*.

– словы ў геаграфічных уласных назвах, якія з'яўляюцца спалучэннем поўнага прыметніка ці парадкавага лічэбніка з назоўнікам: *Стары Свержань, Белы Груд, Вялікія Радванічы, Астрашыцкі Гарадок, Восьмая лінія (вуліца), Першы чыгуначны (завулак)* [9, с. 54—56].

## Складаныя прыметнікі

1. Пішуцца **разам** прыметнікі:
   – якія суадносяцца са складанымі назоўнікамі, што пішуцца разам: *чарназёмны (чарназём), водаправодны (водаправод), мастацтвазнаўчы (мастацтвазнаўства), радыёфізічны (радыёфізіка), жалезабетонны (жалезабетон), хваляводны (хвалявод)*;
   – якія суадносяцца са словазлучэннямі з падпарадкавальнай сувяззю: *каменнавугальны (каменны вугаль), народнапаэтычны (народная паэтыка), агульнаадукацыйны (агульная адукацыя);*
   – якія суадносяцца са словазлучэннямі дзеясловаў з назоўнікамі: *дрэваапрацоўчы (апрацоўваць дрэва), масларобны (рабіць масла), мукамольны (малоць муку);*
   – якія суадносяцца са словазлучэннямі назоўнікаў з лічэбнікамі і прыслоўямі адноснай меры колькасці, аб'ёму, прасторы і інш.: *двухразовы (два разы), трохколавы, сямісотпяцідзесяці-гадовы, саракаградусны, пяцідзесяціпрацэнтны, саракатонны, шматразовы, мнагалюдны, усемагутны*;
   – першай часткай якіх з'яўляюцца прыслоўі: *моцнадзеючы (моцна дзейнічаць), лёгкапаранены (лёгка параніць), цяжкаўспрымальны (цяжка ўспрымаць), нізкарослы, высокаадукаваны, слабасалёны, добраўпарадкаваны, мала-прыкметны;* **але:** *дыяметральна процілеглы (супрацьлеглы), чыста беларускі, яскрава вызначаны, выключна дасканалы, асабліва адказны*;
   – складаныя прыметнікі з дзвюх і больш лексічных частак, якія служаць для абазначэння навуковых і тэхнічных паняццяў: *старажытнаўсходнеславянскі, правабярэжназаходнебугскі, старабеларускамоўны, індаеўрапейскі*;



Рэпазіторый БарГУ

– складаныя прыметнікі, утвораныя ад складаных уласных імёнаў са злучком, калі яны маюць прыстаўку: *заісыккульскі, перадцяньшанскі*;
– субстантываваныя прыметнікі з пачатковай часткай *ваенна*-: *ваеннапалонны, ваеннаабавязаны*.

2. Пішуцца **праз злучок** складаныя прыметнікі:
   – утвораныя ад складаных назоўнікаў, якія пішуцца праз злучок: *вакуум-насосны, генерал-губернатарскі, унтэр-афіцэрскі, ліберал-дэмакратычны, давыд-гарадоцкі*;
   – часткі якіх абазначаюць разнародныя назвы адпаведнай прыкметы: *прыродна-гаспадарчы, жыллёва-будаўнічы, аграрна-сыравінны, лячэбна-працэдурны, таварна-грашовы, электронна-вылічальны, навукова-тэхнічны, грамадска-палітычны, сусветна-гістарычны, народна-вызваленчы*;
   – часткі якіх абазначаюць раўнапраўныя паняцці: *рабоча-сялянскі, руска-беларускі*;
   – часткі якіх абазначаюць асаблівасці ці адценні разнароднай якасці: *кісла-салодкі, жоўта-зялёны, горка-салёны* і інш.;
   – часткі якіх абазначаюць напрамкі свету ў іх спалучэнні: *паўночна-заходні*;
   – якія ўваходзяць у склад геаграфічных назваў з пачатковай часткай *Усходне-, Заходне-, Паўднёва-, Паўночна-, Цэнтральна-* і інш.: *Паўднёва-Афрыканская Рэспубліка, Заходне-Сібірская раўніна, Цэнтральна-Азіяцкі рэгіён* і інш.;
   – пачатковай часткай якіх з’яўляюцца лічба або літара любога алфавіта: *1000-гадовы, 5-павярховы, Т-падобны* [9, с. 57-58].

### Пытанні для самападрыхтоўкі

1. Акрэсліце асаблівасці напісання галосных *о, э, а* ў складаных словах.
2. Адзначце асаблівасці напісання *е, ё, я* ў складаных словах.
3. Пералічыце выпадкі, калі складаныя назоўнікі пішуцца праз злучок.
4. Назавіце выпадкі, калі складаныя прыметнікі пішуцца разам.

Репозиторий БарГУ

## Трэнінг уменняў

**Заданне 1.** Запішыце словы, устаўляючы прапушчаныя літары. Пастаўце націскі. Назавіце заканамернасць, якая адзначаецца пры ўжыванні галосных *о, а* ў першай частцы складаных слоў.

П...знаспелы, п...знацвет, в...даўстойлівы, р...знакаляровы, ч...рнарабочы, м...таспорт, п...ўн...водны, кр...вапраліццё, н...ваабраны, ст...тысячны, шт...хвілінны, м...вазнаўства, в...дападзел, шкл...завод, п...ўкілаграма, сл...ваўжыванне, п...ліграфія, п...ліграфічны, др...бналессе, ш...равокі, н...д...брасумленны, усх...дазнаўства, зб...жжаўборка, сл...ваформа, тр...хпавярховы, св...ечасовы, п...лігібрыдны, м...тагонкі, п...ўнапраўны, пуц...водны, мн...гаматорны, р...знакаляровы, чырв...нашчокі, р...дкалессе, п...ўнаўладдзе, в...страпахучы, н...вагрэчаскі, с...нцапёк.

**Заданне 2.** У кожным радзе маецца толькі адно слова, якое напісана няправільна. Запішыце гэтае слова правільна і патлумачце яго правапіс.

1. Лёдадрабілка, усемагутнасць.
2. Светлафор, геліятэрапія.
3. Палесцінскі, мядсястра.
4. Мядуза, усеўладдзе.
5. Выняньчыць, естрабяня.
6. Аргенціна, палерына.
7. Мёдаварня, маятнік.
8. Дзекабрысты, семісот.
9. Усенародны, негледзечы (на сон).
10. Балярына, бялковападобны.
11. Галаледзіца, Мендзялееў.
12. Ленавод, лёдагенератар.
13. Баязлівец, Вечаслаў.
14. Усяночная, легкараставральны.
15. Крышталякераміка, дзесяцярычны.
16. Лесгас, трэцякласнік.
17. Мензурка, жменя мядзякоў.
18. Сённешні, жыццеўстойлівы.

Репозиторий БарГУ

**Заданне 3.** Запішыце прапанаваныя словы па-беларуску.

Неплатёжеспособность, неравноценный, стосвечовый, стопятидесятилетний, неполнозубые, несамостоятельный, неудобочитаемый, сторублёвка, Великобритания.

**Заданне 4.** Адзначце нумары слоў, у якіх пішацца адпаведная літара.

| | |
|---|---|
| О | 1) выс...кавітамінны; 2) гал...вакружэнне; 3) д...ўгалецце; 4) д...брабыт; 5) д...брасуседскі; 6) зак...напраект; 7) ф...таздымак; 8) ст...годдзе; 9) м...такрос; 10) в...страверхі |
| Е | 1) кра...від; 2) жыцц...радасны; 3) вугл...здабыча; 4) бо...прыпасы; 5) сво...часова; 6) сярэдн...азіяцкі; 7) зерн...сховішча; 8) кон...гадоўля; 9) кле...варня; 10) ус...магутны |
| А | 1) в...даахоўны; 2) пр...цілеглы; 3) ф...таграфія; 4) ст...тысячны; 5) ч...рнаплодны; 6) п...літэхнікум; 7) с...нцастаянне; 8) шт...лета; 9) зак...надаўства; 10) пр...ставалосы |
| Я | 1) н...добразычлівы; 2) з...леналісты; 3) ус...вед; 4) пал...вод; 5) в...лікадзяржаўнасць; 6) ус...ночная; 7) л...саахова; 8) св...тлафор; 9) крыв...носны; 10) ча...апрацоўка |

**Заданне 5.** Адзначце нумары назоўнікаў, якія пішуцца праз злучок.

| Варыянт 1 | Варыянт 2 |
|---|---|
| 1) (Паў)лугавіны; | 1) (Што)тыднёва; |
| 2) (экс)чэмпіён; | 2) (контр)ідэя; |
| 3) (што)месяц; | 3) (Пяці)горск; |
| 4) (зубра)пітомнік; | 4) (Сямі)палацінск; |
| 5) (палі)тэхнікум; | 5) (мёда)варэнне; |
| 6) (меда)варня; | 6) (чае)апрацоўка; |
| 7) (проціва)газ; | 7) (шкло)кераміка; |
| 8) (чая)піцце; | 8) (нова)будоўля; |
| 9) (шкла)посуд; | 9) перш(на)перш; |
| 10) (жыцце)апісанне; | 10) (паў)абарот; |
| 11) (паў)участка; | 11) след(у)след; |
| 12) раз(у)раз; | 12) (плакун)трава; |
| 13) (стоп)кран; | 13) (праграма)мінімум; |
| 14) (Адыс)Абеба; | 14) (бліц)турнір; |
| 15) (Улан)Батар; | 15) (каза)дзераза; |
| 16) (Ла)Манш; | 16) (блок)схема; |
| 17) (коне)завод; | 17) (Доўнар)Запольскі; |
| 18) (Бонч)Бруевіч; | 18) (віцэ)канцлер; |
| 19) Леанарда(да)Вінчы; | 19) Гі(дэ)Мапасан; |
| 20) (Бяла)Падляска | 20) (бія)цыкл |

Репозиторий БарГУ

**Заданне 6.** Запішыце прыметнікі ў левы слупок разам, праз злучок ці асобна. У правым слупку растлумачце іх напісанне па ўзоры:

| | |
|---|---|
| 1) светл**а-**зялёныя палеткі | адценне колеру; утворана ад *светлы **і** зялёны* (ад **раўнапраўных** паняццяў)**; = *і*** |
| 2) нізк**а**апла□т**н**ы | у базе — галоўны і залежны кампаненты **з падпарадкавальнай** сувяззю:<br>***нізк**ая **аплата*****;** утворана складана-суфіксальным спосабам |
| 3) глыбòкапаважáны | утворана ад *глыбок**а** паважаны* спосабам чыстага словаскладання, без злучальнай галоснай; абазначае адно паняцце |
| 4) граматычна правільны | абазначае два самастойныя паняцці |
| 5) **Паўднёва-**Афрыканская Рэспубліка | складаныя прыметнікі з першай часткай ***усходне-, заходне-, паўднёва-, паўночна-*** ў складзе геаграфічнай назвы |
| 6) паўднёв**а**афрыкан**ск**ія землі | **гл. пункт 2:** ад галоўнага і залежнага кампанентаў ***Паўднёв**ая **Афрык**а* + суфікс |
| 7) валгадон**скі** | суфіксальнае ўтварэнне ад *Валгадонск* — **ад складанага назоўніка,** які пішацца разам і інш. |

| 1 варыянт | 2 варыянт |
|---|---|
| 1) (Агніста)чырвоны ўсход; | 1) (Івана)Франкоўскі раён; |
| 2) (вечна)зялёны ўбор; | 2) (леў)талстоўскі матыў; |
| 3) (добра)падрыхтаваны ўрок; | 3) (стара)славянскія літары; |
| 4) (народна)дэмакратычны лад; | 4) (светла)каштанавыя валасы; |
| 5) (мала)вядомы верш; | 5) (бледна)жоўтае адзенне; |
| 6) (высока)таленавіты журналіст; | 6) (руса)валосы хлопец; |
| 7) (вузка)калейная чыгунка; | 7) (паўднёва)заходні вецер; |
| 8) (незвычайна)прыгожы край; | 8) (глыбака)думны позірк; |
| 9) (усходне)славянская мова; | 9) (густа)населены пункт; |
| 10) (заходне)еўрапейскі Рэнесанс; | 10) бел(чырвона)белы сцяг; |
| 11) (Заходне)Сібірская нізіна; | 11) (хутка)цечная аперацыя; |
| 12) (заходне)сібірскія лясы; | 12) (добра)прадуманае рашэнне; |
| 13) пры(чарна)морскі клімат; | 13) (добра)ўпарадкаваная кватэра; |
| 14) (буда)кашалёўскія дарогі; | 14) (мала)выразны малюнак; |
| 15) пры(давыд)гарадоцкія ўзгоркі; | 15) (адмыслова)зробленая рэч; |
| 16) (чыста)вымытая сарочка; | 16) (ста)гадовы дзед; |
| 17) (стылістычна)нейтральная лексіка; | 17) (шмат)павярховы дом; |
| 18) (давыд)гарадоцкія краявіды; | 18) (івана)франкоўскія палі; |
| 19) (высака)якасны адбор; | 19) (маладзёжна)будаўнічы атрад; |
| 20) (дзівосна)багаты ўраджай; | 20) (смугла)твары юнак; |
| 21) (ціха)плынны ручэй; | 21) (літаратурна)мастацкі часопіс; |
| 22) (паўднёва)славянскі народ; | 22) (горна)алтайскі луг; |
| 23) (доўга)чаканы госць; | 23) за(ісык)кульскія прасторы; |
| 24) (пярэдне)баковы кавалак | 24) (снежна)белае покрыва |

Репозиторий БарГУ

## ТЭМА 7
## ПРАВАПІС СУФІКСАЎ У БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

### 7.1 Правапіс галосных у некаторых суфіксах назоўнікаў

1. Суфікс *-ец- (-ац-)* пішацца ў назоўніках мужчынскага роду. Пры змяненні слова галосны выпадае: *акраец, індыец, плывец, вясковец, незнаёмец, канькабежац*.

2. Суфікс *-іц- (-ыц-)* пішацца ў назоўніках жаночага роду і беглага галоснага не мае: *ваколіца, патыліца, спадарожніца, карміліца, розніца, кірыліца, кніжыца*.

3. Памяншальна-ласкальны суфіксальны комплекс *-ічк- (-ычк-)* пішацца ў назоўніках жаночага роду, якія ўтварыліся ад слоў з фіналлю *-іц- (-ыц-)*: *лесвічка, крынічка, сунічка, завушнічка, запальнічка, палічка (ад паліца), сястрычка*.

У астатніх выпадках пішацца памяншальна-ласкальны суфіксальны комплекс *-ечк- (-ачк-)*: *дзядзечка, лялечка, вушачка, Ванечка, Наташачка, Ганначка*.

4. Суфікс *-ак- (-ек-)* пішацца не пад націскам у назоўніках, якія ва ўскосных склонах губляюць суфіксальнае *а* ці *е*: *сшытак — сшытка, каласочак — каласочка, дожджычак — дожджычку*.

5. Суфіксы *-ік- (-ык-), -нік-, -чык-* пішуцца нязменна ва ўсіх формах слоў: *конік — коніка, хлопчык — хлопчыка, спадарожнік — спадарожніка, дарадчык — дарадчыка*.

6. Суфікс *-ень- (-ань-)* ва ўскосных склонах у адных назоўніках захоўвае галосны, у другіх яго губляе: *вусень — вусеня, прамень — праменя*; **але:** *вучань — вучня, шчэбень — шчэбню*. Часам дапускаюцца абедзве формы: *кіпень — кіпеню і кіпню*.

7. Суфіксы *-чык- (-чыц-) і -шчык- (-шчыц-)* ужываюцца пры ўтварэнні назоўнікаў, якія называюць людзей паводле заняткаў.

Суфікс *-чык- (-чыц-)* пішацца:

– калі ўтваральная аснова заканчваецца на пярэднеязычныя *д, т, з, с*: *аб'ездчык, дакладчык, ракетчык, пераплётчыца, лётчык, перапісчык, перапісчыца* (а таксама ў адпаведных прыметніках: *дарадчыцкі, перапісчыцкі* і інш.);

– калі ў канцы ўтваральнай асновы адбываецца чаргаванне [г] — [ж]: *перабягаць — перабежчык, перабежчыца, нябога — нябожчык, абцягваць — абцяжчыца*.

Рэпазіторый БарДУ

Суфікс *-шчык- (-шчыц-)* пішацца:

– калі аснова заканчваецца на санорныя *р, л, м, н, й*: *наборшчык, вугальшчык, атамшчык, згоншчык, мыйшчык* (а таксама ў адпаведных прыметніках: *наборшчыцкі* і інш.);

– пасля спалучэнняў тых жа санорных з наступнымі *т, г* утваральнай асновы: *аліменты — аліментшчык, аліментшчыца, цюбінг — цюбінгшчык*;

– калі ўтваральная аснова заканчваецца на губныя зычныя *б, п, м, ф* і *ў* (з *в*): *гардэробшчыца, падкопшчык, паромшчык, літографшчык, бунтаўшчык, нарыхтоўшчык, забудоўшчык*.

8. З дапамогай суфіксаў *-чын-* і *-шчын-* утвараюцца дзве семантычна розныя групы назоўнікаў: назоўнікі са значэннем пэўнай грамадскай з'явы і назоўнікі са значэннем рэгіёна, абшару.

Суфікс *-чын-* пішацца пасля ўтваральных асноў, што заканчваюцца на *д — т, з — с, ж — ш, дж — ч*: *спадчына* (спад-), *азіятчына* (азіят-), *казаччына* (казак-/казач-), *Суражчына* (сураж-), *Добрушчына* (добруш-), *Турэччына* (турэц-/турэч-), *Полаччына* (Полацк: полат-/полац-/полач-), *Случчына* (Слуцк: слуц-/случ-).

Суфікс *-шчын-* пішацца пасля ўтваральных асноў, што заканчваюцца на губныя *б, п, м, ф, в* або санорныя *н, р, л, й*, а таксама *ў* (з *в* або *л*): *скупшчына* (скуп-), *здзельшчына* (здзель-), *партызаншчына* (партызан-), *мінуўшчына* (мінул-/мінуў-), *суб'ектыўшчына* (суб'ектыв-/суб'ектыў-), *літаратуршчына* (літаратур-), *ваеншчына* (ваен-), *кампанейшчына* (кампаней-), *татаршчына* (татар-), *Гомельшчына* (гомель-), *Магілёўшчына* (магілёў-).

Суфікс *-шчын-* пішацца і тады, калі ўтваральная аснова заканчваецца на зычны з папярэднім санорным: *інтэлігентшчына* (інтэлігент-), *эмігрантшчына* (эмігрант-), *Самаркандшчына* (самарканд-).

9. Падвоенае *нн* пішацца на стыку ўтваральнай асновы і суфікса паміж галоснымі, калі ўтваральная аснова заканчваецца на *н*, а суфікс пачынаецца з гэтай жа літары: *дзённік, маліннік, абранніца, падаконнік, коннік, конны, сасоннік* [9, с. 35-36].

## 7.2 Правапіс суфіксаў прыметнікаў

1. У прыметніках і прыслоўях з ласкальным значэннем:

– пасля мяккіх зычных незалежна ад месца націску пішацца суфікс *-еньк-*: *круценькі, маленькі, ціхенька, утульненькі, нізенькі, беленькі, хуценька*;



Рэпазіторый БарДУ

– пасля цвёрдых зычных пад націскам пішацца суфікс *-эньк-*, а не пад націскам — *-аньк-*: *даражэнькі, старэнькі, харошанькі, свежанькі, добранькі, гарачанькі*.

2. Падвоенае *нн* пішацца ў суфіксальнай марфеме *-энн- (-енн-)* у прыметніках з павелічальным значэннем (*страшэнны, здаравенны, таўсценны*), у прыметніках з якасна-адносным значэннем (*брытвенны, дарэформенны, абедзенны, вогненны*).

3. Падвоенае *нн* пішацца на стыку ўтваральнай асновы і суфікса паміж галоснымі:

– калі ўтваральная аснова заканчваецца на *н*, а суфікс пачынаецца з гэтай жа літары: *карцінны, гартанны, глыбінны, ваенны, вясенні, бяссонны, айчынны*;

– калі аснова слова заканчваецца на *нн*, а суфікс пачынаецца зычным *н*: *ванны* (набор), *манныя* (крупы);

– у прыметніках, утвораных ад назоўнікаў на *-мя*: *іменны, імянны, пайменны, племянны, страмянны, цемянны*; **але:** *палымяны*.

4. Суфіксы *-ск-* і *-ств-* пішуцца:

– калі ўтваральная аснова заканчваецца на *с*, то на пісьме спалучэнне *сс* перадаецца адной літарай: *матроскі, рускі, беларускі, папуаскі, уэльскі, адэскі*;

– калі ўтваральная аснова заканчваецца на *д, з*, то спалучэнне іх з суфіксальным *с* падаецца як *дс*, *зс*: *горад — гарадскі, грамада — грамадства, француз — французскі, Каўказ — каўказскі*;

– у словах, вытворных ад асноў славянскага паходжання на *к*, спалучэнне *к* з суфіксальным *с* на пісьме перадаецца як *ц*: *лясніцтва, казацкі, крыжацкі, славацкі, гарадоцкі, беластоцкі, уладзівастоцкі*;

– у словах, утвораных ад асноў на *к* неславянскага паходжання, на пісьме захоўваецца спалучэнне *кс*: *нью-ёркскі, бангкокскі, цюркскі, таджыкскі, узбекскі*;

– у прыметніках, утвораных ад геаграфічных назваў на *-ка, -кі*, зычны *к* (калі перад ім ёсць іншы зычны) у канцы слова перад суфіксам *-ск-* знікае: *крупскі* (Крупкі), *ямайскі* (Ямайка), *вяцкі* (Вятка); **але:** *касабланкскі*;

– калі ўтваральны назоўнік заканчваецца на літары *-ск*, то суфікс *-ск-* зліваецца з імі: *Пінск — пінскі, Глуск — глускі, Новасібірск — новасібірскі*;



Рэпазіторый БарГУ

– калі ўтваральная аснова слова заканчваецца на *т, ц, ч*, а суфікс пачынаецца зычным *с*, то спалучэнні *тс, цс, чс* на пісьме перадаюцца праз *ц* згодна з вымаўленнем: *агенцтва, адвакацкі, выдавецтва, кравецкі, ткацкі, баранавіцкі, грэцкі (арэх), чытацкі, па-дзявоцку*;
– калі ўтваральная аснова слова заканчваецца на *ж, ш, х* (у тым ліку і пры чаргаванні [г] — [ж], [х] — [ш]), а суфікс пачынаецца зычным *с*, то спалучэнні *жс, шс* у агульных назвах перадаюцца толькі адным *с*: *таварыш — таварыства, мног/множ — мноства, убог/убож — убоства, бог/бож — боскі, птах/пташ — птаства, княжыць — княства*. У некаторых выпадках напісанне такіх слоў вызначаецца па слоўніку, чаргаванне [г] — [ж], [х] — [ш] адсутнічае: *Буг — бугскі, Гаага — гаагскі, Катанга — катангскі, казах — казахскі, Цюрых — цюрыхскі, Карабах — карабахскі, фелах — фелахскі, шах — шахскі, ніўх — ніўхскі, Пецярбург — пецярбургскі*;
– у прыметніках, утвораных ад уласных назваў і назваў народаў, спалучэнні *жс, шс* перадаюцца нязменна: *Нясвіж — нясвіжскі, Парыж — парыжскі, латыш — латышскі, Волг/Волж — волжскі, чэх/чэш — чэшскі, Праг/Праж — пражскі* [9, с. 37—39].

## 7.3 Правапіс суфіксаў дзеясловаў

1. Пераважная большасць запазычаных дзеясловаў ужываецца з суфіксам *-ава- (-ява-)*: *дэградаваць, арыентаваць, цытаваць, іранізаваць, кантактаваць, ліквідаваць, ваенізаваць, кантраляваць, рэканструяваць, дыскутаваць, фінішаваць*.

2. Дзеяслоўны суфікс *-ірава- (-ырава-)* ужываецца:

– калі без гэтага суфікса ўзнікае аманімія дзеясловаў з дзеясловамі з суфіксам *-ава- (-ява-)*: *буксіраваць — буксаваць, газіраваць — газаваць, камандзіраваць — камандаваць, фарміраваць — фармаваць, апаніраваць — апанаваць*;
– калі дзеяслоў без *-ір- (-ыр-)* губляе сваю фармальную і семантычную акрэсленасць: *шакіраваць, бравіраваць,*

*гарманіраваць, драпіраваць, лабіраваць, курыраваць, лавіраваць, дэкарыраваць, сервіраваць, фантазіраваць, лакіраваць, штудзіраваць, мусіраваць, татуіраваць* і інш.;

– калі дзеяслоў мае вузкатэрміналагічнае значэнне: *манціраваць, пасівіраваць, аксідзіраваць, зандзіраваць, сталіраваць, дэмпфіраваць, юзіраваць, юсціраваць, парафіраваць, дыфундзіраваць*.

У некаторых выпадках паралельна ўжываюцца дзве формы: *дэмаскіраваць — дэмаскаваць, акупіраваць — акупаваць, курсіраваць — курсаваць, калькіраваць — калькаваць, базіраваць — базаваць*.

3. Суфікс *-ава- (-ява-)* пішацца ў неазначальнай форме і формах прошлага часу тых дзеясловаў, якія ў першай асобе адзіночнага ліку губляюць гэты суфікс і заканчваюцца на *-ую (-юю)*: *галасую — галасаваць, галасаваў, галасавала, галасавалі, начую — начаваць, малюю — маляваць, даследую — даследаваць*.

4. Суфікс *-іва- (-ыва-)* пішацца ў неазначальнай форме і асабовых формах цяперашняга часу дзеяслова, а таксама ў формах прошлага часу незакончанага трывання пасля збегу зычных, апошні з якіх *л, р* або *н*: *падкрэсліваць, падкрэсліваю, падкрэсліваў, падкрэслівалі; падтрымліваць, адыгрываць, выветрываць, запэўніваць, адрозніваць*.

5. Суфікс *-ва-* пішацца ў астатніх выпадках: *выконваць, выконваю, выконваў, выконвалі; адказваць, вымешваць, заканчваць, загадваць, падстрэльваць, раздумваць, зацярушваць, дагульваць, размяркоўваць, забінтоўваць, распілоўваць*.

У дзеясловах *выйграваць* і *прайграваць* пішацца суфікс *-ава-*.

6. Калі неазначальная форма дзеяслова закончанага трывання заканчваецца на *-іць* або *-яць* з папярэдняй галоснай, то ў незакончаным трыванні перад суфіксам *-ва-* пішацца *й*: *супакоіць — супакойваць, напаіць — напойваць, склеіць — склейваць; засеяць — засейваць, абсмяяць — абсмейваць, настаяць — настойваць*.

7. Суфікс *-ен-* пішацца ў дзеепрыметніках, утвораных ад дзеясловаў на *-іць, -ці*: *адчынены, супакоены, накормлены, куплены, зроблены, пазнаёмлены, заклеены, спалены; звезены, прынесены, заведзены, спрадзены*.

8. Пры чаргаванні ў аснове дзеяслова [с’] — [ш], [з’] — [ж], [ц’] — [ч], [дз’] — [дж] у дзеепрыметніках пішацца суфікс *-ан-: насіць — ношаны, уразіць — уражаны, запрасіць — запрошаны, круціць — кручаны, апярэдзіць — апярэджаны*.

Рэпазіторый БарДУ

9. Спалучэнне галоснай *я* дзеяслоўнай асновы з суфіксам дзеепрыметнікаў *-н-* пішацца ў тых дзеепрыметніках, якія ўтвораны ад дзеясловаў на *-яць-*: *пасеяны, развеяны, змуляны, аблаяны, абстраляны, павыдумляны, абмяняны* (ад абмяняць) [9, с. 29—39].

### Пытанні для самападрыхтоўкі

1. Адзначце асаблівасці выкарыстання суфіксаў *-чык- (-чыц-)* і *-шчык- (-шчыц-)* у беларускай мове.
2. Чым абумоўлены выбар утварэння назоўнікаў пры дапамозе суфіксаў *-чын-* і *-шчын-*?
3. Пералічыце выпадкі падвоенага напісання *нн* у прыметніках.
4. Акрэсліце выпадкі напісання суфіксаў *-ск-* і *-ств-* у прыметніках.
5. Назавіце асаблівасці ўжывання дзеяслоўнага суфікса *-ірава- (-ырава-)*.
6. Пералічыце ўмовы выбару суфіксаў пры ўтварэнні дзеяслоўных форм.

## Трэнінг уменняў

**Заданне 1.** Вусна ўтварыце памяншальна-ласкальныя формы назоўнікаў.

Лесвіца, крыніца, дзядзька, бутэлька, лялька, суніцы, яйка, завулак, завушніцы, запальніца, цётка, галава, булка, палка, рэчка, курыца, паліца, мыльніца, качка, вуха, Ганна, Ваня, Соня, Тоня, Жэня, Юля, Вася, Толя, Міша.

**Заданне 2.** Выпішыце правільна напісаныя словы.

Беражочэк, жоўценькі, агурочак, дубочык, камяніца, чарэшынька, Танічка, роўнянькі, мовазнавіц, дробязь, пянёчак, Валодзечка, венгерэц, матулічка, ночэчка, белелькі, акраяц, ложычка, канадзіц, швейцарац.

**Заданне 3.** Выпішыце словы, у якіх на месцы пропуску трэба ўставіць літару *ш*.

Набор…чык, звар…чык, пераплёт…чык, Лагой…чына, воз…чык, груз…чык, Пола…чына, Уздзен…чына, разнос…чык, вязаль…чык, выдум…чык, перакуп…чык, Брэст…чына, даклад…чык, вугаль…чык, падпіс…чык, бурыль…чык, ліхтар…чык, Браслаў…чына.



Репозиторий БарГУ

**Заданне 4.** Выпішыце па парадку нумары слоў, пры ўтварэнні прыметнікаў ад якіх суфікс *-ск-* захоўваецца (не змяняецца на *-цк-*).

1) Добруш; 2) Слаўгарад; 3) Пухавічы; 4) Гарадок; 5) Глыбокае; 6) узбек; 7) калмык; 8) рыбак; 9) славак; 10) казак; 11) казах; 12) салдат; 13) Кранштат; 14) Пецярбург; 15) сакавік; 16) універсітэт; 17) Брэст; 18) Фінляндыя; 19) гігант; 20) паляшук; 21) Свіслач; 22) прапагандыст.

**Заданне 5.** Выберыце словы, у якіх трэба ўставіць літару *н*.

Дзён…ы стацыянар, алавян…ы салдацік, драўлян…ая лыжка, абедзен…ы перапынак, камен…ы век, камян…істая глеба, лебядзін…ая песня, няплён…ая праца, бяздон…ы калодзеж, фірмен…ы знак, манатон…ы гул, белакачан…ая капуста, жураўлін…ы крык, нявін…ае дзіця, журавін…ы сок, палымян…ы заклік, ветран…ы дзень, блін…ая патэльня, пяцітон…ы груз, бяспошлін…ы праезд.

**Заданне 6.** Ад прапанаваных назоўнікаў пры дапамозе суфіксаў *-ава- (-ява-), -ірава- (-ырава-)* утварыце і запішыце дзеясловы.

Аналіз, шок, камандзіроўка, фінансы, прэмія, кантроль, тыраж, гармонія, віза, кансультацыя, акупацыя, фантазія, ліквідацыя, фініш, пародыя.

**Заданне 7.** Запішыце словы па-беларуску. Растлумачце правапіс суфіксаў у дзеясловах.

Обменивать, засаливать, переваривать, выплывать, взбадривать, проветривать, отговаривать, надаивать, нанизывать, выслушивать, подписывать, разглядывать, доказывать, записывать, подкармливать, показывать, засевать, признавать, завязывать, комбинировать, овладевать, надламывать, выплывать, подклеивать, разглядывать, накалывать, отгадывать, отстаивать, удваивать.

Репозиторий БарГУ

## ТЭМА 8
## ПРАВАПІС *НЕ (НЯ)* З РОЗНЫМІ ЧАСЦІНАМІ МОВЫ

### 8.1 Ужыванне часціц *не* і *ні*

Часціца *не* ў беларускай мове выконвае адмоўную і сцвярджальную функцыю.

Часціца *не* — адмоўная.

1. У адмоўных сказах: *Ідзе зямля ў новы век, не супыніць зямлі*.

2. Пры супрацьпастаўленні: *Гэта была не хата, а хатка, як з казкі, на курыных ножках*.

3. Пры адмоўным параўнанні: *То не гул завірухі мяцежнай і не рокаты ўпартага мора, — гэта Нёман разліўся бязмежна па грудзях Беларусі прасторнай*.

Часціца *не* — сцвярджальная.

1. Калі ўжываецца з пытальнымі займеннікамі, прыслоўямі, часціцамі: *Хто тут не быў на нашай зямлі? Ці ж мы, хлопцы, рук не маем?*

2. Калі спалучаюцца з часцінамі *амаль, ледзь, чуць* і з падпарадкавальнымі злучнікамі *каб, пакуль*: *Юля яшчэ не траціла надзей паспець, пакуль не развіднела, у вёску*.

3. Калі паўтараецца двойчы ў састаўным дзеяслоўным выказніку: *Я не мог не сказаць вам праўды*.

4. Калі спалучаецца са словамі *нельга, немагчыма*: *Не верыць ім нельга*.

Часціца *ні* ў беларускай мове ўзмацняе адмаўленне і сцвярджэнне.

Часціца *ні* — узмацняльная, узмацняе адмаўленне.

1. У сказах з адмоўем *не* ці са словамі *няма, нельга, немагчыма*: *Трэція суткі яна не спала ні часіны і ўсё ішла*.

2. У ролі злучніка і пры пералічэнні аднародных членаў сказа: *Ні дзед Талаш, ні Мартын Рыль не дагаворвалі сваіх думак да канца, але разумелі адзін аднаго вельмі добра*.

3. У пабуджальных сказах з загаднай інтанацыяй: *Ні кроку назад! Ні з месца!*

Часціца *ні* ўзмацняе сцвярджэнне.

1. Калі спалучаецца з займеннікамі і займеннікавымі прыслоўямі: *хто ні, што ні, хто б ні, куды ні, як ні…*: *Хто ні гляне на нас, сам, як май, расцвіце*.

Часціца *ні* ўжываецца ва ўстойлівых зваротах са значэннем няпэўнасці, узмацнення: *ні рыба ні мяса, ні жывы ні мёртвы, ні свет ні зара, ні прайсці ні праехаць*.

Трэба адрозніваць спалучэнне *не раз* «шмат разоў» і *ні разу* «ніколі», *не адзін* «шмат, некалькі» і *ні адзін* «ніхто»: *Не раз мы ўспамінаем дзяцінства. Ні разу не прапусціла заняткаў. Не адзін дзень ішоў снег. Ні адзін не прыйшоў у дождж* [2, с. 214—216].

## 8.2 Асобнае і злітнае напісанне часціц *не (ня)* з living рознымі часцінамі мовы [4, с. 209-210].

| Правіла | Прыклад |
|---|---|
| Не/ня разам (прыстаўка) | |
| З назоўнікам, прыметнікам, дзеясловам, прыслоўем, калі без *не* не ўжываюцца | *Невук, недахоп, нянавісць; неабсяжны, непахісны, непарушны; ненавідзець, нездаровіцца, непакоіць; непахісна, неўзабаве, нельга* |
| З назоўнікам, прыметнікам, прыслоўем, калі можна падабраць сінонім | *Няпраўда = мана, хлусня (сін.); непрыяцель = вораг (сін.); невялікі = малы (сін.); невысокі = нізкі (сін.); нялёгка = цяжка (сін.); нямала = многа (сін.)* |
| З назоўнікам, прыметнікам, прыслоўем, калі набываюць супрацьлеглае значэнне | *Вернасць — нявернасць, уважлівы — няўважлівы, лёгка — нялёгка* |
| З неазначальнымі займеннікамі і прыслоўямі, у якіх *е* ў прыстаўцы пад націскам | *Нехта, нешта, нейкі; некуды, недзе, некалі, неяк* |
| З поўнымі дзеепрыметнікамі, пры якіх няма паясняльных слоў ці супрацьпастаўлення | *Непрачытаная кніга, недапісаны ліст* |
| З прыметнікам, дзеепрыметнікам, прыслоўем, да якіх адносяцца паясняльныя словы са значэннем ступені якасці (*вельмі, надта, зусім, выключна, абсалютна, незвычайна* і інш.) | *Вельмі нядобры ўчынак,*<br>*зусім нядобрыя словы;*<br>*у вышэйшай ступені неабдуманая справа;*<br>*надта нядобра, вельмі няўмела* |
| **Адрознівай:** прыстаўка *неда-* ў назоўніках, у дзеясловах, якія абазначаюць непаўнату дзеяння, неадпаведнасці патрэбнай норме | *Недасол, недабор; недарабіць, недаацаніць* |
| **Запомні:** у прыслоўях: *нечакана, неабсяжна, неўзабаве, незадоўга, неўпапад, непадалёк, неўзаметку, няўцям, нехаця, нельга*; у прыназоўніку *нягледзячы на*; у часціцах *няўжо, няхай*; постфіксе *-небудзь (як-небудзь, хто-небудзь)* і слове *няма* | *Ускрыкнуў нечакана, падняўся нехаця, нягледзячы на надвор'е, няхай бы зрабіў, прыйшоў хто-небудзь* |
| Не асобна (часціца) | |
| Пішацца з назоўнікам, з прыметнікам, з прыслоўем, калі ёсць ці падразумяваецца супрацьпастаўленне | *Не чалавек, а машына; не дажджлівы, а сонечны; не цёмна, а светла; не памытая, а падмеценая падлога* |

Рэпазіторый БарДУ

*Окончание табл.*

| Правіла | Прыклад |
|---|---|
| З прыметнікам, прыслоўем у форме вышэйшай ступені параўнання | *Не больш як кілаграм; не дужэйшы за мяне* |
| З назоўнікам, калі ў сказе адмаўляецца што-небудзь | *Хвароба не радасць* |
| З прыметнікамі, прыслоўямі, калі ў якасці паясняльнага слова выступае займеннік або займеннікавае прыслоўе, якія пачынаюцца з *ні* | *Нікому не патрэбны, ніхто не галодны, ні да чаго не здольны* |
| З усімі словамі, часткі якіх пішуцца праз злучок | *Паступіў не па-сяброўску, зроблена не па-людску, не навукова-папулярны фільм* |
| З кароткімі дзеепрыметнікамі | *Урокі не падрыхтаваны* |
| З поўнымі дзеепрыметнікамі, калі пры іх ёсць паясняльнае слова альбо ёсць ці падразумяваецца супрацьпастаўленне | *Не вывучаныя своечасова ўрокі; не прачытаная, а прагледжаная кніга* |
| З дзеясловамі і ўтворанымі ад іх дзеепрыслоўямі | *Не гаварыць, не прачытаць; не гаворачы, не прачытаўшы* |
| Са словамі: *не варта, не трэба, не супраць, не заўсёды, не зусім* | *Не трэба спрачацца, не заўсёды атрымліваецца, не зусім спакойны* |
| Часткі выразу *не раз* | *Не раз прыходзілася яму хадзіць праз гэты лес* |
| У зваротах *не хто іншы, як; не што іншае, як; не хто іншы, а; не што іншае*, а, у складзе якіх ёсць адносныя займеннікі *хто, што* і азначальны займеннік *іншы* (*хто іншы, што іншае*), якія ў спалучэнні з *не* з'яўляюцца адмаўленнем іх сумеснага значэння | *Не хто іншы, як дырэктар; не што іншае, а праверка* |
| Ні разам (прыстаўка) | |
| З адмоўнымі займеннікамі, прыслоўямі, у якіх *ні-* без націску | *Ніхто, нічый, нішто, ніякі, ніколі, нідзе, ніяк, ніадкуль* |
| З прыметнікам, прыслоўем, з назоўнікам калі без *ні* не ўжываюцца | *Нішчымны, нікчэмны; нічагутка, нічога; нікчэмнасць* |
| Ні *асобна* (часціца) | |
| Калі займеннік і часціца раздзяляюцца прыназоўнікам | Ні з чым, ні з кім, ні ў каго, ні з чым |

## Пытанні для самападрыхтоўкі

1. У чым асаблівасці ўжывання часціц *не* і *ні*?
2. Пералічыце правілы асобнага напісання часціц *не* і *ні* з рознымі часцінамі мовы.
3. Пералічыце правілы напісання разам часціц *не* і *ні* з рознымі часцінамі мовы.

Репозиторий БарГУ

## Трэнінг уменняў

**Заданне 1.** Растлумачце правапіс *не (ня), ні* ў наступных прыкладах.

Непрацаздольнасць; неахайны; нецікава; няшчыра; няўклюда; неруш; нелюдзімы; ненавідзець; неўпапад; немінуча; неяк; нехта; недзе; недалёт; недахоп; недаядаць; нязробленае заданне (не зробленае вучнем заданне); не сустрэць; не зроблена; не ўжываючы; не ціхае, а ветранае надвор'е; не шкада; не надта; не трэба; не па-летняму; ніхто; нічога; ні ў каго; нізашто (прыслоўе); нідзе; нікчэмны; ніводны; ні капейкі.

**Заданне 2.** Выберыце спалучэнні слоў і словы, якія пішуцца з *не*.

Н...сціханыя воплескі; н...хто; н... сумняваўся; н...бы; н...ўміручы; вакол н... кусціка; даўно н... бачыў; жылося н... гладка; н... магу н... паехаць; у хаце н... смяцінкі; н... на хвілінку; н... гуку; н... душы наўкол; н... паслаў пісьмо; н... хацелася парушаць; н... прасіў дапамогі; у лесе н... гуку; н... мог н... пайсці; н... хмурынкі на небе; н... махай расчаравана рукой; н... спіцца Тарасу; н... разу не бачыў; на полі н... душы; н... мог н... прызнацца; куды н... глянь; н... раз даводзілася; н... ўзад н... ўперад; чаго толькі н... пабачыла; хто н... вучыў яго толькі; дзе ён н... ездзіў; н... адрамантавалі; поле н...засеяна; н... складу н... ладу; н... трэба; якое б засушлівае лета н... было; н... праехаць н... прайсці; н... сябра; а вораг; н... шкада; ніяк н... прыгнуты гадамі; даўно н... бачыў; гэта н...надзейна; н... аднойчы; няма н... кусціка; куды н... гляну; з кім толькі н... сустракаўся; н... магу н... паехаць; нельга н... паехаць; нельга прысесці н... на хвіліну; каго толькі н... ўбачыў; н... мыш; н... птушка не праб'ецца; забыць н... маю сілы; шум амаль н... даходзіў; н... абняць і н... змераць пачуццяў; куды б мяне лёс н... кінуў; назад н... прыйдзе хваля тая; ведаем пакуль што н... ўсё; н... душы не было; хіба ж н... праўда; н... ветру; н... шуму; н... кроку назад; н... жыць н... магу; ці н... для цябе; хто н... спытаў хоць раз.

**Заданне 3.** Адзначце нумары пропускаў, на месцы якіх трэба пісаць *ні*.

1. У сад больш …[1] прыляталі …[2] сарокі, …[3] вароны, …[4] галкі, бо ім …[5] было чым пажывіцца.

Репозиторий БарГУ

2. Усё было так, як і заўсёды ў сям'і вылікіх сініц: …[1] пакрыўджаных, …[2] галодных. Бяды-гора …[3] ведалі …[4] дарослыя птушкі, …[5] іх дзеці.

3. Дзе твой пачатак, горад, у якім што …[1] камень — то след шматвяковай гісторыі? …[2] раз і …[3] два …[4] шчадна руйнавалі цябе …[5] прошаныя госці.

4. У сівым тумане далёкай мінуўшчыны хаваецца тваё нараджэнне. Ніхто …[1] засведчыў гэта ў запісах, …[2] занатаваў на бяросце, …[3] высек …[4] на дрэве, …[5] на камені тваё імя і дату.

5. У свой час мы з Пятром пакляліся: дзе б …[1] былі, як бы …[2] жылі, а роўна праз дзесяць гадоў у пэўны дзень і час сустрэцца ў Мінску на плошчы Свабоды. …[3] праз якія дзесяць гадоў мы …[4] сустрэліся. Адзін пра аднаго нічога …[5] ведалі.

**Заданне 4.** Выпішыце фразеалагізмы з часціцамі *не*.

Н… свет н… зара, нічога н… папішаш, з галавы н… выходзіць, канца-краю н… відаць, н… да смеху, н… што сабе, н… села н… пала, н… ў якім разе, н… лыкам шыты, н… з рукі, н… за гарамі, н… слыху н… дыху, н… знай н… ведай, н… па гадах, н… за што н… пра што.

**Заданне 5.** Запішыце словы з *не (ня)* разам або асобна.

(Не) адрамантаваны майстрам гадзіннік, (не) мнагаводны вадаём, адзнака (не) выпраўлена, ніколі (не) востраная піла, абсалютна (не) распрацаваная тэма, яшчэ (не) спілаваны дуб, (не) бяспечная праца, вельмі (не) багаты набытак, машына (не) памыта, нічым (не) агароджаны ўчастак, (не) міласэрныя словы, (не) зацярушаныя снегам мясціны, вельмі (не) зайздросны лёс, праца (не) зроблена, нікому (не) цікавы даклад, (не) прымірымыя ворагі, далёка (не) бліскучы адказ, грошы (не) зароблены, даўно (не) бачаныя краявіды, вельмі (не) прадуманае рашэнне, вельмі (не) ўраджайны год, кабінеты (не) абсталяваны, (не) пабеленая гаспадаром печ, (не) перабраная бульба, нікольki (не) пакрыўджаны хлопчык.

Репозиторий БарГУ

## Прамежкавы тэставы кантроль

*Адзначце правільныя варыянты адказаў.*

1. *Сказы, у якіх **не** з’яўляецца часціцай:*
   а) Неяк нечакана і непрыкметна з’явілася, быццам з-пад зямлі, круглае чырвонае сонца.
   б) Злосна высмейваліся зазнайства, абыякавасць, нерашучасць, неахвота, гультайства, неахайнасць.
   в) Хто не ўмее, той заўсёды не разумее.
   г) Чытанне — гэта не толькі выдатны адпачынак, але і работа, і вучоба, і жыццё ва ўсёй яго паўнаце.
   д) Чалавек адзін нядрэнны меў сады і дом каменны.

2. *У пералічаных сказах часціца **не** пішацца асобна:*
   а) Гэта н_праўда, а хлусня.
   б) Н_прыкметна падкралася восень.
   в) Хлопчыку н_хочацца спаць.
   г) Цэлы тыдзень стаяла н_пагода.
   д) Хата н_падмецена.

3. *Словазлучэнні, дзе ёсць словы, якія без прыстаўкі **не- (ня-)** не ўжываюцца:*
   а) неабмежаваная ўлада;
   б) нясцерпны боль;
   в) неабудны сон;
   г) няпэўная колькасць;
   *д)* сустрэцца неўзабаве.

4. *Словы, якія не могуць пісацца з **не** разам ні пры якіх умовах:*
   а) (не) далёка;
   б) (не) навідзячы;
   в) (не) хочучы;
   г) (не) спяваў;
   д) (не) мой.

5. *Сказы, дзе на месцы пропуску (пропускаў) трэба пісаць часціцу **не:***
   а) … слова ў адказ.
   б) Куды … прыязджалі, першай тэмаю для размовы была гарачыня.

Рэпазіторый БарДУ

в) З гэтымі довадамі нельга … пагадзіцца.
г) Ад зайздрасці … паразумнееш, … падужэеш, … пабагацееш.
д) … дрэўца на тым полі, … адзінокага кусціка.

6. *Сказы, дзе на месцы пропускаў трэба двойчы пісаць **ні:***
а) Завеі непраходныя вылі. Цемра, ноч навокал, дзе … глянь, куды … кінь вока.
б) Чамусьці мы, малыя, … разу … залезлі ў гэты сад.
в) Дзе б … былі мае паходы, які б я … праходзіў край, вясновай песняю заўсёды мне сніўся той шумлівы гай.
г) Ужо … раз і … два рабілі мы яму заўвагі.
д) Пасля вайны ў Васіля Пракопавіча … кала … двара.

7. *Сказы, у якіх ужываецца як часціца **не**, так і часціца **ні:***
а) З маленькіх пачуццяў н… зродзіцца верш, як з пустога вядра вада н… нальецца.
б) І куды бы н… пайшоў, н… паехаў, застаюся пад буслiным крылом Беларусі.
в) Н… адступайся ад праўды н… пры якіх умовах.
г) Зямля бацькоў! Радзімы ціхі кут! Ты бераг мой, я ад цябе н… ўтаю н… болю, н… сумненняў, н… пакут, н… шчасця, н… радасці зямное.
д) Вельмі добра рваць арэхі на такіх кустах: н… трэба н… галавы задзіраць, н… нагінаць арэшніку.

8. *Сінтаксічныя канструкцыі, у якіх **не** з дзеепрыметнікамі пішацца асобна:*
а) сонцам (не) асветлены лес;
б) (не) падмецены двор;
в) агарод (не) дагледжаны;
г) (не) дасолены суп;
д) (не) выцвілая, а толькі парыжэлая ніва.

9. *Сінтаксічныя канструкцыі, у якіх **не** пішацца разам:*
а) зайду, але (не) заўтра;
б) (не) давыканаць заданне;
в) (не) даехаў да Мінска;
г) (не) шырокі палетак;
д) (не) паваротлівы чалавек.

Репозиторий БарГУ

10. *Сінтаксічныя канструкцыі, у якіх **не** пішацца асобна:*
а) сапраўдны (не) вук;
б) (не) пераляцець цераз раку;
в) раскінулася (не) шырока;
г) (не) перабудаваны дом;
д) ні дня (не) працуючы.

## Спіс рэкамендаваных крыніц

### Асноўны


1. *Буракова, М. У.* Беларуская мова. Арфаграфія і пунктуацыя / М. У. Буракова, В. А. Ляшчынская, З. У. Шведава ; пад рэд. В. А. Ляшчынскай. — Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны, 2006. — 237 с.
2. *Лепешаў, І. Я.* Практыкум па беларускай мове: вучэб. дапаможнік / І. Я. Лепешаў, Г. М. Малажай, К. М. Панюціч. — Мн. : Выш. шк., 2005. — 316 с.
3. Новае ў беларускай арфаграфіі. Правілы. Заданні. Тэсты. Слоўнік : вучэб. дапаможнік / У. І. Кулікові. — Мн. : Нов. знание, 2009. — 104 с.
4. Правілы беларускай арфаграфіі і пунктуацыі. — Мн. : Нац. цэнтр прававой інфарм. Рэсп. Беларусь, 2008. — 144 с.


### Дадатковы


1. *Бурак, Л. І.* Сучасная беларуская мова : Арфаграфія і пунктуацыя : Практыкум / Л. І. Бурак, І. Л.Бурак. — Мн. : Універсітэцкае, 1993. — 247 с.
2. *Камароўскі, Я. М.* Сучасная беларуская арфаграфія / Я. М. Камароўскі. — Мн. : [б. в.], 1985.
3. Сучасная беларуская літаратурная мова : Лексікалогія. Фанетыка. Арфаграфія : вучэб. дапаможнік / М. Ц. Кавалёва [і інш.]. — 3-е выд., дапрац. і дапоўн. — Мн. : Выш. шк., 1993.
4. Сучасная беларуская мова : вучэб. дапаможнік / Л. М. Грыгор’ева [і інш.] ; пад агул. рэд. Л. М. Грыгор’евай. — Мн. : Выш. шк., 2006. — 559 с.
5. *Сямешка, Л. І.* Курс беларускай мовы / Л. І. Сямешка, І. Р. Шкраба, З. І. Бадзевіч. — Мн. : Універсітэцкае, 1996. — 654 с.


### Слоўнікі


1. Арфаграфічны слоўнік беларускай мовы / І. У. Кандраценя, Л. П. Кунцэвіч ; Інстытут мовы і літаратуры НАНБ ; пад рэд. А. А. Лукашанца. — Мн. : ТетраСистемс, 2009. — 704 с.
2. *Баршчэўская, А. Л.* Арфаграфічны слоўнік беларускай мовы / аўт.-склад. А. Л. Баршчэўская, Л. П. Баршчэўскі. — Мн. : Радыёла-плюс, 2010. — 560 с.


Рэпазіторый БарГУ

МОДУЛЬ 2

# ПУНКТУАЦЫЯ

***Мэта*** — сістэматызаваць веды пра асаблівасці беларускай пунктуацыі.

***Задачы:***

– фарміраваць навыкі распазнавання ў тэкстах пунктаграм, абгрунтавання правільнасці напісання ў адпаведнасці з пэўным правілам;

– пазнаёміць студэнтаў з дапаўненнямі, якія ўнесены ў беларускую пунктуацыю 2008 года ў параўнанні з правіламі 1959 года;

– праводзіць назіранні над пунктуацыйным афармленнем не толькі асобных сказаў, але і цэлых урыўкаў з лепшых твораў сучаснай мастацкай літаратуры.

Т Э М А 1

## ПУНКТУАЦЫЯ ЯК СІСТЭМА ПАСТАНОЎКІ ЗНАКАЎ ПРЫПЫНКУ. ЗНАКІ ПРЫПЫНКУ ПАМІЖ ДЗЕЙНІКАМ І ВЫКАЗНІКАМ

### 1.1 Пунктуацыя як сістэма пастаноўкі знакаў прыпынку. Роля пунктуацыі ў афармленні пісьмовай мовы

Пунктуацыя — важны сродак афармлення пісьмовай мовы. *Пунктуацыяй* (ад лац. *punctum* — кропка) называюць сукупнасць знакаў прыпынку і правілы іх выкарыстання ў пісьмовай мове.

Ужыванне пунктуацыйных знакаў засноўваецца на двух прынцыпах: сэнсавым і граматычным (сінтаксічным). У залежнасці ад сэнсу, напрыклад, мы ставім у канцы сказа кропку, пытальнік ці клічнік: 1. *Раніца цёплая.* 2. *Раніца цёплая?* 3. *Раніца цёплая!* На сінтаксічным прынцыпе (у залежнасці ад будовы сказа) заснавана, напрыклад, пастаноўка працяжніка паміж дзейнікам і выказнікам, коскі ў складаным сказе і г. д.

Сэнсавая і граматычная асновы пунктуацыі часта сумяшчаюцца. Напрыклад, пастаноўка двукроп'я ў бяззлучнікавым сказе заснавана на сэнсавых узаемаадносінах паміж часткамі сказа і на яго будове.

У вуснай мове важным сродкам афармлення выказвання выступае інтанацыя (рытмамелодыка). Дзякуючы рытмамеладычнаму



Репозиторий БарГУ

малюнку вуснай мовы мы дакладна ўспрымаем сэнс выказвання і яго сінтаксічную структуру. Інтанацыя, суправаджаючы сэнсавае і сінтаксічнае чляненне мовы, служыць, такім чынам, дадатковым паказчыкам ужывання знакаў прыпынку.

Сістэма знакаў прыпынку, якія ўжываюцца ў сучаснай беларускай мове, складаецца з наступных графічных адзінак: кропкі [.], пытальніка [?], клічніка [!], шматкроп'я [...], коскі [,], кропкі з коскай [;], двукроп'я [:], працяжніка [—], дужак () і двукосся [«»]. Некаторыя з гэтых знакаў прыпынку спалучаюцца і ўтвараюць састаўныя знакі прыпынку, якімі з'яўляюцца коска з працяжнікам [,—], пытальнік з клічнікам [?!], пытальнік са шматкроп'ем [?...], клічнік са шматкроп'ем [!...], пытальнік і клічнік са шматкроп'ем [?!..].

Знакі прыпынку бываюць раздзяляльныя і выдзяляльныя.

Раздзяляльныя знакі прыпынку служаць для аддзялення самастойных сказаў у тэксце або асобных членаў простага сказа ці састаўных частак складанага сказа. У канцы самастойных сказаў ставяцца кропка, пытальнік, клічнік, шматкроп'е або розныя спалучэнні гэтых знакаў прыпынку: *Песнямі ўслаўлю сваімі наша жыццё маладое* (Я. Купала). *Хто не любіць адпачынку на зялёных лугах?* (М. Лынькоў). *Шчасце ідзе па маёй старане!* (Ц. Гартны).

Для раздзялення асобных членаў простага сказа і састаўных частак складанага сказа ўжываюцца коска, кропка з коскай, двукроп'е, працяжнік і коска з працяжнікам: *Над палямі, лугамі, садамі зноў у вырай ляцяць жураўлі* (П. Прыходзька). *Гартоўным народам подымем новыя дні; залатых ураджаяў зару збяруць у снапы маторы рукамі стальнымі; і вёснамі будзе цвісці маладымі, вясёлкамі песняў мая Беларусь* (М. Танк). *На ўсходзе заружавела зара: канчалася кароткая летняя ноч* (І. Шамякін).

Раздзяляльныя знакі прыпынку могуць быць адзіночныя і паўторныя. У якасці адзіночных ўжываюцца ўсе раздзяляльныя знакі, а ў ролі паўторных — толькі коска і кропка з коскай, якія звычайна аддзяляюць аднародныя члены простых сказаў і састаўныя часткі складаназлучаных ці бяззлучнікавых складаных сказаў.

Выдзяляльныя знакі прыпынку служаць для выдзялення са структуры сказа асобных яго частак (адасобленых членаў, параўнальных зваротаў, звароткаў, пабочных і ўстаўных канструкцый, простай мовы), якія маюць дадатковае значэнне ў раскрыцці агульнай думкі. Да гэтых знакаў прыпынку адносяцца коска, працяжнік,

Рэпазіторый БарДУ

коска з працяжнікам, дужкі і двукоссе, якія ўжываюцца ў парным выглядзе: *Засвяціў, як цудны сон, лён шаўковым валакном* (Я. Купала). *Прыгожы вы, калгасныя палі, сваім багаццем і сваёй красою* (П. Броўка). Калі выдзяляемыя члены знаходзяцца не ў сярэдзіне, а ў пачатку ці ў канцы сказа, то замест выдзяляльнага знака прыпынку (коскі, працяжніка ці коскі з працяжнікам) на стыку самастойных сказаў ставіцца раздзяляльны знак прыпынку, які патрабуецца зместам, граматычнай будовай і інтанацыйным афармленнем сказа: *Ноч. Цішыня. Нібы казачныя асілкі, стаяць магутныя дубы, аблітыя скупым святлом месяца* (В. Каваль). *У яе былі нейкія непрыемнасці — у каго іх няма!* (У. Шахавец). *Яна хвалюецца, — як і кожная маці* (В. Хомчанка). Дужкі і двукоссе заўсёды ўжываюцца ў парным выглядзе незалежна ад таго, дзе знаходзіцца канструкцыя, якую яны афармляюць*: Буслы над возерам замёрлі (нас ахапіла цішыня)* (П. Глебка).

Адзін і той жа знак прыпынку можа адначасова выконваць і раздзяляльную, і выдзяляльную функцыі. Так, у складаным сказе *Скажы мне, дарога, хто ездзіць табою* (Я. Колас) коска, якая стаіць пасля назоўніка *дарога*, аддзяляе адну састаўную частку ад другой і адначасова выдзяляе гэты назоўнік, таму што ён ужываецца ў ролі зваротка.

Знакі прыпынку ў сучаснай беларускай мове мнагазначныя. І таму натуральна, што дзесяці простых і пяці састаўных знакаў прыпынку зусім дастаткова для таго, каб дакладна перадаваць на пісьме сэнсавыя, граматычныя і інтанацыйныя асаблівасці любога тэксту [3].

## 1.2 Знакі прыпынку ў канцы сказа: кропка, пытальнік, клічнік, шматкроп'е

Правілы пастаноўкі **кропкі:**

1. Кропка ставіцца ў канцы закончанага апавядальнага сказа: *Вечар быў цёмны і ціхі. Позняя ноч. Цішыня.*

2. Калі ў канцы апавядальнага сказа ў дужках указваецца аўтар або даецца пашпартызацыя, то кропка ставіцца пасля дужак: *Жнеі спяваюць у полі, жыта густое жнучы* (М. Танк).

3. Пасля слоў і сказаў, якія з'яўляюцца загалоўкамі да тэкстаў, папер markdown рознага прызначэння, а таксама кніг, карцін, фільмаў і іншых



Рэпазіторый БарДУ

твораў, пасля надпісаў на шыльдах кропка не ставіцца. Калі ж загаловак, назва або надпіс складаюцца з двух або некалькіх сказаў, то кропка пасля апошняга сказа не ставіцца: *Рэстаран «Ружа». Сямейныя абеды*

4. Кропкай звычайна аддзяляецца «назоўны тэмы» — назва прадмета, асобы ці з'явы, пра якую будзе ісці гаворка ў наступным тэксце:

*Піхты. Вынослівыя, гонкія, стройныя. Яны, як громаадводы, тырчаць з тайгі. Без сукоў, адны голыя ствалы. Толькі на самай макавіне дзе-нідзе рэдзенькія кароценькія лапкі* (Я. Сіпакоў).

5. Кропка ставіцца ў канцы пабуджальных сказаў, калі просьба ці пажаданне выказаны спакойным тонам, без клічнай інтанацыі: *Ніколі не спыняйцеся на паўдарозе* (Я. Колас). *Не шуміце, вербы, ля майго акна* (П. Броўка).

6. Кропка ставіцца ў канцы складаных сказаў з ускосным пытаннем: *Пятро падышоў і спытаў у шафёра, ці можна пад'ехаць* (І. Шамякін).

7. Кропка ставіцца пасля сцвярджальных ці адмоўных слоў-сказаў *так, не* і іх сінонімаў (*ага, але, эге, ну, добра* і інш.) пры адсутнасці клічнай або пытальнай інтанацыі: *«У бібліятэку збіраецеся?» — «Так».*

8. Кропка ставіцца перад злучнікамі *і, ды, а, але, аднак* і інш., калі яны звязваюць паміж сабой самастойныя сказы: *Лабановіч борздзенька кінуўся да форткі. Але там было ўсё ціха* (Я. Колас).

9. Кропкай аддзяляюцца асобныя часткі выказвання пры парцэляцыі: *Людзі змагаюцца і перамагаюць. Вайну. Страх. Голад. Дэспатызм, тупасць...* (І. Шамякін).

10. Кропка ставіцца ў канцы рубрык пералічэння, калі гэтыя рубрыкі з'яўляюцца самастойнымі сказамі. Паслядоўнасць пунктаў пазначаецца лічбамі з кропкай:

*У пастанове былі запісаны тры пункты:*

*1. Арганізаваць саюз настаўнікаў на падставе пастановы сходу ад 9 ліпеня 1906 года.*

*2. Арганізаванаму настаўніцкаму саюзу далучыцца да Усерасійскага саюза настаўнікаў і ўвайсці з ім у цесныя зносіны.*

*3. Для вядзення спраў саюза выбіраецца бюро ў складзе 3-х асоб: Садовіча, Райскага і Тукалы* (Я. Колас).

11. Кропка ставіцца пасля ўмоўных графічных скарачэнняў (акрамя стандартных скарочаных абазначэнняў метрычных мер):

Рэпазіторый БарДУ

*г. Мінск; в. Лебядзінец; г. Капыль Мінскай вобл.;* **але:** *100 г, 5 см, 3 сек* і інш.

Калі ўмоўным графічным скарачэннем заканчваецца сказ, то ў канцы сказа другая кропка не ставіцца: *Існуюць індукцыйная электрычная зварка (токамі высокай частаты), зварка электронным промнем* і інш.

12. Кропкай аддзяляюцца назвы дзеючых асоб у драматургічных творах, калі гэтыя імёны запісваюцца ў адным радку з рэплікай:

Чарнавус. *Можа, я занадта рэзка выступіў. Трэба будзе пагаварыць з ім.*

Вера. *Я лічу, што вы вельмі добра выступілі, і няма чаго вам прабачэння прасіць* (К. Крапіва).

13. Кропка ставіцца ў спасылках (у тым ліку і падрадковых) пры ўказанні на крыніцу цытаты пасля прозвішча аўтара, калі ўслед за ім ідзе назва твора гэтага аўтара: *Было лета, самая зялёная пара яго* (І. Мележ).

Правілы пастаноўкі **пытальніка:**

1. Пытальнік ставіцца ў канцы простага сказа (у тым ліку слова-сказа), якім выражаецца прамое пытанне: *Дзе вы, песні жніўныя? Хто вас адвячоркамі панясе над ніваю?* (П. Броўка).

2. Пытальнік ставіцца ў канцы складаназалежнага сказа, калі пытанне выражана ў галоўнай і даданай частках або толькі ў галоўнай: *Хто згадае, чаго сэрца плача?* (П. Трус).

Пытальнік можа ставіцца ў канцы складаназалежнага сказа і тады, калі прамое пытанне заключаецца ў даданай частцы: *І скажы, дзядок, адкуль хмары гэтыя выходзяць?* (Я. Колас).

3. Пытальнік ставіцца ў канцы складаназлучанага і бяззлучнікавага складанага сказа, калі кожная яго частка або толькі апошняя частка выражае пытанне: *Паслухай добра: чуеш песні?* (Я. Колас).

4. У пытальных сказах з аднароднымі членамі сказа пытальнік можа ставіцца пасля кожнага аднароднага члена з мэтай раздзялення пытання: *Вольна ішлі яны [калгаснікі] пушчай, прыцішыўшы крокі... Стрэл адзінокі рэхам трывожна глухім дакаціўся да іх. Што гэта? Стрэл паляўнічы? Ці знак таямнічы?* (А. Куляшоў).

Правілы пастаноўкі **клічніка:**

1. Клічнік ставіцца ў канцы простага і складанага сказаў, якія вымаўляюцца з клічнай інтанацыяй: *Што за дзяўчына! Што за натура!* (Я. Колас). *«Рукі ўгору!» — грымнуў тут дзядзька Мірон...* (М. Лынькоў).



Репозиторий БарГУ

Калі часткі складанага сказа з’яўляюцца клічнымі, то яны раздзяляюцца коскай або іншым знакам прыпынку, а ў канцы сказа ставіцца клічнік: *Якія знаёмыя назвы і словы, якая цудоўная родная мова!* (П. Панчанка).

2. Клічнік ставіцца пасля звароткаў, якія стаяць у пачатку або ў канцы сказа, пасля выклічнікаў і гукаперайманняў, што стаяць у пачатку, у сярэдзіне ці ў канцы сказа, калі гэтыя словы вымаўляюцца з клічнай інтанацыяй: *Пілічык! Нясі з істопкі, што там ёсць у нас. Людзям час даўно снедаць* (М. Лынькоў). *Там рыба — ого-го!* (Я. Маўр).

3. Клічнік ставіцца ў канцы слоў і сказаў, якімі эмацыянальна перадаюцца прывітанні, развітанні, віншаванні, пажаданні, заклікі і інш.:

— *Дзень добры!*

— *Дзень добры! Сядай, чалавеча!* (А. Куляшоў).

*Добрай ночы! З Новым годам! З новым шчасцем! Здароўя вам і поспехаў!*

4. Клічнік можа ставіцца пасля «назоўнага тэмы» («назоўнага ўяўлення»): *Мурог! Ды што за травіца! І шоўк у ёй мяккі і лён, і вечная наша крыніца з гаючай жывіцай-вадзіцай ад бацькаўскіх, дзедаўскіх дзён!* (Я. Колас).

5. Клічнік можа ставіцца ў дужках для выражэння эмацыянальных адносін да зместу выказвання: *Прыйшоў адтуль [з рэдакцыі] ліст. А ў ім, як звычайна, пісалася: «...відаць, вы (!) упершыню ўзяліся за пяро...»* (В. Зуёнак).

Правілы пастаноўкі **шматкроп’я:**

1. Шматкроп’е ставіцца ў канцы апавядальнага сказа для абазначэння незакончанасці выказвання: *Няма Хатыні... Звоняць толькі званы* (Р. Мачульскі). *Беларусь, Беларусь, ні канца, ні краю...* (Я. Брыль).

2. Шматкроп’е ставіцца пасля апошняга слова пералічэння, калі яно абрываецца: *Ёсць кулямёты, ёсць аўтаматы. І шаблі, карабіны...* (Б. Сачанка).

3. Шматкроп’е ставіцца для абазначэння нечаканых перапынкаў, перарывістасці ў маўленні, што ўзнікаюць у выніку перажыванняў, хвалявання чалавека або пошуку спосабу выражэння думкі: *Я хацеў сказаць, што мы... сёння... не сустракаемся...* (І. Мележ).

4. Шматкроп’е ставіцца ў пачатку, у сярэдзіне, у канцы цытаты, каб паказаць, што ў гэтых месцах прапушчаны словы: *Кандрат*

Рэпазіторый БарДУ

*Крапіва, раскрываючы сутнасць сатырычных твораў, адзначае: «...рэзананс сатырычнага твора... залежыць ад значнасці аб'екта, на які гэты твор накіраваны».*

5. У лексікаграфічных працах пры пропуску часткі цытаты-ілюстрацыі звычайна ставяцца дзве кропкі:

***БАРВЕЦЬ**, - вее; незак.* Тое, што і *б а р в а в е ц ь (у 2 знач.). Грывы канчаліся трохі наводдаль, а за імі... барвелі ў густой зелені плямы ўжо чырвоных асінак. Караткевіч* (Тлумачальны слоўнік беларускай мовы).

6. Калі скарачаецца цытата, у канцы якой павінен стаяць пытальнік або клічнік, то гэтыя знакі ставяцца пасля дзвюх кропак: *Гэй! узвейце сваім крыллем, арляняты, буйна, бурна...!* (Я. Купала).

7. Шматкроп'е ставіцца ў дыялогу, каб перадаць маўчанне замест адказу на зварот суразмоўцы:

*— Дык што, пайшлі?— запыталася дзяўчынка.*

*— ...*

*— Ну, чаго ты маўчыш?*

8. Шматкроп'е ставіцца паміж абзацамі пры нечаканым пераходзе ад аднаго плана апавядання да другога: *Яна была яшчэ зусім маладая, але на твары яе ляжаў адбітак перажытага. Цесненькія маршчынкі сабраліся на яе лбе і каля рота, сінія кругі былі пад вачыма, твар увесь быў запэцканы зямлёй. Кароценькі рваны кажушок на ёй таксама быў у зямлі...*

*Часавы раздзеўся, набраў у кварту вады і стаў умывацца. За ім памыліся яшчэ два. Кабета падняла галаву і папрасіла дазвалення памыцца* (К. Чорны).

9. Шматкроп'е можа ставіцца пасля «назоўнага тэмы»: *Хатынь... Мала хто чуў, мусіць, гэтую назву да вайны. Мала хто ведаў і самую вёску, якая згубілася сярод лясоў і пагоркаў Лагойшчыны* [9, с. 68—77].

## 1.3 Знакі прыпынку паміж дзейнікам і выказнікам

**Працяжнік** ставіцца паміж дзейнікам і выказнікам:

– калі абодва галоўныя члены сказа выражаны назоўнікам у назоўным склоне і пры выказніку адсутнічае дзеяслоў-звязка:



Рэпазіторый БарГУ

*Мінск — сталіца, гордасць наша, слава ўсёй краіны* (Я. Купала). *Прастора і час — усеагульныя формы каардынацыі з'яў і падзей*;

– калі абодва галоўныя члены ці адзін з іх выражаны неазначальнай формай дзеяслова: *Вучыцца ў народа — задача кожнага пісьменніка* (К. Чорны). *Хату зрабіць — не скрынку збіць* (Прыказка);

– калі перад выказнікам ёсць словы *гэта, вось, значыць, гэта значыць, гэта ёсць*: *Кожны чалавек — гэта цэлы свет* (К. Чорны). *Ігнараваць мову — гэта значыць ігнараваць народ, нацыю* (П. Пестрак);

– калі дзейнік і выказнік выражаны лічэбнікамі або адзін з іх выражаны назоўнікам у назоўным склоне, а другі — лічэбнікам ці колькасна-іменным спалучэннем: *Пяць і тры — восем. Плошча басейна Нёмана — 98,2 тыс. км²*;

– калі выказнікам выступае ўсечаная форма дзеяслова, выклічнік або гукапераймальнае слова: *Уладзік зараз — шмыг у дзверы* (Я. Колас). *А куля — дзык! А другая ў руку* (П. Броўка).

Працяжнік паміж дзейнікам і выказнікам звычайна не ставіцца, калі:

– дзейнік выражаны асабовым займеннікам: *Я ўжо студэнт*;

– пры выказніку ўжыты параўнальныя словы *як, як быццам, нібы, што*: *Сінія вочкі што васілёчкі* (П. Броўка);

– паміж дзейнікам і выказнікам стаіць недапасаваны член сказа або часціца ці злучнік, пабочнае слова: *Косцік, відаць, добры хлопец* (М. Паслядовіч);

– перад выказнікам стаіць адмоўе *не*: *Воўк не пастух, а свіння не агародніца* (Прыказка);

– іменны выказнік стаіць перад дзейнікам: *Адвечнае дрэва дуб* (І. Шамякін).

**Пытанні для самападрыхтоўкі**

1. Якую ролю выконвае пунктуацыя пры афармленні пісьмовай мовы?
2. Якія прынцыпы ляжаць у аснове пунктуацыі?
3. На якія тыпы падзяляюцца знакі прыпынку паводле іх функцыі ў сказе?
4. Калі ставіцца на пісьме кропка?
5. Калі ўжываецца пытальнік?
6. Калі ставіцца шматкроп'е?

Рэпазіторый БарДУ

## Трэнінг уменняў

**Заданне 1.** Пастаўце патрэбныя знакі прыпынку ў канцы сказаў. Адказ матывуйце.

1. Над ціхай крыніцаю спеў салаўіны ўвечары сэрца маё закранае
2. Няхай растуць спакойна нашы дзеці, няхай рашаюць цяжкія задачы, няхай працуюць, думаюць і мараць пра новы дзень і пра наступны век
3. Што ж мне можа быць больш за Радзіму любімую міла
4. Пакіньце на беразе смутак і жаль, песню бярыце з сабою
5. Матчыны рукі ніколі не чуюць цяжару свайго дзіцяці
6. А як прыгожы пуцявінкі ў шайках зялёнае травінкі
7. Ад чыіх напаўняецца слёз Ніл шырокі, глыбокі вякамі
8. Ночка сядзе на сучча рабін, грукне ў вокны зялёнай рукой
9. — А хто там ідзе, а хто там ідзе ў агромністай такой грамадзе — Беларусы
10. Мір — гэта і праца, і шчасце, і радасць Усё найдаражэйшае, людскае заключана ў гэтым слове
11. Навошта сэрца я параніў чарнявым поглядам вачэй
12. Хай свята дружбы будзе вечным святам

**Заданне 2.** Прааналізуйце і адзначце тыя сказы, у якіх працяжнік пастаўлены правільна.

1. Траецкае прадмесце — адзін з гістарычных цэнтраў Мінска. 2. Мінск рзмешчаны на паўднёва-ўсходніх схілах Мінскага ўзвышша, плошча якога — сем з паловай тысяч квадратных кіламетраў. 3. Гэты хлопец — мой сябар. 4. Гэты падручнік — мой. 5. Хлопец адразу — шусь за дзверы. 6. У 2000 годзе тэрыторыя Мінска была — амаль дзве тысячы пяцьдзесят шэсць квадратных кіламетраў. 7. Тысяча шэсцьсот сёмы год — дата першага летапіснага сведчання пра сучасную сталіцу Беларусі. 8. Заслужыць павагу аднакласнікаў — справа складаная. 9. Восень — халодная, дажджлівая. 10. Адпачынак на канапе — не самы цікавы і карысны занятак. 11. Катацца на лыжах — адно задавальненне. 12. Поле — вокам не абняць. 13. Бацькі — не ворагі табе, дрэннага не параяць. 14. Тонкае пераплеценае голле — як павуцінне. 15. Мець свой дом — мара кожнага чалавека. 16. Ужо, відаць, пенсіянерка — наша першая настаўніца. 17. Бусел, як вядома, — адзін з сімвалаў Беларусі. 18. Вучыцца — твой галоўны клопат.

Репозиторий БарГУ

**Заданне 3.** Адзначце сказы, у якіх на месцы пропускаў абавязкова ставіцца працяжнік.

1. Светлая галава … гэты Юзік! 2. Я тут … белая варона. 3. Грошай у мяне … кот наплакаў. 4. Суседцы … да трох не гавары. 5. Тваёй дапамозе ломаны грош … цана. 6. Марцін … стрэляны верабей, яго на мякіне не правядзеш. 7. У Агаты … адны толькі вочы засталіся. 8. Ноч … хоць іголкі збірай. 9. Старасць … не радасць. 10. Жыццё … як на вулкане.

**Заданне 4.** Спішыце сказы, пастаўце, дзе трэба, працяжнік паміж дзейнікам і выказнікам. Растлумачце яго пастаноўку.

1. Усё ж ён не проста парастак, ён зерне волата. 2. Шчасце гэта не тое, чаго ты дасягнуў. Відаць, шчасце нельга ўзяць у рукі і разгледзець, бо шчасце гэта заўсёды лінія гарызонту: а на яе не наступіш нагою. 3. Мноства яго [клёна] лісцяў найпрыгажэйшы дыван, вытканы рукой дзівоснага мастака. 4. Радасцю засвяціліся вочы, яна зашаптала: «Твае кветкі першыя ў маім жыцці». 5. Вялікае шчасце жыць, таптаць басанож росныя травы, збіраць кветкі, слухаць шум бароў і птушыныя песні, радавацца сонцу, высокаму, чыстаму небу. 6. Восень гэта ростані на вечных дарогах старога і новага жыцця.

**Заданне 5.** Адзначце сказы з пунктуацыйнымі памылкамі (працяжнік паміж дзейнікам і выказнікам).

1. Біяграфія пісьменніка — гэта не толькі даты, якія адзначаюць пэўныя этапы яго жыцця. 2. Жыццё гэта мільёны сітуацый, мільёны характараў. 3. Нават скончыць гарадское вучылішча, на той час вельмі рэдкая для вёскі вышыня. 4. Жыццё для пісьменніка адзіная крыніца, адкуль ён чэрпае тэмы, ідэі, вобразы. 5. Галя — працавітая прыгожая фізічна і духоўна простая беларуская дзяўчына... 6. Гумно вялікае і дагледжанае, пры ім — два хлявы і старая хата. 7. Літаратура — гэта памяць народа, яго сумленне і справядлівасць. 8. Руневіч натура па-мастацку багатая і таленавітая. 9. Птушкі і гнёзды — гэта паэтычная метафара мае дачыненне перш за ўсё да галоўнага героя рамана Алеся Руневіча. 10. Сустрэча з сапраўднай паэзіяй — заўсёды свята для чытача.

Репозиторий БарГУ

**Заданне 6.** Колькі трэба паставіць працяжнікаў у прапанаваным урыўку?

### Белавежская пушча

Белавежская пушча адзін і самых старажытных лясных масіваў Еўропы. Размешчаны ён на паўднёвым захадзе Беларусі, уздоўж мяжы з Польшчай, на водападзеле басейнаў Заходняга Буга, Нёмана і Прыпяці, за шэсцьдзесят кіламетраў ад Брэста. У межах Беларусі плошча Белавежскай пушча амаль сто сорак пяць тысяч гектараў. Назву сваю пушча атрымала, магчыма, ад абарончай вежы (Белая Вежа ў Камянцы) са сценамі белага колеру, пабудаванай у трынаццатым стагоддзі. На працягу стагоддзяў пушча з'яўлялася месцам княжацкага і каралеўскага палявання. З сярэдзіны сямнаццатага стагоддзя Белавежская пушча адзінае месца ў Еўропе, дзе вадзіліся зубры. Пасля Першай сусветнай вайны зуброў у пушчы не засталося зусім. У тысяча дзевяцьсот дваццаць дзявятым тысяча дзевяцьсот трыццатым гадах у Германіі і Швецыі было закуплена сем зуброў для Белавежскай пушчы. У тысяча дзевяцьсот трыццаць дзявятым годзе пушча аб'яўлена запаведнікам, у тысяча дзевяцьсот пяцьдзесят сёмым годзе запаведна-паляўнічай гаспадаркай. Цяпер у пушчы звыш ста васьмідзесяці зуброў.

У тысяча дзевяцьсот дзевяноста першым годзе Белавежскай пушчы нададзены статус нацыянальнага парку (С. Адзінцоў, С. Сідор).

## Т Э М А 2
## ПУНКТУАЦЫЯ
## ПРЫ АДНАРОДНЫХ ЧЛЕНАХ СКАЗА

### 2.1 Знакі прыпынку пры аднародных членах сказа

А д н а р о д н ы я  ч л е н ы  с к а з а — гэта такія члены сказа, якія выконваюць аднолькавую сінтаксічную функцыю, адносяцца да аднаго члена сказа і характарызуюцца інтанацыяй аднароднасці: *Зноў над роднай зямлёй вее водарам* ***хмельным, вясновым*** (Б. Сачанка).

Коска паміж аднароднымі членамі сказа:

1. Коскай раздзяляюцца аднародныя члены сказа, якія не звязаны паміж сабой злучнікамі: *Згінулі сцюжы, марозы, мяцеліцы* (Я. Купала).



Репозиторий БарГУ

Не з’яўляюцца аднароднымі членамі і не аддзяляюцца адзін ад аднаго коскай два дзеясловы ў аднолькавай форме, якія стаяць побач, утвараючы ў сэнсавых адносінах адно цэлае тыпу: *Пайду вазьму. Пайсці даведацца. Вазьмі аднясі*.

2. Раздзяляюцца коскамі два або некалькі прыметнікаў-азначэнняў, якія адносяцца да аднаго і таго слова ў сказе і характарызуюць прадмет з аднаго боку, г. зн. называюць падобныя прыкметы аднаго прадмета: *Мяккія, ласкавыя гукі стройным сугалоссем паліліся па пакоі* (Я. Колас).

Раздзяляюцца коскамі азначэнні, якія абазначаюць адметныя адзнакі розных прадметаў: *Навучэнцы гімназій маюць магчымасць вывучаць нямецкую, французскую, іспанскую, англійскую літаратуры.*

Не раздзяляюцца коскамі неаднародныя прыметнікі-азначэнні: *Над далёкімі лясамі звісала тонкая блакітная смуга* (Я. Колас).

3. Коскай аддзяляюцца аднародныя члены сказа, якія звязваюцца паміж сабой злучнікамі *а, але, ды* (у значэнні «але»), *аднак, хоць, толькі* і інш.: *Паўлюк толькі зірнуў, але нічога не сказаў* (Я. Колас). *Дождж быў моцны, ды кароткі*.

4. Коскай аддзяляюцца аднародныя члены сказа, якія звязваюцца пры дапамозе парных злучнікаў *як ... так і*; *не толькі ... але (а) і*; *калі не ... то (дык)*; *хоць ... але (а)*; *хоць і не ... затое (аднак)*; *не то што ... але і* і інш.: *Пажар заўважылі як з баракаў, так і з пасёлка* (П. Пестрак).

5. Коскай аддзяляюцца адзін ад аднаго аднародныя члены сказа, якія звязваюцца пры дапамозе паўторных злучнікаў *і ... і*, *ды ... ды, то ... то, ні ... ні, не то ... не то, ці ... ці, ці то ... ці то, або (альбо) ... або (альбо)* і інш.: *Я рад і сонцу, і вясне, і дожджыку* (Я. Пушча). *Ні далеч, ні час не заслоняць мне родных бароў* (Я. Колас).

6. Калі паўторныя злучнікі *і ... і, ні ... ні, то ... то* звязваюць словы як аднародныя часткі ўстойлівых (фразеалагічных) выразаў, то ў іх перад гэтымі злучнікамі коска не ставіцца: *і днём і ноччу, і смех і грэх, і вашым і нашым, і ў хвост і ў грыву; ні бэ ні мэ, ні грозьбай ні просьбай, ні спору ні ўмалоту, ні дому ні лому; то скокам то бокам, то сюды то туды, то ўзад то ўперад, то тое то сёе* і інш.

7. Не аддзяляюцца коскай два аднародныя члены сказа, якія звязваюцца паўторнымі злучнікамі, калі яны паводле сэнсу і інтанацыі ўтвараюць адзінства: *Вітаю цябе я і соллю і хлебам!* (Я. Купала). *І дзень і два яны ў дарозе* (Я. Колас).

Репозиторий БарГУ

8. Коскай раздзяляюцца ўсе аднародныя члены сказа, калі папярэднія з іх звязаны паміж сабой без злучнікаў, а наступныя — пры дапамозе паўторнага злучніка *і*: *Дзень іграе на жалейцы, на трубе, і на ражку, і на сінім трыснягу* (М. Танк).

9. Калі паўторны злучнік *і* стаіць пасля першага аднароднага члена, перад злучнікам таксама ставіцца коска: *У песнях жа родны край, родныя словы жылі, і жывуць, і жыць будуць* (Я. Купала).

10. Коскай аддзяляюцца аднатыпныя пары аднародных членаў сказа, звязаных паміж сабой злучнікам *і*; **але** ў сярэдзіне пар коска не ставіцца: *Сосны і вязы, дубы і асіны вакол возера вартай пасталі* (Я. Купала).

11. Калі злучнік *і* звязвае больш як дзве пары аднародных членаў сказа, то перад ім ставіцца коска; **але** ў сярэдзіне пар, звязаных паміж сабой злучнікам *і*, коска не ставіцца: *Лясы ў нашай краіне можна сустрэць вялікія і малыя, і густыя і рэдкія, і хвойныя і змешаныя*.

12. Калі злучнік *і* звязвае неаднатыпныя пары аднародных членаў сказа, паміж імі коска не ставіцца: *Удзень і ўночы над палямі і лясамі чуліся выбухі снарадаў і аўтаматная страляніна* (І. Мележ) [9, с. 77—81].

## 2.2 Знакі прыпынку пры аднародных членах сказа з абагульняльнымі словамі

Пры аднародных членах сказа могуць ужывацца абагульняльныя словы — яны маюць больш шырокае значэнне і суадносяцца з аднароднымі членамі як родавае і відавое паняцці. Яны выконваюць у сказе тую ж сінтаксічную ролю, што і члены аднароднага рада, выражаюцца найчасцей займеннікамі *ўсё (гэта ўсё), усе, кожны, ніхто, нішто*, а таксама назоўнікамі, прыслоўямі, дзеясловамі, спалучэннямі слоў: *Ад снегу і ветру трасецца ўсё на свеце: вёска, ферма, платы і белы лог ля ракі* (І. Пташнікаў).

Калі абагульняльнае слова стаіць перад аднароднымі членамі сказа, то пасля яго ставіцца двукроп'е: *Усё рыхтуецца да сну: само сонца, і далёкі лес, і жыта за завулкам-пагонам, і луг, і рэчка, і людзі, і вецер* (М. Лупсякоў). Калі ж яно стаіць пасля аднародных членаў сказа — перад ім ставіцца працяжнік: *Сінява вады, свежы*



Рэпазіторый БарДУ

*вецер, своеасаблівыя пахі рыбы і перапрэлых водарасцяў — усё было прыгожае, незвычайнае* (П. Гамолка).

Калі сказ не канчаецца аднароднымі членамі, то пасля абагульняльнага слова перад аднароднымі членамі ставіцца двукроп'е, а пасля аднародных членаў — працяжнік: *Жывое асяроддзе: жывёлы, птушкі, расліны — акружаюць нас навокал* (В. Вольскі).

Калі пасля абагульняльнага слова стаяць словы *напрыклад, а іменна*, то перад імі ставіцца коска, пасля іх — двукроп'е: *На ўроках мовы праводзяцца розныя віды работ, напрыклад: дыктанты, сачыненні, ізлажэнні* (ТСБМ).

Калі пасля аднародных членаў перад абагульняльным словам стаіць пабочная канструкцыя (*адным словам, карацей кажучы* і інш.), то перад ёй ставіцца працяжнік, а пасля яе — коска: *Начны лес, ціхі, ледзь улоўны гул маразявых сосен, цішыня лясных нетраў — адным словам, усё аддавалася зямлі* (П. Галавач) [17].

## Гласарый

**Аднародныя члены сказа** — гэта такія члены сказа, якія выконваюць аднолькавую сінтаксічную функцыю, адносяцца да аднаго члена сказа і характарызуюцца інтанацыяй аднароднасці.

## Пытанні для самападрыхтоўкі

1. Калі азначэнні аднародныя? Якія знакі прыпынку ставяцца пры аднародных (дапасаваных і недапасаваных) азначэннях?
2. У якіх выпадках азначэнні неаднародныя?
3. У якім выпадку аднолькавыя члены сказа хоць і адносяцца да агульнага для іх слова, аднароднымі не з'яўляюцца?
4. Якая роля абагульняльных слоў пры аднародных членах?
5. Якія знакі прыпынку ўжываюцца пры аднародных членах з абагульняльнымі словамі?

# Трэнінг уменняў

**Заданне 1.** Вызначце нумары сказаў з аднароднымі: а) дзейнікамі; б) выказнікамі; в) дапаўненнямі; г) азначэннямі; д) акалічнасцямі.

1. Прыйшлі не толькі члены праўлення, але і многія калгаснікі. 2. Люблю я зіму з маразамі, завеі белыя ў палях, і снегу скрып пад



Репозиторий БарГУ

палазамі, і ціш зімовую ў лясах. 3. Пад нагамі ламаўся слабенькі лёд, хрумсцеў, разлятаўся, звінеў. 4. За курганком ляжала вялікая імшара з альховымі, лазовымі і малінавымі кустамі. 5. Вось так рака вякамі то ў дзікай ярасці, то ў ціхім сне плыве. 6. Па абодва бакі вуліцы стаяць частыя, зграбныя домікі з прыгожымі ганкамі. 7. Лагодна, супакойваюча шалясцяць лясныя дрэвы. 8. Вецер дрэвы калыша, кусты… 9. Усё навокал ажывае, дыхае, цягнецца ўгору. 10. У лесе растуць кедры і лістоўніцы, дубы і ліпы, бярозы і клёны… 11. Вецер птушкай біўся ў вокны, ныў, шумеў, стагнаў і апаўшым лісцем мокрым шыбы засыпаў. 12. Люблю я ўзгоркі, і насып-курган, і сіняй далечы празрысты туман. 13. Па наіўнай і смешнай звычцы мы сябе юнакамі лічым. 14. То тут, то там віднеліся паселішчы. 15. Хлопец сядзеў ціха, з апушчанай галавой.

**Заданне 2.** Вызначце нумары сказаў з двума радамі аднародных членаў.

1. Засмужцу прыходзілася не толькі ісці самому, але і цягнуць каня. 2. Дзень сонечны, цёплы, зусім вясновы. 3. Вецер дрэвы калыша, кусты, на паркан атрасае лісты. 4. Тут былі цішыня, спакой і бязлюднасць. 5. Боязь і радасць, трывога і лепшая надзея, няўпэўненасць і юнацкая задзірыстая рашучасць перамяжаліся ў дзіўнае і вельмі салодкае пачуццё. 6. Вецер звінеў галінамі абмёрзлага клёна, скуголіў і свістаў у шчылінах паркана, у дзіравай сцяне хлява. 7. Новыя прасторныя цэхі вабілі да сябе чысцінёй і парадкам. 8. Рэдка ды гулка скрыпелі вароты і асверы. 9. Вясёлы гоман, смех і песні абудзілі двор. 10. І вось па дрыгве і па верасу сінім без троп і без сцежак праходзіць вясна.

**Заданне 3.** Вызначце нумары сказаў, у якіх перад злучнікам *ды* трэба паставіць коску.

1. Хлопцы ўраз зарагаталі ды ўраз жа смех той абарвалі. 2. Антось зварочвае направа ды йдзе на станцыю рухава. 3. Лабановіч мусіў закрыць кнігу ды зноў стаў хадзіць па пакоіку і думаць. 4. Цячэ вада ў сіняе мора ды не выцякае. 5. Навальніца насоўвалася павольна ды настырна. 6. Млын вурчыць ды меле на муку зярно. 7. Свецяць зоры на радзіме ды не свецяць, гаснуць на



Репозиторий БарГУ

чужыне. 8. Няпраўдай свет пройдзеш ды назад не вернешся. 9. Равуць на парогах ды пеняцца хвалі. 10. Шапаціць мне штосьці жыта ды слоў не гамоніць.

**Заданне 4.** Вызначце нумары сказаў, у якіх паміж аднароднымі членамі, звязанымі злучнікам *і*, патрэбна паставіць: а) адну коску; б) дзве коскі; в) тры коскі; г) не патрэбны коскі.

1. Свабодны ад заняткаў час і Ігнась і Янка праводзілі ў клубе. 2. Прыгожыя былі тыя ночы — і цёплыя і светлыя і пахучыя і шчаслівыя… 3. І луг і поле і ўзгоркі — усё засыпана пухам. 4. Агееў падхапіў ватоўку і, дужа кульгаючы, пайшоў за таварышам. 5. І ні зімой і ні вясной упрочкі песня не бяжыць. 6. Праўда мовы — гэта і праўда вобраза і праўда душы і праўда атмасферы. 7. Проста над галавой трэснула, грукнула і з лёскатам, гулам разышлося вакол. 8. Адсюль добра відаць наваколле: і прасцягі лесу і шапкі чырвананіўскага ветрака і вёска Выгары і яе палеткі. 9. Гэта прасторная святліца з мноствам фікусаў і аганькоў і руж і пальмаў і была кватэрай Сашы. 10. Сакавік прыносіць светлыя надзеі і на вясну і на сонца, на зялёны шум.

**Заданне 5.** Вызначце нумары сказаў, у якіх пры абагульняльных словах трэба паставіць: а) двукроп'е; б) працяжнік; в) двукроп'е і працяжнік.

1. Ён адразу пазнаў па галасах людзей на вуліцы Іллюк, Костусь і Акімка. 2. Цяпер і жыта, і пшаніца, і бульба ўсё пойдзе ў рост. 3. Усё разам і хаты, і поле і дарога чарнела ад асенняй імглы і туману. 4. Будынак, парк і агароджа было ўсё слаўна і прыгожа. 5. Я не бачыў таго, што вандроўнікам бачыць належыць ні сланоў, ні жырафаў, ні караванаў. 6. Усё і маўклівыя, прыбраныя ўзгоркі, і пыл, што за цэлы дзень назбіраўся ў паветры, а цяпер асядаў на зямлю, і сырасць, што нацягнула ад прырэчнага алешніку, было ўжо вераснёвым, асеннім. 7. Усюды на вуліцах, у садах, парках і скверах не сціхаюць музыка, смех, гоман і песні. 8. Усё было ў гэтых песнях прастор бязберажных палёў, і шум крыніцы над гарою, і мілы шэлест каласоў. 9. Трава і дрэва, рыба і звер усё ёсць. 10. Кожны дзень вёска сустракала ўсход сонца шумам працы галасамі людзей, стукам конскіх капытоў ды калёс, скрыпам варот.

Рэпазіторый БарДУ

**Заданне 6.** Выпішыце нумары сказаў, у якіх пунктуацыю трэба дапоўніць коскамі. Вусна растлумачце пунктаграмы.

1. Няўвага да мінулага свайго народа, да яго гісторыі і культуры, і мовы бясследна не праходзіць. 2. Лета адыходзіла. І гэта адчувалася ўсюды: у лесе, у полі і на лузе. 3. Ужо адзін за адным пацягнуліся змрочныя восеньскія дні. 4. Зліліся рэкі ўсе ў адно разводдзе шумяць і іскрацца, пеняцца і гудуць. 5. Цёмная вераснёўская ноч нізка накінула на зямлю свой сінявата-чорны аксамітны полаг. 6. Пакланюся пушчам вячыстым і крыніцам, і мурагу. 7. Багдановіч меў усё, каб стаць вялікім: выключны паэтычны талент, вострае вока мастака і бездакорны густ крытыка. 8. Трамвай пабег насустрач Апейку лягчэй, хутчэй з грукатам і звонам. 9. Лес і рэчку, і клёкат бусловы і чалавечую ўсмешку ўраз можна знішчыць адным толькі словам. 10. Песня і казка ходзяць у пары і сеюць па свеце дзівы і чары.

## Прамежкавы тэставы кантроль

*Адзначце правільныя варыянты адказаў.*

1. *Сказы, у якіх дапушчаны пунктуацыйныя памылкі:*
   а) Вёска Перасады раскінулася на двух пагорках, як усё роўна на вялізным, двухгорбым вярблюдзе.
   б) Непрыкметная, ціхая вёсачка Бацькавічы заснавалася ў глыбіннай лясной старане.
   в) Чароўнымі, сардэчнымі песнямі спавіта наша звонкагалосая беларуская зямля.
   г) Чэрвеньскі рынак быў шумлівым, бойкім месцам.
   д) Адцвілі і пасівелі, завязаўшы дробныя яблычкі, ружавата-белыя, разложыстыя яблыні.

2. *Сказы з аднароднымі азначэннямі:*
   а) У бліжэйшы год вырас у Ляўках невялікі драўляны двухпавярховы дамок Янкі Купалы.
   б) Ні дырэктарава ці леснікова, ні прафесарава ці пастухова дзіця не ведае сёння сундучка дарожнага.
   в) Невысокую пасівелую жанчыну ў лёгкім асеннім паліто можна было бачыць у розных канцах Віцебска.



Рэпазіторый БарДУ

г) Крынічка бруіць сярод кустоў алешніку і вербалозу, круглая, з пясчаным дном, з чыстай, як сляза, вадою.
д) Рака шырокая, пакуль што чыстая.

3. *Сказы, у якіх на месцы пропуску трэба паставіць двукроп'е:*
а) Дзе яшчэ знойдзеш такую разнастайнасць з'яў прыроды … бары, лясы, пералескі, гаі, азёркі, рачулкі, крыніцы, узгоркі, палі, лугі, балацявіны...
б) Сталі гаварыць аб усім, што трaплялася на вочы … аб новых будоўлях, аб магазінах.
в) Напэўна, чалавек, які першы раз падняў галаву і ўбачыў начное неба ў зорах … якраз і стаў тым, з каго пачалося паэтычнае радаслоўе.
г) Па тым, як усе абыходзіліся з намі … і афіцыянты, і музыканты, і гіды, адчувалася, што мы госці тут прыемныя.
д) У Паўлышскай школе дзеці вучацца рабіць усё, што ўмеюць іх настаўнікі … ад цацкі да мадэлі токарнага варштата ці радыёпрыёмніка.

4. *Сказы з аднароднымі выказнікамі:*
а) Былі часы, калі слава пра багацце і магутнасць горада лунала-шырылася далёка ў свеце.
б) Алень быў зусім свойскі, ані не баяўся людзей.
в) Галасы чыстыя, маладыя, глыбокія.
г) Адразу за вёскаю цягнуўся і цягнуўся па абодва бакі дарогі на некалькі кіламетраў сад.
д) Мы пачалі рыхтавацца есці.

5. *Сказы з аднароднымі акалічнасцямі:*
а) І днямі і начамі ўсё стыла на роўнай шкляной халадэчы.
б) Шаша вяла ў Крашчанскія лясы, пад Камена, да былой пагранічнай заставы.
в) Восенню, зімою і ранняй вясною ў хваёвых барах, у ельніках, у старых алешніках і дубровах мы часта бачым адзінокіх стракатых дзятлаў.
г) І тут жа нейкая сіла пацягнула яго ўніз, а пасля ўверх.
д) У ім [Янку Брылю] таленавіта, шчасліва, зайздросна спалучаюцца актыўная, яркая чалавечая асоба і выдатны пісьменнік.



Репозиторий БарГУ

6. *У пералічанных сказах Анатоля Кудраўца знакі прыпынку пастаўлены правільна:*
   а) Тоўстыя чорныя з нізкімі навіслымі галінамі ліпы раслі ўсюды: і ў дварах, за высокім частаколам, і проста на вуліцы.
   б) Тоўстыя, чорныя, з нізкімі навіслымі галінамі ліпы раслі ўсюды: і ў дварах, за высокім частаколам, і проста на вуліцы.
   в) Тоўстыя чорныя, з нізкімі навіслымі галінамі ліпы раслі ўсюды: і ў дварах, за высокім частаколам, і проста на вуліцы.
   г) Тоўстыя, чорныя, з нізкімі навіслымі галінамі ліпы раслі ўсюды, і ў дварах, за высокім частаколам, і проста на вуліцы.
   д) Тоўстыя, чорныя, з нізкімі навіслымі галінамі, ліпы раслі ўсюды: і ў дварах за высокім частаколам і проста на вуліцы.

7. *Сказы з аднароднымі дзейнікамі:*
   а) Даволі доўгі час мне думалася, што Цішка Гартны і Змітрок Жылуновіч — два чалавекі.
   б) Дарогі, дарогі, дарогі...
   в) Удар, яшчэ ўдар.
   г) З маленькіх крынічак пачынаюцца Прыпяць і Ясельда, Сож і Бярэзіна.
   д) Хвалі, вялізныя, варухлівыя горы, рушаць адна за адной да берага.

8. *Сказы з некалькімі радамі аднародных членаў:*
   а) Утраіх паселі вакол кучы баравікоў і ў тры нажы пачалі харашыць іх, адрэзваць карэньчыкі ад шапак і ўкладваць шчыльней у свае кошыкі.
   б) Наперадзе цэлы суботні вечар, такой сенакоснай парой цёплы, цёмны, з трывожным шапаценнем лісця і мяккім сакатаннем, з напружаным чаканнем чагосьці вялікага і незвычайнага.
   в) Спявалі і гаманілі шпакі, берасцянкі, ластаўкі.
   г) Мы спыніліся на паляначцы, поўнай нейкага зацішнага, паэтычнага хараства.
   д) Тварыць, мысліць — гэта быў сродак перамагчы хваробу, самога сябе.

Репозиторий БарГУ

9. *Сказы, у якіх на месцы пропускаў трэба паставіць коскі:*

а) Рабінавыя гронкі правакуюць ніякім чынам іх не абмінуць, падскокнуць … ды ўхапіць хаця б адну — крамяную, тугую, сакаўную.

б) Нават пры слабым святле перонных ліхтароў было відаць, як пачырванелі Міхасёвы вушы — ні даць … ні ўзяць петушыныя грабяні.

в) Пах агню … і пах свежага хлеба, і пах антонавак — усё гэта ад зямлі.

г) Дождж то сціхаў … то зноў самотна шумеў у голлі.

д) На лясы ціха апускаўся ранні … зімовы змрок.

10. *Сказы, у якіх ставіцца коска на месцы кожнага пропуску.*

а) Неба несціхана слязілася … ці то драбнюткім дажджом, … ці то буйной вільгаццю.

б) У спакойнай вадзе адлюстроўваецца белае неба з нерухомымі воблачкамі … і стагі сена на паплавах … і зялёны нізкі бераг.

в) Моцныя парывы ветру зрывалі лісце з кустоў … то ярасна падкідваючы высока ў гору … то гонячы між сцвалоў па мокрай зямлі.

г) У спеве жупана можна пачуць … і стракатанне сарокі … і цвырканне вераб'я … і шчабятанне ластаўкі … і меладычны спеў івалгі … і хрыплае карканне вароны.

д) У хоры былі пяшчотныя тэнары … і аксамітныя барытоны … і разложыстыя, нібы ліпеньскі гром, басы.

# Т Э М А 3
# ПУНКТУАЦЫЯ ПРЫ АДАСОБЛЕНЫХ ЧЛЕНАХ СКАЗА

## 3.1 Знакі прыпынку пры адасобленых дапасаваных і недапасаваных азначэннях

А д а с а б л е н н е трэба разглядаць як спецыфічны сродак сінтаксічнай сувязі слоў у сказе, пры дапамозе якога падкрэсліваецца, выдзяляецца сэнсавая функцыя спалучэння слоў ці асобнага слова ў адносінах да іншых слоў сказа.



Рэпазіторый БарДУ

Адасабленне азначэнняў коскай (-амі) [4, с. 220]:

| Правіла | Прыклады |
|---|---|
| Дапасаваныя азначэнні, выражаныя адным або некалькімі прыметнікамі ці дзеепрыметнікамі, звычайна аддзяляюцца, калі стаяць пасля азначаемага слова і не маюць цеснай сувязі па сэнсу і інтанацыі з ім | *На дварэ імжыць дождж, холодны, восеньскі (К. Крапіва)* |
| Дапасаваныя азначэнні заўсёды адасабляюцца, калі стаяць перад азначаемым словам, якое выражана асабовым ці азначальным займеннікам | *Радасная здагадка азарае мяне, і, здзіўлены, я паволі ўстаю ў акопе (В. Быкаў). Задаволеныя, усе весела ўсміхаліся (І. Гурскі)* |
| Дапасаваныя азначэнні адасабляюцца, калі стаяць перад азначаемым словам, выражаным назоўнікам, толькі пры інтанацыйным і сэнсавым выдзяленні гэтых азначэнняў і набыцці імі дадатковага акалічнаснага значэння | *Пакрытыя тоўстым пластом снегу, галіны дрэў гнуліся да самай зямлі (Я. Колас)*; **але**: *Шчаслівыя дзеці ідуць па вуліцы (К. Крапіва)* |
| Дапасаваныя азначэнні, якія стаяць у сярэдзіне сказа і ўдакладняюць папярэдняе азначэнне, заўсёды адасабляюцца | *На тым, лугавым, беразе ракі гарэў вялікі касцёр (І. Шамякін)* |
| Недапасаваныя азначэнні, выражаныя назоўнікамі ва ўскосных склонах, адасабляюцца, калі адносяцца да асабовага займенніка | *У белай сукенцы, з белым капялюшыкам на галаве, яна мне адразу кінулася ў вочы (І. Навуменка)* |
| Недапасаваныя азначэнні, выражаныя назоўнікамі ва ўскосных склонах, адасабляюцца, калі адносяцца да ўласнага імені | *Іван Кузьміч, з неразлучнай люлькай у зубах, глядзіць на мяне (Я. Брыль)* |
| Недапасаваныя азначэнні адасабляюцца, калі знаходзяцца ў адным радзе з адасобленымі дапасаванымі азначэннямі | *З выгляду гэта быў падлетак, худы, даўгарукі, з тонкай шыяй (І. Мележ)* |

## 3.2 Знакі прыпынку пры адасобленых прыдатках [4, с. 221]

| Правіла | Прыклады |
|---|---|
| Адасабляюцца коскай (-амі) | |
| Выражаныя назоўнікамі ці назоўнікавымі словазлучэннямі, калі стаяць пасля азначаемага слова | *Ціха дрэвы штосьці гутораць, веку выхаванцы (Я. Колас)* |
| Выражаныя назоўнікамі, якія адносяцца да ўласнага назоўніка і стаяць пасля яго | *Прыход Зарубы, фельчара, памог падняцца Януку (М. Танк)* |
| Выражаныя назоўнікамі ці назоўнікавымі словазлучэннямі, якія адносяцца да асабовага займенніка | *Ёй было прыемна, што ён, такі сур'ёзны чалавек, заўважыў яе, зялёную настаўніцу, і пажадаў ёй поспехаў (У. Дамашэвіч)* |

Рэпазіторый БарДУ

*Окончание табл.*

| Правіла | Прыклады |
|---|---|
| Выражаныя субстантыўнымі прыметнікамі (ласкальнымі ці зневажальнымі) | *Гнаў гэту думку ад сябе Крушына, але, проклятая, вярталася ізноў (М. Зарэцкі)* |
| Выражаныя ўласным назоўнікам са словамі *па прозвішчы, па мянушцы* і інш., якія стаяць пасля азначаемага слова | *Пажылы мужчына, па прозвішчы Хмель, ехаў у млын (Я. Колас)* |
| Выражаныя ўласным назоўнікам толькі тады, калі ўдакладняе азначаемае слова і суправаджаецца выдзяляльнай інтанацыяй | *Мой лепшы таварыш, наводчык Пятроў, выдатна навёў кулямёт (Я. Брыль)* |
| Разам са злучнікамі *ці, як, або, гэта значыць*, якімі звязваюцца з азначаемым словам | *У беларускіх лясах гняздзіцца жаўна, або чорны дзяцел (В. Вольскі)* |
| Адасабляюцца працяжнікам (-і) | |
| Заўсёды, калі ў сказе ўскладненай будовы ёсць свае знакі прыпынку | *Якраз год таму, летась, па прасохлых сцежках, напрамік цераз поле, прыйшоў быў з суседняй вёскі — Цёмнага бору — шчуплы і худы чалавек — Сцяпан Юрчык (К. Чорны)* |
| Можа, калі яны маюць паясняльны характар і перад ім можна ўставіць словы *а іменна, гэта значыць* | *З ініцыятывы і фундацыі Ефрасінні была пабудавана царква Спаса — унікальны помнік мураванага дойлідства Беларусі* |
| Калі да аднаго назоўніка адносяцца некалькі прыдаткаў, яны выдзяляюцца працяжнікамі (другі можа быць апушчаны, заменены коскай), а паміж імі, як аднароднымі членамі сказа, ставіцца коска | *Шырокі — тутэйшы настаўнік, загадчык двухкласнае школы, (—) быў шырокім не толькі па прозвішчы, але і па сваей фігуры, і па сваёй натуры, і нават па размаху гульні ў карты (Я. Колас)* |

## 3.3 Знакі прыпынку пры адасобленых акалічнасцях [4, с. 222-223]

| Правіла | Прыклады |
|---|---|
| Выражана дзеепрыслоўем | |
| Звычайна аддзяляюцца коскай, калі стаяць пасля паясняемага выказніка, калі не страчваюць значэнне дадатковага дзеяння | *Па-над прасторамі ракі гудуць, прачнуўшыся, гудкі (М. Танк)* |
| Звычайна аддзяляюцца коскай, калі стаяць перад паясняемым выказнікам, калі не страчваюць значэнне дадатковага дзеяння | *Лежачы, разважаў аб падзеях гэтай ночы і аб выніках гэтых падзей (Я. Колас)* |
| Якія стаяць пасля злучальнага ці падпарадкавальнага злучніка або злучальнага слова, выдзяляюцца коскамі, не ўключаючы злучнік | *Хлопец ідзе і, усміхаючыся, гучна вітаецца* |

Рэпазіторый БарГУ

*Окончание табл.*

| Правіла | Прыклады |
|---|---|
| Выражана дзеепрыслоўным зваротам | |
| Адасабляюцца заўсёды, незалежна ад іх месца ў сказе | *Спявала, дажынаючы збажыну, і Ганна, якой час ад часу памагала, падгалошвала мачыха* (*І. Мележ*) |
| Адасабляюцца разам з часціцамі *нават, амаль*, якія стаяць перад імі | *Ён быў радасны, нават не думаючы чаму* |
| Могуць адасабляцца працяжнікамі, калі сэнсава-інтанацыйна выдзяляюцца | *Не даўшы слова — крапіся, а даўшы — дзяржыся* (*Прыказка*) |
| Не адасабляюцца, якія з'яўляюцца аднароднымі членамі сказа да неадасобленых акалічнасцяў-прыслоўяў і злучаны з імі спалучальнымі злучнікамі | *Крушынскі гаварыў ціха і не пазіраючы на госця* (*З. Бядуля*) |
| Не адасабляюцца, якія маюць цэласны, непадзельны сэнс і, як правіла, з'яўляюцца фразеалагізмамі | *Я так вывучыў гэту сцежку, што мог ісці па ёй заплюшчыўшы вочы* (*Б. Сачанка*) |
| Выражана назоўнікам з прыназоўнікам | |
| Адасабляюцца акалічнасці ўступкі, якія выражаны назоўнікам з прыназоўнікавым спалучэннем *нягледзячы на*, *дзякуючы* і стаяць перад паясняемым выказнікам | *Нягледзячы на даволі багатую літаратуру пра Ф. Скарыну, абставіны яго жыцця ўвогуле малавядомы* |
| Могуць адасабляцца, калі ў іх складзе вытворныя прыназоўнікі або прыназоўнікавыя спалучэнні *ў сувязі з, згодна з, з прычыны, у адпаведнасці з* і інш. | *З прычыны слабога здароўя, ён увесь час сядзеў дома* (*М. Зарэцкі*). *Насуперак жаданню, Лабановіч доўга не мог заснуць* (*Я. Колас*) |

## 3.4 Знакі прыпынку пры адасобленых дапаўненнях і ўдакладняючых членах сказа

Адасабляюцца дапаўненні, выражаныя назоўнікамі з прыназоўнікамі *акрамя, апрача, замест, за выключэннем, уключаючы* і пад. Дапаўненні ў такім выпадку абазначаюць прадметы і з'явы, якія ўключаюцца ў шэраг іншых прадметаў ці з'яў, выключаюцца іншымі прадметамі ці з'явамі, замяшчаюцца іншымі прадметамі ці з'явамі: *Бацька яго загінуў на фронце, а ў маці, акрамя Андрэя, было яшчэ двое малодшых дзяцей — Барыс і Наста* (А. Чарнышэвіч); *Усе вяскоўцы, за выключэннем дзяцей, сабраліся ўвечары на сход* (М. Лынькоў); *Апроч чалавека, ім [бярозавікам] ласуюцца і некаторыя лясныя жыхары: дзятлы, берасцянкі, дразды* (Р. Ігнаценка).

Рэпазіторый БарДУ

Калі прыназоўнік *замест* мае значэнне *за*, зварот з ім з'яўляецца састаўным іменным выказнікам і не адасабляецца: *Міхасёк у лесе быў для нас замест праваднiка* (г. зн. быў праваднікам).

Адасабленне ўдакладняльных членаў сказа [4, с. 223]:

| Правіла | Прыклады |
|---|---|
| Удакладняльныя дзейнікі выдзяляюцца | |
| 1. Коскай | *Яна вечна чым-небудзь занята, гэтая Ульяна (Я. Сіпакоў)* |
| 2. Працяжнікам | *Пасля яны пачалі шаптацца між сабою — Света і Жэнька (І. Пташнікаў)* |
| Удакладняльныя выказнікі выдзяляюцца | |
| 1. Працяжнікам | *Сырая зямля дыміцца лёгкаю параю — падсыхае (А. Якімовіч)* |
| 2. Двукроп'ем | *Удзень Васіль найбольш быў у гумне: малаціў (І. Мележ)* |
| Удакладняльныя дапаўненні выдзяляюцца | |
| 1. Коскамі | *Іх, Максіма і Машу, за гэты час я сустракаў не часта, нават вельмі мала (Я. Брыль)* |
| 2. Працяжнікамі | *Але ў каго іх няма — недахопаў, чалавечых слабасцей! (І. Шамякін)* |
| Удакладняльныя азначэнні выдзяляюцца | |
| 1. Коскамі | *На ўскраіне лесу тут часта сустракаюцца невялікія, з вераб'я, зеленавата-жоўтыя птушкі (В. Вольскі)* |
| 2. Працяжнікамі (як правіла, разгорнутыя азначальныя словазлучэнні або некалькі аднародных азначэнняў з коскай паміж імі) | *У поўнай форме — зашпілены на ўсе гузікі, абуты — набліжаўся ён да вёскі... (І. Шамякін)* |
| Удакладняльныя акалічнасці выдзяляюцца | |
| 1. Коскай (як правіла, акалічнасці месца, часу, меры і ступені, спосабу дзеяння, якія выражаны словазлучэннямі або асобнымі прыслоўямі і размешчаны пасля другіх акалічнасцей у сказе, пры іх інтанацыйным і сэнсавым выдзяленні) | *Дзесьці там, далёка на тым беразе, мусіць, на старой сівой званіцы, прагудзеў мілагучны звон (М. Лынькоў)* |
| 2. Працяжнікамі (калі ўдакладненне падкрэслена з асаблівай сілай ці калі дзве і больш удакладняючыя акалічнасці спалучаны злучнікам *і, ці*) | *Унізе — у кустах — пра нешта журчаць пераліва рэчкі (І. Навуменка). Заўжды — ці працую, ці пільна на варце стаю — я твой велічны вобраз у думках сваіх уяўляю і люблю, як жыццё, зямлю маладую тваю! (П. Панчанка)* |

Рэпазіторый БарДУ

## Гласарый

**Адасабленне** — спецыфічны сродак сінтаксічнай сувязі слоў у сказе, пры дапамозе якога падкрэсліваецца, выдзяляецца сэнсавая функцыя спалучэння слоў ці асобнага слова ў адносінах да іншых слоў сказа.

## Пытанні для самападрыхтоўкі

1. Якія члены сказа могуць адасабляцца?
2. Пералічыце выпадкі адасаблення дапасаваных азначэнняў.
3. Пры якой умове адасабляецца прыдатак? Якія знакі прыпынку ставяцца пры ім?
4. Пры якой умове адасабляюцца акалічнасці?
5. Пералічыце выпадкі адасаблення ўдакладняльных членаў сказа.

# Трэнінг уменняў

**Заданне 1.** Назавіце нумары сказаў, у якіх набраныя курсівам словы трэба выдзеліць коскамі.

1. *Захоплены незвычайным відовішчам* я забыўся, дзеля чаго сюды прыехаў. 2. Выступалі цёмна-сінія сцены высокіх лясоў *прыгожа раскіданых па бясконцых прасторах зямлі*. 3. На ўзлеску *памытая дажджом* рабіна ярка зіхаціць буйнымі чырвонымі гронкамі. 4. Ужо выбіваўся і леташні чарнічнік *свежы і сакавіты*. 5. Дзівосна сінела над горадам *светлае, чыстае, з рэдкімі аблокамі* неба. 6. Прывычка *гаварыць самому сабе* бывае ў адзінокіх людзей. 7. *Патрывожаныя новымі парасткамі* падаюць на дол сухія сасновыя шыпулькі. 8. Нямала валялася жалудоў на дарозе. Яны падалі і цяпер *мокрыя, не абсохлыя ад расы*. 9. Пасярод палянкі стаяў *сукаваты, з шырокаю кронаю* дуб. 10. *Самотны* блукаў я ў зацішках саду. 11. Невысокага росту егер *хударлявы, сутулы, з кароткімі рыжымі вусамі і рэдкай бародкай* быў падобны на сапраўднага лесавічка. 12. З-пад бryля выбіваўся *шэры, даўно не стрыжаны* чуб. 13. *Шырокі, прасторны* шлях працягнуўся на некалькі кіламетраў. 14. Сосны *дужыя* засланілі неба. 15. *Захутаны ў дзве коўдры* на ложку ляжаў хлопчык.

Репозиторий БарГУ

**Заданне 2.** Назавіце нумары сказаў, у якіх правільна адасоблены азначэнні.

1. У велічным маўчанні стаяць, пакрытыя інеем, бары і дубровы. 2. Па абодва бакі дарогі ляжалі сажалкі, акаймаваныя густымі кустамі светлалістага лазняку. 3. З галінак тут і там звісаюць гнёзды. Нявідныя ўлетку, цяпер яны агаліліся. 4. Нарэшце была з'едзена салдацкая каша прасяная, на сале. 5. Усю ноч цадзіў па шыбах калючы, востры дождж. 6. Пабітыя дажджом і раннімі прымаразкамі, у палісадніках пазвешвалі галовы вяргіні. 7. Вечар быў, цёплы і ціхі. 8. Доўгі брод, зацягнуты зялёнаю раскаю выглядаў сіратліва. 9. Цудоўны ў гэтую пару лес! Поўны пахаў, шумаў і песень, ён жыве сваім таямнічым жыццём. 10. Узрадаваны, я паскорыў крок і пачаў шукаць дарогу. 11. Упоперак ляжала, даўно зламаная навальніцаю, тоўстая вольха. 12. Абсыпаныя халодным срэбрам інею, заблішчалі ў сонечных промнях дрэвы. 13. На акаймаванай маладым бярэзнікам паляне, такавала каля дзясятка цецерукоў. 14. Званочкі ландыша цягнуцца да сонца, сумна праводзяць яго, недаступнае. 15. Смаліць сонца, соладка пахне маліннікам і, настоенай на леташнім лісці, вадой азярынкі.

**Заданне 3.** Назавіце нумары сказаў, у якіх правільна адасоблены прыдаткі.

1. Яшчэ ўчора ўцекачы, яны сёння сталі выгнаннікамі. 2. Карэнны вясковы жыхар, Пётр Ільіч не мог прывыкнуць да гарадской мітусні. 3. Вядомы ў акрузе майстар па рамонту збруі, Мікалай Буткавец суткамі не разгінаецца над хамутамі. 4. Творчасць Янкі Брыля, аднаго з выдатных майстроў беларускай прозы, уяўляе вялікую цікавасць як для даследчыка-літаратуразнаўца, так і для крытыка. 5. Аквілегіі, або ворлікі, пашыраны пераважна ва ўмераных абласцях Еўропы, Азіі і Паўночнай Амерыкі. 6. Вадзянік — злы дух, увасабленне вады, як небяспечнай для чалавека стыхіі. 7. Як крыніца многіх багаццяў, лес вякамі карміў і саграваў наш народ, а ў цяжкі час служыў яму надзейным абаронцам. 8. Дзверы ў народных павер'ях асэнсоўваліся, як увасабленне граніцы, мяжы. 9. Аднарог, або нарвал, належыць да атрада кітападобных. 10. Як гаспадар, Мікалай увесь вечар весяліў гасцей.

Репозиторий БарГУ

**Заданне 4.** Параўнайце наступныя сказы, змешчаныя парамі, і растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў іх.

1. Каровы скубуць акрашаную буйной расою траву. Пахла зямля, багата акропленая расою. 2. На вуліцы каля плота ляжалі нядаўна прывезеныя бярвенні. Мая мама на заводзе, ля чыгуннага станка. 3. Тарас прыехаў на поле па снапы. Каля клуба, на пляцоўцы, моладзь гуляла ў мяч. 4. Недзе высока над галавою каркалі вароны. На полі, недалёка ад вёскі, працавалі людзі. 5. Пад паветкаю насупраць хатніх акон ляжаў лом. На двары, насупраць акна, месціцца старая стопка.

**Заданне 5.** Спішыце. Знайдзіце адасобленыя члены сказа і пастаўце патрэбныя знакі прыпынку. Укажыце магчымыя варыянты адасаблення.

1. Пачынаў ісці дождж дробны і нясмелы. 2. Яны не змаўляючыся пабеглі на голас. 3. Ён прыцішыў хаду ўзрушаны шчаслівы і глядзеў на мнагалюдную вуліцу. 4. З усходу дзьмуў халодны вецер і развяваў па пустых і шырокіх палях нудную мелодыю зыкаў бурнай ночы. 5. Па-над зямлёй успыхнулі сцягі авеяныя славаю нязгаснай. 6. Спыніўся Віхор ля варот новай асветленай электрычнымі лямпачкамі канюшні. 7. Дзядзька Юстын у палінялай ад сонца ваеннай гімнасцёрцы ў ботах у чорнай картовай шапцы варухнуў плячом. 8. Плывуць на небе хмаркі белыя кучаравыя. 9. Забалочаная паляна акружаная з усіх бакоў цёмнай сцяною лесу млела ад гарачыні.

## Кантрольны дыктант

### Інтэр’ер хаты

Цяпер — у хату. Выгляд яе для кожнай мясцовасці быў розны. У даўніну бывалі хаты з комінам, плеценым і абмазаным глінаю конусам, пад якім на жароўні ці ў свечніку гарэла лучына, а дым ішоў комінам праз столь і страху, а цяпер комінам завецца пячны дымаход. Бывалі хаты з вялізным, таксама абмазаным, каўпаком ля ачага, дзе ў зімнія ночы было цяплей і збіралася прасці і майстраваць уся сям’я. Ды і ў розных мясцовасцях хаты былі розныя: на два



Репозиторий БарГУ

пакоі — трысцен і ўласна хата, на два пакоі з прыбудовамі і іншыя. Але найбольш тыповы выгляд быў такі. З трысцена, дзе елі летам і, хто хацеў, спалі зімой, і куды ўзімку бралі маладняк быдла, быў уваход у хату. Ля ўваходу, справа, мыцельнік, месца для мыцця посуду і кухонных рэчаў. Пасля печ. За печчу, па правай сцяне пол. Пад полам складалі розныя рэчы. Але ўжо тады замест пола часта стаялі шырокія ложкі, а адзін з завесаю, для гаспадара. Уздоўж астатніх дзвюх сцен ішлі шырокія лавы, часам з тканымі налаўнікамі. На іх сядзелі і ноччу маглі спаць, асабліва калі бывалі госці.

Перад лаўкамі — стол. Заўсёды дужа белы, бо яго часта скрэблі нажом. Стол і лаўкі часцей за ўсё былі з тоўстых лубовых дошак. Ля той сценкі, дзе былі дзверы, стаялі куфры, а ўзімку — гаспадыніны кросны.

Сярод мэблі, апрача лаў, палічак, кутняга стала, шырока ўжываліся ўслоны, зэдлікі, архаічныя табурэты ў форме куба, дзіцячыя стойкі, хадуны, уласцівыя той ці іншай мясцовасці формы калысак.

З упрыгожанняў былі абразы на покуце, тканыя посцілкі ў шашачку, у шэсць, дванаццаць і дваццаць чатыры ніткі, чынаватыя і іншыя і, вядома ж, мноства ручнікоў. Ручнікі былі раней вакол абразоў і акон, а цяпер каля карцін і партрэтаў, ручнікі на сценах, ручнікі ў мыцельніку. Ручнікі ў нас на Беларусі таксама розныя, у залежнасці ад мясцовасці, і дужа разнастайныя (Паводле У. Караткевіча). (202 словы).

## Т Э М А 4
## ПУНКТУАЦЫЯ ПРЫ ПАРАЎНАЛЬНЫХ ЗВАРОТАХ І ЗВАРОТКАХ

# 4.1 Знакі прыпынку пры параўнальных зваротах

П а р а ў н а л ь н ы м і з в а р о т а м і называюцца словы і словазлучэнні, якія шляхам параўнання раскрываюць і ўдакладняюць змест усяго выказвання або пэўнага члена сказа: *Высцілаецца роўны прастор, быццам стэп неаглядны, навокал* (П. Глебка).

Параўнальныя звароты даюць магчымасць ярчэй і наглядней ахарактарызаваць прадмет (дзеянне) ці яго прымету шляхам супастаўлення, параўнання іх з больш тыповым носьбітам той ці іншай якасці, уласцівасці, з больш тыповай прыметай.



Репозиторий БарГУ

Коска пры параўнальных зваротах:

1. Параўнальныя звароты, якія пачынаюцца злучнікамі *як, бы, як бы, нібы, нібыта, быццам, як быццам, што, як і, чым,* выдзяляюцца коскамі: *Поле, нібыта падковай, акружана лесам* (І. Навуменка). *Зоры высыпаюць, бы іней...* (Я. Колас).

2. Выдзяляюцца коскамі спалучэнні слоў *як адзін, як правіла, як звычайна, як знарок, як цяпер, як заўсёды* і інш.: *Мы па сігналу ваеннай трывогі ўсе, як адзін, уставалі на бой* (П. Глебка). *Каля магазіна, як заўсёды, збіраюцца вяскоўцы*.

3. Пры параўнальных зваротах са злучнікамі *як, як быццам, чым* і іншых у шэрагу выпадкаў коска не ставіцца.

Коска не ставіцца перад злучнікамі *як* і *чым* у спалучэннях *больш як* (*не больш як*), *больш чым* (*не больш чым*), *менш як* (*не менш як*), *менш чым* (*не менш чым*), *не бліжэй як*, *не далей як*, *не часцей як*, *не радзей як, не іначай як, усё роўна як* і інш., якія выражаюць абмежаванне ў прасторы, часе, колькасці: *Абоз расцягнуўся больш як на вярсту* (Я. Колас).

У такіх спалучэннях коска перад *як* і *чым* ставіцца тады, калі яны сэнсава і інтанацыйна выдзяляюцца: *Лес патрэбен людзям не меней, чым хлеб* (І. Навуменка). *Людзей у лесе было больш, як грыбоў* (Я. Колас).

4. Не выдзяляюцца коскамі:

– устойлівыя выразы са злучнікам *як*: *як мага, як след, як мае быць, як належыць, як не ў сябе* і інш.: *Трэба як належыць рыхтавацца ў дарогу*.
– устойлівыя параўнанні з *як*: *відна як днём, гол як сакол, растаў як снег, лопнуў як мыльны пузыр, прыстаў як смала, стаіць як укопаны, расце як на дражджах, адчуваць сябе як дома, усе як на падбор, як на іголках* і інш.

5. Не выдзяляюцца коскамі параўнальныя звароты, якія з’яўляюцца іменнай часткай выказніка: *Яны для мяне як бацькі* (В. Быкаў). *Ты як песня тая* (Я. Пушча).

6. Коска не ставіцца перад параўнальным зваротам, калі перад ім ёсць часціца *не* або прыслоўі *зусім, амаль*: *Міхась трымаўся не як сталы чалавек* (Я. Колас). *Яны адчувалі сябе амаль як дарослыя людзі* (Я. Колас).

7. Не выдзяляюцца коскамі звароты з *як*, калі яны ўжываюцца са значэннем «*у якасці*» або са значэннем тоеснасці: *Чмаруцьку ведаюць усе як чалавека з фантазіяй* (М. Лынькоў). *Гэта кніга выдадзена як дапаможнік для студэнтаў* [9, с. 83—85].

Рэпазіторый БарДУ

## 4.2 Знакі прыпынку пры зваротках

З в а р о т а к — гэта слова або спалучэнне слоў, што служаць для абазначэння асоб ці прадметаў, якім адрасуецца паведамленне.

Коска пры зваротку:

1. Коскамі выдзяляюцца звароткі ў пачатку, у сярэдзіне і ў канцы сказа разам са словамі, якія адносяцца да іх: *Сонца, умыйся расою на світальнай зары* (А. Бялевіч). *Відаць, па сур'ёзных справах да нас, Надзя?* (М. Лынькоў).

2. Калі зваротак раздзяляецца на часткі іншымі словамі, то кожная з іх выдзяляецца коскамі: *Ой ты, мая рыбка, спі, залатая!*

3. Калі паміж зваротками-паўторамі ёсць займеннік *ты* або *вы*, то ён адносіцца да першага зваротка і коска ставіцца пасля займенніка: *Лета ты, лета прыгожа-квяцістае, колькі ты ўносіш аздобы з сабой!* (Я. Купала) [9, с. 103-104].

### Гласарый

**Параўнальнымі зваротамі** называюцца словы і словазлучэнні, якія шляхам параўнання раскрываюць і ўдакладняюць змест усяго выказвання або пэўнага члена сказа.

**Зваротак** — гэта слова або спалучэнне слоў, што служаць для абазначэння асоб ці прадметаў, якім адрасуецца паведамленне.

### Пытанні для самападрыхтоўкі

1. Якую сінтаксічную канструкцыю называюць параўнальным зваротам?
2. Што называецца звароткам? Якая яго роля ў сказе?
3. Адзначце выпадкі пастаноўкі коскі пры параўнальных зваротах.
4. Якімі знакамі прыпынку выдзяляюцца (аддзяляюцца) звароткі?

## Трэнінг уменняў

**Заданне 1.** Адзначце сказы, у якіх на месцы пропускаў трэба паставіць коскі.

1. Малінаўкі раз-пораз нахіляюць галоўкі … нібыта кланяюцца грыбніку. 2. Лісце алешніку прывялае … быццам прыпаленае.



Репозиторий БарГУ

3. Снегіры … нібыта дэманструюць … прыгажосць свайго ўбрання. 4. У летнюю пару бываюць часіны, калі дзятлы становяцца такімі ж лаўцамі насякомых … як і іншыя птушкі. 5. Мясцінка … як мясцінка. 6. Хлопцаў … як ветрам … здзьмула. 7. Мурашкам хадзіць па густым імху … што чалавеку прабірацца праз непраходныя джунглі. 8. На мурашыных дарогах … як на людных магістралях … ажыўлены рух. 9. Пад папараццю … як і ў яловым лесе … змрочна нават у сонечны дзень. 10. На стрэхах па-над вокнамі … як гірлянды … звісалі доўгія ледзяшы.

**Заданне 2.** Адзначце сказы, у якіх на месцы пропускаў коскі не ставяцца.

1. Я куляю даляцеў да дуба і … як тая рысь … хутка і спрытна ўзлез на дрэва. 2. Часам сярод лесу трапляюцца лапікі дробненькага … нібы прасеянага праз сіта … сівавата-белага пяску. 3. Гэта самыя вялікія дразды нашага лесу — шэра-карычневыя … як кара хваёвых камлёў … дразда-дзярабы. 4. Дрэвы … быццам апранулі … белыя махнатыя кажухі. 5. Суніцы тут радзілі добра, толькі выспявалі на тыдзень-два пазней і былі не такія салодкія … як на сонечных угрэвах, затое буйныя. 6. Лісіца ляжала … нібы мёртвая. 7. Вышыня … як быццам надае жаўруку энергію і сілу — так звонка гучыць яго вясновая песня. 8. Зімою, у моцныя маразы, у гэтых нетрывалых пнях часта адлежваецца вавёрка, бо спарахнелая драўніна … як кажух … захоўвае цяпло. 9. Пад кустом … нібы пад невялікім шатром … заўсёды цень. 10. Мядзведзю трэба было ад’есціся, назапасіць пад скураю … як ага … болей тлушчу.

**Заданне 3.** Прачытайце сказы, захоўваючы патрэбную інтанацыю. Растлумачце ўжыванне знакаў прыпынку пры зваротках.

1. Мы шчасце збудавалі, цвіці, мой родны край! 2. Радзіма, голас твой мяне спяваць вучыў, і ты мне аддала ад родных слоў ключы. 3. Краіна мая! Ты прайшла праз агонь, праз буры, руіны... 4. Разгарні ты, люд рабочы, сілу, волю ва ўсю шыр. 5. Ой, лясы-бары ды лугі-разлогі! Цераз вас ідуць пуцінкі-дарогі. 6. Эх ты, жыццё, жыццё людское! Няма табе, няма спакою. 7. О Радзіма,



Репозиторий БарГУ

табою напоўнена сэрца да краю. 8. Зазвіні ты, песня, звонка ад мяжы і да мяжы, па-над роднаю старонкай перамогай задрыжы. 9. «Панас!» — вырваўся нямы крык з грудзей старога, і ён кінуўся да нерухлівай постаці свайго сына. 10. Сонца, сонца! З мірнаю зарою ты вярніся ў стэп з начных дарог.

**Заданне 4.** Спішыце, падкрэсліце звароткі. Пастаўце знакі прыпынку і растлумачце іх.

1. Зямля маёй цудоўнай Магілёўшчыны, ты ўся з красы і радасці саткана. 2. Квітней жыццё на ўсёй зямлі як першы летні дзень. 3. Гэй вольная песня уздымайся ляці ты на крылах маланак нястрымных агністых на крылах заранак і зор прамяністых над роднымі нівамі ўдаль.4. Вясна вясна о колькі ў табе шчасця о колькі радасці прыносіш ты з сабой. 5. Ён падышоў на два крокі пільна зазірнуў мне ў вочы уздыхнуў эх Шапятовіч Шапятовіч... 6. Прымі паклон і пажаданне цудоўны Пінск дзіця вякоў каб за цяжкія ўсе насланні ты шчасце вечнае знайшоў. 7. Выходзь народ працоўны вітай свой дзень цудоўны што даў табе прастор. 8. Ці ёсць такая дзе яшчэ другая як ты мая Радзіма дарагая. 9. Ой дарогі вы дарогі колькі мы вас абышлі. 10. Ой ты ночка чарнявая ноч агарні цеплынёю мяне...

## Прамежкавы тэставы кантроль

*Адзначце правільныя варыянты адказаў.*

1. *Сказы з параўнальнымі зваротамі:*
   а) Сны мы не заказваем, як і надвор'е.
   б) Яшчэ болей, чым папера, Петрака зацікавіла манастырская кніжная келля.
   в) Прыступы смутку і жальбы што прылівы і адлівы.
   г) Дні стаялі светлыя, ясныя, бы крышталь.
   д) Вольга, як зачараваная, слухала і не адводзіла вачэй ад берага.

Рэпазіторый БарДУ

2. *Не выдзяляецца параўнальны зварот у сказе* ***Вочкі нібы васілёчкі*** *таму што:*
   а) уваходзіць у склад устойлівых (фразеалагічных) выразаў;
   б) мае значэнне «ў якасці»;
   в) уваходзіць у склад выказніка;
   г) абедзьве часткі параўнальнага зварота выражаны аднолькавымі словамі.

3. *Сказы, у якіх параўнальныя канструкцыі выдзяляюцца ці аддзяляюцца коскамі:*
   а) Алесь нібы не сваімі нагамі ступаў па тратуары.
   б) Спынілася каля дзвярэй, трымалася за ручку як бы рыхтуючыся ўцякаць.
   в) Хацелася ганяцца за гэтымі белымі пушынкамі як за матылькамі.
   г) На вузенькім як толькі размінуцца тратуары стаіць яна.
   д) Лебедзі зноў прыляцелі на Беларусь пасля перапынку больш як у тры стагоддзі.

4. *Сказы, у якіх на месцы пропускаў ставяцца коскі:*
   а) Хмара здаволілася ліць … як з вядра … і пацягнулася за лес.
   б) Разгалістыя сосны … быццам зялёныя шатры … раскінуліся на пясчаным узгорку каля лесу.
   в) Лес … нібы памаладзеў … пасля дажджу.
   г) Двор … як брукаваны пляц.
   д) Вялізнае барвовае сонца на небасхіле такое свежае … як вынуты з печы каравай.

5. *Сказы, у якіх знакі прыпынку пастаўлены правільна:*
   а) Вечарамі пасажыры праводзілі час хто, як мог, па сваім гусце.
   б) Цвілі сінія, як лён, верасы, з дрэў пакрысе ападала пажоўклае лісце.
   в) Хвіліну яны пазіралі адна на адну, нібы чужыя.
   г) Страх, як хацелася Міхасю мець такую кніжку.
   д) Вакол азярынкі, быццам у няспынным урачыстым карагодзе, кружылася мноства жураўлёў.

Рэпозиторий БарГУ

6. *Сказы, у якіх неабходна выдзеліць ці аддзяліць параўнальны зварот са злучнікам **як**:*
   а) Унізе раскінуўся город — увесь як на далоні.
   б) Увесь вялізны прасторны сонечны схіл ззяў шырокім як возера ярка-пунсовым разлівам альпійскага маку.
   в) Маладзіца як брусніца.
   г) Як стужка віецца дарога між гоняў.
   д) Ішлі мы дадому як мыла з'еўшы.

7. *Сказы са звароткамі:*
   а) О, гэтыя маленькія палешукі! Усё іх жыццё, ад самых першых крокаў, звязана з Прыпяццю.
   б) Ты свяціла мне, полымя, ты адорвала мяне неацэннаю навукаю руху, жвавасці, жыцця.
   в) «Перад табой, сынок, шырокая дарога ў свет, — сказаў бацька, пазіраючы мне ў твар яснымі блакітнымі вачыма. — Ідзі па ёй і ніколі не забывайся, што ты чалавек».
   г) Гэта рыплівае, калі цягнуць ваду, шэрае збудаванне [калодзеж] было для нас, малы, і велічным, і таямнічым.
   д) «Эх, прыгажун які. Калі ласка, у кошык», — ледзь не ўголас падумаў Сяргей.

8. *Сказы, у якіх на месцы ўсіх пропускаў трэба ставіць коскі:*
   а) Узыдзі … зорка срэбная … над абшарамі нашых бароў.
   б) Дзе … ты … зорка мая прамяністая … за якія хмары схавалася?
   в) Гэй … ляці … маленства … рвіся ў люстраную даль.
   г) Спевы, грукат перуновы слухаць буду рад. Толькі не грымі ты … лес мой … грукатам гармат.
   д) Люблю … цябе … я … лес кашлаты … у ціхім шэлесце бяроз.

9. *Сказы са звароткам, у якіх трэба паставіць дзве коскі:*
   а) Дзе б ні быў сябры перад вачыма нібы жывая ўстае радзіма.
   б) А помніце хлопцы Таню Чарэшневу?
   в) Век жыць вам у сэрцы народа героі!
   г) Эх дай нам сілы маці-зямля прытулі нас!
   д) Чаму ты сынок спаць не ідзеш?



Репозиторий БарГУ

10. *Сказы, у якіх правільна пастаўлены знакі прыпынку пры параўнанні:*

а) У мроку нікне лес кашлаты, бы нейкі хітры чарадзей.

б) Ляцяць як і летась, у вырай з наседжаных гнёзд жураўлі.

в) Там, дзе гулі пшаніцы і жыта, стаяць снапы як рыжыя браты.

г) Гукне вясна і, як ветрам, развее гора-нуду.

д) На дварэ было ўжо не так хмурна як раніцай.

# ТЭМА 5
# ПУНКТУАЦЫЯ ПРЫ ПАБОЧНЫХ І ЎСТАЎНЫХ СЛОВАХ, СЛОВАЗЛУЧЭННЯХ І СКАЗАХ

## 5.1 Знакі прыпынку пры пабочных сінтаксічных канструкцыях

Пабочнымі канструкцыямі называюцца словы, словазлучэнні і сказы, якія выражаюць розныя адценні адносінаў моўцы да зместу выказвання, да рэчаіснасці.

Коска пры пабочных канструкцыях:

1. Коскамі выдзяляюцца пабочныя словы і канструкцыі, якія стаяць у сярэдзіне або ў пачатку сказа: *безумоўна, бясспрэчна, вядома, канечне, зразумела, напэўна, сапраўды, праўда, пэўна, відавочна, відаць, здаецца, здавалася, мабыць, магчыма, можа, мусіць, няйначай, бадай, знаць, нябось, часам, бывае, бывала, як вядома, як відаць, па ўсім відаць, можа быць, чаго добрага, таго і глядзі, само сабой разумеецца* і інш.: *І я, безумоўна, шчаслівы і рад, што добра зародзіць густая пшаніца* (П. Глебка). *Лабановіч, відавочна, быў задаволены, што не трэба доўга шукаць фурманкі* (Я. Колас).

2. Не выдзяляюцца коскамі тыя словы, якія ўжываюцца ў ролі мадальнай часціцы або са значэннем прыслоўя і выражаюць сцвярджэнне, узмацненне: *можа, няйначай, пэўна, напэўна, канечне, сапраўды, часам, бывае, бывала, бадай, бадай што, мо* (усечаная форма слова можа) і інш., а таксама словы *відаць, здавацца*, якія ў сказе выступаюць выказнікам: *Цяпер зіма напэўна ляжа* (Я. Колас). *Часамі Лабановічу здавалася, што вынікі дасягнуты нязначныя* (Я. Колас).



Репозиторий БарГУ

3. Выдзяляюцца коскамі спалучэнні слоў і сказы, якія маюць значэнне эмацыянальнай ацэнкі фактаў рэчаіснасці, а таксама перадаюць пачуццёвую рэакцыю на тыя факты, пра якія гаворыцца ў сказе: *на жаль, на вялікі жаль, на шчасце, як на тое шчасце, на маё здзіўленне, як на тое ліха, як на грэх, як на тую бяду, хвароба на іх* і інш.: *Як на грэх, лоў быў шчаслівы* (Я. Колас). *Хата была, на шчасце, ужо абжытая* (П. Пестрак).

4. Коскамі выдзяляюцца словы, спалучэнні слоў і сказы, якія паказваюць на крыніцу паведамлення, на прыналежнасць выказанай думкі: *па-мойму, па-твойму, па-ягонаму, па-вашаму, па-іхняму, маўляў, думаю, на мой погляд, з пункту гледжання (каго-небудзь), на думку (каго-небудзь), як вядома, як кажуць, як людзі кажуць, як той казаў* і інш.: *Гэта, па-мойму, і ёсць сапраўдная сувязь з жыццём* (К. Чорны). *Яшчэ, як той казаў, не ўсё скончана* (Я. Брыль).

5. Коскамі выдзяляюцца словы, спалучэнні слоў і сказы, якія перадаюць адносіны да спосабу выражэння думкі, матывацыю спосабу выказвання ці выбару стылістычных сродкаў мовы: *адным словам, словам, што называецца, скажам, як гаворыцца, як гэта гаворыцца, інакш кажучы, карацей кажучы, уласна кажучы, прасцей кажучы, шчыра кажучы, не пры вас кажучы, праўдзівей сказаць, папраўдзе сказаць, так сказаць, з дазволу сказаць, я сказаў бы* і інш.: *Шчыра кажучы, я толькі лічуся брыгадзірам* (А. Асіпенка). *Скажам, аб вадзе гамонкі не было спрадвек, бо хапала нам заўсёды і азёр, і рэк* (А. Астрэйка).

6. Коскамі выдзяляюцца словы, спалучэнні слоў і сказы, што выражаюць адносіны гаворачай асобы да слухача: *бачыш (бач), прызнацца, кажаш, кажаце, ведаеш, ведаеце, разумееш, разумееце, паверце, выбачайце, даруйце, даруйце мне, калі ласка, калі хочаце ведаць, ці дасце веры, зрабіце ласку* і інш.: *Напішы мне, калі ласка, пісямко дахаты!* (Я. Колас). *Але ж язык у цябе, даруй мне, як тая мянташка* (М. Лынькоў).

7. Коскамі выдзяляюцца словы і спалучэнні слоў, якія служаць сродкамі сувязі асобных частак выказвання і ўказваюць на паслядоўнасць, абмежаванне, удакладненне, супастаўленне або аб'яднанне частак тэксту, на выражэнне выніку, заключэння і пад.: *па-першае, па-другое, па-трэцяе* і інш., *першае, другое, трэцяе* і інш., *нарэшце, значыць, дарэчы, наогул, аднак, прынамсі, наадварот, з аднаго боку, з другога боку, у сваю чаргу, разам з тым, у прыватнасці, між іншым, між тым, да таго ж, такім чынам,*



Репозиторий БарГУ

*галоўным чынам, па крайняй меры* і інш.: *Спазніліся, аднак, на вялікае спатканне, трэба было раней* (В. Быкаў). *Валодзька выпрасіў, нарэшце, у рэдактара дазвол паехаць на раён* (Я. Брыль).

8. Калі слова *нарэшце* не выконвае функцыі пабочнага слова і выражае часавае значэнне, то яно коскамі не выдзяляецца: *Тым часам поезд з кожнай хвілінай набліжаўся да вакзала і нарэшце спыніўся* (Я. Колас).

Калі слова *аднак* у пачатку сказа ці другой часткі складаназлучанага сказа і пры аднародных членах ужываецца як супраціўны злучнік, яно коскай не аддзяляецца: *Трэба было паспаць. Аднак чамусьці не спалася.*

9. Спалучэнні слоў *між тым, тым не менш, да таго ж*, якія ўжываюцца ў пачатку сказа або другой часткі складанага сказа, выконваюць функцыю злучніка і коскай не аддзяляюцца: *Да таго ж Мініч яшчэ меў недахоп у вымаўленні: ён шапялявіў* (Я. Колас). *На двары ноч. Між тым спаць не хочацца* (І. Мележ).

10. Коскамі выдзяляюцца словы і спалучэнні слоў, якія не маюць уласна сінтаксічнага значэння і ўводзяцца ў сказ без якой-небудзь матывацыі: *гэта, гэта самае, ну, вот, само сабой, знацца, значыцца, стала быць, так сказаць, брат ты мой, тудэма-сюдэма, каліна-маліна* і інш.: *Тудэма-сюдэма, куды тут садзіцца!* (Я. Купала). *Проста, ну, сімпатызуюць адзін другому маладыя, хіба ж ім і не пагаварыць, хіба ж ім і не пасмяяцца* (М. Лынькоў).

11. Коскамі выдзяляюцца пабочныя словы і спалучэнні слоў, якія ўваходзяць у склад іншых пабочных ці ўстаўных сказаў, адасобленых зваротаў, удакладняльных ці іншых выдзеленых знакамі прыпынку частак сказа: *Немцы, як ты, мабыць, ведаеш, аднавілі завод у Гудове* (Б. Сачанка). *Не будку мае Жук — палацы (хоць не свае, вядома, працы)* (К. Крапіва). *Мы зайшлі ў крайнюю хату, пабудаваную, напэўна, пасля вайны.*

12. Калі пабочнае слова стаіць перад адасобленым зваротам, пабочным сказам або ўдакладняльнай канструкцыяй, то яно ўваходзіць у іх склад і коскай не аддзяляецца: *Аднекуль, мабыць з печы, да іх кінулася жанчына* (В. Быкаў).

13. Паміж пабочнымі словамі, спалучэннямі слоў і сказамі, якія ідуць адно за адным, ставіцца коска: *Само сабой, канечне, паставілі мы і хату* (Б. Сачанка).

14. Пабочныя словы, спалучэнні слоў і сказы аддзяляюцца коскамі ад папярэдніх злучнікаў, якія звязваюць члены сказа або

Рэпазіторый БарДУ

часткі складанага сказа: *Маёр спыніўся каля дзвярэй, заплюшчыў вочы і, здалося мне, пахіснуўся* (І. Шамякін).

15. Злучнік *а*, калі ён складае адно цэлае з наступным пабочным кампанентам сказа, не аддзяляецца ад апошняга коскай: *а можа, а магчыма, а значыцца, а між іншым, а па-другое*:

*— І штаб па кіраўніцтву партызанскім рухам будзе? — пытаў Багавік.*

*— Будзе. А можа, ён ужо і ёсць* (В. Быкаў).

16. Не аддзяляецца коскай ад пабочных кампанентаў узмацняльная часціца *і*: *І сапраўды, гэта не кепская думка!* (Я. Колас).

17. Коска не ставіцца паміж пабочнымі словамі і часціцамі, якія да іх адносяцца і стаяць пасля іх: *Можа б ты даў мне хоць кавалачак хлеба ў дарогу?* (Я. Колас). *Ну, напэўна ж ёсць прычына, калі кпіць з цябе яна?* (Я. Колас).

18. Коскамі выдзяляюцца ўстаўныя словы, спалучэнні слоў і сказы, якія выконваюць удакладняльную функцыю (тлумачэнні, заўвагі, дадатковыя звесткі і інш.): *Віхрасты хлапчук, яму было год шэсць, штосьці мармытаў праз сон і смяяўся* (К. Чорны) [9, с. 97—103].

## 5.2 Знакі прыпынку пры ўстаўных канструкцыях

Устаўнымі канструкцыямі называюцца словы, словазлучэнні ці сказы, якія ўдакладняюць, дапаўняюць, пашыраюць, раскрываюць, тлумачаць сэнс усяго сказа ці яго асобных членаў; паказваюць на абставіны, якія абумоўліваюць або суправаджаюць асноўнае паведамленне; служаць мімаходнай заўвагай ці своеасаблівай рэмаркай да асноўнага паведамлення.

Традыцыйна лічыцца, што такія канструкцыі не ўключаюцца ў структуру сказа і фармальна-граматычна не звязваюцца з ім, а прымацоўваюцца пры дапамозе сэнсавай (суадноснай) сувязі і вылучаюцца са сказа інтанацыйна: вымаўляюцца паніжаным тонам і паскораным тэмпам з выразнымі паўзамі на іх мяжы, што абазначаецца дужкамі або працяжнікамі пры іх афармленні на пісьме.

Паводле структуры ўстаўныя канструкцыі падзяляюцца на:

а) устаўныя словы: *Яблык апісаў над Кастуськом дугу (пералёт!) і мякка ўпаў на пясок* (Ф. Янкоўскі). *Дэкаратыўныя посцілкі ўпрыгожвалі ў хаце і скрыні (куфры)* (Н. Камсюк);



Репозиторий БарГУ

б) устаўныя спалучэнні слоў: *Паміж хаткай і абрывам, на вялікай разлегласці ўсяго (кіламетраў паўтара), варушыліся чалавечыя постаці* (К. Чорны);

в) устаўныя сказы: *Прыснілася, што сею жыта (Чамусьці часта сны такія сняцца)* (М. Танк).

Устаўныя сказы выдзяляюцца:

– коскамі, калі маюць неразвітую або маларазвітую будову, лагічна не выдзяляюцца, слаба звязаны з асноўным зместам сказа і суправаджаюцца непрацяглымі паўзамі на стыку з яго членамі: *Першы раз, было й нязвычна, я пайшла гуляць у сад (*А. Александровіч*). Вучні мясцовай школы, а іх тут было каля трыццаці чалавек, дапамагалі калгаснікам выбіраць бульбу* («Чырвоная змена»);

– працяжнікамі, калі маюць маларазвітую або развітую будову, лагічна выдзяляюцца, слабей звязаны з асноўным зместам сказа і суправаджаюцца працяглымі паўзамі на стыку з яго членамі: *Над апусцелым полем — праз вокны відаць было — неба ўзняло некалькі малых і чырванаватых хмар* (К. Чорны). *Вацлаў Стралічка — так звалі палкоўніка — спачуваў партызанам* (М. Лынькоў). *Неўзабаве — на дварэ быў ужо вечар — пачалі сыходзіцца суседзі* (І. Мележ);

– коскамі з працяжнікамі, калі маюць развітую будову, выдзяляюцца лагічна, яшчэ слабей звязаны з асноўным зместам сказа і суправаджаюцца больш працяглымі паўзамі на стыку з яго членамі: *Каля Нёмана, — а ён працякаў тут зусім недалёка, — чуліся галасы дзяцей* (Я. Колас). *Малая дзяўчынка Галя ,— якая плакала, — згубіла сваю маці* (І. Мележ);

– дужкамі, калі маюць самую развітую будову, лагічна не выдзяляюцца, надзвычай слаба звязаны з асноўным зместам сказа, служаць у якасці заўваг, удакладненняў і пад. і суправаджаюцца асабліва працяглымі паўзамі на стыку з яго членамі: *Бараноўскія (тры хлопцы як дубы) былі дома* (А. Гурло). *Узялі мы вуды, кацялок для юшкі, сачок (на ўсякі выпадак) і рушылі на рыбалку* (А. Якімовіч). *Мы, дзеці, сядзелі на нашым бярвенні (бацька збіраўся ставіць новую хату і таму навазіў ужо многа лесу) і рабілі сабе свістулькі з вярбовых пруткоў* (Я. Сіпакоў) [3].

Рэпазіторый БарДУ

## Гласарый

**Пабочныя канструкцыі** — словы, словазлучэнні і сказы, якія выражаюць розныя адценні адносінаў моўцы да зместу выказвання, да рэчаіснасці.

**Устаўныя канструкцыі** — словы, словазлучэнні ці сказы, якія ўдакладняюць, дапаўняюць, пашыраюць, раскрываюць, тлумачаць сэнс усяго сказа ці яго асобных членаў; паказваюць на абставіны, якія абумоўліваюць або суправаджаюць асноўнае паведамленне; служаць мімаходнай заўвагай ці своеасаблівай рэмаркай да асноўнага паведамлення.

## Пытанні для самападрыхтоўкі

1. Якімі знакамі прыпынку выдзяляюцца пабочныя словы, спалучэнні слоў, сказы?
2. Што выражаюць устаўныя словы, словазлучэнні і сказы?
3. Якімі знакамі прыпынку выдзяляюцца ўстаўныя словы, спалучэнні слоў і сказы?

# Трэнінг уменняў

**Заданне 1.** Адзначце сказы, у якіх набраныя курсівам сінтаксічныя канструкцыі з'яўляюцца членамі сказа.

1. Чалавек *відаць* валодаў сабою добра. 2. Птушка *відаць* не заўважыла мяне. 3. З-пад хвой-красунь як на далоні *відаць* і хаты і двары. 4. Імя гэтага чалавека было *вядома* ўсім местачкоўцам. 5. У дзеда *прызнацца* стрэльба ёсць. 6. Я вырашыў *прызнацца* бацьку. 7. На жывой касці мяса *мусіць* нарасці. 8. Час *можа* астудзіць самы вялікі пажар пачуццяў. 9. У жыцці *бывае* ўсякае. 10. Прадбачанні нават вопытных людзей *бывае* аказваюцца памылковымі.

**Заданне 2.** Вызначце, якія сказы з'яўляюцца пабочнымі, а якія — устаўнымі. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў іх.

1. Гасяць, чуў я, пажары лясныя сустрэчным агнём. 2. Зямля — дзе глянеш — роўная як стол. 3. Часта тут — былі здарэнні — заб'ецца тхорык пад карэнне. 4. Кажуць — я ўжо дзед стары. 5. Дарога — вялікая яна ці малая — заўсёды хвалявала Лабановіча. 6. Мужчын і хлопцаў — іх было дзевяць — Алена накіравала вазіць снапы. 7. Сыну — бачу на твары — кранаўшчык палюбіўся.



Репозиторий БарГУ

8. Я вырашыў — было ні было — чакаць машыны. 9. Пяты клас — чуваць Даніку — ужо шуміць за сцяной. 10. Ад малодшага брата не было ніякіх вестак (як потым высветлілася, ён загінуў у час блакады). 11. Трэба працаваць — гэта належыць усім добра ведаць — з душой і аганьком. 12. Тысячы дзяўчат блакітнавокіх — па тварах бачу — зычаць шчасця мне. 13. Юзэфа Мітрафанаўна Малецкая, а гэта была яна, галоўны ўрач бальніцы, узяла Галіну руку і памацала пульс.

**Заданне 3.** Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку пры ўстаўных словах, словазлучэннях і сказах.

1. Важна ступаюць кароўкі, жуючы жуйку (жвачку). 2. Феадальныя (прыгонніцкія) перажыткі накладалі адбітак на ўвесь грамадскі лад краіны. 3. Перад хатаю да самага гасцінца (крокаў з трыццаць) буяў спарыш і трыпутнік. 4. Дзве стрэльбы (сняць гушчар) сумуюць у кутку. 5. Мне не лёгка расстацца з табою (хоць даўно ўжо мінуў аўдыенцыі час). 6. Пытаецца аб чым-небудзь Волька — яе заўсёды цікавяць розныя рэчы, — а маці не чуе і не адказвае. 7. Камандзір, у баях суровы (хваляваўся вельмі рэдка), усё ж двух вучняў Смалячкова пасылае на разведку. 8. Яўмен чытаў газету, у якой зноў (каторы раз за вясну!) пісалі пра Сяргея Бярозку. 9. Шчасце здабудуць сабе назаўсёды — так будзе! — гордасць і слава зямлі нашай — простыя людзі. 10. Вугор, чорны, вялізны, як змей, — мы ў казках такіх сустракалі, — скача далей і далей, з хвалі на хвалю.

**Заданне 4.** Адзначце сказы, у якіх набраныя курсівам сінтаксічныя канструкцыі трэба выдзеліць дужкамі або працяжнікамі.

1. Ніхто з маладых *зразумела* не верыў у старыя забабоны. 2. Ён быў тады маленькім *схаваеш у рукавіцу* цёплым камком, калі паявіўся на свет у бярлозе маці, вялікай старой мядзведзіцы. 3. Аднойчы надвячоркам *было гэта пад канец чэрвеня* я вяртаўся дадому праз стары лес. 4. Ліса, адчываючы перавагу ў хуткасці, вадзіла сабаку *як кажуць* за нос. 5. І над усім *ты вельмі хутка пачынаеш адчуваць* пануе святочнасць, урачыстасць. 6. Птушкі спявалі так заўзята і весела, звонка і гучна, што *здавалася мне* аж калаціўся лес. 7. *Як сведчаць гістарычныя крыніцы* яшчэ ў XV стагоддзі



Рэпазіторый БарДУ

ў Белавежскую пушчу ездзілі на паляванне літоўскія князі, польскія каралі і, нарэшце, рускія цары. 8. Буйная і густая раса *кроплі віселі на траве, на лісці дрэў і кустоў* заіскрылася ў сонечных промнях. 9. У сонечныя дні ліса *яна не любіла яркага святла* адпачывала ў нары, бавіла час з дзецьмі. 10. Пачаў ён здалёк *як кажуць ад Адама* і гаварыў вельмі агульнымі фразамі, устаўляючы шмат незразумелых слоў.

**Заданне 5.** Знайдзіце ўстаўныя словы, словазлучэнні і сказы, выдзеліце іх знакамі прыпынку.

1. Валерыя Мікалаеўна так звалі тэлеграфістку мела прыемны голас. 2. Нарэшце дзед Талаш запыніўся і гэта было цэнтральным месцам яго апавядання аб здзеках акупантаў над людзьмі. 3. Максім не бачыў яе год калі ён прыязджаў на зімовыя канікулы яна была на сесіі завочнікаў у тэхнікуме і цяпер ледзь пазнаў. 4. Нехта цяпер цяжка было ўстанавіць хто чуў стрэл на грэблі. 5. Янка Купала Іван Дамінікавіч Луцэвіч нарадзіўся ў 1882 годзе. 6. Узялі мы вуды, кацялок для юшкі, сачок на ўсякі выпадак і рушылі на рыбалку. 7. Ад дарогі дарога нібы мяжой была пачынаецца заліўны луг. 8. Шумнаю, гаманліваю грамадою а было іх чалавек пятнаццаць накіраваліся настаўнікі ў бок возера. 9. У апошнія дні хлопцы часта ляталі праўда на сваіх шустрых нястомных нагах да старшыні суседняга калгаса. 10. Ля ганка, дзе дубы лесавыя пасланцы ў поле застылі ў перадранішняй дрымоце, цямнела ў водбліску неба чалавечая постаць.

## Прамежкавы тэставы кантроль

*Адзначце правільныя варыянты адказаў.*

1. *Сказы, у якіх выдзелены пабочныя словы, словазлучэнні ці сказы:*
   а) *Здаецца* сам свет гатовіўся як можна лепш сустрэць калядны вечар.
   б) *Бывае* што прывязуць у краму свежага тавару.
   в) А на самай справе *аказалася* трошкі не так.
   г) Увечары *бывала* раскіне антэну на грушыне і слухае.
   д) Было *відаць* што вячэра ідзе не першую гадзіну.



Рэпазіторый БарДУ

2. *Сказы, у якіх не выдзелены пабочныя словы і словазлучэнні:*
   а) Пэўна, гэты сюжэт ён запазычыў з майго апісання Беларусі.
   б) Гэта бясспрэчна сляды войнаў пра якія не ўспамінаў аніводзін гісторык.
   в) Няхай думаю будзе на ўсякі выпадак, можа і спатрэбіцца.
   г) Самі бывала зрэбныя кашулі ды порткі насілі, а кужаль маці ўвесь богу аддавала…
   д) Вось і выйшаў, такім чынам, з мяне хлапец набожны, такі ж, як і мае бацькі.

3. *Сказы, дзе выдзеленыя словы і словазлучэнні з'яўляюцца членамі сказа:*
   а) *Мабыць*, трэба было будавацца ў іншай брыгадзе.
   б) Усё *можа быць*, блакада якая яшчэ.
   в) Бывае так, *ведаеце*, калі чалавек не плача, а слёзы самі коцяцца.
   г) …У тым лесе лепш *відаць*, што гэта за работнік…
   д) І заўсёды так *здараецца*, што са складанага становішча выблытаешся, а на ўласнай дурасці пападзешся.

4. *Сказы, у якіх выдзеленыя словы (спалучэнні слоў) не з'яўляюцца пабочнымі і не выдзяляюцца коскамі (коскай):*
   а) Выбачайце, калі я *магчыма* не так зразумеў вас.
   б) Гэта *магчыма* зрабіць толькі пры пэўных умовах.
   в) Праз два маленькія акенцы дзень нясмела лез у пакой, і было *відаць* праз іх, як шарэла на дварэ.
   г) З узгорка добра *відаць* уся дарога.
   д) Здаецца лістоў на дрэвах зусім няма.

5. *Сказы, у якіх на месцы пропускаў ставяцца коскі:*
   а) У вёсках знойдуцца хаты, у якіх … бадай … кожны дзень павернецца паўсяла людзей, але ёсць і такія, куды рэдка хто заглядвае.
   б) Праўда … не заўсёды ў паштовай сумцы радасныя весткі.
   в) У нас … можа … тысячы рабочых.
   г) Ён пражыў у горадзе з год, а … можа, і паўтара.
   д) Наша з вамі зямля … можна сказаць … сочыцца вадою.

Репозиторий БарГУ

6. *Сказы, у якіх знакі прыпынку пастаўлены правільна:*
   а) Упершыню купаўся ў моры; вада сапраўды салёная, як слёзы.
   б) Саміх баброў, праўда, цяжка падпільнаваць, хоць ты ад рання да позняга вечара цікуй за імі.
   в) Аднак, да вечара работа была закончана.
   г) Вунь, на ўзгорку, відаць, гонтавыя і чарапічныя дахі хат.
   д) З кустоў з шумам сарваліся дразды-рабіннікі: відаць прыляталі сюды ласавацца ўжо добра налітымі ягадамі рабіны.

7. *Сказы, у якіх патрэбна паставіць знакі прыпынку пры ўстаўных канструкцыях:*
   а) Перад хатаю да самага гасцінца крокаў з трыццаць буяў спарыш і трыпутнік.
   б) За сухары пшанічныя каржы на кіслым малацэ лепшага ласунку не прыдумаеш.
   в) Ну словам за праўду можна і галавою.
   г) Воддаль на другім беразе рэчкі вызначаюцца цені вясковых будынкаў.
   д) Голас у Дзяміда Мікалаевіча быў няроўны відаць яму было цяжка гаварыць.

8. *Сказы, у якіх выдзелены ўстаўныя канструкцыі:*
   а) *Паводле ўяўленняў нашых продкаў-язычнікаў* курыныя яйкі ўвасаблялі творчыя, жыццёвыя сілы прыроды, таму ўжываліся ў веснавых абрадах як сімвал абуджэння ад вясновага сну.
   б) Рыгор Андрэевіч Угоднік *такое было яго прозвішча* ляжаў на цвёрдым ложку, закінуўшы ногі на біла.
   в) Вам жа *вядомая рэч* патрэбен адпачынак.
   г) Тут *як гэта чуецца ў самой назве* знойдзены горы солі.
   д) Самаму старому чаўну, знойдзенаму на Беларусі *ён зараз у Пінскім музеі* 7 тысяч гадоў.

9. *Сказы, дзе набраныя курсівам канструкцыі лепш выдзеліць працяжнікамі або ўзяць у дужкі:*
   а) Львіцы *як толькі могуць уседзець яны ў адной клетцы!* з чыста жаночай цікавасцю паглядалі праз краты.
   б) Ад’езд і радаваў *дома мяне чакала сустрэча з жонкай, з дзецьмі*, і крышачку засмучаў.
   в) Да возера ад нас *самі бачыце* те так ужо і блізка.



Репозиторий БарГУ

г) Увесь тыдзень *як сцвярджаюць сіноптыкі* будзе цёплае надвор'е.
д) Слёзы *адкуль яны браліся?* нястрымна ліліся з вачэй.

10. *Сказы, у якіх набраныя курсівам словы трэба выдзеліць коскамі:*
а) Мая карта рэк *а на ёй пазначаны толькі даўжэйшыя за пяць кіламетраў рэкі* ўся пранізана сінімі жылкамі.
б) Не будзі *матуля* дачок закаханых, не трывож іх светлых сноў.
в) Садзілі нас на лаўкі такой чысціні, што нам *здавалася*: яны толькі-толькі з-пад рукі столяра.
г) З вачэй дзяўчыны *здавалася* струменіліся дабрыня і ласкавы спакой.
д) Душой паэта *мабыць* кіруе ўразлівае дзяцінства.

## Т Э М А 6
## ПУНКТУАЦЫЯ Ў СКЛАДАНАЗЛУЧАНЫХ СКАЗАХ

### 6.1 Знакі прыпынку ў складаназлучаных сказах

С к л а д а н а з л у ч а н ы я  с к а з ы — сказы, прэдыкатыўныя часткі якіх з'яўляюцца сінтаксічна раўнапраўнымі, аб'ядноўваюцца злучальнымі злучнікамі і выражаюць розныя віды сінтаксічных адносін: *Уздоўж дарогі чынна з краю слупы стаяць у два рады[1],* ***і****, нібы гуслі-самаграі, звіняць іх струны-правады[2]* (Я. Колас).

Коска ў складаназлучаным сказе:

1. Коскай аддзяляюцца часткі складаназлучаных сказаў, якія аб'яднаны злучнікамі *і, ды* (у значэнні «і»), *дый* (*ды і*), *або* (*альбо*), *ці*: *Ідуць ад кожнага перона на ўсход і захад цягнікі, і ад апошняга вагона далёка свецяць аганькі* (С. Грахоўскі).

2. Перад злучнікамі *і, ды* (у значэнні «і»), *або, ці* коска не ставіцца:
– калі ў складаназлучаным сказе (звычайна ў пачатку) ёсць агульны член, які адносіцца да першай і да другой частак, або агульная часціца ці пабочнае слова: *Дзе-нідзе ў гародчыках, ля ганкаў чырванелі вясновыя кветкі і зацвітаў бэз* (В. Быкаў). *Праз нейкі час вецер разагнаў хмары ў вышыні і дождж сціх* (І. Мележ).
– калі часткі складаназлучанага сказа з'яўляюцца безасабовымі (аднароднымі па значэнні), няпэўна-асабовымі або

намінатыўнымі сказамі, а таксама калі маюць форму пытальных, пабуджальных ці клічных сказаў: *Цішыня і прастор* (Э. Агняцвет). *Колькі радасці і колькі захаплення!*
– калі выказнік або яго звязка апушчаны ў другой частцы (бо яны ёсць у першай частцы): *Сонца будзе свяціць і трава зеляніцца* (В. Каваль);
– калі дзейнік другой часткі выражаны азначальным займеннікам *сам*, якім узмацняецца дзейнік першай часткі: *Крушынскі спыніў каня і сам стаў азірацца навокал* (З. Бядуля).

3. Коскай аддзяляюцца часткі, якія аб'яднаны ў складаназлучаны сказ злучнікамі *але, а, ды* (у значэнні «але»), *ж* (*жа*), *аж*, *аднак*, *затое*, *толькі* і інш.: *Наводдалек чуліся стрэлы, але тут было ўжо ціха* (І. Мележ). *І чужому навучайся, ды свайго не цурайся* (Прыказка). *На вуліцы скрыпка грае, мяне ж маці не пускае* (Народнае).

4. Коскай аддзяляюцца часткі, якія аб'яднаны ў складаназлучаны сказ пры дапамозе паўторных злучнікаў *і... і, ні... ні, то... то, не то... не то, або (альбо)... або (альбо), ці... ці, ці то... ці то*: *І хвалюецца пшаніца, і дрыжыць пяшчотна гай* (П. Броўка). *Ці то стогне бура, ці то віхор гуляе* [9, с. 106-107].

Працяжнік у складаназлучаным сказе ставіцца, калі другая частка паказвае нечаканы вынік, рэзкае супрацьпастаўленне ў адносінах да першай або паміж часткамі выражаецца хуткая змена падзей: *Узмах — плёснулася недзе на сярэдзіне [ракі] блясна* (І. Шамякін); *Так, бывае, ліст за ліст чапляецца, чапляецца — і на зямлю ўжо сыплецца жоўтая замець* (А. Дзятлаў).

## Гласарый

**Складаназлучаныя сказы** — сказы, прэдыкатыўныя часткі якіх з'яўляюцца сінтаксічна раўнапраўнымі, аб'ядноўваюцца злучальнымі злучнікамі і выражаюць розныя віды сінтаксічных адносін.

## Пытанні для самападрыхтоўкі

1. Якія сказы называюцца складаназлучанымі?
2. Якімі знакамі прыпынку раздзяляюцца часткі ў складаназлучаных сказах?
3. Калі паміж часткамі складаназлучанага сказа коска не ставіцца?
4. Калі ў складаназлучаным сказе ставіцца працяжнік?

Рэпазіторый БарДУ

## Трэнінг уменняў

**Заданне 1.** Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку паміж прэдыкатыўнымі часткамі складаназлучаных сказаў.

1. У пералесках і гаях апошнія канцэрты дае салавей, а ў пачатку ліпеня падае голас і зязюля. 2. Нашы ластаўкі, відаць, запазніліся звіць сваё гняздо, і таму ластавяняты вывеліся ў іх запознена. Іншыя ўжо даўно на сваіх крылах абляталі Жыцькава, а нашы ўсё яшчэ сядзелі ў гняздзе і па-дзяцінаму прасілі ў бацькоў корму. 3. Лось пакуль што хадзіць не мог, і Янка прыносіў яму канюшыну і сена, паіў вадой, падоўгу, седзячы каля яго, расказваў пра школу, пра сябе, нібы падбадзёрваючы «хворага». 4. Лапецька часам праз меру займаўся сваёй стрэльбай, і на бліжэйшым балоце ці ў лесе грымела сапраўдная кананада. 5. А на небасхіле падымалася вялізная цёмна-сіняя хмара. Яна расла ўвачавідкі, і маланкі пранізвалі яе. 6. Дажджу яшчэ не было, але ўсё навокал пацямнела і прыціхла. 7. Мінула яшчэ, відаць, хвілін дзесяць, а потым сапраўды шум, грукат, дождж пачалі сціхаць. 8. У светлым небе лёталі птушкі. Сёння іх чамусьці многа лётала. Ці, можа, і заўсёды так было, ды Марыйка не заўважала. 9. Сонца пячэ, а гарачыні няма. 10. Ці пах немца раздражніў сабаку, напомніўшы нешта прыкрае, ці не спадабаўся яму шалік на немцавай галаве, але шпіц ускочыў на ногі і моцна забрахаў.

**Заданне 2.** Выпішыце спачатку складаназлучаныя сказы, потым — сказы з аднароднымі выказнікамі, звязанымі злучнікамі. Пастаўце знакі прыпынку і растлумачце іх.

1. Сонца разагнала над зямлёй рэшткі туману і павольна плыло паміж высокіх купчастых аблачынак. 2. Завіруха бушавала і на славу вырастала беласнежная гара. 3. Так на полі ўвечар мая ветру лёгенькі павеў чуць калосікі гайдае ды з іх гутаркі складае нейкі гожы-ціхі спеў. 4. Выглянула сонца радасна пырснула праменямі але дождж яшчэ ішоў сляпы дробны. 5. З першага погляду яго бараду можна было б назваць рыжаю але яна была не рыжая а так сабе светлаватая. 6. Яны [немцы] туляліся па сасонніку але высоўвацца баяліся і стралялі рэдка. 7. Вясна была яшчэ ўпачатку



Репозиторий БарГУ

але снягі ўжо раставалі і дружна ў полі балбаталі раўкі рачулкі і ў грамадку яны ваду сваю злівалі. 8. А сняжынкі сеюць кволую імглістасць падаюць бялюткі за маім акном і цвіце на вішнях снежная ўрачыстасць сцелецца на скронях перад раннім сном. 9. З двара ў акно пазірала чорная ноч і завешанае густымі хмарамі-валокнамі цёмнае неба. 10. Ногі то слізгалі па голым абледзянелым каменні то ў горных упадзінах угрузалі па калена ў снезе.

**Заданне 3.** Спішыце сказы, устаўляючы прапушчаныя злучнікі; вызначце функцыі злучнікаў. Пастаўце знакі прыпынку і растлумачце іх. Першы сказ разбярыце па членах сказа.

1. На дрэвах пявуча перасвістваліся дразды трашчоткамі стракаталі сарокі ... час ад часу паветра раздзіраў непрыемны прарэзлівы крык жаўны. 2. Сонейка заходзіць ... кладуцца цені ... плывуць хмурынкі ў ціхім задуменні. 3. Стаяла ўжо сцюдзёнае надвор'е ... ён усё хадзіў у сваім лёгенькім пальцечку рудаватага колеру даволі зношаным і памятым. 4. Усе птушкі крылы маюць ... не ўсе лятаюць. 5. Узыходзіць сонца над прасторамі ... красуе ніва за далінаю. 6. Але ўсюды ўсё было ціха ні стрэлу ні гуку ... скуголіў гудзеў і шастаў навокал вецер. 7. Віецца вядзе іх у нетры сцяжына...ўстане над ёю старая альшына ... знікне дарожка ў засохлым трысці. 8. Крукам я стаяў глядзеў ... знянацку воўк праклятьі як той віхар наляцеў. 9. Цяпер камінак спачывае: хату лямпа асвятляе.

**Заданне 4.** Вызначце нумары сказаў, у якіх: а) трэба паставіць коску перад *і, ды* (*і*); б) не трэба ставіць коскі перад *і, ды* (*і*).

1. Стары ўсміхнуўся і ўсмешка разгладзіла густыя маршчакі на лбе. 2. Сонца і вецер. 3. Маўчала возера ў тумане ды вербы плакалі ў цішы. 4. Мікіта трохі саромеўся і прамова яго была не зусім гладкая… 5. Для нас цвітуць сады і агароды і жытнія звісаюць каласы. 6. Дождж і снег. 7. Жнеі жніўную песню пяюць і шчабечуць птушкі. 8. Толькі верхавіны соснаў гудзелі ледзь чутна ды шалясцелі няўмоўныя трапяткія асіны. 9. За вокнамі шумяць у садзе слівы ды месяц стаў над стрэхамі сяла. 10. У хвойных лясах густа рос верас і зелянеў ягаднік.



Рэпазіторый БарДУ

**Заданне 5.** Вызначце нумары сказаў, у якіх можна перад злучнікам ***і*** паставіць: а) коску; б) працяжнік; в) не трэба ні коскі, ні працяжніка.

1. Шуміць і гамоніць Палессе і новыя акорды чуваць у гэтым шуме і ў гэтым гомане. 2. Настане ноч і ўсюды ціха. 3. У новым будынку трымаўся халадок і панавала цішыня. 4. Бясконца падымаюцца прысады і вечны шолах нейкі кіпіць у іх. 5. Узмах і плёснулася недзе на сярэдзіне ракі блясна. 6. На кожным чаўне льецца песня і гучыць гармонік. 7. Яшчэ дзён колькі і жніво настане. 8. Горад вымер і згас толькі свеціцца адзінокі ліхтар. 9. У кастрычніку ўзяліся замаразкі і пасыпаў снег. 10. Па дарозе імчаліся аўтамабілі і з трэскам праносіліся матацыклы.

**Заданне 6.** Выпішыце нумары сказаў, у якіх на месцы пропуску ставіцца коска або працяжнік. Вусна растлумачце пунктаграмы.

1. Праб'юся я ў Прыбалтыку сінюю … і прыйду ў Беларусь сваю сцежкаю даўняй, дзяцінаю. 2. Спіць шырокая далеч палёў … і ўрачыстая ціш, звонкая і чуткая, суправажае павольны лёт ночы. 3. Момант … і ў веснічках паказалася Аленка. 4. А побач уздымаецца чаротнік, аер … і растуць яны не абы-як, а вуліцамі. 5. Багдановіч ведаў многія еўрапейскія мовы … і паэты з розных зямель і з розных стагоддзяў далучаліся праз яго да тутэйшай мовы. 6. Ранняй вясной распушыліся вербы … і заціўкалі сініцы ў набраклых гаях. 7. Толькі ноч настае … і ўзрываюцца, падаюць зоры. 8. На захадзе бліснула журботная, ласкавая ўсмешка сонца і патухла … і ў небе засвяціліся першыя зоркі. 9. Бабіна лета заканчвалася … і ад зямлі і ад неба цягнула холадам, асабліва па начах. 10. На высокім беразе не дзьмуў вецер … і не шумела лісце.

## Прамежкавы тэставы кантроль

*Адзначце правільныя варыянты адказаў.*

1. *Пералічанныя сказы з'яўляюцца складаназлучанымі:*
   а) Сонца смаліць дзень пры дні, у небе ні аблачынкі, а вецер набяжыць — абдасць сухменню, быццам з пустыні, і зноў не аддыхаешся, не астынеш.



Рэпазіторый БарДУ

б) Старыя вербы каля хаты гудуць і гнуцца ва ўсе бокі, над долам сцелюць верх шырокі, і круціць бура ім галіны, кудлаціць, крышыць верхавіны.
в) Дзяцінства бераг васільковы, дзівосны кут маіх надзей, ты не забудзешся ніколі, хоць я з табой усё радзей.
г) Ідзеш і адною рукою лёгенька вядзеш па рабрыстай сцяне жыта, і табе чамусьці робіцца вельмі радасна і спакойна.
д) Гэтаму дрэўцу радаваўся не толькі я, але і мой сын, радавалася і жонка.

2. *Складаназлучаныя сказы, у якіх на месцы пропуску ставіцца коска:*
а) Пры пыльнай дарозе шумяць палыны … і вясёлыя плачуць наводдаль каліны.
б) Толькі верхавіны сosнаў гудзелі ледзь чутна … ды шалясцелі няўмоўчныя трапяткія асіны.
в) Вечарэе … і пахне кветкамі.
г) Без працы я не быў нідзе … а праца нам і творыць долю.
д) Узмах весла … і сонны бераг адразу пачынае жыць.

3. *Складаназлучаныя сказы, у якіх на месцы пропуску не ставіцца коска:*
а) Хай шчасце куецца на свеце … і вечная дружба расце.
б) Ляцяць на ветры косы рыжай восені … і кліча лісцяў жоўты сум зіму.
в) Зашумела пад кручай сасна … і вярба зацвіла пры дарозе.
г) Сакавітая зяляніна травы … і блакітная бель ракі.
д) Паміж пнёў буяў верас … і купчасціўся ядловец.

4. *Складаназлучаныя сказы, у якіх на месцы пропуску ставіцца працяжнік:*
а) Вось дзьмухне вецер __ і вершаліны асін паціху закіпяць.
б) Зносіць вецер сухія лісты __ зіма неўзабаве пастукае ў нашыя дзверы.
в) Гукну ў прастор __ і грозна адзавецца шалёны гром…
г) Нарэшце ўсё было ўпарадкавана __ і куток адразу набыў культурны выгляд.
д) Я збіраў каля берага шчодрыя краскі … і яны мне нашэптвалі даўнюю-даўнюю казку.



Репозиторий БарГУ

5. *Складаназлучаныя сказы, у якіх знакі прыпынку расстаўлены правільна:*
   а) І хмары хадзілі, і сонца свяціла і пад золатам халоднай ясноты ціха ляжала зямля.
   б) Недзе далёка-далёка паблісквала мокрае вясло, і чарнела хісткая рысачка чоўна.
   в) Самотным дрэвам сняцца май і радасць, а мне — маё забытае святло.
   г) У дняпроўскіх хвалях, бы ў калысцы, разгайдалася хмурынак бель, і спявае пад тугім вятрыскам лугавіны вясёлы жаўтазель.
   д) То салавей зальецца ўдала, то шпак пасобіць ценарком.

6. *Складаназлучаныя сказы, у якіх знакі прыпынку расстаўлены няправільна:*
   а) Цяпер салодкія маліны свае галовы хіляць ніц, і ўсе сухія баравіны пакрыты завяззю брусніц.
   б) Дождж ідзе, і на сэрцы маркотна, і душы не хапае спакою.
   в) Лісты ападаюць, а верас цвіце і шуміць каля ног.
   г) І грукаюць голлем дубы, і ветры паўднёвыя веюць і ўзгоркі крутыя гарбы пад сонечнай сеткаю грэюць.
   д) Або сіверны холад пачнецца, або мокра стане на дварэ.

7. *Сказы, у якіх на месцы пропускаў трэба ставіць коскі:*
   а) У канцы ліпеня прайшлі шчодрыя дажджы … а потым зноў наладзілася надвор'е.
   б) То заскрыпіць сухое дрэва … то ўпадзе на зямлю пераспелая шышка.
   в) Здаецца, працягні руку … і возьмеш птушку.
   г) Хвіліна затрымкі … і машына імчыцца далей.
   д) Куды цяпер падацца … і што рабіць?

8. *Складаназлучаныя сказы, у якіх перад злучнікамі коскі не ставяцца:*
   а) Ад цямна да цямна непадалёку ад лісінай нары звінелі пілы … і грукалі сякеры.
   б) Сарока зноў раскрычалася … ды лісіца не звяртала на яе ўвагі.



Репозиторий БарГУ

в) Сініца хуценька аддала птушаняці матылька … і сама зноў паляцела на сліву.
г) Няма чым дыхаць і хочацца спаць.
д) На бліжэйшым балоце тужліва загігікала кнігаўка … і высока ў небе дробненька замаркатаў бакас.

9. *Сказы, у якіх на месцы пропуску ставіцца коска:*
а) Сына трэба жаніць … ды і дачка на выданні.
б) Цёпла … і таму ў хаце ніхто не сядзіць.
в) Зносіць вецер сухія лісты і зіма неўзабаве пастукае ў нашыя дзверы.
г) Часам чуваць тут стрэлы … ды праедзе на кані пагранічнік.
д) Беглі дні … і памалу канчалася восень.

10. *У пералічанных сказах дапушчана пунктуацыйная памылка:*
а) Паблізу нікога не было відаць, і, трохі захінуўшыся за кустамі алешніку, даклыпаў [Хведар] да большага лесу.
б) Яшчэ не азвярэлі камары і машкара не налятае хмарай.
в) Ён [Хведар] паглядзеў троху, думаў, можа, і яшчэ каго згледзіць на вечаровай дарозе, ды болей не было нікога.
г) Маленечкі павеў ветру — і ўжо выпырхнула з далоні гэтая амаль бязважкая, нібы само паветра, пушынка.
д) Толькі верхавіны соснаў гудзелі ледзь чутна, ды шалясцелі няўмоўчныя трапяткія асіны.

Т Э М А 7
# ПУНКТУАЦЫЯ Ў СКЛАДАНАЗАЛЕЖНЫХ СКАЗАХ

## 7.1 Знакі прыпынку ў складаназалежных сказах

С к л а д а н а з а л е ж н ы я с к а з ы — гэта сказы, у якіх прэдыкатыўныя часткі (галоўная і даданая) звязаны падпарадкавальнай сувяззю і паміж імі выражаюцца розныя віды сінтаксічных адносін: *Ёсць у жыцці шчаслівыя хвіліны азарэння, **калі** ты бываеш найбольш — з даступнага табе — чысты, разумны, натхнёны, відушчы*[1] (Я. Брыль).

Коска ў складаназалежным сказе.

1. Коска ставіцца:

– паміж галоўнай і даданай часткамі: *Пасаджу каля вёсак сады маладыя, каб ты вечна цвіла і ў шчасці расла, дарагая мая Беларусь* (П. Панчанка);
– паміж даданымі часткамі, якія адносяцца да адной і больш галоўных частак: *Глянь туды, дзе машыны спяваюць, дзе палае ў горане сталь, дзе рабочыя песні складаюць пад сталёвы напеў малатка* (П. Трус).

Калі даданая частка стаіць у сярэдзіне галоўнай, яна выдзяляецца коскамі з двух бакоў: *Над ускрайкам лесу, дзе пачыналіся жоўтыя пяскі, зазвінела песня ляснога жаваранка* (Я. Колас).

2. Калі аднародныя даданыя часткі звязваюцца пры дапамозе адзіночных злучнікаў *і, ды* (у значэнні «і»), *або, ці*, то паміж імі коска не ставіцца: *Я люблю часіну навальніцы, калі б'е пярун па ўсіх ладах і злуюцца ў хмарах бліскавіцы* (П. Панчанка).

Перад супраціўнымі злучнікамі і перад злучнікам *і*, які паўтараецца паміж аднароднымі даданымі часткамі, коска ставіцца: *Нарадзіўся я ў маі, як сады вакол цвілі, а ў наднёманскім гаі распявалі салаўі* (А. Русак).

3. Коска не ставіцца перад злучнікамі *і, ды* (у значэнні «і»), *або, ці*, што звязваюць дзве галоўныя часткі, да якіх адносіцца агульная даданая частка: *Калі наступае глыбокая восень, над зямлёй нізка сцелецца туман або імжыць дробны дождж* (К. Чорны).

4. Калі даданая частка звязваецца з галоўнай пры дапамозе састаўных падпарадкавальных злучнікаў (*перш чым, затым што, пасля таго як, для таго каб, па меры таго як, да таго часу пакуль, з прычыны таго што, нягледзячы на тое што, дзякуючы таму што, у сувязі з тым што* і інш.), то коска ставіцца паміж даданай часткай і галоўнай, калі даданая пачынаецца такім злучнікам і стаіць перад галоўнай (злучнік не разрываецца): *З той пары як пайшлі на аблаву, цягнецца іх паляванне да сённяшніх дзён* (А. Куляшоў).

Калі даданая частка сказа стаіць пасля галоўнай, коска ставіцца або перад другой часткай састаўнога падпарадкавальнага злучніка, або перад гэтым злучнікам у поўным яго складзе ў залежнасці ад сэнсу: *Я гэту мову ўзяў сабе таму, што зашмат у ёй было гаротных песень* (М. Танк). *Бабка была спагадлівая да чужога гора, таму што сама перажыла шмат пакут і нягод* (Ю. Пшыркоў).

Репозиторий БарГУ

5. У залежнасці ад сэнсу коска можа ставіцца пасля першай часткі састаўнога падпарадкавальнага злучніка: *Перад тым, як ісці ў поле, яна прыбірала ў хаце, мыла падлогу, лавы* (Б. Сачанка).

6. Коска не ставіцца перад *як, калі, што* і інш., якія ўваходзяць у склад устойлівых выразаў тыпу *як не трэба лепш, як ні ў чым не бывала, калі б то ні было, што б там ні было* і інш.: *Усё было вылічана і вымеркавана як не трэба лепш* (К. Чорны).

7. Калі побач стаяць два падпарадкавальныя злучнікі (ці злучнік і злучальнае слова), а таксама злучальны і падпарадкавальны злучнікі (у сказах з рознымі відамі сувязі), то паміж імі ставіцца коска: *Пот залівае вочы, але, каб не выдаць сваёй слабасці, хлопец не кідаў вёслаў* (І. Шамякін).

8. Калі ў галоўнай частцы другому злучніку адпавядаюць словы *то*, *дык* (калі — то, калі — дык), то перад другім злучнікам коска не ставіцца: *Ужо такі быў гэты чалавек, што калі закарціць у яго якое жаданне, дык ён даможацца свайго* (В. Быкаў).

9. Калі перад падпарадкавальным злучнікам ці злучальным словам стаіць адмоўе *не* або злучальны злучнік (*і, ці, або* і інш.), які звязаны з даданай часткай, то яна не аддзяляецца коскай ад галоўнай часткі: *Нам трэба ведаць не дзе ты быў, а што ты за дзень зрабіў. Ён спакойны і калі заўзята працуе, і калі адпачывае.*

10. Даданая частка ў пазіцыі пасля галоўнай, выражаная толькі адным злучальным словам або спалучэннем слоў, коскай не аддзяляецца: *Яны паехалі і не сказалі куды* [9, с. 108—111].

11. Працяжнік можа ставіцца:

– калі даданая дапаўняльная частка знаходзіцца пасля галоўнай і выдзяляецца лагічна: *Мы хочам — каб мір заўсёды быў на зямлі* (А. Звонак). Параўн.: *Бачу я, з прыродай зліўшыся душой, — як дрыжаць ад ветру зоркі нада мной...* (А. Бакач).

  Пры лагічным жа выдзяленні галоўнай часткі і асабліва працяглай паўзе замест працяжніка ставіцца двукроп'е: *Усё поглядам пытае маладога года: што нясе нам, чым спаткае новая прыгода?* (Я. Колас). *Абавязкова паведаміць не забудзься: калі ў Дуброве будзеце вы будаваць гідрастанцыю* (М. Танк).

– калі даданая дзейнікавая частка стаіць перад галоўнай, у якой адсутнічае ўказальны займеннік, то пры ўзмоцненай



Репозиторий БарГУ

інтанацыі і працяглай паўзе яна аддзяляецца працяжнікам: *Хто з нядоляю рос — устань гартаваць сляды непакорных* (У. Хадыка). *Хто ў грыбы хадзіў — ведае іх смак* (Я. Колас). *Што было — ужо сплыло* (Прыказка).

– у складаназалежных сказах з даданымі часткамі часу;
– калі галоўная і даданая часткі з'яўляюцца развітымі і маюць свае знакі прыпынку: *А калі навальваўся вораг усёй сваёй масай і гатовы быў, здавалася, вось-вось расціснуць, скрышыць, сцерці ў пыл сваёй тэхнікай, артылерыяй, мінамётамі — тады партызаны прасочваліся, праслізалі праз яго баявыя парадкі і тут жа, злучыўшыся, сабраўшыся, зноў білі ворага* (М. Лынькоў);
– калі даданая частка суправаджаецца ўзмоцненай інтанацыяй і падкрэслена лагічна: *Калі ўстане сонца — на рыштаванні ўзыдуць будаўнікі* (Э. Самуйлёнак). *Пакуль спакойна зоры ў нас гараць — палі ў калгасах зноў буду араць* (П. Панчанка);
– калі даданая частка суправаджаецца дадатковым умоўным адценнем: *Толькі выйшлі мы з сяброўкай на шырокую пляцоўку — як памалу ды патрошку нас прывабілі дарожкі...* (П. Глебка). *Як толькі прыеду дамоў — бацька вядзе мяне адразу ў сад* (Я. Брыль).

Калі параўнанне або супастаўленне ў складаназалежным сказе падкрэслена з асаблівай сілай, тады паміж даданай і галоўнай часткамі ставіцца працяжнік: *Гваздзічка белая рассыпана вакол — нібы махрыстыя сняжынкі ляглі на тонкія націнкі* (Я. Колас). *Мільгануў некалькі разоў агеньчык — быццам нехта падаваў сігнал трывогі* (І. Шкуцько).

12. Ставіцца двукроп'е:
– калі адна з даданых частак выдзяляецца лагічна: *Пілiпчык баяўся, што дзядзька не дазволіць яму далёка адыходзіцца ад лагера: таму, нічога не гаворачы, ён пайшоў на востраў адзін* (М. Лынькоў). *Час ад часу мы спыняліся, каб прыслухацца: ці не шаркаюць па жвіры, усцяж рэек, падкаваныя боты патруля...* (Я. Брыль) [3].



Репозиторий БарГУ

## Гласарый

**Складаназалежныя сказы** — гэта сказы, у якіх прэдыкатыўныя часткі (галоўная і даданая) звязаны падпарадкавальнай сувяззю і паміж імі выражаюцца розныя віды сінтаксічных адносін.

## Пытанні для самападрыхтоўкі

1. Якія сказы называюцца складаназалежнымі?
2. Якімі знакамі прыпынку раздзяляюцца часткі ў складаназалежных сказах?
3. Калі паміж часткамі складаназалежнага сказа коска не ставіцца?
4. Калі паміж часткамі складаназалежнага сказа ставіцца коска?

# Трэнінг уменняў

**Заданне 1.** Спішыце сказы, пастаўце прапушчаныя знакі прыпынку і растлумачце іх пастаноўку.

1. Заходзячы раніцай у дыспетчарскі пакой, Люда перш за ўсё кідала позірк на бярозку, вітаючыся з ёй, як з сяброўкай, і заўважала як дзень за днём вясна мяняе яе выгляд. 2. Навальніца дагнала мяне калі я не ад’ехаў і кіламетра ад лесу. 3. Гэта было ў той год калі ўсе травы і кветкі, стомленыя ад спёкі, павыгаралі на карані. 4. Лепш паліваць палын-траву чым дні перабіраць. 5. Нарэшце з правага боку паказалася рэчка што, вырваўшыся з густых хмызнякоў, кацілася ў рэчышчы Бярозы. 6. Спачатку здалося што ў прыбярэжных кустах лазнякоў і чаромхі гулка заспяваў салавей. 7. Як горкі шлях быў на Усход для нас у цяжкую гадзіну так светлым стаў цяпер зварот, зварот дадому, на Радзіму. 8. Чалавек і ад страт багацее калі ён не замкнуўся ў сабе. 9. Ды не знаходжу таго што шукаю. 10. Творчасць М. Багдановіча — жывая крыніца з якой мы будзем яшчэ доўга чэрпаць крыштальную ваду.

**Заданне 2.** Выпішыце нумары сказаў, у якіх на месцы пропуску ставіцца коска. Вусна растлумачце пунктаграмы.

1. Калі ты гай бярозавы спаткаеш у дальнім краі ці між родных ніў … заўжды бярозку тую прыгадаеш, якую сам калісьці пасадзіў.

Репозиторий БарГУ

2. Ты скажаш, што песня не прапета … і што сёння вясна, а не бабіна лета. 3. Я адчуў, што і я не чужы на зямлі … і што гараць на далонях маіх мазалі. 4. Іду між смолак і званочкаў, дзе б'юць крыламі матылі … і не магу душу і вочы красой забытай наталіць. 5. Покуль ніва красуе … і не высахлі рэкі, прыязджайце дахаты, дзе ля ганка жаўцее бярэма свірэнкі … і ад сонца хаваюцца ў пыл кураняты. 6. Для таго, каб даць свету мастака … патрэбны вялікія намаганні многіх пакаленняў. 7. Трэба дбаць, каб сцябло ні адно не змарнела … ды каб зерне расло, налівалася, спела. 8. Штогод … перш чым запаліць кастры на бярозах ды асінах, восень упрыгожвае пушчу дыванамі верасоў. 9. А як вернуцца з чужыны госці лета — гусі … тады з цяжкага блукання з імі і я вярнуся. 10. Дома, пакуль снедаў … усё ўспамінаў старую, адчуваў той светлы настрой, якім яна асвятліла яго.

**Заданне 3.** Спішыце сказы, пастаўце прапушчаныя знакі прыпынку, растлумачце іх пастаноўку.

1. Нарэшце немаладая, апранутая ў ватоўку і валёнкі з галошамі жанчына якая пасвіла карову сказала Высоцкаму што палаткі знялі яшчэ тыдзень назад. 2. Калі ж сядзенне скончылася дзеду так спадабалася цудоўнае спалучэнне працы садоўніка які распланаваў і да часу выхоўваў дрэвы і свавольства прыроды якая вызваліла іх ад прыгнёту нажніц што ён загадаў пакінуць парк у спакоі. 3. Людзі патокам ідуць сюды каб палюбавацца на сабор, спасцігнуць яго непаўторнае хараство і веліч якія застылі ў камені раннегатычнага храма. 4. Так і засталася маці адна ў гэтай цеснай хаце якая колькі мы яе ні падымаем усё роўна ўязджае і ўязджае ў зямлю. 5. Сумна калі нехта адчувае сябе ізгоем калі людзі імкнуцца адмежавацца ад некага нешчаслівага, ад таго хто памыліўся.

**Заданне 4.** Выпішыце з тэксту складаназалежныя сказы, расстаўляючы ў іх знакі прыпынку.

З усіх сродкаў выхавання якія ёсць у нас у людзей самым выпрабаваным і надзейным было і будзе слова.

Репозиторий БарГУ

Нельга не ўстрывожыцца тым што наша школа ўзбройваючыся тэхнічна паспяхова засвойваючы самую сучасную інфармацыю як гэта ні прыкра зніжае свой асноўны паказчык пісьменнасць.

А хто ж як не школа адзіная і галоўная ўстанова па абавязку ўсенароднай сярэдняй адукацыі павінна не толькі навучыць кожнага свайго выхаванца пісьменнасці але і абавязкова даць яму трывалыя асновы эстэтычнай культуры развіць слых і густ да слова каб потым кім бы чалавек ні стаў якую б спецыяльнасць ні выбраў у ім бы жыла патрэба няспыннага духоўнага ўзбагачэння.

Няшчасны на ўсё жыццё той чалавек якому не трапіўся настаўнік які адкрыў бы яму радасць і асалоду далучэння да невыказнага хараства слова да скарбаў паэзіі (Паводле В. Віткі).

## Кантрольны дыктант

### Нараджэнне дзіцяці

Паводле народнага меркавання, з'яўленне на свет дзіцяці, роды — настолькі загадкавыя і таямнічыя з'явы, што набліжаючыся да іх, прытрымліваліся ўсіх спрадвечных звычаяў і абрадаў.

Жанчына, якая жыла ў беларускай вёсцы ў мінулыя часы, зацяжарыўшы, працавала, як звычайна, і нават у другой палове цяжарнасці. Яна вымала цяжкія гаршкі з печы, мясіла хлеб, знаходзілася ў полі пад спякотным сонцам, укладвала сена і снапы на вазы. Нярэдка будучая маці ішла жаць жыта і вярталася адтуль з дзіцём. У шэрагу паветаў Магілёўскай і Мінскай губерняў такіх дзяцей, якія нарадзіліся ў час жніва на жытнім полі, без дапамогі павітухі, называлі «жытнічкамі».

Звычайна ж пры родах карысталіся паслугамі вясковых бабак-павітух. Як правіла, павітуха была жанчына сталага веку, часцей за ўсё ўдава, якая сама перастала раджаць. Яна валодала прасцейшымі прыёмамі народнай медыцыны і выконвала акушэрскія функцыі.

У шэрагу раёнаў Палесся, Цэнтральнай Беларусі, Падняпроўя ў вёсцы звычайна жыла адна вопытная павітуха, якая называлася «родавая бабка», яна прымала роды. Разам з ёю да парадзіхі і нованароджанага запрашалі і другую, так званую прыёмную, бабку, што перавязвала пупавіну і першы раз купала дзіця. Яна затым

Репозиторий БарГУ

і была галоўнай дзеючай асобай на ўсіх этапах радзіннага рытуалу. Звычайна прыёмная бабка даводзілася блізкай сваячкай сям'і, станавілася хроснай бабкай дзіцяці, прыносіла яму падарункі на розныя святы (Паводле Т. Кухаронак). (201 слова).

ТЭМА 8
# ПУНКТУАЦЫЯ Ў БЯЗЗЛУЧНІКАВЫХ СКЛАДАНЫХ СКАЗАХ

## 8.1 Знакі прыпынку ў бяззлучнікавых складаных сказах

Бяззлучнікавыя складаныя сказы — сказы, арганізаваныя з сінтаксічна раўнапраўных або нераўнапраўных прэдыкатыўных частак, якія аб'яднаны бяззлучнікавай сувяззю: *Пасля адлігі закруціў мароз[1], ударыла ў сцены завіруха[2], шыпшыннік за маім акном аброс празрыстым, лёгкім лябядзіным пухам[3]* (С. Грахоўскі); *Няма народаў малых[1] — бываюць малыя паэты[2]* (Р. Баравікова).

Калі ў бяззлучнікавым сказе паміж прэдыкатыўнымі часткамі выражаюцца адносіны адначасовасці або паслядоўнасці дзеяння, звычайна ставіцца коска: *Яшчэ горача свяціла сонца, зусім палетняму дрыжала сінявaтая смуга над пыльнай дарогай, у кустах крушыны свісталі вясёлыя дразды* (І. Навуменка).

Кропка з коскай ставіцца, калі прэдыкатыўныя часткі развітыя, маюць свае знакі прыпынку або не маюць цеснай сэнсавай сувязі: *Адшумела лета каласамі, у паплавах зялёных адцвіло; журавы на поўдзень пад крыламі паняслі ліпнёвае цяпло* (А. Кулакоўскі).

Двукроп'е ў бяззлучнікавым сказе ставіцца:

– калі другая частка паясняе, тлумачыць сэнс першай (можна ўставіць *а іменна*): *Дае прырода зноў урокі нам: не верце цішыні, салодкім снам, бяда і радасць ходзяць побач вечна, людзей ратуе толькі чалавечнасць* (П. Панчанка);

– калі ў другой частцы змяшчаецца прычына таго, пра што паведамляецца ў першай частцы (можна ўставіць словы *бо, таму што*): *Дзень сягоння ў хаце шчаслівы: дарагія прыехалі госці* (К. Буйло);



Репозиторий БарГУ

– калі паміж часткамі можна ўставіць словы *і ўбачыў (бачу), што; і пачуў (чую), што; і адчуў (адчуваю), што*: *Агляну́ўся: кусцікі згінулі ў процьме ночы* (Ц. Гартны);

– калі другая частка змяшчае ў сабе прамое пытанне: *Спрэчка пачалася нечакана: што смачней з усіх вядомых страў?* (П. Панчанка);

– калі першая частка з'яўляецца абагульняльнай да наступных: *Усё навокал было знаёмае і звычайнае: даверліва шапацелі грушы, дрымотна чарнелі на могілках купы вербаў і акацый, шарэў ледзь відна туман на балоце* (І. Мележ).

Працяжнік ставіцца, калі:

– паміж прэдыкатыўнымі часткамі выражаецца хуткая змена падзей (можна ўставіць злучнік *і*): *Раптам бліснула маланка — стала відна, як удзень* (С. Грахоўскі);

– у другой частцы паказваецца вынік, вывад, заключэнне з таго, пра што гаворыцца ў першай частцы (можна ўставіць злучнікі *так што, таму*): *Прыйшло лета — няма калі спаць* (У. Дамашэвіч);

– паміж прэдыкатыўнымі часткамі выражаецца супастаўленне, якое падкрэсліваецца з асаблівай сілай (можна ўставіць злучнікі *а, але*): *Каса не косіць — каса брые* (Я. Колас). Калі супастаўленне афармляецца суадноснымі словамі *то не — гэта, то не — то* і пад., то прэдыкатыўныя часткі раздзяляюцца коскай з працяжнікам: *То не першая пароша запарошыла загон, — гэта поле прыхарошыў кучаравы сіні лён* (А. Бялевіч);

– змест другой часткі параўноўваецца са зместам першай (можна ўставіць злучнікі *як, быццам, як быццам*): *Камбайны ідуць — караблі плывуць*;

– у першай частцы паказваецца час ці ўмова дзеяння, якое адбываецца ці адбудзецца ў другой частцы (можна ўставіць злучнік *калі — то*): *А пойдзе ў танец Галачка — пастой ды паглядзі* (Я. Брыль);

– у сказе выражаюцца далучальныя адносіны, другая частка пачынаецца словамі *гэта, то, так, такі, вось што* і інш.: *Андрэй быў у добрым гуморы — гэта адразу кідалася ў вочы* (А. Зарыцкі) [9, с. 108].

## Гласарый

**Бяззлучнікавыя складаныя сказы** — сказы, арганізаваныя з сінтаксічна раўнапраўных або нераўнапраўных прэдыкатыўных частак, якія аб'яднаны бяззлучнікавай сувяззю.

Рэпазіторый БарДУ

**Пытанні для самападрыхтоўкі**

1. Чым адрозніваюцца бяззлучнікавыя складаныя сказы ад простых сказаў з аднароднымі членамі?
2. Калі ставіцца двукроп'е ў бяззлучнікавым сказе?
3. Калі ставіцца працяжнік у бяззлучнікавым сказе?
4. У якіх выпадках паміж часткамі бяззлучнікавых сказаў ставіцца кропка з коскай?

# Трэнінг уменняў

**Заданне 1.** Вызначце нумары сказаў, у якіх пастаўлена двукроп'е: а) у простым сказе; б) у бяззлучнікавым складаным сказе.

1. За колькі дзён да касавіцы касцы заглянуць на паліцы, каб малаток знайсці і бабку: ідзе работа, не спі ў шапку. 2. Дабрацца да Люцінкі можна двума шляхамі: валожынскім і івянецкім. 3. Не смяшы Хвядос, сціхні: дом не мой — агульны, усіхні. 4. Ва ўсіх куточках нашай зямлі стаяць помнікі мужнасці і гераізму людзей. Яны розныя: вялікія і малыя, сціплыя і велічныя. 5. Ідуць салдаты, і дзіўна, прыемна падумаць: кожны з іх быў малы, кожны з іх быў абцалаваны мамай. 6. Мы зберажом усё: і зуброў, і чалавечнасць, і старыя вежы, і ўсплёскі бабра, і дзіва сонечных палян, і вуркатанне дзікага голуба, і святую гучную цішыню Пушчы. 7. Не хапайся з козамі на торг: і коз прадасі, і грошы праясі. 8. Усе па-святочнаму апранутыя і настроеныя: шахцёры і будаўнікі, калгасныя жнеі і агародніцы, настаўнікі і студэнты… 9. Дае прырода зноў урокі нам: не верце цішыні, салодкім снам, бяда і радасць ходзяць побач вечна, людзей ратуе толькі чалавечнасць. 10. На станцыі саставы і саставы: з цэглаю, з вугалем, пяском, металам, машынамі, абсталяваннем.

**Заданне 2.** Выпішыце нумары сказаў, у якіх на месцы пропуску ставіцца двукроп'е. Вусна растлумачце пунктаграмы.

1. Ёсць такі закон жыцця … шануй чужое аж да пакланення, сваё любі да самазабыцця. 2. З трох крыніц я вады паспытала … наталіла адна Беларусь. 3. Пад поўдзень выбівалася з туману сонца … трава і дрэвы яснелі, неба ўзнімалася вышэй. 4. Жадаю лёсу

Рэпазіторый БарГУ

аднаго … быць камусьці неабходным, не адчуваючы таго. 5. І бачыць дзед Талаш … вялізны дзікі кабан павольна выходзіць з ляснога гушчару і брыдзе па чэрава ў снезе, не зважаючы на дзеда. 6. Прылажыўся дзед Талаш … і гулкі стрэл здрыгануў лясную глухмень. 7. Дзесьці хруснуў сучок … мякка ўпала паблізу хваёвая шышка. 8. Раптам бачу … паволі падае на зямлю адзінокі жоўты лісток. 9. Мусіць, недзе там … у гушчары маладога сасонніку, хаваецца беластволая бярозка. 10. Валодзя добра ведае … нездарма коршак кружыць над полем цэлы ранак.

**Заданне 3.** Вызначце нумары сказаў, у якіх паміж часткамі можна паставіць: а) коску ці кропку з коскай; б) двукроп'е.

1. Было чуваць недзе гудзе трактар. 2. Двое ці трое сяброў шчырасць павольнай размовы вецер з лугоў і бароў сіні дымок сасновы. 3. Пераезд сціх за лініяй чыгункі ў траншэі стаілася чацвёра абаронцаў. 4. Праз хвіліну яму ўжо добра было відаць ідуць двое людзей. 5. Задрамлю і можа, зноў прысніцца, што прынесла з лесу аж сюды вечна маладая чараўніца прыгаршчы гаючае вады! 6. Зямля Беларусі! Мы знаем нямала загінула ў бойках адважных сыноў. 7. На другой фурманцы сядзела двое мужчын адзін з іх быў за фурмана. 8. Думаў я ўсё ж пакідаць родных, усіх, з кім гэтулькі гадоў жыў, нядобра. 9. Знаю няма таго зелля, што хоць на міг ад тугі па Айчыне вылечвае. 10. Толькі снег адзін бялее шэрань лес адзеты.

**Заданне 4.** Спішыце сказы і расстаўце знакі прыпынку паміж часткамі бяззлучнікавых складаных сказаў.

1. Як віхры, машыны бягуць па зямлі, па моры па сінім плывуць караблі. 2. Такі наш век не падай у знямозе! 3. Твар зямлі заснежанай не мёртвы ён зменлівы, як пошум баравы. 4. Хадзіў я па лесе і сведчу ад звонкіх аглух галасоў. 5. Пахне свежая ралля пятрэе сухое бадыллё цвёрды чабор хаваецца ў іржэўнік. 6. На кроне ў высі яснай не аблачынак белы пух дзярэ анёла ястраб. 7. Здаецца, хай пойдзе суткі цёплы дождж папараць зазелянее, пусціцца ў рост і дагоніць малады сасняк. 8. Над Прыпяццю сінее

Рэпазіторый БарДУ

лес адтуль нясе густым водарам, сатканым з пахаў хвоі, прэлай зямлі, грыбоў і багуну. Шырокая лугавіна прымешвае свайго да гэтай разнастайнай гамы пахне аерам, мурагом, салодкай медуніцай. 9. Ліўні прыбавілі людзям работы купаецца бульба ў свежых разорах. 10. Сцвярджае век ты чалавек — не страх, не крах, не прах.

**Заданне 5.** Прачытайце сказы, звяртаючы ўвагу на пунктуацыю. Якія вы заўважылі адхіленні ад прынятых нормаў ужывання знакаў прыпынку паміж часткамі бяззлучнікавых сказаў?

1. Нездарма ў народзе кажуць — рэкі прыцягваюць дождж. 2. Прасторы нябёсаў зарой палымнеюць; сінеюць азёры; бары зелянеюць; гамоняць палеткі; бруяцца крыніцы. 3. Ведайце — чалавек заўсёды мае сілы на пераадоленне жыццёвых цяжкасцей. 4. Памыліўся твой сябар ці родны табе чалавек: дапамажы яму. 5. Раніца першага верасня выдалася хмурная і халодная — уначы ішоў дождж. 6. Вецер загуляе: хвойнік, лозы гнуцца. 7. Адспявала лета песні, усе сабрала каласы — пад сасонкамі, на ўзлессі, расцвітаюць верасы. 8. У народзе пра гэты перыяд гавораць больш вобразна — дзіця гудзе. 9. Радасна і сумна шалясцяць асіны; радасна і сумна шалясцяць дубы.

## Прамежкавы тэставы кантроль

*Адзначце правільныя варыянты адказаў.*

1. *Пералічаныя сказы з'яўляюцца бяззлучнікавымі складанымі сказамі:*
   а) Памалу рабілася цяплей, у лесе ўвогуле было зацішна.
   б) Раней устанеш — болей зробіш.
   в) На палубе шум галасоў, вясёлы смех, баяна звон.
   г) Балота, мокры лес, зноў балота.
   д) Вось толькі пытанне: як рана ён пойдзе ў дарогу?

2. *Двукроп'е ў бяззлучнікавым складаным сказе ставіцца, калі другая частка:*
   а) дапаўняе, раскрывае ці ўдакладняе змест першай;



Репозиторий БарГУ

б) паказвае вынік, вывад з таго, пра што гаворыцца ў першай;
в) абазначае прычыну таго, пра што гаворыцца ў першай;
г) другая частка супрацьпастаўляецца зместам з першай;
д) дапаўняе ў першай выказнік, выражаны дзеясловамі са значэннем успрымання *(адчуў, пачуў, убачыў, заўважыў).*

3. *Працяжнік у бяззлучнікавых складаных сказах ставіцца, калі:*
а) паміж часткамі выражаюцца адносіны часу або ўмовы;
б) абазначае прычыну таго, пра што гаворыцца ў першай;
в) другая частка дапаўняе, раскрывае ці ўдакладняе сэнс першай;
г) змест частак супастаўляецца ці супрацьпастаўляецца;
д) выражаецца хуткая змена падзей, нечаканы вынік.

4. *Сказы, у якіх на месцы пропуску трэба паставіць двукроп'е:*
а) Трэба сказаць праўду … харошае тут месцейка.
б) Маці будзіла снедаць … ён не ўстаў.
в) Позна ўночы Васіль спяшаўся дамоў у Ляды, ён не заўважаў ні дажджу, ні гразкай дарогі … яму хацелася як мага хутчэй расказаць пра ўсё Машы.
г) Лабановіч акінуў вачамі ваколіцы Цельшына … цесна, цёмна і пуста.
д) Яе агортваў страх … а што калі прыйдуць палякі?

5. *Сказы, у якіх на месцы пропуску трэба паставіць працяжнік:*
а) Прыйшла вясна … ужо часу няма, прыйшло лета … бярыся то за тое, то за гэта, надышла восень … яшчэ работ восем.
б) Хацеў сказаць слова … язык не варушыўся.
в) Я добра яго памятаю … Юрка быў худзенькі, шчупленькі і вельмі сарамлівы.
г) Выйшла маці, паклікала вячэраць … адмовіўся.
д) Бліснула маланка … стала відаць як удзень.

6. *Складаныя бяззлучнікавыя сказы, у якіх на месцы пропуску ставіцца коска:*
а) Я па ўсіх прыкметах бачу … будзе сёлета багаты ўраджай.
б) Узыходзіла сонца … ажывалі ручаі, ціха пачынаў шумець лес пад цёплым ветрам.

Репозиторий БарГУ

в) Сышло разводдзе шумна, дружна … раскошна ўмыліся лугі і ў цеплыні заслоны смужнай убор сабе ткуць дарагі.
г) У гаі раптам пацямнела …сюды апусцілася хмара гракоў.
д) Гудуць на ліпах пчолы … за штосьці птушкі сварацца ў гаях.

7. *Складаныя бяззлучнікавыя сказы, у якіх знакі прыпынку расстаўлены правільна:*
а) Расхінае вечар свае крылы, за ракой туманяцца лугі.
б) Падаў першы снег: весела мітусіліся ўвішныя сняжынкі.
в) Ужо зацвілі верасы; пышнае ўбранне лісцевых дрэў, асабліва бяроз, сям-там пачынала жаўцець; даспелы ліст, зрываючыся з галінак ад лёгкага подыху ветру, трапятаўся, як матылёк.
г) Мне было прыемна хадзіць у адзіноце і думаць пад шум дажджу і ручая: ніхто не перашкаджаў.
д) Умеў памыліцца, умей і паправіцца.

8. *Пастаноўка двукроп'я ў сказе* ***Навокал рассцілалася поле, яшчэ даволі стракатае: за жаўтлявым спелым жытам зелянела бульба, з другога боку сінеў лубін*** *матывуецца наступным:*
а) другая частка дапаўняе змест першай;
б) другая частка раскрывае змест першай;
в) другая частка называе прычыну таго, аб чым гаворыцца ў першай;
г) першая частка з'яўляецца абагульняльнай да наступных;
д) другая частка дапаўняе ў першай выказнік, выражаны дзеясловамі са значэннем успрымання *(адчуў, пачуў, убачыў, заўважыў).*

9. *У прапанаваных сказах дапушчана пунктуацыйная памылка:*
а) Кветку-званочак крані — песні пальюцца адтуль жаўруковы.
б) Наблізілася старасць: захацелася адпачынку.
в) Нічога асаблівага не здарылася: зноў вярнулася лета, зноў ласкава грэе сонца...
г) Крычалі на ўсю вуліцу дзеці; далёка, у другім канцы, дзяўчаты спявалі штосьці працяжнае і незнаёмае.
д) Усе лісточкі даўно вецер-сівер разнёс, толькі гэты лісток моцна к дрэву прырос.

Репозиторий БарГУ

10. *Устанавіце адпаведнасць паміж пропускам у складаным бяззлучнікавым сказе і знакам прыпынку, які неабходна паставіць на месцы пропуску. Адказ запішыце.*

а) Хтось палюе на сініцу … нехта ловіць жураўля.
б) І вось незабыўны малюнак … спраўляем улазіны.
в) У ручаіны спеў ажывае … дзень прыбывае.

1) Кропка з коскай;
2) двукроп’е;
3) коска;
4) працяжнік.

# ТЭМА 9
# ПУНКТУАЦЫЯ Ў СКЛАДАНЫХ СКАЗАХ З РОЗНЫМІ ВІДАМІ СУВЯЗІ. ПУНКТУАЦЫЯ Ў СКАЗАХ З ПРОСТАЙ МОВАЙ

## 9.1 Коска, кропка з коскай, двукроп’е, коска з працяжнікам, працяжнік у сказах з рознымі відамі сувязі (камбінаванай будовы)

Складаны сказ з рознымі відамі сувязі — гэта складаны сказ, у якім можа быць разнастайная камбінацыя састаўных частак: звязаныя падпарадкавальнай і злучальнай, злучальнай і бяззлучнікавай, бяззлучнікавай і падпарадкавальнай і іншай сувяззю: *Сонца даўно ўзышло, але трымаўся змрок: промні губляліся ў тумане* (З. Бяспалы).

Калі часткі складаных сказаў з рознымі відамі сувязі звязваюцца (злучнікамі ці без іх) непасрэдна адна з другой, то яны аддзяляюцца тымі знакамі прыпынку, што і часткі складаназлучаных, складаназалежных або бяззлучнікавых складаных сказаў: *Мы гаворым пра ўсё, і калі я раптоўна змаўкаю, яна не здзіўляецца* (Я. Брыль).

Паміж злучальным і падпарадкавальным злучнікамі коска не ставіцца, калі дадзеная частка мае злучальны характар, а яе пропуск парушае сэнс усяго складанага сказа: *Цёмная ноч агарнула лес, але калі прыслухацца, то і ў гэтай цемнаце пульсуе жыццё* (З. Бядуля).

Паміж злучальным і падпарадкавальным злучнікамі ставіцца коска, калі дадзеная частка мае далучальны характар, а яе пропуск не парушае сэнсу ўсяго складанага сказа: *Праз пяць хвілін*



Рэпазіторый БарДУ

*камандзір загадаў ісці далей, і, пакуль сонца апусцілася да захаду, рота прайшла яшчэ пятнаццаць кіламетраў гасцінцам* (К. Чорны).

Калі асобныя часткі складаных сказаў камбінаванай будовы звязваюцца ў блізкія па сэнсу групы, то паміж гэтымі групамі ставіцца коска, кропка з коскай (пры працяглай паўзе) або коска і працяжнік (пры супастаўленні): *На дварэ цёпла — дзеці гуляюць каля хаты, а стане халадней — яны ідуць у хату* (З. Бядуля). *Напэўна б выйшаў сказ тут цэлы, калі б ад самага пачатку апавядаць вам па парадку; але Міхалу непрыемна, бо й тут пан лаяўся дарэмна, а ён стаяў, свяціў вачамі перад людзьмі і леснікамі* (Я. Колас).

Калі пераход ад адной групы частак да другой характарызуецца рэзкай зменай інтанацыі, то паміж гэтымі групамі камбінаванага сказа (перыяду) ставіцца працяжнік, а пры больш працяглай паўзе, развітасці і аслабленай сувязі — коска і працяжнік: *Ці буду я ў шчасці, ці буду я ў смутку, ці буду ў вялікай бядзе — цябе на часінку, цябе на мінутку нідзе не забуду, нідзе* (А. Бялевіч). *Дзе ляжалі дзірванамі панскія абшары, дзе казённыя вякамі пусцелі гушчары, дзе была адна пустэча — елкі ды бярозкі,— поле будзе, пушча згіне, стануць хаты, вёскі* (Я. Купала).

Першая частка камбінаванага сказа аддзяляецца:

двукроп'ем, калі наступныя часткі ўказваюць на прычыну або раскрываюць яе змест: *Зусім нечакана Міхалка ўбачыў цікавы малюнак: ці то кружыліся на гарызонце маленькія мошачкі, ці то проста брыжэла паветра, напоенае густымі пахамі лесу* (З. Бядуля);

працяжнікам, калі наступныя часткі дапаўняюць або развіваюць яе змест: *Не пазнаць — не то вецер надрываецца, не то дзесьці далёка шуміць машына* (М. Гарэцкі) [3].

## 9.2 Двукоссе пры простай мове. Працяжнік у сказах з простай мовай

Выказванні, што належаць іншай асобе, а не таму, хто гаворыць ці піша (аўтару), называюцца чужой мовай. Разнавіднасцю перадачы чужой мовы з'яўляецца простая мова. Простая мова — гэта чужое выказванне, якое перадаецца даслоўна, з захаваннем яго лексічных, граматычных і стылістычных асаблівасцей.



Рэпазіторый БарДУ

1. У залежнасці ад месца слоў аўтара, якія ўводзяць простую мову, ставяцца наступныя знакі прыпынку:

– калі простая мова запісваецца ў радок, яна заключаецца ў двукоссе: *Барвіна праціснуўся праз натоўп да Андрэя і Санкоўскага і з ходу сказаў: «Пойдзем»* (П. Пестрак);
– калі простая мова пачынаецца з абзаца, перад ёй ставіцца працяжнік: *Васіль ужо гатоў быў зноў пакрыўдзіцца, але Ганна добра, шчыра просіць:*
  *— Скажы што-небудзь!...* (І. Мележ);
– калі словы аўтара стаяць перад простай мовай, то пасля іх ставіцца двукроп’е, а простая мова, якая пачынаецца не з абзаца, заключаецца ў двукоссе: *У прамове на ўрачыстым сходзе Якуб Колас гаварыў: «Маё слова, хоць і вузкімі дарогамі, але даходзіла да народа»*;
– калі словы аўтара стаяць у сярэдзіне простай мовы, падзяляючы яе на дзве часткі, то перад словамі аўтара ў залежнасці ад інтанацыйнага афармлення першай часткі простай мовы ставяцца пытальнік, клічнік, шматкроп’е ці коска і ўслед за гэтымі знакамі — працяжнік, а пасля слоў аўтара — або кропка і працяжнік (калі першая частка простай мовы з’яўляецца закончаным сказам), або коска і працяжнік (калі першая частка простай мовы не з’яўляецца закончаным сказам): *«Хіба ж можам мы з табою займацца несур’ёзнымі справамі? — пытаннем на пытанне адказала Надзя і прыгарнула да сябе Майку, прытуліла, як туляць дарослыя малых дзяцей. — Расказвай, як жывеш, як ваюеш?»* (М. Лынькоў). *«Сцяпанка, — сказаў чалавек, — ідзі пасядзі ў цяньку, ты стаміўся»* (К. Чорны). *«Эх, вадзічка... — працягваў Сава, выціраючы твар крысом курткі, — кветкамі пахне»* (П. Пестрак).

2. У словах аўтара могуць ужывацца два дзеясловы са значэннем маўлення, думкі ці блізкія да іх па значэнні; пры гэтым калі другі дзеяслоў адносіцца да другой часткі простай мовы, то пасля слоў аўтара ставяцца двукроп’е і працяжнік: *«Ведаеш, мама, каго я прывяла? — весела сказала дачка і таемна прашаптала: — Гэта той самы госць, якога мы ўсе калісьці ратавалі ад немцаў»* (Я. Маўр).

3. Калі ў складзе слоў аўтара, што стаяць перад простай мовай, няма дзеясловаў са значэннем маўлення, думкі ці блізкіх да іх па



Репозиторий БарГУ

значэнні, то ў канцы слоў аўтара ставіцца кропка: *Урэшце дзед дастае з кішэні кавалак хлеба.*

*— Еш, Віхор... На-а-а...* (З. Бядуля).

*Віктар заплюшчыў вочы і на ўвесь пакой прытворна захроп. «Хай думае, што я сплю...»* (Б. Сачанка).

4. Калі словы аўтара ідуць за простай мовай, то пасля простай мовы ў адпаведнасці з інтанацыяй ставяцца пытальнік, клічнік, шматкроп'е ці коска (на месцы кропкі), а за гэтымі знакамі — працяжнік:

*— Што вы сёння нешта не ў гуморы? — запыталася Ядвіся і глянула на настаўніка* (Я. Колас).

*— Эх, што за мясціна! — пачаў ён [Лабановіч] і раптам перапыніў самога сябе* (Я. Колас).

*«Вам, Лескавец, відаць, хочацца, каб асабіста вас пахвалілі», — Ліда сказала гэта як бы між іншым, нават не павярнуўшыся да яго* (І. Шамякін).

5. Нявыказаная простая мова, пры якой у складзе слоў аўтара звычайна ёсць дзеяслоў *думаць* (*падумаць*) або іншыя словы, спалучэнні слоў і нават сказы са значэннем думкі, меркавання, разважання і пад., заўсёды бярэцца ў двукоссе: *«Во ўскочыў дык ускочыў», — чухаў патыліцу Яўхім Бабай* (Б. Сачанка).

6. Рэплікі дзвюх і больш асоб (у дыялогу) звычайна запісваюцца з чырвонага радка і з працяжнікам перад кожнай рэплікай:

*— Ты па вёсцы вольна ходзіш?*

*— Хаджу, як і хадзіў. А што?*

*— Нічога, нікога не баішся?*

*— Я не злодзей, не забойца. Чаго ж мне баяцца? (Б. Сачанка).*

*— Бой быў, Валя.*

*— Дзе?*

*— Над морам. Далёка.*

*— З кім?*

*— Невядома* (І. Мележ).

7. Калі некалькі рэплік запісваюцца ў радок без указання, каму яны належаць, то паміж імі ставіцца працяжнік і кожная з іх бярэцца ў двукоссе: *«Вы яшчэ не былі ў сваёй школе?» — «Не, не была. І не ведаю, якая яна там. А вы ўжо даўно тут?» — «А ўжо зараз два месяцы будзе»* (Я. Колас).

8. Калі пасля папярэдняй рэплікі ідуць словы аўтара, то перад наступнай рэплікай працяжнік не ставіцца: *Нарэшце адчыняюцца*



Репозиторий БарГУ

*дзверы, недзе брэша сабака, уваходжу. Перада мной хлопчык з лямпай у руках. «Ты што тут робіш?» — пытаюся. «Нічога, — кажа. — Чыстапісанне пішу»* (В. Быкаў) [9, с. 131—134].

## 9.3 Знакі прыпынку пры цытатах і спасылках

Ц ы т а т а — гэта даслоўная вытрымка з чыйго-небудзь выказвання, з кнігі іншага аўтара. Цытата звычайна выкарыстоўваецца ў навуковых працах, лекцыях, дакладах, рэфератах, сачыненнях, у розных творах як эпіграф.

Цытата афармляецца як простая і як ускосная мова.

Невершаваная цытата заўсёды бярэцца ў двукоссе; калі цытата суправаджаецца словамі аўтара, яна афармляецца, як простая мова, напрыклад: *Ф. Скарына пісаў: «Любіце і шануйце як святыню, роднае слова, з якім вас літасцівы Бог на свет пусціў». «Трэба, каб са слоў і дзеянняў чалавека было відаць, які ён», — гаварыў М. Горкі.*

Цытата, уключаная ў тэкст як частка сказа, пачынаецца з малой літары (у адным сказе можа быць некалькі цытат), напрыклад: *Я. Колас падкрэсліваў, што «добра быць у дарозе, якую ты сам выбіраеш...».*

У цытатах захоўваюцца тыя ж знакі прыпынку, што і ў крыніцы, якая цытуецца. Калі сказ цытуецца часткова, то замест прапушчанага тэксту перад пачаткам цытуемага сказа ці ў сярэдзіне яго, ці ў канцы ставіцца шматкроп'е, напрыклад: *В. Бялінскі падкрэсліваў цесную ўзаемасувязь, якая існуе паміж думкамі і словам: «...слова, — пісаў ён, — покрыва, адзенне, форма адлюстравання думкі, а думка ёсць сэнс, розум, значэнне слова».*

Цытата абавязкова суправаджаецца спасылкай на аўтара, якога цытуюць.

Спасылкі афармляюцца паводле ўстаноўленага ДАСТ, напрыклад: [4, с. 234] — 4 — нумар крыніцы, з якой узята цытата; с. 234 — дакладная старонка, на якой знаходзіцца цытата.

Правілы паслядоўнасці знакаў прыпынку пры спасылках:

1. Коска, кропка з коскай, двукроп'е і кропка ставяцца пасля лічбы або зорачкі, якія з'яўляюцца знакамі-паказальнікамі спасылкі (каб указаць, што спасылка адносіцца да пэўнага слова ці групы слоў): ...[1], або ...[2]; або ...*; або ...**.

Рэпазіторый БарДУ

2. Пытальнік, клічнік, шматкроп'е і двукоссе ставяцца перад знакам спасылкі (лічбай ці зорачкай): ...?[1]; або ...![2]; або ...»*.

3. Пасля знака спасылкі (лічбы ці зорачкі), які размешчаны за двукоссем, кропка захоўваецца: ...»[1]; або ...»** [9, с. 140].

## 9.4 Перыяд. Яго афармленне на пісьме

У беларускім мовазнаўстве пад **перыядам** разумеецца асобая сінтаксічная канструкцыя (складаны ці просты ўскладнены сказ), якая характарызуецца паводле зместу паўнатой і закончанасцю выказанай думкі, адзінствам тэмы, а паводле інтанацыі падзяляецца на два кампаненты («павышэнне» і «паніжэнне»), паміж якімі ў маўленні робіцца значная (даўжэйшая, чым у канцы звычайнага сказа) паўза, а на пісьме пераважна ставіцца працяжнік. (*Заўвага. // — мяжа паміж часткамі.)*

*І радасць — ніякая радасць, а горыч,*
*І песня — ніякая песня, а скарга,*
*І страва — ніякая страва, а камень,*
*І брага — ніякая брага, а слёзы,*
*І сонца — ніякае сонца, а крыга, — //.*
*Калі ты на свеце ўсім гэтым*
*Не маеш з кім падзяліцца* (М. Танк).

### Гласарый

**Перыяд** — асобая сінтаксічная канструкцыя (складаны ці просты ўскладнены сказ), якая характарызуецца паводле зместу паўнатой і закончанасцю выказанай думкі, адзінствам тэмы, а паводле інтанацыі падзяляецца на два кампаненты («павышэнне» і «паніжэнне»), паміж якімі ў маўленні робіцца значная (даўжэйшая, чым у канцы звычайнага сказа) паўза.

**Простая мова** — гэта чужое выказванне, якое перадаецца даслоўна, з захаваннем яго лексічных, граматычных і стылістычных асаблівасцей.

**Складаны сказ з рознымі відамі сувязі** — гэта складаны сказ, у якім можа быць разнастайная камбінацыя састаўных частак: звязаныя падпарадкавальнай і злучальнай, злучальнай і бяззлучнікавай, бяззлучнікавай і падпарадкавальнай і іншымі відамі сувязі.

**Цытата** — гэта даслоўная вытрымка з чыйго-небудзь выказвання, з кнігі іншага аўтара.



Репозиторий БарГУ

## Пытанні для самападрыхтоўкі

1. Адзначце асаблівасці пастаноўкі знакаў прыпынку ў складаных сказах з рознымі відамі сувязі.
2. Пералічыце асаблівасці пастаноўкі знакаў прыпынку ў сказах з простай мовай, калі словы аўтара знаходзяцца перад словамі простай мовы і пасля іх.
3. Пералічыце асаблівасці пастаноўкі знакаў прыпынку ў сказах з простай мовай, калі словы аўтара знаходзяцца ў сярэдзіне простай мовы.
4. Як правільна аформіць цытаты?
5. Як афармляюцца спасылкі?

# Трэнінг уменняў

**Заданне 1.** Выберыце правільны варыянт пастаноўкі знакаў прыпынку на месцы пропускаў.

1. *Возера пакалыхвала свае хвалі ... і ... каб пачуць іх шум ... трэба было дужа ўважліва прыслухоўвацца да гамонкі дробных хваляў ... што ... як срэбра ... пераліваліся на сонцы.*

   1) Працяжнік, коска, коска, працяжнік, коска, коска;
   2) коска, коска, коска, коска, коска, коска;
   3) працяжнік, коска, працяжнік, коска, коска, коска;
   4) кропка з коскай, коска, коска, коска, працяжнік, працяжнік.

2. *Яшчэ не скора тыя дні ... калі пачне сеяцца дождж ... яшчэ стаіць цёплае, сонечнае надвор'е ... але ўжо адчуваецца ... лес быццам насцярожыўся ў прадчуванні не такіх і далёкіх перамен.*
   1) Коска, коска, коска, двукроп'е;
   2) коска, коска, коска, працяжнік;
   3) коска, кропка з коскай, коска, коска;
   4) коска, коска, працяжнік, двукроп'е.

3. *Яшчэ не паспела абудзіцца сяло ... а ўжо ўсе зналі ... лесніку вядома ... хто выкапаў капцы ... хто што гаварыў і нават думаў.*

   1) Коска, працяжнік, коска, коска;
   2) коска, двукроп'е, коска, коска;
   3) працяжнік, двукроп'е, коска, коска;

Репозиторий БарГУ

4) коска, працяжнік, двукроп’е, коска.

4. *Здаецца … усё па-летняму было … і сонца шчыра грэла … і луг у промнях зыркіх за сялом свяціў сваёй чупрынай парыжэлай.*
   1) Працяжнік, двукроп’е, коска;
   2) коска, двукроп’е, працяжнік;
   3) двукроп’е, працяжнік, коска;
   4) коска, двукроп’е, коска.

5. *Адчуваючы … што юнацтва мінае … мы думаем … а што за той мяжой … дзе пачынаецца сталасць … дзе розум бярэ верх над пачуццямі?*
   1) Коска, коска, працяжнік, коска, коска;
   2) коска, коска, коска, двукроп’е, коска;
   3) коска, коска, двукроп’е, коска, коска;
   4) коска, працяжнік, двукроп’е, коска, коска.

**Заданне 2.** Спішыце сказы, пастаўце прапушчаныя знакі прыпынку, растлумачце іх пастаноўку.

1. Пад вечар дзіўна выглядалі хвоі і елкі з паўднёвага боку яны былі цёмна-зялёныя бо сонца зняло іней а з паўночнага — сівавата-белыя, халодныя, змрочныя, з абвіслым галлём ад цяжкага ледзянога срэбра. 2. Недзе паверсе хадзіў вецер але на дарозе, унізе, было ціха толькі аднойчы калі справа зашарэла поле вецер шырока ўварваўся на дарогу, стаў мокра біць у твар. 3. Каля плота пакалыхваўся дзікі кмен разросся, выпусціў сваё шырокае лісце лопух густымі купкамі ўзялася расці піжма, глухая канапелька і пакалыхваў шара-празрыстымі, пухкімі, а дзе палысельымі ўжо, чубатымі макаўкамі дзьмухавец і пры беразе хвойніку жоўта-яснымі махрыстымі кветачкамі зацвіў валаснік і зазвінеў ад пчол нізкі ліловы чабор. 4. Часта сніцца што ў яе зноў хворае сэрца што яна зноў задыхаецца і яна прачынаецца ў халодным поце і слухае сваё сэрца. 5. Набрынялі на дрэвах пупышкі зялёным туманам задыміўся лес запахла грыбамі растапі цёплыя дымчатыя аблокі на чыстым небе запарыла зямля змоўклі ручаі і высахлі курганы.

**Заданне 3.** Спішыце, расстаўляючы прапушчаныя знакі прыпынку. Вусна растлумачце іх пастаноўку.



Репозиторий БарГУ

У жыцці на нейкім пераломе яго чалавек як бы заварочвае назад і нібы галоўным клопатам становіцца яшчэ раз прайсці пражытае. Можа таму гэтакімі кароткімі на сон робяцца старэчыя ночы. Усё думае думае чалавек пра тое што было і пра тое што ёсць цяпер
і сіліцца звязаць усё ў адно разгадаўшы вечную загадку жыцця
і мабыць непакоіцца не прызнаючыся самому сабе з сумотаю
і болем, што хутка хутка... (А. Жук).

**Заданне 4.** Вызначце нумары сказаў, у якіх простую мову, запісаную з чырвонага радка, трэба браць у двукоссе.

1. Гэта нашы партызаны б’юцца са шляхтай, — падумаў дзед. 2. Ён марыў юнаком: Сваю гармонь набуду і першым жаніхом на ўсю воласць буду… 3. Што гэта будзе тут? — думаў Юлік Барановіч. 4. Сябры гаварылі пра хлопца: Баявы партызан быў добры работнік і сёння. 5. Сама яна падумала: Дарэмна ты, мілая, прыкідваешся сіратою. 6. Нічога на свеце не пашкадуем, — думалася Вольцы, — дзень і ноч будзем працаваць, аграному спакою не дамо, а вырасцім лён на дрэннай зямлі. 7. Я ў полі прыбіраю жыта ды сама сябе пытаю: Як мой сын у яслях? 8. У аўтабіяграфіі Янка Купала пісаў: Маладыя гады мае прайшлі страшэнна пагана. 9. На гэты раз інтуіцыя цябе не падвяла, — сказаў Іван Васільевіч.

**Заданне 5.** Прачытайце сказы, знайдзіце сярод іх перыяды. Дайце ім характарыстыку.

1. Ад неба да зямлі — падаць рукой. Яшчэ бліжэй ад радасці да слёз, ад жаваранка — да яго гнязда, ад гулкіх струнаў скрыпкі — да смыка. Ад гронак вінаградных — да віна, ад хлебнага акрайца — да зубоў. І толькі я не ведаю, чаму далёка так ісці да твайго сэрца? 2. Хмара нібы асшчапілася маланкай, прагучаў магутны ўдар грому, і дождж лінуў — густы і цёплы. 3. Яшчэ ў калысцы я навучыўся з песень сніць аб гэтых блізкіх мне, а цесных так мясцінах: што роднай нівы я мільённая часціна, што зоркі роднай у сэрцы мне іскрынка тліць. 4. Непакой за цябе, зямля мая, за твой ураджай, спакойны сон, за дрэва кожнае ў гаях, за весніх песень



Репозиторий БарГУ

пераzвон, непакой за цябе, зямля мая, — мой хлеб надзённы. 5. Кій, на які ў жыцці не абапрэшся, нож, якім хлеба сябрам не адкроіш, кубак, з якога вады не нап'ешся, соль, якой гутарку, смех не падсоліш, дружба, не зведаўшая ліхалецця, слава без працы мазольнай, упартай, слова, якое не грэе, не свеціць, — нічога не варты.

## Спіс рэкамендаваных крыніц

### Асноўны

1. *Бурак, Л. І.* Пунктуацыя беларускай мовы / Л. І. Бурак. — 3-е выд., дап. і перапрац. — Мн. : Нар. асвета, 1982. — 223 с.

2. *Буракова, М. У.* Беларуская мова. Арфаграфія і пунктуацыя / М. У. Буракова, В. А. Ляшчынская, З. У. Шведава ; пад рэд. В. А. Ляшчынскай. — Гомель : ГДУ ім. Ф. Скарыны, 2006. — 237 с.

3. *Лепешаў, І. Я.* Практыкум па беларускай мове : вучэб. дапаможнік / І. Я. Лепешаў, Г. М. Малажай, К. М. Панюціч. — Мн. : Выш. шк., 2005. — 316 с.

4. Правілы беларускай арфаграфіі і пунктуацыі. — Мн. : Нац. цэнтр прававой інфарм. Рэсп. Беларусь, 2008. — 144 с.

5. *Яўневіч, М. С.* Сінтаксіс сучаснай беларускай мовы: падруч. для студэнтаў філал. спецыяльнасцей устаноў, якія забяспечваюць атрыманне выш. адукацыі / М. С. Яўневіч, П. У. Сцяцко. — Мн. : Аверсэв, 2006. — 286 с.

### Дадатковы

1. *Бурак, Л. І.* Сучасная беларуская мова: Арфаграфія і пунктуацыя : практыкум / Л. І. Бурак, І. Л. Бурак. — Мн. : Універсітэцкае, 1993. — 247 с.

2. Сучасная беларуская мова : вучэб. дапаможнік / Л. М. Грыгор'ева [і інш.] ; пад агул. рэд. Л. М. Грыгор'евай. — Мн. : Выш. шк., 2006. — 559 с.

3. *Сямешка, Л. І.* Курс беларускай мовы / Л. І. Сямешка, І. Р. Шкраба, З. І. Бадзевіч. — Мн. : Універсітэцкае. — 1996. — 654 с.

Рэпазіторый БарГУ

# *КАНТРОЛЬНЫ БЛОК*

## КАНТРОЛЬНЫ ТЭСТ ПА МОДУЛІ 1

[6, с. 122—131]

### Варыянт 1

#### Частка А

*Адзначце правільныя варыянты адказаў.*

А1. *Словы, у якіх прапушчана літара* ***ё:***

а) рады…вышка;
б) рады...актыўны;
в) рады...біёлаг;
г) рады...выпрамяненне;
д) рады...пеленгатар.

А2. *Словы, у якіх прапушчана літара* ***э****:*

а) скан...р;
б) Інтэрн...т;
в) тун...ль;
г) рэзюм...;
*д)* с...рвіс.

А3. *Словы, у якіх прапушчана літара* ***а:***

а) відэ...інжынер;
б) аўды...касета;
в) радэ...;
г) вінчэст...р;
д) Пот...р.

А4. *Словы, у якіх прапушчана літара* ***о:***

а) ст...літровы;
б) сл...ваформа;
в) м...талодка;
г) герц...г;
д) і...наабмен.

Репозиторий БарГУ

А5. *Словы, у якіх прапушчана літара* ***е:***

а) рады...тэрапія;
б) вас…мнаццаць;
в) восемдз...сят;
г) в...лікамучанік;
д) пік... .

А6. *Словы, у якіх прапушчаны спалучэнні літар* ***іа (ыа):***

а) становчыя мед...паказчыкі;
б) наведалі ...рданію;
в) ...нічнае мора;
г) загадкавае Антар...;
д) ...рыхонская труба.

А7. *Словы, у якіх прапушчаны спалучэнні літар* ***ія (ыя):***

а) мед...ндустрыя;
б) від...пракат;
в) ...зуіцкі;
г) ...нізатар;
д) Іл…да.

А8. *Словы, у якіх прапушчана літара* ***я:***

а) в...лікадушны;
б) пяцьдз...сят;
в) в...лікадзяржаўны;
г) васьмідз...сяты;
д) рады...логія.

А9. *Словы, у якіх прапушчана літара* **ь** *(мяккі знак):*

а) восен...скі;
б) астрахан...скі;
в) казан...скі;
г) проц...ма;
д) венесуэл...скі.

А10. *Словы, у якіх прапушчана літара* **ы***:*

а) пост...ндустрыяльны;
б) дэз…нтэграваць;
в) між...нстытуцкі;

Репозиторий БарГУ

г) супер...нтэндант;
д) перад...нфарктны.

А11. *Словы, у якіх замест пропуску пішацца літара **ў** (у нескладовае):*
а) якасны ліноле...м;
б) лячэнне ...льтрагукам;
в) кейпта...нская прырода;
г) рады...с-вектар;
д) невылечная гла…кома.

А12. *Дзеясловы, якія заўсёды пішуцца па-беларуску з суфіксам **-ірава- (-ырава-):***
а) инфицировать;
б) конструировать;
в) парировать;
г) калькировать;
д) апанироваць.

А13. *Словы, у якіх замест пропуску пішацца апостраф:*
а) наў...ючваць;
б) М...янма;
в) над...едзены;
г) нечарназем...е;
д) Лавуаз...е.

А14. *Пары слоў, у якіх беларускія эквіваленты напісаны правільна:*
а) масштаб — масштаб;
б) многоместный — мнагаместны;
в) предмостный — перадмаставы;
г) присвистнуть — прысвіснуць;
д) поимённый — пайменны.

А15. *Правільныя варыянты форм слоў:*
а) світра (світар);
б) знатка (знаток);
в) верасня (верасень);
г) майстра (майстар);
д) ліпня (ліпень).

Репозиторий БарГУ

A16. *Пары назоўнікаў, напісанне якіх адпавядае арфаграфічнай норме:*

а) спальня — спальнь;
б) сотня — соцен;
в) студзень — студзеня;
г) шэршань — шэршня;
д) багор — багора.

A17. *Абрэвіятуры, напісаныя правільна:*

а) фабзаўком (фабрычна-заводскі камітэт);
б) фізрук (кіраўнік фізкультуры);
в) галаўком (галоўнакамандуючы);
г) селькар (сельскі карэспандэнт);
д) лінкар (лінейны карабель).

A18. *Словазлучэнні, у якіх два словы пішуцца з вялікай літары:*

а) (Н, н) араджэнне (Х, х) рыстова;
б) (Дз, дз) ень (В, в) едаў;
в) (В, в) енера (М, м) ілоская;
г) (Г, г) ерой (Б, б) еларусі (узнагарода);
д) (Дз, дз) яржаўная (Д, д) ума (орган кіравання ў Расіі).

A19. *Словазлучэнні, у якіх прыметнікі пішуцца з малой літары:*

а) Ушэсце (Г, г) асподняе;
б) (К, к) рычаўскае паўстанне;
в) (Л, л) ютаўская рэвалюцыя;
г) (З, з) алаты век;
д) (Я, я) нтарны пакой (прадмет мастацтва).

A20. *Словы, напісанне якіх не адпавядае новым арфаграфічным правілам:*

а) фітнес-йога;
б) шніцэль;
в) васемнаццаць;
г) Мекка;
д) пяцьдзясят.

Рэпазіторый БарГУ

## Частка Б

Б1. Запішыце па-беларуску словазлучэнне *великовозрастный тинейджер.*

Б2. Запішыце па-беларуску словазлучэнне *компостное удобрение.*

Б3. Утварыце і запішыце абрэвіятуру са слоў *гарадскі выканаўчы камітэт.*

Б4. Запішыце па-беларуску *третьеразрядник.*

Б5. Запішыце ў родным склоне словазлучэнне *гарнец жыта.*

Б6. Устанавіце адпаведнасць паміж пропускамі ў словах і літарамі, якія неабходна ўставіць. Запішыце правільны адказ.

| | |
|---|---|
| а) Экз...куцыя; | 1) літара ***а;*** |
| б) Венесу...ла; | 2) літара ***о;*** |
| в) чырлід...ры; | 3) літара ***э;*** |
| г) штэпс...ль; | 4) літара ***е;*** |
| д) юні...р; | 5) літара ***ё.*** |

# Варыянт 2

## Частка А

*Адзначце правільныя варыянты адказаў.*

А1. *Словы, у якіх прапушчана літара **ё:***
а) рады...лячэнне;
б) рады...рубка;
в) рады...спорт;
г) рады...нукліды;
д) рады...часопіс.

А2. *Словы, у якіх прапушчана літара **э:***
а) экз...мпляр;

Репозиторий БарГУ

б) партман...;
в) с…рвіз;
г) фрыкас...;
д) сак... .

А3. *Словы, у якіх прапушчана літара* ***а:***
а) Піт...р;
б) відэ...камера;
в) бар...ль;
г) сальфеджы...;
д) аўды...прадукцыя.

А4. *Словы, у якіх прапушчана літара* ***о:***
а) сл...ватворчасць;
б) ст...гадовы;
в) ф...такопія;
г) шніц...ль;
д) м...тагонкі.

А5. *Словы, у якіх прапушчана літара* ***е:***
а) дз...сяцера;
б) і...рогліф;
в) рады...вугляродны;
г) рэл...;
д) семдз...сят.

А6. *Словы, у якіх прапушчаны спалучэнні літар* ***іа (ыа):***
а) ...нічныя астравы;
б) ...русалімская вуліца;
в) беларускі мед...рынак;
г) п...раўскі ход;
д) прыгожы Ток... .

А7. *Словы, у якіх прапушчаны спалучэнні літар* ***ія (ыя):***
а) пл...да;
б) партфол...;
в) аўд...відэасістэма;
г) с...мскія;
д) мед...энцыклапедыя.

Репозиторий БарГУ

A8. *Словы, у якіх прапушчана літара **я:***

а) дз...вяты;
б) в...лікасвецкі;
в) і...рэй;
г) верхн...азёрны;
д) с...мнаццаць.

A9. *Словы, у якіх прапушчана літара **ь** (мяккі знак):*

а) сычан...скі;
б) урал...скі;
в) дзевяц...сот;
г) снежан...скі;
д) цзянмын...скі.

A10. *Словы, у якіх прапушчана літара **ы:***

а) пост...мперскі;
б) двух...мпульсны;
в) спорт...нвентар;
г) дэз...нфекцыйны;
д) пад...нтэгральны.

A11. *Словы, у якіх замест пропуску пішацца літара **ў** (у складовае):*

а) наведалі Ланьчжо...;
б) Кіева-Пячэрская ла...ра;
в) выйшлі з са...ны;
г) цікавая фра...;
д) выбралі прэзіды...м.

A12. *Дзеясловы, якія заўсёды пішуцца па-беларуску з суфіксам **-ірава- (-ырава-):***

а) капитулировать;
б) курсировать;
в) лавировать;
г) мелиорировать;
д) будировать.

A13. *Словы, у якіх замест пропуску пішацца апостраф:*

а) між...ярусны;
б) мангальф...ёр (паветраны шар);

Репозиторий БарГУ

в) культ...інвентар;
г) між...імперыялістычны;
д) мыш...яковы.

A14. *Пары слоў, у якіх беларускія эквіваленты напісаны правільна:*
а) лестница — лесвіца;
б) многовёрстный — мнагавёрсты;
в) пестролистный — стракаталісты;
г) разноименный — разнаіменны;
д) подкостный — падкостны.

A15. *Правільныя варыянты форм слоў:*
а) грэбня (грэбень);
б) успышк (успышка);
в) шатра (шацёр);
г) юнка (юнак);
д) свёкра (свёкар).

A16. *Пары назоўнікаў, напісанне якіх адпавядае арфаграфічнай норме:*
а) заяц — заяца;
б) віхар — віхру;
в) гросмайстар — гросмайстра;
г) корань — кораня;
д) шасцярэнька — шасцярэнек.

A17. *Абрэвіятуры, напісаныя правільна:*
а) фабком (фабрычны камітэт);
б) наркам (народны камісар);
в) зямфонд (зямельны фонд);
г) спяцназ (атрад спецыяльнага прызначэння);
д) ООН.

A18. *Словазлучэнні, у якіх два словы пішуцца з вялікай літары:*
а) (Дз, дз) ень (П, п) ерамогі;
б) (О, о) рдэн (А, а) йчыны;
в) (Ц, ц) арыца (Н, н) ябесная;
г) (Н, н) ацыянальны (К, к) ангрэс (у ЗША);
д) (В, в) ялікая (С, с) убота.

Репозиторий БарГУ

А19. *Словазлучэнні, у якіх прыметнікі пішуцца з малой літары:*
- а) Дзень (К, к) астрычніцкай рэвалюцыі;
- б) Першая (С, с) усветная вайна;
- в) (С, с) вяты Дух;
- г) (М, м) іжнародная прэмія Міру;
- д) Бярэзінскі (Б, б) іясферны запаведнік.

А20. *Словы, напісанне якіх не адпавядае новым арфаграфічным правілам:*
- а) адажыа;
- б) шымпанзэ;
- в) дзевяты;
- г) камп'ютэршчык;
- д) дзярж'юрвыдавецтва.

## Частка Б

Б1. Запішыце па-беларуску словазлучэнне *рейдерская операция.*

Б2. Запішыце па-беларуску словазлучэнне *контрастный фотоснимок.*

Б3. Утварыце і запішыце абрэвіятуру са слоў *Савет Народных Камісараў.*

Б4. Запішыце па-беларуску *жароустойчивый.*

Б5. Запішыце назоўнік *адзёр* у родным склоне.

Б6. Устанавіце адпаведнасць паміж пропускамі ў словах і літарамі, якія неабходна ўставіць. Запішыце правільны адказ.

| | |
|---|---|
| а) Вестмінст...р; | 1) літара ***а***; |
| б) ...ўрабачанне; | 2) літара ***о***; |
| в) Мака...; | 3) літара ***э***; |
| г) Ні...гара ; | 4) літара ***е***; |
| д) Эфі...пія; | 5) літара ***я.*** |

Репозиторий БарГУ

# КАНТРОЛЬНЫ ТЭСТ ПА МОДУЛІ 2

## Варыянт 1

*Адзначце правільныя варыянты адказаў.*

1. *Сказы, у якіх на месцы пропускаў неабходна паставіць працяжнік:*
   а) Каханне … зарука вечнасці жыцця.
   б) Купіць касу … гэта, брат, штука!
   в) Далоні ад працы … быццам люстэркі: прыгледзеўшыся, убачыш, што ў іх увесь дзень адлюстраваны, а можа, і гады.
   г) Дарога … хоць кацíся.
   д) Людзі ў нас … дбалыя, гасцінныя.

2. *Сказы, у якіх на месцы пропускаў трэба паставіць коскі:*
   а) Жыву, як тое кола ў млыне: то міг на сонцы … то ў вадзе.
   б) Люблю ліпнёвы грыбасей … і ціш палёў, і водар мяты.
   в) Завея рве пухавікі … ды па твары б'е халоднай лапай.
   г) А нам з табой упарта сніцца сцяжынка вузкая мая, бярозак юных завушніцы … і рабін зялёная сям'я.
   д) Як хочацца вярнуць усё назад … і маладосць, і салаўіны сад, і закаханы позірк той дзяўчыны.

3. *Сказы, у якіх ставіцца коска на месцы кожнага пропуску:*
   а) Неба несціхана слязілася … ці то драбнюткім дожджыкам … ці то буйнай вільгаццю.
   б) Кашуля мела круглы … або чатырохвугольны … ці касы выраз.
   в) Барвовасць … ды блакіт … ды бель садоў расквецілі, нібы вясёлкай, далі.
   г) Стрэхі крыты шыферам ці гонтаю … ці чарапіцай.
   д) Рака была на доўгім кавылі … і на пушыстым мятліку … і на пунсовых кубачках макаў.

4. *Сказы, у якіх пры абагульняючых словах трэба паставіць двукроп'е:*
   а) З грудка мне ўсё відаць і ўсё чутно і трактар дзесь з-за Балачанкі, і гром сталёвае маланкі, і спеў дзявочы з Беразянкі.

Репозиторий БарГУ

б) І двор, і дарога, і лес усё было занесена снегам, ад якога бялела ў вачах.
в) Стэп і неба ўсё ў змроку шэрым.
г) Грузяць на машыну рэчы кнігі, шафы, стол і ложкі.
д) У гэтай будыніне хаваліся галоўныя калгасныя прадукты зерне, бульба і агародніна.

5. *Сказы, у якіх выдзеленыя словы адасабляюцца:*
а) Над лесасекай *зарослай густымі кустамі арэшніку* плыло павуцінне бабінага лета.
б) Андрэй *спяшаючыся* саскочыў на другі бок калёс, хуценька пабег ад дарогі глыбей у лес і там, адбегшыся, за кустамі стаіўся.
в) Воддаль *пад старымі бярозамі* гуляюць дзеці.
г) Вечар ступіць *туманны* на раскошныя пожні і акрые траву-мураву.
д) Зоркі можна было ўбачыць *глянуўшы ўбок*, у вузкія прагаліны паміж дрэвамі.

6. *Сказы, у якіх выдзеленыя словы адасабляюцца:*
а) Зранку хмары *ўсё яшчэ цёмныя* ішлі з мора на горы.
б) Кацер *узняўшы над ціхай вадою гордыя грудзі* памчаў нас, як белая птушка.
в) Барыс маўчаў *як мыла з'еўшы.*
г) Ціха варушылі сваімі галінамі ўкрытыя маладым лісцем дрэвы.
д) *Акрамя індывідуальных заплываў* у чэрвені іншых спаборніцтваў не праводзілася.

7. *Сказы, у якіх развітыя дапасаваныя азначэнні патрэбна выдзеліць коскамі:*
а) З дрыжаннем сэрца дабег ён да завулка, дзе быў доўгі і нізкі дом знаёмы з маленства.
б) Проста на Андрэя рухаўся знаёмы з дзяцінства натоўп.
в) Абложанае бялявымі хмарамі неба, здавалася, ніжэй павісла над зямлёй.
г) Маці стаяла ля печы. Расчырванелая ад агню яна налівала на скавараду драўлянаю лыжкаю цеста з дранай бульбы.
д) Сонца занадта нейкае жывое і дрыготкае за Нарачанскай запаліла лес.

Репозиторий БарГУ

8. *Сказы, у якіх знакі прыпынку пастаўлены правільна:*

а) Я тваіх вачэй смяшынкі, як нябесны дар, люблю.

б) За сталом Лена сядзела як на іголках: ёй вельмі хацелася паглядзець, што прынёс у скрутку бацька.

в) Пан Мечыслаў ведаў Бірулю, як сябра Жукоўскага.

г) Зямля для Аўдзея была як кладоўка.

д) Мясцовыя краявіды быццам створаныя для кахання.

9. *Сказы, у якіх выдзеленыя курсівам канструкцыі трэба выдзеліць дужкамі ці працяжнікамі:*

а) Паддасць *бывала* дзядзька руху, пачуўшы холад-завіруху.

б) Беларусы-перасяленцы, ці самаходы *як іх называлі* абжывалі тайгу ў многіх дзікіх мясцінах.

в) Варта было падумаць пра начлег, бо параход *як сказалі яму на станцыі* будзе толькі раніцаю.

г) Адсюль, з гэтага пагорка, не раз любаваўся роднымі Мікуцічамі *пад такой назвай паказваецца вёска Мікалаеўшчына ў трылогіі «На ростанях»* Андрэй Лабановіч.

д) Асеннімі днямі бацька *тады не было яшчэ вайны і маці была жывая* прыцемкам уставаў малаціць.

10. *Сказы, у якіх на месцы пропускаў трэба паставіць коскі:*

а) Ты каля печы грэеш рукі … мілая, а я б дыханнем іх адаграваў.

б) Нават … прынца казачнага ўсмешку да твайго акна не дапушчу.

в) Тонкі лёд … напэўна … не вытрымаў бы чалавека, каб той спыніўся на месцы.

г) Лаўлю дрыготкія агні вачэй, якія … здаецца … свецяць толькі мне.

д) Хлопчык збіраў пралескі … яны дыхалі свежасцю маладой вясны … ў маленькі кучаравы букецік.

11. *Сказы, у якіх набраныя курсівам словы выдзяляюцца коскамі:*

а) А пытанне гэтае *трэба сказаць* не дробязь.

б) Па гэтым пероне Ліда *напэўна* не раз хадзіла.

в) І сам ты *сынок* глядзі, не прагаварыся.

г) Пазней *на двары ўжо быў вечар* пачалі сыходзіцца людзі.

д) Ой *вы* вёскі мае дарагія!



Репозиторий БарГУ

12. *Складаназлучаныя сказы, у якіх знакі прыпынку паміж сэнсава-граматычнымі часткамі пастаўлены правільна:*
   а) Плыве ў тумане вечар разамлелы — а ў духаце чаромхавых завей шчыруе асмялелы, утрапёны, вясёлы, задушэўны салавей.
   б) Толькі ўчора, здаецца, плылі ручаі, і веснавое сонца зямлю цалавала.
   в) Зорка пазвоньвае ў шыбу, і месяц за зоркай імчыць.
   г) Да сонца ўстанеш — і з плячэй гара.
   д) Доўга песню хаваў шпак за морам ад сцюжы і слоты, затое яна ў цёплай дзюбе цяпер і звініць, і булькоча.

13. *Сказы, у якіх на месцы пропускаў трэба паставіць коскі:*
   а) Хто вы … і што вам трэба?
   б) Вось адгарэла восень залаціста-чырвонымі барвамі … і абляцела жоўта-бурае лісце асін, бяроз, клёнаў.
   в) Увесь свет не схопіш вокам … дык я вока і не віню.
   г) Не ўтрымаеш у руках … і разаб'юцца аб зямлю ландышы-званочкі.
   д) Вышэй у неба цягнецца дрэва … а карані глыбей ідуць у зямлю.

14. *Сказы, у якіх на месцы пропускаў трэба паставіць коскі:*
   а) Як бы мы ні пастарэлі … няхай і летам, і зімой юнацтва сінія арэлі ляцяць між небам і зямлёй.
   б) Так спрадвеку павялося … што знайсці мы ўсе павінны свайго шчасця, свайго лёсу, свайго сэрца палавіну.
   в) Я да цябе прапісаны, мой край, матулі наймілейшымі вачыма, якіх … хоць цэлы свет ты абшукай, мілей знайсці ніколі немагчыма.
   г) Я ніколі таго саду не забуду, дзе сінічкі ўзляталі гурбой … і дзе, як вечнаму цуду, мы дзівіліся бэзу з табой.
   д) Бор … калі сонца ўзыходзіць … быццам срэбрам заліты.

15. *Сказы, у якіх трэба паставіць дзве коскі:*
   а) Калі б магло каменне гаварыць дык таямніцы нашае зямліцы на дзіва нам яно магло б раскрыць такія што і ў снах не могуць сніцца.

Репозиторий БарГУ

б) За гады ён так звыкся з Дуброўскім што хоць і быў чалавекам сціплым лічыў яго сваім сябрам і нярэдка ўступаў у шчырыя прыяцельскія размовы.
в) Адкуль было Арцёму Іванавічу ведаць пра нейкія брыганціны калі ён за жыццё не збудаваў не толькі карабля а і лодкі і бачыў тое мора хіба з берага!
г) Непаўторным водарам у ліпені настоена паветра на сухіх палянках дзе ўжо выкінуў свае залацістыя кветкі святаяннік і абліўся бэзавым колерам чабор.
д) Мікола не столькі аддаваў увагі таму дзеля чаго сюды прыехаў колькі любаваўся строгай прыгажосцю ўбранай у снегавое адзенне пушчы.

16. *Сказы, у якіх на месцы пропускаў трэба паставіць працяжнік:*
а) Намарозіць радня па крыві … адагрэе радня па долі.
б) Шумяць пшаніцаю даліны … цвітуць вішнёвыя сады.
в) Гляджу … сусед згружае жыта, бадзёра выгукнуўшы «так!».
г) Над намі — неба полаг распісны, гукні … любая зорка адзавецца.
д) Жыць без сэрца не маю права … мне не дазволяць людскія справы, людскія вочы, людская вернасць.

17. *Сказы з рознымі відамі сувязі, у якіх знакі прыпынку паміж сэнсава-граматычнымі часткамі пастаўлены правільна:*
а) Я з табою багаты, разумны, харошы дык няўжо ты дазволіш, каб стаў я нічым без цябе?
б) Аддзячыць поле табе, аддзячыць ракою звонкай сваіх зярнят, яму вось толькі б адчуць і ўбачыць: што ты не знекуль, а з гэтых хат.
в) Блішчаць сенажаці травой-аксамітам, хвалюецца возера спелага жыта, і шум канюшыны ўзлятае з лагчын.
г) Пятрок усміхнуўся: тое, што казаў цясляр, ён ужо чуў на рынку.
д) Пакута творчасці, пакута спасціжэння мастацтва — салодкая катарга, і не варта рабіць выгляд быццам гэта самае страшнае для мастака.

Репозиторий БарГУ

18. *Прапанаваны варыянт пастаноўкі знакаў прыпынку ў сказе* ***Каці сёння не пазнаць яна сядзіць маўклівая ціхая і толькі калі да яе звяртаюцца мякка ўсміхаецца*** *правільны:*
   а) працяжнік, коска, коска, коска, коска;
   б) працяжнік, коска, коска, коска;
   в) двукроп'е, коска, коска, коска, коска;
   г) двукроп'е, коска, коска, коска;
   д) коска, коска, коска, коска, коска, коска.

19. *У пералічаных сказах дапушчаны пунктуацыйныя памылкі:*
   а) Пасля таго, як Кавалевіч і Гарэльчык вярнуліся ад Баклана, яны яшчэ доўга сядзелі і гаварылі.
   б) З той пары як пайшлі на аблаву, цягнецца іх паляванне да сённяшніх дзён.
   в) Бабка была спагадлівая да чужога гора, таму што сама перажыла шмат пакут і нягод.
   г) Яшчэ большую прыемнасць ён [Андрэй] адчуў, калі даведаўся, што Драбок прысланы спецыяльна і што ён ужо прыязджаў сюды па Андрэя ўчора.
   д) Мяне ўжо радуе і тое, што ночка стала ўбываць, і што ад мёртвага спакою пачне прырода ажываць.

20. *Сказы з простай мовай, у якіх трэба паставіць коску:*
   а) «А ты, Ядвіська, калі ласка, заспявай» — звярнуўся пан да дачкі.
   б) «Вершы пісаць — вялікая навука» — з захапленнем гаворыць Юрка.
   в) «Няўжо яны ўбачылі наш кулямёт» — буксавала ў адчаі думка.
   г) «Калі пашанцуе, то і з адной калодкі можна развесці піолкі» — гаварыў Сёмка, абціраючы цыбук проста аб халат.
   д) «Спалілі вас» — адразу спытаў дзядзька.

## Варыянт 2

*Адзначце правільныя варыянты адказаў.*

1. *Сказы, у якіх на месцы пропускаў неабходна паставіць працяжнік:*
   а) Раса … салаўіная песня, на пацеркі разабраная.

Репозиторий БарГУ

б) Чытанку дзецям падарыць … цяжкая доля і свята.
в) Спазнанне рэчаіснасці … гэта першая прыступка жыцця кожнага чалавека.
г) Лес … ціхі, бадзёры, свежы.
д) «Ты … мой лепшы дарадца», — сказала Марына бабулі.

2. *Сказы, у якіх знакі прыпынку пры аднародных членах пастаўлены правільна:*
а) Ішла, ляцела, спадзявалася, і думала, што шчасце назаўжды.
б) Двор, і кветнік, і белыя бярозы — усё зіхацела ў пераспелых росах.
в) Хіба маці нас не расціла, не любіла, песень нам не спявала, нас не вучыла спяваць?
г) Паабапал дарогі гайдалася жыта, густое з цяжкімі каласамі.
д) А я журыўся і смяяўся, калі спявалі «Песняры» і пра Алесю, і пра Яся, пра тры дарожанькі ў бары.

3. *Сказы, у якіх азначэнні з'яўляюцца аднароднымі і раздзяляюцца коскамі:*
а) Лясной малінай палымнее грымлівае … маланкавае лета.
б) Міхась спыніўся каля высокага … прыгожа афарбаванага будынка.
в) У гладышы пагнулі галовы прывялыя … чырвоныя вяргіні.
г) Горад зіхацеў сінімі … белымі … жоўтымі агнямі.
д) Хацелася зазірнуць за дзіўны … борам акаймаваны далягляд.

4. *Сказы, у якіх пры абагульняючых словах трэба паставіць двукроп'е:*
а) У нас і цыбуля і сала і бульба ўсё ёсць.
б) Ад спёкі застыла ўсё і далёкі сіні лес, і поле, і хаты, і самі людзі…
в) Дрэвы, стагі, будынкі ўсё гэта злівалася з гарызонтам.
г) Вясна, кажуць, прыгожая ўсюды і ў полі, і ў лесе, і ў горадзе.
д) Яна ўзялася за работу набрала бярэмя дроў, унесла ў хату і стала класці ў печ.

5. *Сказы, у якіх выдзеленыя словы адасабляюцца:*
а) На маім акне для вавёркі была заўсёды насыпана горачка сланечнікавых семечак, ляжаў драбок цукру і *знарок засушаны* пернік.

Репозиторий БарГУ

б) Сцежка *караткаватая, не болей як на паўкіламетра* бегла ад рэчкі пад серабрыстыя купчастыя вербы.
в) Раптам самалёт, у якім ляцелі мы *нядаўнія студэнты*, быццам дакрануўся крылом да воблака.
г) *Стоячы ў глыбокім снезе на прасветленым полі* адчуваеш сябе як на зямлі першароднай.
д) Алена ехала дадому *хвалюючыся*.

6. *Сказы, у якіх азначэнні трэба выдзеліць знакамі прыпынку:*
а) Узбунтавала ўсю душу вясновая чаромха прыгожая, пяшчотная, чароўная.
б) Прысыпаныя снегам сосны сустрэлі мяне на паваротцы маўчаннем.
в) У небе плылі ружовыя ад сонца воблачкі.
г) Беларускай прыродзе заўсёды патрэбны прамень сонца, каб сціплая, скрытая ў сваіх непрыметных фарбах яна засвяцілася асаблівай чароўнасцю і пяшчотнай прыгажосцю.
д) Усё сваё жыццё жаўна ці чорны дзяцел праводзіць на ствалах дрэў і ў дупле.

7. *Сказы, у якіх развітыя дапасаваныя азначэнні патрэбна выдзеліць коскамі:*
а) Паветра напоенае густымі пахамі хвоі навісла шызаватай смугой.
б) Гудзе, вірыць запоўненая гараджанамі плошча.
в) Зоська адразу ўпала на прысыпаны снегам мох.
г) Зачараваная суровай прыгажосцю ракі Зоська не магла адвесці да яе вачэй.
д) Пафарбаваныя марозам, абмытыя дажджом заснулі ціхія бярозы ўночы пад акном.

8. *Сказы, у якіх на месцы пропускаў трэбы паставіць коскі:*
а) Не старэеш ты ў маіх вачах, з мінулага выходзячы … як з гаю.
б) Па родных мясцінах, бацькоўскіх звычаях, дзіцячых забавах сумуе … як выгнанніца … заклапочаная душа.
в) З першых памятных мне дзён на працягу трыццаці гадоў жыцця тата быў для мяне … як самае надзейнае апірышча і абарона.



Репозиторий БарГУ

г) Касец, прагаладаўшыся … як след, над скавародкай завіхаўся дбала.
д) Быццам у танцы … выгінала тонкі стан рака Іслач.

9. *Сказы, у якіх выдзеленыя курсівам канструкцыі трэба выдзеліць дужкамі ці працяжнікамі:*
а) Хацелася неадкладна кудысьці бегчы, нешта рабіць *здаецца я пачынаў адчуваць у сабе сілу і рашучасць* супраціўляцца абставінам.
б) Кароткія перапынкі паміж работаю выкарыстоўваў Марцін для спраў рыбацкіх, балазе Нёман быў *як кажуць* пад самым бокам.
в) Няможна *мабыць* нам на свеце жыць, каб свет, які б ні быў ён, не любіць!
г) Каля Нёмана *а быў ён тут зусім блізка* пачулася песня.
д) Не ўбачыш *вядома*, дзе маладосць канчаецца.

10. *Сказы, у якіх набраныя курсівам словы трэба выдзеліць коскамі:*
а) Не кожны *можа* з гонарам вытрымаць боль неразздзеленага кахання, упэўнена пайсці далей па дарозе свайго жыцця і на развітанне пажадаць любаму чалавеку шчасця.
б) Мы з вамі *здаецца* знаёмыя.
в) Юнацтва *пра гэта ўжо сказана неаднойчы* дае выдатную мажлівасць стаць такім, якім яшчэ ніхто не быў.
г) *Можа* з гадзіну цягнулася навальніца і ішоў пралійны дождж.
д) Я спатыкнулася аб хмары тваіх вачэй *каханы*.

11. *Сказы, у якіх набраныя курсівам словы выдзяляюцца коскамі:*
а) Расказы пра чароўнасць возера Нарач ішлі ад паселішча да паселішча і *нават* даходзілі да іншых краін.
б) Мне *здаецца*, што няма больш прыгожых мясцін, чым у нашым азёрным краі.
в) Я *напрыклад* прынцыпова ніколі не крытыкую сваіх прыяцеляў.
г) Як ні цяжка *дачушка*, а душу беражы.
д) У гутарцы старшыня *як кажуць* браў ініцыятыву ў свае рукі.

12. *Сказы, у якіх на месцы пропускаў трэба паставіць коскі:*
а) Зязюля пачала адлік нам строгі … а ў лесе зноў пайшлі баравікі.
б) На доўгім шасце залацее цыбуля … і свецяцца яблыкі ў цесных кашах.


Рэпазіторый БарДУ

в) Апошняе намаганне … і мы ў тамбуры вагона.
г) Увосень шасціць пад нагамі мох … і гарыць верас сіняватымі кветкамі.
д) Пах суніц … і водар жывіцы.

13. *У пералічаных сказах, у якіх дапушчаны пунктуацыйныя памылкі:*
а) Ці мала на свеце цудоўных мясцін ці мала добрых і шчырых людзей!
б) Цёпла, і ўтульна.
в) У нізінах мякка закучаравілася трава, і пракінуліся залатыя вочкі кураслепу.
г) Згарэлі дровы, а вуголле яшчэ захоўвала агонь
д) Момант — і Сцёпкава постаць знікае з вачэй.

14. *Сказы, у якіх на месцы пропускаў трэба паставіць коскі:*
а) Глядзіць Мар’яна … як мітусяцца хвоі … прыслухоўваецца да шуму … што ідзе ад лесу.
б) Не верце … калі хто скажа … што … хоць адна дарога ў жыцці лёгкая.
в) Калі ўначы сніцца што-небудзь з дзяцінства … тады агортвае жаласлівасць да маці … вобраз якой непарыўна звязаны з той парой.
г) Як не прайсці па ціхіх пожнях … дзе безліч прагуло вятроў … і столькі шэрых ліўняў позніх!
д) Сасна такая высокая … што … калі спрабуеш глянуць на яе вяршыню … шапка звальваецца з галавы.

15. *Сказы, у якіх трэба паставіць дзве коскі:*
а) Там дзе чарнеў алешнік разлілася сажалка якая ўвабрала ў сябе ўсю ясную сінь летняга неба.
б) Ледзь толькі мы прычалілі да берага дзеці якія даўно заўважылі лодку і з нецярплівасцю чакалі акружылі нас.
в) Дома бацька вельмі часта меркаваў аб тым колькі спатрэбіцца новага дрэва каб перанесці на новае месца хату.
г) Іван не хваляваўся бо калі Кавалёў пачне пярэчыць то ў яго ў запасе ёсць яшчэ аргументы.
д) Міхал як толькі ажаніўся тады ж ад бацькі аддзяліўся бо стала цесна.

Репозиторий БарГУ

16. *Сказы, у якіх на месцы пропускаў трэба паставіць двукроп'е:*

а) Юшка, прыгатаваная ў той вечар, атрымалася адмысловая … яна была з добрым рыбным наварам і прыемным летнім дымком, замешаным на водары свежаскошанай травы і позніх лугавых кветак.

б) Спявалі дразды свае сумныя песні … нястомна зязюля лічыла гады.

в) Баба з возу … каню лягчэй.

г) Пісьменнікі, раскрываючы знешнюю прыгажосць каханых, услаўлялі, абагаўлялі сваю адзіную і непаўторную … Максім Багдановіч — Вераніку, Янка Купала — Паўлінку, Аркадзь Куляшоў — Алесю.

д) У зорнае небя гляджу і адчуваю … штосьці павінна адбыцца з маёю душой.

17. *Сказы з рознымі відамі сувязі, у якіх знакі прыпынку пастаўлены правільна:*

а) Алесь заўсёды з замілаваннем глядзеў на жытняе поле: маці расказвала яму, што з усіх раслін, якія растуць на полі, самай чуйнай і самай разумнай з'яўляецца жыта.

б) Уся кампанія знаходзілася ў тым цудоўным узросце, калі асноўны цяжар жыццёвых праблем быў яшчэ наперадзе і душу кожнага перапаўнялі ўспаміны пра незабыўныя школьныя і студэнцкія гады.

в) З расчаравання вырасла пытанне — ці быў той храм, калі быў грунтам лёд?

г) У лесе, у засені калматых елак, яшчэ трымаліся гурбы брудна-сіняга снегу і было вільготна, а ў хмызняках і на высечках ужо зазелянела трава.

д) Мы як дубы: нас можна знішчыць громам, але з зямлі нас роднай не скрануць.

18. *Прапанаваны варыянт пастаноўкі знакаў прыпынку ў сказе* ***Пачуццё шырокае вольнае кружыла Андрэя і ён ужо адчуваў што яму гэтаму пачуццю рабілася цесна ў грудзях*** *правільны:*

а) коска, коска, коска, коска, коска, коска;

б) коска, коска, коска, коска, коска, коска, коска;

Рэпазіторый БарДУ

в) коска, коска, коска, коска, коска;
г) коска, двухкроп’е, коска, коска, коска, коска, коска;
д) коска, коска, коска, коска.

19. *У пералічаных сказах дапушчаны пунктуацыйныя памылкі:*

а) Нават здаралася, што калі канчалася паліва, яна мабілізоўвала персанал бальніцы, ішла разам з усімі ў лес і на самацягах прывозіла дровы.
б) Андрэй заняў месца каля акна і, як толькі выехалі з горада, пачаў углядацца ў некалі да драбніц знаёмую дарогу.
в) Немцы так і не пачалі сваёй пятай атакі, і, як стала цямнець, на грудок да Леўчуковага акопчыка прыбег ротны Мяжэвіч.
г) Яна думала, што, каб Пеця быў недзе тут недалёка, у родным краі, і ваяваў сярод гэтага высокага жыта, у якім так лёгка схавацца, ці вунь у тым лесе, што відзён за Дняпром, на душы ўсё было б куды спакайней.
д) Мы гаварылі, бо ўжо нам можна было гаварыць аб усім і маўчалі, бо добра было і маўчаць, і спыняліся часта, бо нас тут, на ціхім аснежаным лузе, не бачыў ніхто.

20. *Сказаў з простай мовай, у якія трэба паставіць працяжнік.*

а) «Лаві, лаві яго! Караул!» крычалі яны і гналіся за Саўкам.
б) Як гром пранёсся кліч «Таварышы, прэч цара! Далоў вайну! Далоў людскае гора!»
в) «Го, падмарожваць пачало!» весела прамовіў паляшук Сцяпан Рылка.
г) Зімавец схапіў трубку «Вайцюк?... Тэк-тэк… Што?»
д) «Удзячнасці ў нас малавата», думаў сам сабе Андрэй да болю адчуваючы сабе вінаватым перад некім.

Репозиторий БарГУ

## КЛЮЧЫ ДА ТЭСТАВЫХ ЗАДАННЯЎ

### Прамежкавы тэставы кантроль

#### Модуль 1

Тэма 1. **Прынцыпы беларускай арфаграфіі**
**1.** д. **2.** г, д. **3.** б, г. **4.** в, д. **5.** в, д, е, ж, к, л, м, н, с, т, у, х. **6.** а, б, в, ж, л, м, р, с, т, х.

Тэма 2. **Правапіс галосных**
**1.** в, г, д. **2.** а, г, д. **3.** б, в. **4.** б, в, д. **5.** в, д. **6.** а, б, в, д. **7.** а, б, г, д. **8.** б, в, д. **9.** а, г, д. **10.** б, д.

Тэма 3. **Правапіс зычных**
**1.** б, г. **2.** б, в, д. **3.** б, в, г. **4.** б, г. **5.** а, в, д. **6.** б, в, г. **7.** б, г, д. **8.** а, в, д. **9.** а, б, д. **10.** а, в, г.

Тэма 8. **Правапіс *не (ня)* з рознымі часцінамі мовы**
**1.** в, г. **2.** а, в, д. **3.** б, в, д. **4.** в, г, д. **5.** в, г. **6.** а, в, д. **7.** в, г, д. **8.** а, д. **9.** б, г. **10.** б, д.

#### Модуль 2

Тэма 2. **Пунктуацыя пры аднародных членах сказа**
**1.** а, д. **2.** б, в, г, д. **3.** а, б, г, д. **4.** б, в. **5.** а, в, г, д. **6.** б. **7.** а, г **8.** а, б, в, д. **9.** в, г. **10.** б, в, д.

Тэма 4. **Пунктуацыя пры параўнальных зваротах і зваротках**
**1.** б, г. **2.** в. **3.** в, г. **4.** б, д. **5.** б, д. **6.** б, г. **7.** б, в, г. **8.** а, б, г. **9.** б, д. **10.** а, г.

Тэма 5. **Пунктуацыя пры пабочных і ўстаўных словах, словазлучэннях і сказах**
**1.** а, г. **2.** б, в, г. **3.** б, г, д. **4.** б, в, г. **5.** б, в, д. **6.** б, г. **7.** а, б. **8.** б, д. **9.** а, б, д. **10.** б, г, д.

Тэма 6. **Пунктуацыя ў складаназлучаных сказах**
**1.** б, г, д. **2.** а, г. **3.** а, д. **4.** а, в. **5.** в, г, д. **6.** а, г. **7.** а, б. **8.** а, в, г. **9.** а, в, д. **10.** д.

Тэма 8. **Пунктуацыя ў бяззлучнікавых складаных сказах**
**1.** а, б, г. **2.** а, в, д. **3.** а, г, д. **4.** а, в, г, д. **5.** а, б, г, д. **6.** б, д. **7.** а, в, г. **8.** в. **9.** б. **10.** А4Б2В3.



Репозиторий БарГУ

## Кантрольны тэст па модулі 1

### Варыянт 1

**Частка А**

**А1.** а, д. **А2.** б, в, г, д. **А3.** а, в, г. **А4.** б, в, д. **А5.** а, в, г, д. **А6.** б, в, г. **А7.** а, д. **А8.** б, в, г. **А9.** а, г, д. **А10.** б, д. **А11.** б, в, д. **А12.** а, в, д. **А13.** б, в, г. **А14.** в, г, д. **А15.** а, б, д. **А16.** в, г. **А17.** б, г, д. **А18.** а, в, г, д. **А19.** в, г. **А20.** а, б, в.

**Частка Б**

**Б1.** Вялікаўзроставы тынейджар. **Б2.** Кампоснае ўгнаенне. **Б3.** Гарвыканкам. **Б4.** Трэцеразраднік. **Б5.** Гарца жыта. **Б6.** А4, Б3, В1, Г4, Д5.

### Варыянт 2

**Частка А**

**А1.** 4. **А2.** 5. **А3.** 6. **А4.** 7. **А5.** 8. **А6.** 9. **А7.** 10. **А8.** а, д. **А9.** б, в, г. **А10.** а, г, д. **А11.** а, г, д. **А12.** б, в, д. **А13.** а, д. **А14.** а, б, в. **А15.** а, б, г. **А16.** б, в, г, д. **А17.** б, в. **А18.** а, в, г. **А19.** б, д. **А20.** в, г, д.

**Частка Б**

**Б1.** Рэйдарская аперацыя. **Б2.** Кантрасны фотаздымак. **Б3.** Саўнаркам. **Б4.** Гарачаўстойлівы. **Б5.** Адру. **Б6.** А1, Б4, В1, Г5, Д2.

## Кантрольны тэст па модулі 2

### Варыянт 1

**1.** а, б, г. **2.** а, б. **3.** в, г, д. **4.** а, г, д. **5.** а, б, в, д. **6.** а, б, г, д. **7.** а, в, г. **8.** а, б, г, д. **9.** г, д. **10.** а, в, г. **11.** а, б, в. **12.** в, г. **13.** в, д. **14.** а, б, в, д. **15.** а, в, д. **16.** а, г. **17.** б, в. **18.** г. **19.** а, д. **20.** а, г.

### Варыянт 2

**1.** а, б, в, д. **2.** б, в, д. **3.** б, г, д. **4.** б, г, д. **5.** б, в, г. **6.** а, г, д. **7.** а, г, д. **8.** а, б, д. **9.** а, г. **10.** б, г, д. **11.** в, г, д. **12.** а, б. **13.** а, б, в. **14.** а, в, д. **15.** в, г. **16.** г, д. **17.** а, д. **18.** б. **19.** а, д. **20.** а, в, д.

Рэпазіторый БарГУ

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ


1. Беларуская мова : тэматычны трэнажор : Сінтаксіс : Пунктуацыя : для падрыхтоўкі да цэнтралізав. тэсціравання / А. І. Калечыц [і інш.]. — Мн. : Аверсэв, 2008. — 141 с.

2. Беларуская мова : Тэорыя. Тэсты : для школьнікаў і абітурыентаў / Э. Д. Блінава [і інш.]. — Мн. : Выш. шк., 2004. — 384 с.

3. *Бурак, Л. І.* Пунктуацыя беларускай мовы / Л. І. Бурак. — 3-е выд., дап. і перапрац. — Мн. : Нар. асвета, 1982. — 223 с.

4. *Буракова, М. У.* Беларуская мова. Арфаграфія і пунктуацыя / М. У. Буракова, В. А. Ляшчынская, З. У. Шведава ; пад рэд. В. А. Ляшчынскай. — Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны, 2006. — 237 с.

5. *Кулеш, Г. І.* Рэпетытар па беларускай мове : Фанетыка, арфаэпія і правапіс : для падрыхтоўкі да цэнтралізав. тэсціравання / Г. І. Кулеш, Г. К. Ціванова. — Мн. : Аверсэв, 2008. — 128 с.

6. *Кулікові̌ч, У. І.* Вучымся пісаць па-новаму : вучэб. дапаможнік па беларус. арфаграфіі / У. І. Кулікові̌ч. — Мн. : Конкурс, 2009. — 144 с.

7. *Марозава, Я. Н.* Рыхтуемся да цэнтралізаванага тэсціраваннння / Я. Н. Марозава. — Віцебск : УА «ВДУ імя П. М. Машэрава», 2007. — 148 с.

8. Новае ў беларускай арфаграфіі. Правілы. Заданні. Тэсты. Слоўнік : вучэб. дапаможнік / У. І. Кулікові̌ч. — Мн. : Новое знание, 2009. — 104 с.

9. Правілы беларускай арфаграфіі і пунктуацыі. — Мн. : Нац. цэнтр прававой інфарм. Рэсп. Беларусь, 2008. — 144 с.

10. *Сіўковіч, В. М.* Беларуская мова. Практыкум для старшакласнікаў і абітурыентаў / В. М. Сіўковіч. — Мн. : УніверсалПрэс, 2005. — 240 с.

11. Сучасная беларуская літаратурная мова : тэсты для тэмат. кантролю : вучэб. дапам. для студэнтаў філал. фак. устаноў, якія забяспечваюць атрыманне выш. адукацыі / аўт.-склад. А. І. Калечыц [і інш.] ; пад рэд. П. А. Міхайлава. — Мн. : Адукацыя і выхаванне, 2006. — 280 с.

12. *Сямешка, Л. І.* Курс беларускай мовы / Л. І. Сямешка, І. Р. Шкраба, З. І. Бадзевіч. — Мн. : Універсітэцкае. — 1996. — 654 с.

13. *Цыбульская, С. І.* Беларуская мова : вучэб.-трэніров. тэсты для падрыхт. да тэсціравання і экзамену / С. І. Цыбульская. — Мн. : ТэтраСистемс, 2005. — 224 с.

14. *Цыбульская, С. І.* Школьны курс беларускай мовы ў табліцах і тэстах : Падрыхтоўка да цэнтралізаванага тэсціравання і экзамену : у 2 ч. / С. І. Цыбульская. — Ч. І. — Мн. : Сэр-Вит, 2008. — 296 с.


Репозиторий БарГУ

15. *Цыбульская, С. І.* Школьны курс беларускай мовы ў табліцах і тэстах : падрыхтоўка да цэнтралізаванага тэсціравання і экзамену : у 2 ч. / С. І. Цыбульская. — Ч. ІІ. — Мн. : Сэр-Вит, 2008. — 320 с.

16. Цэнтралізаванае тэсціраванне. Беларуская мова : поўны зб. тэстаў / Рэсп. ін-т кантролю ведаў М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь. — Мн. : Аверсэв, 2009. — 509 с.

17. *Яўневіч, М. С.* Сінтаксіс сучаснай беларускай мовы: падруч. для студэнтаў філал. спецыяльнасцей устаноў, якія забяспечваюць атрыманне выш. адукацыі / М. С. Яўневіч, П. У. Сцяцко. — Мн. : Аверсэв, 2006. — 286 с.

## Слоўнікі

1. Арфаграфічны слоўнік беларускай мовы / І. У. Кандраценя, Л. П. Кунцэвіч ; Інстытут мовы і літаратуры НАНБ ; пад рэд. А. А. Лукашанца. — Мн. : ТетраСистемс, 2009. — 704 с.

2. *Баршчэўская, А. Л.* Арфаграфічны слоўнік беларускай мовы / аўт.-склад. А. Л. Баршчэўская, Л. П. Баршчэўскі. — Мінск : Радыёла-плюс, 2010. — 560 с.

3. Русско-белорусский словарь : Более 108 000 слов : в 2 т. / под ред. К. К. Артаховича (Кондрата Крапивы). — 2-е изд., доп. и перераб. — Минск : Белорус. Сов. Энцикл., 1982. — Т. 1. А—О — 648 с.

4. Русско-белорусский словарь : Более 108 000 слов : в 2 т. / под ред. К. К. Артаховича (Кондрата Крапивы). — 2-е изд., доп. и перераб. — Минск : Белорус. Сов. Энцикл., 1982. — Т. 2. П—Я — 636 с.

5. Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы: Больш за 65 000 слоў / пад. рэд. М. Р. Судніка, М. Н. Крыўко ; Афармленне А. М. Хількевіча. — 2-е выд. — Мн. : Бел ЭН, 1999. — 784 с.

6. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы : у 5 т. / пад агул. рэд. К. К. Атраховіча (К. Крапівы). — Мн. : Беларус. Сав. Энцыкл., 1977 — 1984. — Т. 1—5.

Репозиторий БарГУ

## ЗМЕСТ

Спіс скарачэнняў і абрэвіятур . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 3

*Уводзіны* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 4

**Праграмна-інфармацыйны блок**

Выпіска з вучэбнай праграмы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 6
Тэматычны план дысцыпліны . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 6
Змест дысцыпліны . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 7

**Навучальна-метадычны блок**

М о д у л ь 1 **Арфаграфія** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 11
*Тэма 1* Прынцыпы беларускай арфаграфіі . . . . . . . . . . . . . . . 11
*Тэма 2* Правапіс галосных . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 24
*Тэма 3* Правапіс зычных . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 40
*Тэма 4* Правапіс мяккага знака і апострафа . . . . . . . . . . . . . . 49
*Тэма 5* Правапіс вялікай і малой літар . . . . . . . . . . . . . . . . . . 55
*Тэма 6* Правапіс складаных слоў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 69
*Тэма 7* Правапіс суфіксаў у беларускай мове . . . . . . . . . . . . . 79
*Тэма 8* Правапіс не (ня) з рознымі часцінамі мовы . . . . . . . . . 86
М о д у л ь 2 **Пунктуацыя** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 97
*Тэма 1* Пунктуацыя як сістэма пастаноўкі знакаў прыпынку. Знакі прыпынку паміж дзейнікам і выказнікам . . . . . . . 94
*Тэма 2* Пунктуацыя пры аднародных членах сказа . . . . . . . . . . 104
*Тэма 3* Пунктуацыя пры адасобленых членах сказа . . . . . . . . . 113
*Тэма 4* Пунктуацыя пры параўнальных зваротах і зваротках . . . 121
*Тэма 5* Пунктуацыя пры пабочных і ўстаўных словах, словазлучэннях і сказах . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 128
*Тэма 6* Пунктуацыя ў складаназлучаных сказах . . . . . . . . . . . . 138
*Тэма 7* Пунктуацыя ў складаназалежных сказах . . . . . . . . . . . . 145
*Тэма 8* Пунктуацыя ў бяззлучнікавых складаных сказах . . . . . . 152
*Тэма 9* Пунктуацыя ў складаных сказах з рознымі відамі сувязі. Пунктуацыя ў сказах з простай мовай . . . . . . . . 159



Репозиторий БарГУ

**Кантрольны блок**

Кантрольны тэст па модулі 1 . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 169
Кантрольны тэст па модулі 2 . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 170

Ключы да тэставых заданняў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 190

Спіс выкарыстаных крыніц . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 192

Репозиторий БарГУ

*Вучэбнае выданне*

**Шавель** Вольга Міхайлаўна
**Швед** Марыя Васільеўна

# ПРАКТЫКУМ ПА АРФАГРАФІІ І ПУНКТУАЦЫІ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

**Вучэбна-метадычны комплекс для студэнтаў педагагічных спецыяльнасцей**


Тэхнічны рэдактар *М. Л. Патапчык*
Карэктар *В. М. Майсюк*
Камп'ютарная вёрстка *В. В. Кукрэш*

Адказны за выпуск *А. Г. Хахол*

Падпісана ў друк 01.09.2011.
Фармат 60×84 1/16. Папера афсетная.
Гарнітура Таймс. Аддрукавана на рызографе.
Ум. друк. арк. 11,39. Ул.-выд. арк. 8,17.
Заказ 39. Тыраж 90 экз.

ЛИ 02330/0552803 от 09.02.2010

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
установа адукацыі
«Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт»,
225404, г. Баранавічы, вул. Войкава, 21.


Репозиторий БарГУ